Пераклад Кодэкса адобраны экспертным саветам па пытаннях перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову (пратакол ад 08.10.2021 № 5)

# ГРАМАДЗЯНСКІ ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

11 студзеня 1999 г. № 238-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 снежня 1998 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 18 снежня 1998 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. № 285-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 54, 2/56);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 1999 г. № 349-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 5, 2/124);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 мая 2000 г. № 375-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 47, 2/150);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 2002 г. № 134-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 87, 2/883);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2002 г. № 171-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 3, 2/919);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 183-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/932);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2003 г. № 212-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 74, 2/961);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 лістапада 2003 г. № 246-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 133, 2/995);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 37-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 120, 2/1134);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2005 г. № 76-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1173);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 2006 г. № 118-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 86, 2/1215);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 137-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 107, 2/1235);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 кастрычніка 2006 г. № 173-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 179, 2/1270);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2007 г. № 250-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 170, 2/1347) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 29 ліпеня 2007 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2007 г. № 251-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 170, 2/1348);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 лістапада 2007 г. № 281-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 264, 2/1378);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 301-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1398);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2008 г. № 307-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 5, 2/1404);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 315-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1412);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2008 г. № 346-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 157, 2/1443) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 2 студзеня 2009 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 23 чэрвеня 2008 г. № 354-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 158, 2/1451) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 ліпеня 2009 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 366-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 170, 2/1463) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 16 студзеня 2009 г.**;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 376-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1473);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 397-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 175, 2/1494) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2009 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 417-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1514);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 лістапада 2008 г. № 446-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 275, 2/1543) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 20 мая 2009 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2008 г. № 449-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 289, 2/1551) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2009 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2009 г. № 26-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 148, 2/1578) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 ліпеня 2009 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 77-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 5, 2/1629);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 96-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 6, 2/1648) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 15 лютага 2010 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 104-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 15, 2/1656);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 166-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 183, 2/1718);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2011 г. № 285-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 78, 2/1837);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 302-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 83, 2/1854);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 334-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 2, 2/1884) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 6 красавіка 2012 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2012 г. № 337-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 8, 2/1889);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 г. № 349-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 10, 2/1901) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 25 ліпеня 2012 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2012 г. № 376-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 62, 2/1928) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 5 верасня 2012 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 411-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.07.2012, 2/1963) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 20 студзеня 2013 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 417-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 21.07.2012, 2/1969) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 22 верасня 2012 г.;**

Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 2012 г. № 428-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.09.2012, 2/1980) – **Кодэкс Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 2 сакавіка 2013 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 54-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2013, 2/2052) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 24 студзеня 2014 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 55-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2013, 2/2053);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 59-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2013, 2/2057) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 24 студзеня 2014 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2014 г. № 175-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 10.07.2014, 2/2173);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2016 г. № 356-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.01.2016, 2/2354);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 439-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 15.11.2016, 2/2437) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 16 мая 2017 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2017 г. № 19-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.01.2017, 2/2457) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 19 студзеня 2017 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 ліпеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2017 г. № 19-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.01.2017, 2/2457) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 19 студзеня 2017 г. і 1 ліпеня 2017 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2018 г. № 94-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 20.01.2018, 2/2532) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 21 студзеня 2018 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 21 ліпеня 2018 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2018 г. № 94-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 20.01.2018, 2/2532) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 21 студзеня 2018 г. і 21 ліпеня 2018 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 жніўня 2018 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 лютага 2019 г. і 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 жніўня 2018 г. і 1 лютага 2019 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.07.2018, 2/2573) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 жніўня 2018 г., 1 лютага 2019 г. і 1 жніўня 2020 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2018 г. № 142-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.11.2018, 2/2580);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2019 г. № 233-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.08.2019, 2/2671);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2019 г. № 277-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.12.2019, 2/2715);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2019 г. № 281-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 31.12.2019, 2/2719);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2020 г. № 45-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2020, 2/2764) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 жніўня 2020 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 студзеня 2021 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2020 г. № 45-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2020, 2/2764) – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 жніўня 2020 г. і 1 студзеня 2021 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 снежня 2020 г. № 69-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.12.2020, 2/2788);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2021 г. № 90-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 14.01.2021, 2/2810) – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 15 ліпеня 2021 г.**;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2021 г. № 104-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 15.05.2021, 2/2824);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 мая 2021 г. № 113-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 29.05.2021, 2/2833)

## ЗМЕСТ

РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 1. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе
Артыкул 2. Заканадаўства аб грамадзянскім судаводстве
Артыкул 3. Адносіны, якія рэгулююцца грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам
Артыкул 4. Дзеянне грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства
Артыкул 5. Задачы грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства
Артыкул 6. Права на зварот па судовую абарону
Артыкул 7. Спосабы судовай абароны
Артыкул 8. Віды вядзення грамадзянскіх спраў
ГЛАВА 2. ПРЫНЦЫПЫ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА
Артыкул 9. Ажыццяўленне правасуддзя толькі судом
Артыкул 10. Аднаасобны і калегіяльны разгляд грамадзянскіх спраў
Артыкул 11. Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону
Артыкул 12. Роўнасць грамадзян перад законам і судом
Артыкул 13. Павага годнасці асобы
Артыкул 14. Права карыстання юрыдычнай дапамогай
Артыкул 15. Растлумачэнне судом удзельнікам грамадзянскага судаводства іх правоў і абавязкаў
Артыкул 16. Мова судаводства
Артыкул 17. Галоснасць судовага разбору
Артыкул 18. Дыспазітыўнасць (распарадчасць)
Артыкул 19. Спрачальнасць і роўнасць бакоў
Артыкул 20. Высвятленне судом сапраўдных акалічнасцей справы
Артыкул 21. Вырашэнне спраў на падставе заканадаўства
Артыкул 22. Нагляд вышэйстаячых судоў за судовай дзейнасцю
Артыкул 23. Пракурорскі нагляд у грамадзянскім судаводстве
Артыкул 24. Абавязковасць судовых пастаноў

РАЗДЗЕЛ II. СУДЫ
ГЛАВА 3. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 25. Задачы судоў
Артыкул 26. Разгляд грамадзянскіх спраў па першай інстанцыі
Артыкул 27. Склады судовых калегій абласных, Мінскага гарадскога судоў і Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь для разгляду грамадзянскіх спраў у апеляцыйным парадку
Артыкул 28. Склады судоў для разгляду грамадзянскіх спраў у парадку нагляду
Артыкул 29. Паўнамоцтвы суда
Артыкул 30. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі)
Артыкул 31. Парадак вырашэння пытанняў судом
Артыкул 32. Падставы для адводу суддзі і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі)
Артыкул 33. Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі ў разглядзе справы
Артыкул 34. Заява аб адводзе
Артыкул 35. Парадак вырашэння заяўленага адводу
Артыкул 36. Наступствы задавальнення заявы аб адводзе суддзі
ГЛАВА 4. ПАДВЕДАМНАСЦЬ ГРАМАДЗЯНСКІХ СПРАЎ СУДАМ
Артыкул 37. Агульныя правілы аб падведамнасці
Артыкул 38. Падведамнасць у сувязі са змяненнем заканадаўства і звязаных паміж сабой патрабаванняў
Артыкул 39. Перадача спрэчак на вырашэнне трацейскіх судоў
Артыкул $39^1$. Урэгуляванне спрэчкі з удзелам медыятара (медыятараў)
Артыкул 40. Вызначэнне падведамнасці
Артыкул 41. Спрэчкі аб падведамнасці
ГЛАВА 5. ПАДСУДНАСЦЬ
Артыкул 42. Грамадзянскія справы, падсудныя раённаму (гарадскому) суду
Артыкул 43. Выключаны
Артыкул 44. Падсуднасць грамадзянскіх спраў абласным, Мінскаму гарадскому судам
Артыкул 45. Падсуднасць грамадзянскіх спраў Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь
Артыкул 46. Агульныя правілы падсуднасці
Артыкул 47. Падсуднасць па выбары істца
Артыкул 48. Выключная падсуднасць
Артыкул 49. Дагаворная падсуднасць
Артыкул 50. Падсуднасць сустрэчнага іску і грамадзянскага іску, які вынікае з крымінальнай справы
Артыкул 51. Перадача справы, прынятай судом да свайго вядзення, у іншы суд
Артыкул 52. Перадача спраў абласнымі, Мінскім гарадскім судамі або Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь з аднаго суда ў іншы
Артыкул 53. Падсуднасць спраў, па якіх адным з бакоў з’яўляецца грамадзянін або юрыдычная асоба іншай дзяржавы
РАЗДЗЕЛ III. УДЗЕЛЬНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА
ГЛАВА 6. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 54. Удзельнікі грамадзянскага судаводства
Артыкул 55. Пазіцыі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул 56. Правы і абавязкі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул 57. Правы і абавязкі юрыдычна не зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул $57^1$. Асаблівасці ажыццяўлення ўдзельнікамі грамадзянскага судаводства асобных правоў па грамадзянскіх справах, у матэрыялах якіх утрымліваюцца звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты
Артыкул 58. Грамадзянская працэсуальная правадольнасць
Артыкул 59. Грамадзянская працэсуальная дзеяздольнасць
ГЛАВА 7. БАКІ
Артыкул 60. Ісцец і адказчык
Артыкул 61. Працэсуальныя правы бакоў
Артыкул 62. Удзел у справе некалькіх істцоў або адказчыкаў (працэсуальны саўдзел)
Артыкул 63. Замена неналежнага боку
Артыкул 64. Працэсуальная правапераемнасць

ГЛАВА 8. ТРЭЦІЯ АСОБЫ
Артыкул 65. Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі
Артыкул 66. Апавяшчэнне судом асоб, якія могуць заявіць самастойныя патрабаванні
Артыкул 67. Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі
Артыкул 68. Правы і абавязкі трэціх асоб, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі
Артыкул 69. Наступствы непрыцягнення ў справу трэціх асоб, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі
ГЛАВА 9. ПРАДСТАЎНІКІ
Артыкул 70. Вядзенне спраў грамадзянамі, юрыдычнымі асобамі, а таксама арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, праз прадстаўнікоў
Артыкул 71. Вядзенне спраў Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак
Артыкул 72. Асобы, якія могуць быць прадстаўнікамі ў судзе
Артыкул 73. Асобы, якія не могуць быць прадстаўнікамі ў судзе
Артыкул 74. Законныя прадстаўнікі
Артыкул 75. Прадстаўнікі па даверанасці і прадстаўнікі калегіяльных органаў кіравання юрыдычных асоб
Артыкул 76. Афармленне даверанасці на вядзенне справы ў судзе
Артыкул 77. Прадстаўнікі, прызначаныя судом
Артыкул 78. Прадстаўнікі грамадскасці
Артыкул 79. Паўнамоцтвы прадстаўніка
ГЛАВА 10. ПРАКУРОР
Артыкул 80. Заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць пракурора ў грамадзянскім судаводстве
Артыкул 81. Права пракурора звярнуцца ў суд з заявай аб узбуджэнні справы або ўступіць у справу
Артыкул 82. Заява пракурора аб узбуджэнні справы
Артыкул 83. Абавязковы ўдзел пракурора ў грамадзянскім судаводстве
Артыкул 84. Працэсуальныя правы пракурора
ГЛАВА 11. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ, ЮРЫДЫЧНЫЯ АСОБЫ І ГРАМАДЗЯНЕ, ЯКІЯ АД УЛАСНАГА ІМЕНІ АБАРАНЯЮЦЬ ПРАВЫ іншыХ АСОБ
Артыкул 85. Права дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб на зварот у суд
Артыкул 86. Права грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку прафесійных саюзаў, на зварот у суд
Артыкул 87. Права грамадзян на зварот у суд у абарону правоў і інтарэсаў іншых асоб
Артыкул 88. Заява аб узбуджэнні справы дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай або грамадзянінам у абарону правоў іншых асоб
Артыкул 89. Працэсуальныя правы дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб і грамадзян, якія ад уласнага імені абараняюць правы іншых асоб
Артыкул 90. Заключэнні дзяржаўных органаў
ГЛАВА 12. УДЗЕЛЬНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА, ЯКІЯ НЕ МАЮЦЬ ЮРЫДЫЧНАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦІ Ў ЗЫХОДЗЕ СПРАВЫ
Артыкул 91. Сведкі
Артыкул 92. Асобы, якія не могуць быць сведкамі
Артыкул 93. Абавязкі сведкі
Артыкул 94. Права сведкі адмовіцца ад дачы паказанняў
Артыкул 95. Іншыя правы сведкі
Артыкул 96. Эксперт
Артыкул 97. Правы эксперта
Артыкул 98. Абавязкі эксперта
Артыкул 99. Спецыяліст
Артыкул 100. Правы спецыяліста
Артыкул 101. Абавязкі спецыяліста
Артыкул 102. Перакладчык і яго правы
Артыкул 103. Абавязкі перакладчыка
Артыкул 104. Паняты, яго правы і абавязкі
ГЛАВА 13. АДВОДЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА
Артыкул 105. Падставы для адводу пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, панятога
Артыкул 106. Падставы для адводу прадстаўніка боку або трэцяй асобы

Артыкул 107. Парадак заявы і вырашэння адводу і самаадводу ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства
РАЗДЗЕЛ IV. АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЯДЗЕННЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СПРАВЫ
ГЛАВА 14. ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ФАКТЫ, ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ І СУДОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 108. Працэсуальныя факты, працэсуальныя і судовыя дакументы і іх форма
Артыкул 109. Рэквізіты працэсуальных дакументаў
Артыкул 110. Копіі працэсуальных дакументаў
Артыкул 111. Выпраўленне недахопаў працэсуальнага дакумента
Артыкул 112. Структура судовай пастановы
Артыкул 113. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем
ГЛАВА 15. СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ
Артыкул 114. Судовыя выдаткі
Артыкул 115. Выключаны
Артыкул 116. Выдаткі, звязаныя з разглядам справы
Артыкул 117. Абскарджанне (апратэставанне) судовых пастаноў па пытаннях, звязаных з судовымі выдаткамі
Артыкул 118. Выключаны
Артыкул 119. Выключаны
Артыкул 120. Цана іску
Артыкул 121. Выключаны
Артыкул 122. Выключаны
Артыкул 123. Выключаны
Артыкул 124. Пакрыццё выдаткаў на аплату дапамогі прадстаўніка
Артыкул 125. Сумы, якія падлягаюць выплаце сведкам, экспертам, спецыялістам і перакладчыкам
Артыкул 126. Унясенне бакамі сум, якія падлягаюць выплаце сведкам, судова-экспертнай арганізацыі, экспертам і спецыялістам
Артыкул 127. Выплата сум, належных сведкам, экспертам, спецыялістам і перакладчыкам
Артыкул 128. Выключаны
Артыкул 129. Вызваленне ад выплаты выдаткаў, звязаных з разглядам справы
Артыкул 130. Вызваленне ад выплаты судовых выдаткаў у даход дзяржавы
Артыкул 131. Заява аб вызваленні ад выплаты судовых выдаткаў
Артыкул 132. Адмена вызначэння аб вызваленні ад судовых выдаткаў
Артыкул 133. Абавязак боку, вызваленага ад судовых выдаткаў, па іх пакрыцці
Артыкул 134. Адтэрміноўка або растэрміноўка выплаты судовых выдаткаў і змяншэнне іх памераў
Артыкул 135. Размеркаванне судовых выдаткаў паміж бакамі
Артыкул 136. Размеркаванне судовых выдаткаў паміж працэсуальнымі саўдзельнікамі
Артыкул 137. Размеркаванне судовых выдаткаў пры адмове ад іску і міравым пагадненні
Артыкул 138. Спагнанне кампенсацыі за страту працоўнага часу
Артыкул 139. Спагнанне судовых выдаткаў з нядобрасумленнага боку або трэціх асоб
Артыкул 140. Спагнанне выдаткаў, звязаных з разглядам справы, са сведкі, судова-экспертнай арганізацыі, эксперта, перакладчыка, спецыяліста або прадстаўніка
Артыкул 141. Пакрыццё бакам судовых выдаткаў са сродкаў бюджэту
Артыкул 142. Пакрыццё дзяржаве судовых выдаткаў
ГЛАВА 16. СУДОВАЯ КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ
Артыкул 143. Судовыя павесткі і судовыя паведамленні
Артыкул 144. Змест судовай павесткі і іншых паведамленняў
Артыкул 145. Дастаўка і ўручэнне судовай карэспандэнцыі
Артыкул 146. Дзеянні асобы, якая ўручае судовую карэспандэнцыю, пры адсутнасці адрасата
Артыкул $146^1$. Наступствы адмовы ад прыняцця судовай павесткі або іншай карэспандэнцыі з суда
Артыкул 147. Перамена адраса ў час вядзення справы
Артыкул 148. Дзеянні суда пры невядомасці месца знаходжання адказчыка
Артыкул 149. Вышук адказчыка праз органы ўнутраных спраў
ГЛАВА 17. ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ
Артыкул 150. Падлік працэсуальных тэрмінаў
Артыкул 151. Заканчэнне працэсуальных тэрмінаў

Артыкул 152. Прыпыненне працэсуальных тэрмінаў
Артыкул 153. Прадаўжэнне або скарачэнне працэсуальнага тэрміну
Артыкул 154. Аднаўленне прапушчаных працэсуальных тэрмінаў
Артыкул 155. Наступствы пропуску працэсуальных тэрмінаў
Артыкул 156. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэння аб прадаўжэнні, скарачэнні і аднаўленні працэсуальнага тэрміну
Артыкул 157. Адкладанне вядзення справы да разгляду заявы аб аднаўленні тэрміну
Артыкул 158. Тэрміны разгляду грамадзянскіх спраў судом першай інстанцыі
ГЛАВА 18. АДКЛАДАННЕ, ПРЫПЫНЕННЕ І СПЫНЕННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ. ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ
Артыкул 159. Адкладанне разбору справы або абвяшчэнне перапынку ў яе разборы
Артыкул 160. Абавязак суда прыпыніць вядзенне справы
Артыкул 161. Права суда прыпыніць вядзенне справы
Артыкул 162. Прававыя наступствы прыпынення вядзення справы
Артыкул 163. Аднаўленне вядзення справы
Артыкул 164. Спыненне вядзення справы
Артыкул 165. Пакіданне заявы без разгляду
Артыкул 166. Парадак прыпынення, спынення вядзення справы і пакідання заявы без разгляду
Артыкул 167. Права на абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў аб прыпыненні, спыненні вядзення справы і пакіданні заявы без разгляду
ГЛАВА 19. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПРАЦЭСУАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ
Артыкул 168. Умовы і віды працэсуальнага ўздзеяння
Артыкул 169. Прывод
Артыкул 170. Выключаны
Артыкул 171. Выключаны
Артыкул 172. Выключаны
Артыкул 173. Выключаны
ГЛАВА 20. ПРАТАКОЛЫ
Артыкул 174. Змест сціслага пратакола, пратакола
Артыкул 175. Парадак фіксавання ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем
Артыкул 176. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол
РАЗДЗЕЛ V. ДОКАЗЫ І ДАКАЗВАННЕ
ГЛАВА 21. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 177. Прадмет даказвання
Артыкул 178. Доказы і сродкі даказвання
Артыкул 179. Размеркаванне цяжару даказвання, прадастаўленне і выпатрабаванне доказаў
Артыкул 180. Адноснасць доказаў
Артыкул 181. Дапушчальнасць доказаў
Артыкул 182. Падстава вызвалення ад даказвання
ГЛАВА 22. СРОДКІ ДАКАЗВАННЯ
§ 1. Тлумачэнні бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул 183. Змест тлумачэнняў бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул 184. Асобы, якія даюць тлумачэнні ў якасці боку
Артыкул 185. Парадак допыту бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул $185^1$. Удзел у судовым пасяджэнні шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі
§ 2. Паказанні сведак
Артыкул 186. Прадмет допыту сведкі
Артыкул 187. Дзеянні суда да допыту сведкі
Артыкул 188. Парадак допыту сведкі
Артыкул 189. Допыт непаўналетняга сведкі
Артыкул 190. Абвяшчэнне паказанняў сведкі
Артыкул 191. Вочная стаўка
§ 3. Пісьмовыя доказы
Артыкул 192. Пісьмовыя доказы
Артыкул 193. Афіцыйныя і прыватныя дакументы
Артыкул 194. Дакументы, якія афармляюць заключэнне здзелкі

Артыкул 195. Абавязак прадстаўлення суду пісьмовых доказаў
Артыкул 196. Парадак выпатрабавання і прадстаўлення пісьмовых доказаў
Артыкул 197. Абвяшчэнне і прад'яўленне пісьмовых доказаў
Артыкул 198. Абвяшчэнне асабістай перапіскі і тэлеграфных паведамленняў грамадзян
Артыкул 199. Даказванне падложнасці пісьмовых доказаў
Артыкул 200. Вяртанне сапраўдных дакументаў
§ 4. Рэчавыя доказы. Агляды. Асведчанне. Апазнанне. Судовы эксперымент
Артыкул 201. Рэчавыя доказы
Артыкул 202. Выпатрабаванне і прадстаўленне рэчавых доказаў
Артыкул 203. Захоўванне рэчавых доказаў
Артыкул 204. Вяртанне рэчавых доказаў
Артыкул 205. Даследаванне рэчавых доказаў
Артыкул 206. Агляд на месцы
Артыкул 207. Парадак вядзення агляду
Артыкул 208. Асаблівасці агляду памяшканняў
Артыкул 209. Асведчанне
Артыкул 210. Сціслы пратакол, пратакол агляду або асведчання
Артыкул 211. Прад'яўленне для апазнання
Артыкул 212. Парадак прад'яўлення для апазнання
Артыкул 213. Сціслы пратакол, пратакол прад'яўлення для апазнання
Артыкул 214. Мэты і падставы правядзення судовага эксперымента
Артыкул 215. Парадак правядзення судовага эксперымента
§ 5. Правядзенне экспертыз
Артыкул 216. Мэты правядзення экспертызы
Артыкул 216[1]. Заключэнне эксперта
Артыкул 217. Віды экспертыз
Артыкул 218. Камісійная экспертыза
Артыкул 219. Комплексная экспертыза
Артыкул 220. Правы юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб у сувязі з экспертызай
Артыкул 221. Прызначэнне экспертызы судом
Артыкул 222. Узоры і матэрыялы для экспертнага даследавання
Артыкул 223. Правядзенне экспертызы ў судова-экспертнай арганізацыі
Артыкул 224. Размяшчэнне даследуемага ў арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар
Артыкул 225. Правядзенне экспертызы па-за судова-экспертнай арганізацыяй
Артыкул 226. Змест заключэння эксперта
Артыкул 227. Даследаванне экспертнага заключэння
Артыкул 228. Правядзенне дадатковай і паўторнай экспертыз
§ 6. Іншыя сродкі даказвання
Артыкул 229. Гуказапіс, відэазапіс, кіна- і відэафільмы і іншыя носьбіты інфармацыі
Артыкул 230. Заключэнні дзяржаўных органаў
Артыкул 231. Пратаколы працэсуальных дзеянняў як сродкі даказвання
ГЛАВА 23. ЗБОР, ПРАВЕРКА І АЦЭНКА ДОКАЗАЎ
Артыкул 232. Суб'екты збору доказаў
Артыкул 233. Вырашэнне хадайніцтваў аб ажыццяўленні доказных дзеянняў
Артыкул 234. Забеспячэнне доказаў
Артыкул 235. Заява аб забеспячэнні доказаў
Артыкул 236. Парадак забеспячэння доказаў судом
Артыкул 237. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў па пытанні забеспячэння доказаў
Артыкул 238. Судовыя даручэнні
Артыкул 239. Выключаны
Артыкул 240. Праверка доказаў
Артыкул 241. Ацэнка доказаў
РАЗДЗЕЛ VI. ІСКАВАЕ ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ
ГЛАВА 24. УЗБУДЖЭННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ
Артыкул 242. Падача іскавай заявы
Артыкул 243. Змест іскавай заявы

Артыкул 244. Узбуджэнне справы
Артыкул 245. Адмова ва ўзбуджэнні справы ў сувязі з адсутнасцю права на зварот у суд
Артыкул 246. Адмова ва ўзбуджэнні справы ў сувязі з наяўнасцю да гэтага перашкод
Артыкул 247. Наступствы адмовы ва ўзбуджэнні справы
Артыкул 248. Пакіданне іскавай заявы без руху
Артыкул 249. Адмова ад пададзенай іскавай заявы аб узбуджэнні справы
Артыкул 250. Злучэнне і раз'яднанне некалькіх іскавых патрабаванняў
Артыкул 251. Абарона супраць іску
Артыкул 252. Пярэчанні супраць іску
Артыкул 253. Прад'яўленне сустрэчнага іску
ГЛАВА 25. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ІСКУ
Артыкул 254. Падставы забеспячэння іску
Артыкул 255. Меры па забеспячэнні іску
Артыкул 256. Вырашэнне пытання аб забеспячэнні іску
Артыкул 257. Замена адной меры забеспячэння іску іншай і адмена забеспячэння іску
Артыкул 258. Пакрыццё адказчыку страт, прычыненых забеспячэннем іску
Артыкул 259. Абскарджанне вызначэнняў па пытаннях забеспячэння іску
ГЛАВА 26. ПАДРЫХТОЎКА СПРАВЫ ДА СУДОВАГА РАЗБОРУ
Артыкул 260. Вызначэнне аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору
Артыкул 260$^{1}$. Дзеянні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору
Артыкул 261. Задачы па падрыхтоўцы справы да судовага разбору
Артыкул 262. Дзеянні суддзі пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору
Артыкул 263. Мэта папярэдняга судовага пасяджэння
Артыкул 264. Папярэдняе судовае пасяджэнне
Артыкул 265. Прызначэнне справы да судовага разбору
ГЛАВА 27. СУДОВЫ РАЗБОР
§ 1. Агульныя палажэнні
Артыкул 266. Мэта судовага разбору
Артыкул 267. Судовае пасяджэнне
Артыкул 268. Час і месца правядзення судовага пасяджэння
Артыкул 269. Прынцыпы судовага разбору
Артыкул 270. Старшынствуючы ў судовым пасяджэнні
Артыкул 271. Парадак у судовым пасяджэнні
Артыкул 272. Меры, якія прымаюцца ў дачыненні да парушальнікаў парадку ў судовым пасяджэнні
Артыкул 273. Межы судовага разбору
§ 2. Падрыхтоўчая частка судовага разбору
Артыкул 274. Адкрыццё судовага пасяджэння
Артыкул 275. Праверка яўкі і ўстанаўленне асобы ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства
Артыкул 276. Праверка своечасовасці ўручэння адказчыку копіі іскавай заявы
Артыкул 277. Растлумачэнне перакладчыку яго абавязкаў
Артыкул 278. Выхад сведак з залы пасяджэння суда
Артыкул 279. Аб'яўленне складу суда, іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства і растлумачэнне права адводу
Артыкул 280. Растлумачэнне юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, эксперту і спецыялісту іх правоў і абавязкаў
Артыкул 281. Вырашэнне заяўленых хадайніцтваў
Артыкул 282. Наступствы няяўкі ў судовае пасяджэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, сведкі, эксперта, спецыяліста або перакладчыка
Артыкул 283. Допыт сведак, эксперта або спецыяліста пры адкладанні разбору справы
§ 3. Разгляд справы па сутнасці
Артыкул 284. Даклад старшынствуючага
Артыкул 285. Адмова ад іску, прызнанне іску, міравое пагадненне бакоў, правядзенне медыяцыі
Артыкул 285$^{1}$. Наступствы заключэння бакамі медыяцыйнага пагаднення па спрэчцы, якая знаходзіцца на вырашэнні суда
Артыкул 286. Тлумачэнні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Артыкул 287. Устанаўленне парадку прадстаўлення і даследавання доказаў
Артыкул 288. Процідзеянне злоўжыванню правамі ў працэсе даказвання
Артыкул 289. Заканчэнне судовага даследавання доказаў
§ 4. Заключная частка судовага разбору
Артыкул 290. Судовыя спрэчкі
Артыкул 291. Судовыя рэплікі
Артыкул 292. Аднаўленне разбору справы па сутнасці
Артыкул 293. Выхад суда для вынясення рашэння
ГЛАВА 28. СУДОВЫЯ ПАСТАНОВЫ СУДОЎ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ
§ 1. Агульныя палажэнні
Артыкул 294. Віды судовых пастаноў суда першай інстанцыі
Артыкул 295. Паняцце рашэння суда першай інстанцыі
Артыкул 296. Паняцце вызначэння суда першай інстанцыі
Артыкул 297. Законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў
§ 2. Парадак вынясення і змест рашэння суда першай інстанцыі
Артыкул 298. Абавязак суда не выходзіць за межы іскавых патрабаванняў
Артыкул 299. Тайна дарадчага пакоя
Артыкул 300. Пытанні, якія вырашаюцца пры вынясенні рашэння
Артыкул 301. Парадак работы суда ў дарадчым пакоі
Артыкул 302. Змест рашэння
Артыкул 303. Уводная частка рашэння
Артыкул 304. Апісальная частка рашэння
Артыкул 305. Патрабаванне аб складанні матывавальнай часткі (абгрунтавання) рашэння
Артыкул 306. Рэзалюцыйная частка рашэння
Артыкул 307. Рэзалюцыйная частка рашэння па некаторых катэгорыях спраў
Артыкул 308. Рашэнне аб прысуджэнні маёмасці
Артыкул 309. Рашэнне, якое абавязвае адказчыка ажыццявіць пэўныя дзеянні
Артыкул 310. Падрыхтоўка рашэння
Артыкул 311. Абвяшчэнне рашэння
Артыкул 312. Складанне матывавальнай часткі рашэння
§ 3. Неадкладнае выкананне і законная сіла рашэння, індэксацыя прысуджаных грашовых сум
Артыкул 313. Рашэнні, якія падлягаюць неадкладнаму выкананню
Артыкул 314. Права суда дапусціць неадкладнае выкананне рашэння
Артыкул 315. Забеспячэнне інтарэсаў адказчыка пры неадкладным выкананні рашэння
Артыкул 316. Забеспячэнне выкanання рашэння, не накіраванага да неадкладнага выканання
Артыкул 317. Уступленне рашэння суда ў законную сілу
Артыкул 318. Наступствы ўступлення рашэння суда ў законную сілу
Артыкул 318[1]. Судовая пастанова аб працаўладкаванні
Артыкул 318[2]. Індэксацыя прысуджаных грашовых сум
§ 4. Парадак вынясення і змест вызначэння суда першай інстанцыі
Артыкул 319. Парадак вынясення вызначэння
Артыкул 320. Змест вызначэння
Артыкул 321. Абвяшчэнне або ўручэнне вызначэння
Артыкул 322. Абгрунтаванне вызначэння
Артыкул 323. Законная сіла вызначэння
Артыкул 324. Прымяненне да вызначэння нормаў аб рашэнні
Артыкул 325. Прыватнае вызначэнне суда
§ 5. Дадатковае рашэнне. Растлумачэнне і выпраўленне рашэння суда першай інстанцыі
Артыкул 326. Дадатковае рашэнне
Артыкул 327. Растлумачэнне рашэння
Артыкул 328. Выпраўленне апісак і відавочных падліковых памылак у рашэнні
Артыкул 329. Права суда адтэрмінаваць або растэрмінаваць выкананне рашэння суда, а таксама змяніць спосаб і парадак яго выканання
Артыкул 330. Парадак вынясення дадатковага рашэння, растлумачэння рашэння, выпраўлення апісак і відавочных падліковых памылак, адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, а таксама змянення спосабу і парадку выканання рашэння

Артыкул 331. Права на абскарджанне вызначэння суда аб адмове ў вынясенні дадатковага рашэння, а таксама па пытаннях растлумачэння рашэння, выпраўлення ў рашэнні апісак і падліковых памылак, аб адтэрміноўцы і растэрміноўцы выканання рашэння, а таксама змяненні спосабу і парадку выканання рашэння
§ 6. Перагляд судом першай інстанцыі судовых пастаноў суда першай інстанцыі
Артыкул 332. Права суда перагледзець вынесеную ім судовую пастанову, вынесці новую судовую пастанову
Артыкул 333. Вынясенне новага рашэння пасля змянення акалічнасцей
Артыкул 334. Адмена або змяненне вызначэння судом, які яго вынес
ГЛАВА 28[1]. ЗАВОЧНАЕ ВЯДЗЕННЕ
Артыкул 334[1]. Падставы для завочнага вядзення
Артыкул 334[2]. Парадак завочнага вядзення, змест завочнага рашэння суда і ўступленне яго ў законную сілу
Артыкул 334[3]. Высылка копіі завочнага рашэння суда
Артыкул 334[4]. Адмена завочнага рашэння суда
Артыкул 334[5]. Змест заявы аб адмене завочнага рашэння суда
Артыкул 334[6]. Разгляд заявы аб адмене завочнага рашэння суда
Артыкул 334[7]. Аднаўленне разгляду справы
ГЛАВА 28[2]. ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ АБ ВЯРТАННІ ДЗІЦЯЦІ АБО АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ПРАВОЎ ДОСТУПУ
Артыкул 334[8]. Падача заявы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу
Артыкул 334[9]. Парадак разгляду і вырашэння спраў аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу
Артыкул 334[10]. Забеспячальныя меры
Артыкул 334[11]. Адкладанне і прыпыненне вядзення справы, звязанай са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці)
Артыкул 334[12]. Недапушчальнасць злучэння патрабаванняў і прад'яўлення сустрэчнага іску
Артыкул 334[13]. Рашэнне суда па справе аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу
Артыкул 334[14]. Накіраванне копій судовых пастаноў
РАЗДЗЕЛ VII. ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ, ЯКІЯ ЎЗНІКАЮЦЬ З АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ПРАВАВЫХ АДНОСІН. АСАБЛІВАЕ ВЯДЗЕННЕ. ЗАГАДНАЕ ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ
ГЛАВА 29. ВЯДЗЕННЕ СПРАў, ЯКІЯ ўЗНІКАЮЦЬ З АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ПРАВАВЫХ АДНОСІН
§ 1. Агульныя палажэнні
Артыкул 335. Агульныя правілы падведамнасці суду спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін
Артыкул 336. Парадак разгляду і вырашэння спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін
Артыкул 337. Агульныя палажэнні вядзення спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін
Артыкул 338. Правы і абавязкі заяўнікаў, а таксама дзяржаўных органаў, арганізацый і службовых асоб, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца
Артыкул 339. Абавязак доказвання і прадстаўлення доказаў
Артыкул 340. Скарга і сродкі яе забеспячэння
§ 2. Асаблівасці разгляду скаргаў на дзеянні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, на рашэнне органаў, якія стварылі камісію
Артыкул 341. Падача скаргі
Артыкул 342. Разгляд скаргі
Артыкул 343. Рашэнне суда па скарзе
§ 3. Выключаны
Артыкул 344. Выключаны
Артыкул 345. Выключаны
Артыкул 346. Выключаны
Артыкул 347. Выключаны

§ 4. Асаблівасці разгляду скаргаў на адмову органаў, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, унесці выпраўленні ў запісы актаў грамадзянскага стану
Артыкул 348. Падсуднасць
Артыкул 349. Змест скаргі
Артыкул 350. Рашэнне суда па скарзе
§ 5. Асаблівасці разгляду скаргаў на натарыяльныя дзеянні або на адмову ў іх ажыццяўленні
Артыкул 351. Падача скаргі. Разгляд скаргі
Артыкул 352. Рашэнне суда па скарзе
§ 6. Асаблівасці разгляду і вырашэння скаргаў на дзеянні (бяздзейнасць) дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб, а таксама арганізацый, што не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асоб, якія ўшчамляюць правы грамадзян, а ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства, – і правы юрыдычных асоб
Артыкул 353. Права на зварот са скаргай у суд
Артыкул 354. Падача скаргі
Артыкул 355. Тэрміны для звароту ў суд са скаргай
Артыкул 356. Разгляд скаргі
Артыкул 357. Рашэнне суда па скарзе. Выкананне рашэння
Артыкул 358. Права на зварот у суд юрыдычных асоб
§ $6^1$. Асаблівасці разгляду і вырашэння скаргаў асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, на прымяненне да іх мер спагнання і скаргаў адміністрацыйна арыштаваных на прымяненне да іх відаў дысцыплінарных спагнанняў
Артыкул $358^1$. Падсуднасць
Артыкул $358^2$. Падача і разгляд скаргі
Артыкул $358^3$. Рашэнне суда па скарзе
§ $6^2$. Асаблівасці разгляду і вырашэння скаргаў грамадзян на вынесенае ў дачыненні да іх папярэджанне аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый і скаргаў грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, на пастанову аб прымяненні да іх мер спагнання
Артыкул $358^4$. Падсуднасць
Артыкул $358^5$. Падача і разгляд скаргі
Артыкул $358^6$. Рашэнне суда па скарзе
§ 7. Асаблівасці разгляду скаргаў на рашэнні Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе
Артыкул 359. Падача і разгляд скаргі
Артыкул 360. Рашэнне суда па скарзе
§ 8. Асаблівасці разгляду скаргаў на рашэнні аб спыненні разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадаўжэнні тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь
Артыкул $360^1$. Падача скаргі. Разгляд скаргі
Артыкул $360^2$. Рашэнне суда па скарзе
§ 9. Асаблівасці разгляду скаргаў (пратэстаў) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання
Артыкул $360^3$. Падача скаргі (пратэсту)
Артыкул $360^4$. Змест скаргі (пратэсту)
Артыкул $360^5$. Разгляд скаргі (пратэсту)
Артыкул $360^6$. Рашэнне суда па скарзе (пратэсце)
ГЛАВА 30. АСАБЛІВАЕ ВЯДЗЕННЕ
§ 1. Агульныя палажэнні
Артыкул 361. Справы, якія разглядаюцца судом у парадку асаблівага вядзення
Артыкул 362. Парадак разгляду спраў асаблівага вядзення

§ 2. Асаблівасці разгляду спраў аб устанаўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне
Артыкул 363. Умовы ўстанаўлення фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне, у судовым парадку
Артыкул 364. Справы аб устанаўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне
Артыкул 365. Падсуднасць
Артыкул 366. Змест заявы
Артыкул 367. Рашэнне суда па справе
§ 3. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб'яўленні грамадзяніна памерлым
Артыкул 368. Падсуднасць
Артыкул 369. Падача заявы. Змест заявы.
Артыкул 370. Падрыхтоўка справы да судовага разбору. Разгляд заявы
Артыкул 371. Рашэнне суда па справе
Артыкул 372. Дзеянні суда ў выпадку яўкі або выяўлення грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак або аб'яўленага памерлым
§ 4. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, а таксама аб прызнанні грамадзяніна дзеяздольным ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці
Артыкул 373. Падача заявы. Змест заявы
Артыкул 374. Прызначэнне экспертызы
Артыкул 375. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе
Артыкул 376. Прызнанне недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным або абмежавана дзеяздольным. Адмена абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна
§ $4^1$. Асаблівасці разгляду спраў аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях
Артыкул $376^1$. Падача заявы. Змест заявы
Артыкул $376^2$. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе
§ 5. Асаблівасці разгляду спраў аб аб'яўленні непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыя)
Артыкул 377. Падача заявы. Разгляд заявы
Артыкул 378. Рашэнне суда па заяве
§ 6. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай уласнасці на нерухомую рэч
Артыкул 379. Падача заявы. Змест заявы
Артыкул 380. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе
§ $6^1$. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі
Артыкул $380^1$. Падача заявы. Змест заявы
Артыкул $380^2$. Разгляд заявы. Рашэнне суда па заяве
§ 7. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні спадчыны вымарачнай
Артыкул 381. Падача заявы. Змест заявы
Артыкул 382. Разгляд заявы. Рашэнне суда па заяве
§ 8. Асаблівасці разгляду спраў аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка
Артыкул 383. Падача заявы
Артыкул 384. Змест заявы
Артыкул 385. Падрыхтоўка справы да судовага разбору
Артыкул 386. Заява трымальніка дакумента
Артыкул 387. Дзеянні суда пасля паступлення заявы ад трымальніка дакумента
Артыкул 388. Дзеянні суда пры адсутнасці заявы трымальніка дакумента
Артыкул 389. Рашэнне суда па справе
Артыкул 390. Права трымальніка дакумента прад'явіць іск аб беспадстаўным набыцці або захаванні маёмасці
§ 9. Асаблівасці разгляду спраў аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзян, прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзян
Артыкул 391. Падача і разгляд заявы аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні
Артыкул 392. Рашэнне суда па заяве аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні
Артыкул $392^1$. Падача і разгляд заявы аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння
Артыкул 393. Рашэнне суда па заяве аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння

§ 10. Асаблівасці разгляду спраў аб усынаўленні дзіцяці
Артыкул $393^{1}$. Падача заявы
Артыкул $393^{2}$. Змест заявы і пералік дакументаў, якія дадаюцца да яе
Артыкул $393^{3}$. Падрыхтоўка справы да судовага разбору
Артыкул $393^{4}$. Разгляд заявы
Артыкул $393^{5}$. Рашэнне суда па заяве
§ 11. Асаблівасці разгляду спраў аб змяшчэнні непаўналетніх у спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы або спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб пераводзе непаўналетніх са спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў у спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб спыненні знаходжання непаўналетніх ва ўказаных установах да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў іх, аб прадаўжэнні гэтага тэрміну, а таксама аб змяшчэнні непаўналетніх у прыёмнікі-размеркавальнікі для непаўналетніх, аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання непаўналетніх у прыёмніках-размеркавальніках для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетніх з прыёмнікаў-размеркавальнікаў для непаўналетніх
Артыкул $393^{6}$. Падача заявы
Артыкул $393^{7}$. Разгляд заявы
Артыкул $393^{8}$. Рашэнне (вызначэнне) суда па заяве
§ 12. Асаблівасці разгляду спраў аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі, прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі
Артыкул $393^{9}$. Падача і разгляд заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый
Артыкул $393^{10}$. Рашэнне суда па заяве аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый
Артыкул $393^{11}$. Падача і разгляд заяў аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі
Артыкул $393^{12}$. Рашэнне суда па заявах аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі
ГЛАВА 31. ЗАГАДНАЕ ВЯДЗЕННЕ
Артыкул 394. Паняцце загаднага вядзення
Артыкул 395. Падача і змест заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення
Артыкул 396. Падставы для адмовы ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення
Артыкул 397. Парадак вынясення і змест вызначэння аб судовым загадзе
Артыкул 398. Выкананне і адмена вызначэння аб судовым загадзе
РАЗДЗЕЛ VIII. ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ У АПЕЛЯЦЫЙНЫМ ПАРАДКУ І Ў ПАРАДКУ НАГЛЯДУ. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ПА НОВЫХ АКАЛІЧНАСЦЯХ
ГЛАВА 32. ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ У АПЕЛЯЦЫЙНЫМ ПАРАДКУ
§ 1. Перагляд у апеляцыйным парадку судовых пастаноў суда першай інстанцыі
Артыкул 399. Права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) рашэння суда, якое не ўступіла ў законную сілу
Артыкул 400. Права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда, якія не ўступілі ў законную сілу
Артыкул 401. Суды апеляцыйнай інстанцыі
§ 2. Узбуджэнне апеляцыйнага вядзення
Артыкул 402. Парадак падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 403. Тэрміны апеляцыйнага абскарджання (апратэставання)
Артыкул 404. Падставы да адмовы ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 405. Змест апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 406. Копіі апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту і пісьмовых матэрыялаў, якія прыкладаюцца да іх
Артыкул 407. Пакіданне апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без руху
Артыкул 408. Дзеянні суда першай інстанцыі пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту

Артыкул 409. Дапаўненні, змяненні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 410. Далучэнне да апеляцыйнай скаргі
Артыкул 411. Пярэчанні на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст
Артыкул 412. Адмова ад апеляцыйнай скаргі, адкліканне апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 413. Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, міравое пагадненне бакоў
Артыкул 414. Правядзенне медыяцыі
§ 3. Падрыхтоўка і разгляд справы судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 415. Падрыхтоўка справы да разгляду ў апеляцыйным парадку
Артыкул 416. Тэрміны разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 417. Парадак разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 418. Прадмет і межы разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 419. Удзел у судовым пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі
Артыкул 420. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 421. Наступствы няяўкі ў судовае пасяджэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб
Артыкул 422. Разгляд справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 423. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту на рашэнне суда першай інстанцыі
Артыкул 424. Падставы да адмены або змянення рашэння суда першай інстанцыі
Артыкул 425. Падставы да адмены рашэння са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду
Артыкул 426. Парадак разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, якія паступілі пасля разгляду справы ў апеляцыйным парадку
Артыкул 427. Вяртанне справы ў суд першай інстанцыі
§ 4. Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце на рашэнне суда першай інстанцыі
Артыкул 428. Змест вызначэння суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 429. Парадак вынясення вызначэння судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 430. Прыватнае вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 431. Законная сіла вызначэння суда апеляцыйнай інстанцыі
§ 5. Перагляд у апеляцыйным парадку вызначэнняў суда першай інстанцыі
Артыкул 432. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда першай інстанцыі
Артыкул 433. Парадак падачы і разгляду прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту
Артыкул 434. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту на вызначэнне суда першай інстанцыі
ГЛАВА 33. ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ У СУДЗЕ НАГЛЯДНАЙ ІНСТАНЦЫІ
Артыкул 435. Судовыя пастановы, якія могуць быць перагледжаны ў парадку нагляду
Артыкул 436. Нагоды і падставы да выпатрабавання спраў і прынясення пратэстаў у парадку нагляду
Артыкул 437. Змест нагляднай скаргі
Артыкул 438. Вяртанне нагляднай скаргі
Артыкул 439. Службовыя асобы, якія маюць права прынясення пратэсту ў парадку нагляду
Артыкул 440. Суды нагляднай інстанцыі, якія разглядаюць справы па пратэстах у парадку нагляду
Артыкул 441. Выпатрабаванне справы. Прыпыненне выканання судовых пастаноў
Артыкул 442. Тэрміны разгляду наглядных скаргаў. Прынясенне пратэсту ў парадку нагляду
Артыкул 443. Апавяшчэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб і накіраванне ім копій пратэсту ў парадку нагляду
Артыкул 444. Адкліканне пратэсту ў парадку нагляду
Артыкул 445. Разгляд справы ў судзе нагляднай інстанцыі
Артыкул 446. Судовыя пастановы судоў нагляднай інстанцыі
Артыкул 447. Паўнамоцтвы суда нагляднай інстанцыі
Артыкул 448. Падставы да адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду
Артыкул 449. Абавязковасць указанняў суда, які разглядае справу ў парадку нагляду
Артыкул 450. Змест і законная сіла судовых пастаноў судоў нагляднай інстанцыі
Артыкул 451. Прыватнае вызначэнне (пастанова) суда нагляднай інстанцыі

ГЛАВА 34. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ПА НОВЫХ АКАЛІЧНАСЦЯХ
Артыкул 452. Падставы для перагляду судовых пастаноў па новых акалічнасцях
Артыкул 453. Суды, якія пераглядаюць судовыя пастановы па новых акалічнасцях
Артыкул 454. Узбуджэнне вядзення па пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях
Артыкул 455. Вылічэнне тэрміну падачы заявы аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях
Артыкул 456. Разгляд заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях
Артыкул 457. Вызначэнне суда па заяве або прадстаўленні аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях
Артыкул 458. Разгляд справы пасля вынясення вызначэння аб задавальненні заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях
РАЗДЗЕЛ VIII[1]. ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ТРАЦЕЙСКАГА СУДА, ПРАЦОЎНАГА АРБІТРАЖУ
ГЛАВА 34[1]. ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ТРАЦЕЙСКАГА СУДА
Артыкул 458[1]. Абскарджанне рашэння трацейскага суда
Артыкул 458[2]. Форма і змест заявы аб адмене рашэння трацейскага суда
Артыкул 458[3]. Парадак разгляду заявы аб адмене рашэння трацейскага суда
Артыкул 458[4]. Падставы для адмены рашэння трацейскага суда
Артыкул 458[5]. Вызначэнне суда па заяве аб адмене рашэння трацейскага суда
ГЛАВА 34[2]. ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ПРАЦОЎНАГА АРБІТРАЖУ
Артыкул 458[6]. Абскарджанне рашэння працоўнага арбітражу
Артыкул 458[7]. Форма і змест заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу
Артыкул 458[8]. Парадак разгляду заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу
Артыкул 458[9]. Падставы для адмены рашэння працоўнага арбітражу
Артыкул 458[10]. Вызначэнне суда па заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу
РАЗДЗЕЛ IX. ВЯДЗЕННЕ, ЗВЯЗАНАЕ З ВЫКАНАННЕМ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ, ІНШЫХ РАШЭННЯЎ І АКТАЎ. ВЫДАЧА ВЫКАНАЎЧАГА ЛІСТА НА ПРЫМУСОВАЕ ВЫКАНАННЕ МЕДЫЯЦЫЙНАГА ПАГАДНЕННЯ
ГЛАВА 35. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 459. Кампетэнцыя судоў, звязаная з выкананнем судовых пастаноў, іншых рашэнняў і актаў
Артыкул 460. Выдача судом выканаўчага ліста
Артыкул 461. Выдача па адной судовай пастанове некалькіх выканаўчых лістоў
Артыкул 462. Змест выканаўчага ліста, выдадзенага судом
Артыкул 463. Растлумачэнне выканаўчага ліста або іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, выдадзеных судом, спосабу і парадку іх выканання
Артыкул 464. Выдача дубліката выканаўчага ліста
ГЛАВА 35[1]. ВЫДАЧА ВЫКАНАЎЧАГА ЛІСТА НА ПРЫМУСОВАЕ ВЫКАНАННЕ МЕДЫЯТЫЎНАГА ПАГАДНЕННЯ
Артыкул 464[1]. Зварот па выдачу выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення
Артыкул 464[2]. Форма і змест заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення
Артыкул 464[3]. Вяртанне заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення
Артыкул 464[4]. Парадак разгляду заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення
Артыкул 464[5]. Адмова ў выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення
ГЛАВА 36. ПАВАРОТ ВЫКАНАННЯ СУДОВАЙ ПАСТАНОВЫ. АДНАЎЛЕННЕ ПРАПУШЧАНАГА ТЭРМІНУ ПРАД'ЯЎЛЕННЯ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА ДА ВЫКАНАННЯ. ПРЫНЯЦЦЕ МЕР ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ВЫКАНАННЯ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА. ВЫЗВАЛЕННЕ МАЁМАСЦІ АД АРЫШТУ
Артыкул 465. Паварот выканання судовай пастановы
Артыкул 466. Разгляд пытання аб павароце выканання судовай пастановы судом першай інстанцыі
Артыкул 467. Вырашэнне пытання аб павароце выканання судовай пастановы судом апеляцыйнай або наглядной інстанцыі

Артыкул 468. Аднаўленне прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання
Артыкул 469. Прыняцце судом мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента
Артыкул 470. Вызваленне маёмасці ад арышту
ГЛАВЫ 37–40. ВЫКЛЮЧАНЫ
РАЗДЗЕЛ X. МІЖНАРОДНЫ ГРАМАДЗЯНСКІ ПРАЦЭС
ГЛАВА 41. ПРАВІЛЫ МІЖНАРОДНАГА ГРАМАДЗЯНСКАГА ПРАЦЭСУ
Артыкул 541. Грамадзянскія працэсуальныя правы замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, замежных юрыдычных асоб
Артыкул 542. Прымяненне працэсуальнага закона пры разглядзе грамадзянскіх спраў з удзелам замежных грамадзян і юрыдычных асоб
Артыкул 543. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 544. Падсуднасць судам Рэспублікі Беларусь грамадзянскіх спраў па спрэчках, у якіх удзельнічаюць замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя юрыдычныя асобы, а таксама па спрэчках, па якіх хаця б адзін з бакоў пражывае за мяжой
Артыкул 545. Агульныя правілы падсуднасці спраў судам Рэспублікі Беларусь
Артыкул 546. Падсуднасць па пагадненні бакоў
Артыкул 547. Нязменнасць першапачатковай падсуднасці
Артыкул 548. Дзеянні суда Рэспублікі Беларусь у выпадку ўзбуджэння тоеснай справы ў замежным судзе
Артыкул 549. Наступствы непадсуднасці справы суду Рэспублікі Беларусь
Артыкул 550. Працэсуальная праваздольнасць і дзеяздольнасць асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы
Артыкул 551. Прадстаўнік у міжнародным грамадзянскім працэсе
Артыкул 552. Консульскае прадстаўніцтва
Артыкул 553. Іскі да замежных дзяржаў
Артыкул 554. Дыпламатычны імунітэт
Артыкул 555. Выключэнне з юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь кіраўнікоў і персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў або міжнародных міжурадавых арганізацый
Артыкул 556. Выключэнні з юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь для супрацоўнікаў консульскіх устаноў замежных дзяржаў і некаторых іншых асоб
Артыкул 557. Дзеянні суда пасля выхаду асобы з-пад юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь пасля ўзбуджэння справы
Артыкул 558. Адмова ад дыпламатычнага імунітэту
Артыкул 559. Меры ў адказ у выпадку парушэння дыпламатычнага імунітэту Рэспублікі Беларусь або яе прадстаўнікоў
Артыкул 560. Выкананне судовых даручэнняў замежных судоў і зварот судоў Рэспублікі Беларусь з даручэннямі да замежных судоў
Артыкул 561. Выкананне рашэнняў замежных судоў і арбітражаў (трацейскіх судоў)
Артыкул $561^1$. Асаблівасці разгляду просьбаў аб спагнанні аліментаў на падставе Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і
РАЗДЗЕЛ XI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 42. ПАРАДАК УСТУПЛЕННЯ ГЭТАГА КОДЭКСА Ў СІЛУ
Артыкул 562. Момант уступлення гэтага Кодэкса ў сілу
Артыкул 563. Дзеянне заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сувязі з уступленнем у сілу гэтага Кодэкса
Артыкул 564. Завяршэнне вядзення па асобных катэгорыях спраў
Артыкул 565. Дзеянні дзяржаўных органаў у сувязі з уступленнем у сілу гэтага Кодэкса
Артыкул 566. Прызнанне страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь
Дадатак 1. Выключаны
Дадатак 2. Аднаўленне страчанага судовага вядзення
Дадатак 3. Выключаны
Дадатак 4. Выкананне ў Рэспубліцы Беларусь судамі рашэнняў замежных судоў і арбітражаў (трацейскіх судоў), калі бокам па справе з'яўляецца грамадзянін, які не з'яўляецца прадпрымальнікам, што ажыццяўляе сваю дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы

# РАЗДЗЕЛ I
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 1
## АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе

Для мэт гэтага Кодэкса прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

1) апеляцыйная скарга – скарга аб адмене або змяненні рашэння, якое не ўступіла ў законную сілу;

2) апеляцыйны пратэст – пратэст упаўнаважанага гэтым Кодэксам пракурора аб адмене або змяненні рашэння, якое не ўступіла ў законную сілу;

3) блізкія родзічы – бацькі, дзеці, усынаўляльнікі (удачаральнікі) (далей – усынаўляльнікі), усыноўленыя (удачароныя) (далей – усыноўленыя), родныя браты і сёстры, дзядуля, бабуля, унукі;

4) грамадзянскія справы – іскавыя справы (па спрэчках, якія вынікаюць з грамадзянскіх, сямейных, працоўных і іншых адносін), справы, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, справы асаблівага вядзення, справы загаднага вядзення, іншыя справы ў прадугледжаных законам выпадках;

5) законныя прадстаўнікі – бацькі, усынаўляльнікі, апекуны, апекавальнікі істца, або адказчыка, або трэцяй асобы і іншыя асобы, якім гэта права прадастаўлена законам, а таксама арганізацыі, на апекаванні якіх знаходзяцца істец, або адказчык, або трэцяя асоба;

6) сціслы пратакол, пратакол – судовыя дакументы, у якіх з захаваннем парадку, устаноўленага гэтым Кодэксам, фіксуюцца факт вядзення грамадзянскай справы, змест і вынікі працэсуальных дзеянняў;

7) начны час – перыяд часу з 22 да 6 гадзін;

8) вызначэнне – усякая судовая пастанова судоў усіх інстанцый, акрамя пастаноў, указаных у пунктах 11 і 17 гэтага артыкула;

9) падведамнасць – размежаванне кампетэнцыі па вырашэнні спрэчак і разглядзе спраў паміж Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь, судамі агульнай юрысдыкцыі, міжнароднымі арбітражнымі (трацейскімі) судамі, органамі па вырашэнні працоўных спрэчак і разглядзе спраў, іншымі органамі і арганізацыямі;

10) падсуднасць – аднясенне грамадзянскай справы, падведамнай суду агульнай юрысдыкцыі, да вядзення суда першай інстанцыі;

11) пастанова – судовая пастанова, прынятая Пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога судоў па выніках праверкі судовых пастаноў у парадку нагляду;

12) выключаны;

13) прэюдыцыя – папярэдняе вырашэнне пытання аб праўдзівасці фактаў і праваадносін, устаноўленых судовай пастановай, якая ўступіла ў законную сілу пры разглядзе іншай справы паміж тымі ж асобамі;

14) пракурор – дзеючыя ў межах сваёй кампетэнцыі Генеральны пракурор і падначаленыя яму пракуроры, у тым ліку транспартныя пракуроры, іх намеснікі і памочнікі, саветнікі, начальнікі структурных падраздзяленняў органаў пракуратуры і іх намеснікі, старшыя пракуроры і пракуроры структурных падраздзяленняў органаў пракуратуры;

15) пратэст у парадку нагляду – пратэст упаўнаважанай гэтым Кодэксам службовай асобы аб адмене або змяненні судовых пастаноў, якія ўступілі ў законную сілу;

16) выключаны;

17) рашэнне – судовая пастанова суда першай інстанцыі, што разгледзеў справу па сутнасці, якая ўтрымлівае адказ (адказы) на заяўленыя патрабаванні;

18) суд – любы арганізаваны на законных падставах суд агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь, які разглядае грамадзянскія справы калегіяльна або аднаасобна: суд першай інстанцыі, суд апеляцыйнай (другой) інстанцыі, суд наглядай інстанцыі;

19) суд апеляцыйнай (другой) інстанцыі – суд, правамоцны па скаргах юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, а таксама іншых асоб, калі суд вынес рашэнне аб іх правах і абавязках, і пратэстах пракурора правяраць у апеляцыйным парадку законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу;

20) суд наглядай інстанцыі – суд, правамоцны правяраць у парадку нагляду справы па пратэстах на судовыя пастановы, якія ўступілі ў законную сілу, і прымаць пастановы ў межах сваёй кампетэнцыі;

21) суд першай інстанцыі – суд, правамоцны вынесці рашэнне па грамадзянскай справе;

22) судовая пастанова – рашэнне, вызначэнне, пастанова судоў усіх інстанцый;

23) суддзя – асоба, прызначаная на пасаду суддзі ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі, для ажыццяўлення абавязкаў суддзі на прафесійнай аснове;

24) прыватная скарга – скарга на вызначэнне суда першай інстанцыі, якое не ўступіла ў законную сілу;

25) прыватны пратэст – пратэст упаўнаважанага гэтым Кодэксам пракурора на вызначэнне суда першай інстанцыі, якое не ўступіла ў законную сілу;

26) члены сям’і – блізкія родзічы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, а таксама іншыя родзічы, муж (жонка), непрацаздольныя ўтрыманцы і іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з істцом, або адказчыкам, або трэцяй асобай і вядуць з імі агульную гаспадарку.

**Артыкул 2. Заканадаўства аб грамадзянскім судаводстве**

Судаводства па грамадзянскіх справах рэгулюецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 3. Адносіны, якія рэгулююцца грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам**

Грамадзянскае працэсуальнае заканадаўства рэгулюе парадак разгляду і вырашэння судамі грамадзянскіх, сямейных, працоўных, іншых іскавых спраў, спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-праваых адносін, спраў асаблівага вядзення, спраў загаднага вядзення, а таксама іншых спраў і парадак вядзення, звязанага з выкананнем судовых пастаноў, іншых рашэнняў і актаў.

**Артыкул 4. Дзеянне грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства**

У Рэспубліцы Беларусь вядзенне грамадзянскіх спраў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам, якое дзейнічае на яе тэрыторыі падчас разгляду справы ў судзе.

Грамадзянскае працэсуальнае заканадаўства, якое абмяжоўвае правы ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства, адваротнай сілы не мае.

**Артыкул 5. Задачы грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства**

Задачамі грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства з’яўляюцца забеспячэнне правільнага і своечасовага разгляду і вырашэння судамі грамадзянскіх спраў, выканання судовых пастаноў і іншых актаў, якія падлягаюць выкананню, абарона правоў і ахаваных законам інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб.

Грамадзянскае працэсуальнае заканадаўства дапамагае выхаванню грамадзян у духу павагі і выканання законаў, супрацоўніцтва пры вырашэнні спрэчак, папярэджванню правапарушэнняў, умацаванню сістэмы гаспадарання і розных формаў уласнасці.

**Артыкул 6. Права на зварот па судовую абарону**

Зацікаўленая асоба мае права ва ўстаноўленым парадку звяртацца ў суд па абарону парушанага або аспрэчваемага права ці ахаванага законам інтарэсу.

Адмова ад права на зварот у суд неправадзейная. Аднак пры ўзаемнай згодзе зацікаўленых асоб іх спрэчка аб абароне парушанага або аспрэчваемага права ва ўстаноўленых законам выпадках можа быць перададзена імі на разгляд трацейскага суда або для ўрэгулявання з удзелам медыятара (медыятараў).

Судовыя справы ў абарону правоў або ахаваных законам інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб у прадугледжаных законам выпадках могуць быць узбуджаны таксама па заявах пракурора, дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб і асобных грамадзян.

Не дапускаецца адмова ў судовай абароне па матывах адсутнасці, непаўнаты, супярэчлівасці, няяснасці нарматыўнага акта.

Зацікаўленая асоба абавязана захаваць парадак папярэдняга пазасудовага вырашэння справы, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі для спагнання ў бясспрэчным парадку грашовых сум (запазычанасці) з даўжніка прадугледжана ажыццяўленне натарыусам выканаўчага надпісу, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 7. Спосабы судовай абароны**

Суд ажыццяўляе абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў шляхам:

прызнання права;

прысуджэння да выканання абавязку, аднаўлення парушанага права або забароны ці стрымання дзеянняў, якія вядуць да парушэння права;

забеспячэння ўзнікнення, змянення або спынення праваадносін;

устанаўлення факта, які мае юрыдычнае значэнне;

прымянення іншых прадугледжаных заканадаўствам спосабаў.

**Артыкул 8. Віды вядзення грамадзянскіх спраў**

Грамадзянскае працэсуальнае заканадаўства прадугледжвае наступныя віды вядзення:

іскавае;

спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін;

асаблівае;

загаднае;

іншыя віды вядзення, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

## ГЛАВА 2
## ПРЫНЦЫПЫ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА

**Артыкул 9. Ажыццяўленне правасуддзя толькі судом**

Правасуддзе па грамадзянскіх справах ажыццяўляецца толькі судом. Грамадзянскія справы разглядаюць суддзі, прызначаныя на пасаду ва ўстаноўленым заканадаўчымі актамі парадку.

**Артыкул 10. Аднаасобны і калегіяльны разгляд грамадзянскіх спраў**

Грамадзянскія справы па першай інстанцыі разглядаюцца суддзямі ўсіх судоў аднаасобна, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – калегіяльна.

Суды апеляцыйнай і нагляднай інстанцый па скаргах і пратэстах на рашэнні суда разглядаюць грамадзянскія справы калегіяльна, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага артыкула.

Разгляд у судзе апеляцыйнай інстанцыі грамадзянскіх спраў па прыватных скаргах і прыватных пратэстах на вызначэнні суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу і якімі справа не вырашана па сутнасці, ажыццяўляецца суддзёй суда апеляцыйнай інстанцыі аднаасобна.

**Артыкул 11. Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону**

Пры ажыццяўленні правасуддзя па грамадзянскіх справах суддзі незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону. Умяшанне ў іх дзейнасць па ажыццяўленні правасуддзя не дапускаецца і цягне адказнасць па законе.

Гарантыі незалежнасці суддзяў устанаўліваюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 12. Роўнасць грамадзян перад законам і судом**

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь роўныя перад законам і судом незалежна ад паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў, роду і характару заняткаў, месца жыхарства, часу пражывання ў гэтай мясцовасці і іншых абставін.

**Артыкул 13. Павага годнасці асобы**

Суд абавязаны паважаць годнасць удзельнікаў грамадзянскага судаводства. Любы ўдзельнік грамадзянскага судаводства лічыцца добрасумленным, пакуль не даказана адваротнае.

**Артыкул 14. Права карыстання юрыдычнай дапамогай**

У судаводстве па грамадзянскіх справах грамадзяне і юрыдычныя асобы маюць права на юрыдычную дапамогу адвакатаў і іншых прадстаўнікоў.

Парадак аказання юрыдычнай дапамогі грамадзянам і юрыдычным асобам вызначаецца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 15. Растлумачэнне судом удзельнікам грамадзянскага судаводства іх правоў і абавязкаў**

Суд растлумачвае ўдзельнікам грамадзянскага судаводства іх працэсуальныя правы і абавязкі, а таксама папярэджвае аб наступствах неналежнага ажыццяўлення правоў, адмовы ад іх ажыццяўлення ці невыканання або неналежнага выканання працэсуальных абавязкаў.

**Артыкул 16. Мова судаводства**

Судаводства ў Рэспубліцы Беларусь вядзецца на беларускай і (або) рускай мовах.

Юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, калі яны не валодаюць (або недастаткова валодаюць) мовай судаводства, забяспечваецца права азнаёміцца

з матэрыяламі справы і ўдзельнічаць у судовых дзеяннях праз перакладчыка, а таксама права выступаць у судзе на мове, якой яны звычайна карыстаюцца.

Судовыя дакументы ва ўстаноўленым парадку ўручаюцца юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам на мове судаводства.

**Артыкул 17. Галоснасць судовага разбору**

Разгляд грамадзянскіх спраў ва ўсіх судах адкрыты.

З мэтай абароны звестак, што складаюць дзяржаўныя сакрэты або іншую ахаваную законам тайну, якія ўтрымліваюцца ў матэрыялах справы, праводзіцца закрытае судовае пасяджэнне.

Для прадухілення разгалошвання інфармацыі, якая тычыцца інтымных бакоў жыцця грамадзян або зневажае іх гонар, годнасць або дзелавую рэпутацыю, а таксама ў выпадку, калі гэта неабходна для аховы інтарэсаў непаўналетняга, суд можа слухаць справу ў цэлым або ажыццяўляць асобныя працэсуальныя дзеянні ў закрытым судовым пасяджэнні.

Па просьбе бакоў або аднаго з іх пры адсутнасці пярэчанняў юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб суд можа разгледзець у закрытым судовым пасяджэнні любую справу.

Пры разглядзе справы або ажыццяўленні асобных працэсуальных дзеянняў у закрытым судовым пасяджэнні прысутнічаюць толькі юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, а ў неабходных выпадках – сведкі, эксперты, спецыялісты, перакладчыкі. Закрытае судовае пасяджэнне праводзіцца з выкананнем усіх працэсуальных правіл, установленых гэтым Кодэксам. Рэзалютыўная частка рашэння суда ў любым выпадку абвяшчаецца публічна.

Аб разглядзе справы ў закрытым судовым пасяджэнні суд выносіць вызначэнне.

**Артыкул 18. Дыспазітыўнасць (распарадчасць)**

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права свабодна выкарыстоўваць прыналежныя ім матэрыяльныя і працэсуальныя правы, не парушаючы пры гэтым правы і ахаваныя законам інтарэсы іншых асоб і дзяржавы.

Грамадзянскія справы ўзбуджаюцца судом толькі па заявах юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб і разглядаюцца толькі ў дачыненні да заяўленых патрабаванняў, акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 19. Спрачальнасць і роўнасць бакоў**

Грамадзянскія справы ва ўсіх судах разглядаюцца на аснове спрачальнасці і роўнасці бакоў у працэсе. У спрэчцы паміж сабой бакі абавязаны добрасумленна карыстацца прыналежнымі ім матэрыяльнымі і працэсуальнымі правамі і выконваць працэсуальныя абавязкі.

**Артыкул 20. Высвятленне судом сапраўдных акалічнасцей справы**

Абавязак прадставіць неабходныя для ўстанаўлення ісціны па справе доказы ляжыць на баках, трэціх асобах і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асобах. Для ўсебаковага, поўнага, аб’ектыўнага высвятлення ўсіх акалічнасцей, якія маюць істотнае значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы, суд садзейнічае ўказаным асобам па іх хадайніцтве ў выпатрабаванні доказаў, калі прадстаўленне такіх доказаў для іх немагчымае.

**Артыкул 21. Вырашэнне спраў на падставе заканадаўства**

Суд абавязаны вырашаць справы на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынятых у адпаведнасці з ёй нарматыўных прававых актаў. У выпадку разыходжання

дэкрэта або ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з законам закон мае вяршэнства толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта або ўказа былі прадастаўлены законам.

У выпадку адсутнасці нормы права, якая рэгулюе спрэчныя адносіны, суд прымяняе норму права, якая рэгулюе падобныя адносіны (аналогія закона), а пры адсутнасці такой нормы права суд, вырашаючы спрэчку, зыходзіць з агульных пачаткаў (прынцыпаў) і сэнсу заканадаўства (аналогія права).

Калі пры разглядзе канкрэтнай справы суд прыйдзе да вываду аб неадпаведнасці нарматыўнага акта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ён прымае рашэнне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і ставіць ва ўстаноўленым парадку пытанне аб прызнанні гэтага нарматыўнага акта неканстытуцыйным.

**Артыкул 22. Нагляд вышэйстаячых судоў за судовай дзейнасцю**

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе правасуддзе і нагляд за судовай дзейнасцю судоў Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым законамі.

Абласныя, Мінскі гарадскі суды ажыццяўляюць нагляд за судовай дзейнасцю раённых (гарадскіх) судоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі гэтай вобласці, горада Мінска.

**Артыкул 23. Пракурорскі нагляд у грамадзянскім судаводстве**

Нагляд за законнасцю і абгрунтаванасцю судовых пастаноў па грамадзянскіх справах, а таксама за захаваннем заканадаўства пры іх выкананні ажыццяўляецца Генеральным пракурорам і падначаленымі яму пракурорамі.

Пракурор абавязаны на ўсіх стадыях грамадзянскага судаводства своечасова прымаць прадугледжаныя законам меры да ліквідацыі любых парушэнняў закона, ад каго б гэтыя парушэнні ні паходзілі.

Свае паўнамоцтвы ў грамадзянскім судаводстве пракурор ажыццяўляе незалежна ад якіх бы тое ні было органаў і службовых асоб, кіруючыся толькі заканадаўчымі актамі і падпарадкоўваючыся ўказанням Генеральнага пракурора.

**Артыкул 24. Абавязковасць судовых пастаноў**

Судовыя пастановы, якія ўступілі ў законную сілу, абавязковыя для ўсіх грамадзян, у тым ліку службовых асоб, а таксама юрыдычных асоб і падлягаюць выкананню на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Абавязковасць судовых пастаноў не пазбаўляе зацікаўленых асоб магчымасці звярнуцца ў суд па абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў, спрэчка аб якіх судом не была разгледжана і вырашана.

## РАЗДЗЕЛ II
## СУДЫ

### ГЛАВА 3
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 25. Задачы судоў**

Правасуддзе па грамадзянскіх справах ажыццяўляецца судамі ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

Суд арганізуе працэс па грамадзянскай справе з мінімальна неабходнымі выдаткамі сіл, сродкаў, часу і забяспечвае ў межах устаноўленых гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства тэрмінаў вырашэнне задач грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства (артыкул 5 гэтага Кодэкса).

### Артыкул 26. Разгляд грамадзянскіх спраў па першай інстанцыі

Грамадзянскія справы па першай інстанцыі разглядаюць аднаасобна старшыні, намеснікі старшынь, суддзі раённых (гарадскіх), абласных, Мінскага гарадскога судоў і Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Грамадзянскія справы па спрэчках у галіне аўтарскага права і сумежных правоў разглядаюцца ў судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па першай інстанцыі суддзямі аднаасобна, грамадзянскія справы па спрэчках, якія вынікаюць з прымянення заканадаўства, што рэгулюе адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі са стварэннем, прававой аховай і выкарыстаннем аб’ектаў прамысловай уласнасці, – у складзе трох суддзяў.

Суддзя пры аднаасобным разглядзе і вырашэнні спраў або іншых пытанняў працэсу дзейнічае ад імені суда.

### Артыкул 27. Склады судовых калегій абласных, Мінскага гарадскога судоў і Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь для разгляду грамадзянскіх спраў у апеляцыйным парадку

Судовыя калегіі па грамадзянскіх справах абласных, Мінскага гарадскога судоў, судовая калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у якасці судоў другой інстанцыі правяраюць у апеляцыйным парадку законнасць і абгрунтаванасць рашэнняў і вызначэнняў судоў першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу. У гэтых выпадках названыя суды засядаюць у складзе трох суддзяў, адзін з якіх старшынствуе пры разглядзе справы.

### Артыкул 28. Склады судоў для разгляду грамадзянскіх спраў у парадку нагляду

У якасці судоў наглядной інстанцыі прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога судоў, судовая калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь правяраюць па пратэстах упаўнаважаных службовых асоб законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў ніжэйстаячых судоў, якія ўступілі ў законную сілу.

Разгляд грамадзянскай справы ў парадку нагляду ажыццяўляецца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога судоў пры ўдзеле большасці членаў прэзідыума суда; судовай калегіяй па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – у складзе трох суддзяў, адзін з якіх старшынствуе пры разглядзе справы; Прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – пры ўдзеле большасці членаў Прэзідыума; Пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – пры ўдзеле не менш за дзве трэці членаў Пленума.

### Артыкул 29. Паўнамоцтвы суда

Да паўнамоцтваў суда адносяцца:

разгляд грамадзянскай справы і вынясенне судовай пастановы;

разгляд справы ў апеляцыйным парадку і ў парадку нагляду;

перагляд пастаноў суда па новых абставінах;

разгляд заявы аб адмене рашэння трацейскага суда;

разгляд заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу;

разгляд пытанняў, якія ўзнікаюць пры выкананні рашэнняў і іншых дакументаў.

Пры калегіяльным разглядзе справы ў якасці суддзяў дзейнічаюць старшынствуючы і суддзі, якія ўваходзяць у склад суда. Усе суддзі ў складзе суда валодаюць аднолькавымі правамі.

### Артыкул 30. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі)

Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) па даручэнні суддзі ажыццяўляе дзеянні, неабходныя для падрыхтоўкі справы да папярэдняга судовага пасяджэння або разгляду ў судовым пасяджэнні; апавяшчае ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства пра час і месца судовага разбору і правярае іх яўку ў суд; высвятляе прычыны няяўкі і дакладвае аб гэтым суддзі; забяспечвае выкарыстанне сродкаў гука- або відэазапісу для фіксавання ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем і складанне сціслага пратакола, пратакола; выконвае ўсе іншыя даручэнні суддзі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем судовага пасяджэння.

У выпадку рознагалоссяў з суддзёй наконт зместу сціслага пратакола, пратакола сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) мае права прыкласці да сціслага пратакола, пратакола свае заўвагі.

У выпадку нязгоды з гэтымі заўвагамі суддзя абавязаны вынесці матываванае вызначэнне, якое разам з заўвагамі далучаецца да справы.

### Артыкул 31. Парадак вырашэння пытанняў судом

Пры разглядзе справы па першай інстанцыі аднаасобна суддзёй усе пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе судовага разбору, вырашаюцца ім аднаасобна.

Калі справа разглядаецца калегіяльна, усе пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе судовага разбору і ў дарадчым пакоі, вырашаюцца суддзямі большасцю галасоў. Галасаванне праводзіцца адкрыта пры вырашэнні кожнага пытання, ніхто з суддзяў не мае права ўстрымацца ад галасавання. Старшынствуючы галасуе апошнім. Суддзя, не згодны з рашэннем большасці, можа выказаць у пісьмовым выглядзе сваё асаблівае меркаванне. Асаблівае меркаванне далучаецца да справы, але ў зале судовага пасяджэння не абвяшчаецца.

Пытанні, якія ўзнікаюць па-за судовым разборам, суддзя вырашае аднаасобна. Суддзя (старшынствуючы) аднаасобна аддае таксама распараджэнні па вядзенні судовага разбору і падтрыманні парадку ў зале судовага пасяджэння.

### Артыкул 32. Падставы для адводу суддзі і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі)

Суддзя не можа ўдзельнічаць у разглядзе справы, калі:

1) яго звязваюць з адным з бакоў па справе, якая разглядаецца, адносіны шлюбу, сваяцтва, усынаўлення (удачарэння) (далей, калі не ўказана іншае, – усынаўленне), апекі або апекавальніцтва;

2) ён быў або застаецца прадстаўніком аднаго з бакоў па справе;

3) ён пры папярэднім разглядзе гэтай справы ў судах першай і другой інстанцый або ў парадку нагляду ўдзельнічаў у якасці сведкі, эксперта, перакладчыка, пракурора, сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі);

4) ён асабіста прама або ўскосна зацікаўлены ў зыходзе справы або маюцца іншыя абставіны, якія выклікаюць сумненні ў яго аб’ектыўнасці і бесстароннасці.

У склад суда, што разглядае грамадзянскую справу, не могуць уваходзіць асобы, якія знаходзяцца ў сваяцтве паміж сабой.

Падставы для адводу, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, распаўсюджваюцца таксама на сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі). Аднак удзел яго ў папярэднім разглядзе справы ў той жа якасці падставай для адводу не з’яўляецца.

### Артыкул 33. Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі ў разглядзе справы

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе грамадзянскай справы ў судзе першай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах апеляцыйнай або нагляднай інстанцыі, а таксама ў новым разглядзе гэтай справы ў судзе першай інстанцыі ў выпадку адмены вынесенага ім рашэння.

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў парадку нагляду, а таксама ў новым разглядзе справы ў судзе першай або апеляцыйнай інстанцыі пасля адмены вызначэння, вынесенага з яго ўдзелам.

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў парадку нагляду, не можа прымаць удзел у далейшым разглядзе гэтай справы ў судзе нагляднай інстанцыі, за выключэннем Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, а таксама ў разглядзе справы ў судзе першай, другой або нагляднай інстанцыі пасля адмены судовай пастановы, вынесенай з яго ўдзелам.

Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў парадку нагляду ў Пленуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, мае права прымаць удзел у разглядзе гэтай справы ў судзе першай, другой або нагляднай інстанцыі, за выключэннем выпадкаў адмены Пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь судовай пастановы, вынесенай з удзелам гэтага суддзі.

### Артыкул 34. Заява аб адводзе

Пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкулах 32 і 33 гэтага Кодэкса, суддзя абавязаны заявіць самаадвод і адмовіцца ад удзелу ў разглядзе справы. Па тых жа падставах матываваны адвод суддзі можа заявіць асоба, юрыдычна зацікаўленая ў зыходзе справы.

Адвод заяўляецца пісьмова або вусна да пачатку разгляду справы па сутнасці і ўносіцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння. Пазнейшая заява адводу дапускаецца толькі ў выпадках, калі падстава для яго ўзнікла або стала вядомай асобе, якая заяўляе адвод, пасля пачатку разгляду справы. Калі такія абставіны сталі вядомыя суддзі пасля пачатку разгляду справы, ён абавязаны паведаміць аб іх у судовым пасяджэнні і вырашыць пытанне аб адводзе па ўласнай ініцыятыве.

У такім жа парадку заяўляецца адвод сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі).

### Артыкул 35. Парадак вырашэння заяўленага адводу

У выпадку заявы адводу суд павінен выслухаць меркаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, а таксама заслухаць асобу, якой заяўлены адвод, калі асоба, якая адводзіцца, жадае даць тлумачэнні.

Суддзя, сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі), якім заяўлены адвод, да вырашэння пытання аб іх выконваюць толькі неадкладныя працэсуальныя дзеянні.

Адвод, заяўлены суддзі, які разглядае справу аднаасобна, вырашаецца самім суддзёй. Пры разглядзе справы ў калегіяльным складзе пытанне аб адводзе суддзі вырашаецца астатнімі суддзямі ў адсутнасць асобы, якая адводзіцца. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных за адвод і супраць яго, суддзя лічыцца адведзеным. Адвод, заяўлены некалькім суддзям або ўсяму складу суда, вырашаецца гэтым жа судом у поўным складзе простай большасцю галасоў.

Адвод, заяўлены сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі), вырашаецца суддзёй або старшынствуючым, які разглядае справу.

Пытанне аб адводзе вырашаецца ў дарадчым пакоі з вынясеннем вызначэння.

**Артыкул 36. Наступствы задавальнення заявы аб адводзе суддзі**

У выпадку задавальнення адводу, заяўленага суддзі або суддзям, справа разглядаецца ў тым жа судзе, але іншым складам суддзяў.

Калі ўтварыць новы склад суда для разгляду справы ў гэтым судзе немагчыма, яна накіроўваецца ў вышэйстаячы суд для перадачы на разгляд іншага суда.

## ГЛАВА 4
## ПАДВЕДАМНАСЦЬ ГРАМАДЗЯНСКІХ СПРАЎ СУДАМ

**Артыкул 37. Агульныя правілы аб падведамнасці**

Судам падведамныя справы:

1) па спрэчках, якія ўзнікаюць з грамадзянскіх, сямейных, працоўных, жыллёвых, зямельных адносін, адносін па выкарыстанні прыродных рэсурсаў, а таксама навакольнага асяроддзя, калі хаця б адным з бакоў у спрэчцы выступае грамадзянін, за выключэннем выпадкаў, калі актамі заканадаўства вырашэнне такіх спрэчак аднесена да кампетэнцыі іншых судоў або да вядзення іншых дзяржаўных органаў, а таксама іншых арганізацый;

2) па спрэчках юрыдычных асоб у выпадках, устаноўленых гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

3) якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін і пералічаны ў артыкуле 335 гэтага Кодэкса;

4) асаблівага вядзення, пералічаныя ў артыкуле 361 гэтага Кодэкса;

5) загаднага вядзення, пералічаныя ў артыкуле 394 гэтага Кодэкса.

Судам падведамныя і іншыя справы, аднесеныя заканадаўчымі актамі да іх кампетэнцыі.

**Артыкул 38. Падведамнасць у сувязі са змяненнем заканадаўства і звязаных паміж сабой патрабаванняў**

Справа, прынятая судом да свайго вядзення з выкананнем правіл падведамнасці, павінна быць вырашана ім па сутнасці, хаця б у далейшым яна стала яму непадведамнай.

Пры прад'яўленні некалькіх звязаных паміж сабой патрабаванняў, з якіх адны падведамныя суду агульнай юрысдыкцыі, а другія – іншаму дзяржаўнаму органу або арганізацыі, усе патрабаванні падлягаюць разгляду ў судзе агульнай юрысдыкцыі, калі іншае не прадугледжана актамі заканадаўства.

**Артыкул 39. Перадача спрэчак на вырашэнне трацейскіх судоў**

У выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, спрэчка па пагадненні бакоў можа быць перададзена на вырашэнне трацейскага суда.

**Артыкул $39^1$. Урэгуляванне спрэчкі з удзелам медыятара (медыятараў)**

Спрэчка, якая ўзнікла з грамадзянскіх, сямейных, працоўных, іншых праваадносін і падведамная суду, па пісьмовым пагадненні бакоў да выхаду суда ў дарадчы пакой для вынясення судовай пастановы па сутнасці спрэчкі можа быць перададзена для ўрэгулявання бакамі з удзелам медыятара (медыятараў).

**Артыкул 40. Вызначэнне падведамнасці**

Падведамнасць вызначаецца суддзёй, які прымае справу да вядзення, або судом, у вядзенні якога яна знаходзіцца.

**Артыкул 41. Спрэчкі аб падведамнасці**

Судовая пастанова аб падведамнасці, якая ўступіла ў законную сілу, абавязковая для іншых судоў, дзяржаўных органаў, а таксама арганізацый, указаных у судовай пастанове, якія маюць права паставіць пытанне аб яе адмене перад вышэйстаячым судом.

## ГЛАВА 5
## ПАДСУДНАСЦЬ

**Артыкул 42. Грамадзянскія справы, падсудныя раённаму (гарадскому) суду**

Раённы (гарадскі) суд разглядае па першай інстанцыі падведамныя судам грамадзянскія справы, за выключэннем спраў, аднесеных да падсуднасці іншых судоў.

**Артыкул 43. Выключаны**

**Артыкул 44. Падсуднасць грамадзянскіх спраў абласным, Мінскаму гарадскому судам**

Абласныя, Мінскі гарадскі суды маюць права забраць любую грамадзянскую справу з раённага (гарадскога) суда, які знаходзіцца на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска, і прыняць яе да свайго вядзення ў якасці суда першай інстанцыі.

Абласныя, Мінскі гарадскі суды разглядаюць справы па першай інстанцыі, падсудныя ім паводле актаў заканадаўства (па скаргах на адмову ў рэгістрацыі мясцовых грамадскіх аб'яднанняў грамадзян, на адмову ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па правядзенні абласнога рэферэндуму і інш.).

Абласныя, Мінскі гарадскі суды разглядаюць справы па першай інстанцыі, у матэрыялах якіх утрымліваюцца звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты.

**Артыкул 45. Падсуднасць грамадзянскіх спраў Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь**

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь мае права забраць любую грамадзянскую справу з любога суда агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь і прыняць яе да свайго вядзення ў якасці суда першай інстанцыі.

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае таксама справы па першай інстанцыі, падсудныя яму ў адпаведнасці з актамі заканадаўства (па скаргах на адмову ў рэгістрацыі рэспубліканскіх і міжнародных грамадскіх аб'яднанняў грамадзян, па заявах аб спыненні дзейнасці такіх аб'яднанняў, па скаргах на адмову ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму, па скаргах на адмову ў рэгістрацыі палітычных партый, па заявах аб спыненні дзейнасці палітычных партый, па скаргах на рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях грамадзянства, па скаргах на адмову Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў у рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, справы па спрэчках, што вынікаюць з прымянення заканадаўства, якое рэгулюе маёмасныя і асабістыя немаёмасныя адносіны, што ўзнікаюць у сувязі са стварэннем, прававой аховай і выкарыстаннем аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці і інш.).

**Артыкул 46. Агульныя правілы падсуднасці**

Заява аб узбуджэнні справы падаецца ў суд па месцы жыхарства адказчыка, калі іншае не вызначана гэтым Кодэксам.

Калі адказчыкам з'яўляецца юрыдычная асоба, заява падаецца па месцы яе знаходжання, указаным у статуце або іншым устаноўчым дакуменце.

**Артыкул 47. Падсуднасць па выбары істца**

Іск да адказчыка, месца жыхарства якога невядомае або які не мае месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, можа быць прад'яўлены па месцы знаходжання яго маёмасці або па апошнім вядомым месцы яго жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь.

Іск, які вынікае з дзейнасці філіяла юрыдычнай асобы, можа быць прад'яўлены таксама па месцы знаходжання філіяла.

Іскі аб спагнанні аліментаў, аб устанаўленні мацярынства і (або) бацькоўства ці аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў могуць прад'яўляцца істцом таксама па месцы яго жыхарства.

Іск аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, можа прад'яўляцца істцом таксама па месцы яго знаходжання або па месцы знаходжання дзяцей на дзяржаўным забеспячэнні.

Іск аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў можа прад'яўляцца істцом таксама па месцы жыхарства (знаходжання) дзіцяці, калі дзіця знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні.

Іск аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна, можа прад'яўляцца істцом таксама па месцы яго жыхарства або па месцы прычынення шкоды.

Іск аб пакрыцці шкоды, прычыненай маёмасці грамадзяніна або юрыдычнай асобы, можа прад'яўляцца таксама па месцы прычынення шкоды.

Іск, што вынікае з дагавора, у якім указана месца выканання, можа быць прад'яўлены таксама па месцы выканання дагавора.

Іск аб скасаванні шлюбу з асобай, прызнанай ва ўстаноўленым законам парадку адсутнай без вестак, недзеяздольнай, а таксама асобай, асуджанай за ўчыненне злачынства да пазбаўлення волі на тэрмін не меншы за тры гады, можа прад'яўляцца па месцы жыхарства істца.

Іск аб скасаванні шлюбу можа быць прад'яўлены па месцы жыхарства істца таксама ў выпадку, калі пры ім знаходзяцца непаўналетнія дзеці або калі па стане здароўя выезд істца да месца жыхарства адказчыка прадстаўляецца для яго цяжкім.

Іск аб пакрыцці шкоды, прычыненай грамадзяніну незаконным асуджэннем, незаконным прыцягненнем да крымінальнай адказнасці, незаконным прымяненнем у якасці меры стрымання заключэння пад варту, незаконным накладаннем адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе арышту або папраўчых работ, можа быць прад'яўлены істцом таксама па месцы яго жыхарства.

Іск аб абароне правоў спажыўца можа быць прад'яўлены таксама па месцы жыхарства або знаходжання істца ці па месцы выканання дагавора або па месцы прычынення шкоды.

Іск да некалькіх адказчыкаў, якія пражываюць або знаходзяцца ў розных месцах, прад'яўляецца ў суд па месцы жыхарства або месцы знаходжання аднаго з адказчыкаў.

Выбар паміж некалькімі судамі, якім падсудная справа, належыць істцу.

Падсуднасць па выбары істца можа быць устаноўлена і ў іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі законамі.

**Артыкул 48. Выключная падсуднасць**

Іскі аб правах на зямельныя ўчасткі, будынкі, памяшканні, збудаванні, іншыя аб'екты, моцна звязаныя з зямлёй, а таксама аб вызваленні маёмасці ад арышту прад'яўляюцца па месцы знаходжання гэтых аб'ектаў або арыштаванай маёмасці.

Іск крэдытора спадчынадаўцы, які прад'яўляецца да прыняцця спадчыны спадчыннікамі, падсудны суду па месцы знаходжання спадчыннай маёмасці або асноўнай яго часткі.

Іск да перавозчыка, што вынікае з дагавора перавозкі грузаў, пасажыраў або багажу, прад'яўляецца па месцы знаходжання перавозчыка, да якога ва ўстаноўленым парадку была прад'яўлена прэтэнзія або павінна была быць прад'яўлена прэтэнзія.

Скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, на якога ўскладзены функцыі па непасрэдным выкананні выканаўчых дакументаў (далей – іншы работнік органа прымусовага выканання), а таксама скаргі (пратэсты) на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, вынесеныя па выніках разгляду скаргі (пратэсту) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання ў пазасудовым парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні (далей – пастанова кіраўніка органа прымусовага выканання), падаюцца ў суд па месцы знаходжання адпаведнага органа прымусовага выканання, за выключэннем скаргаў (пратэстаў), разгляд якіх гаспадарчым працэсуальным заканадаўствам ускладзены на суды, што разглядаюць эканамічныя справы.

**Артыкул 49. Дагаворная падсуднасць**

Бакі могуць па пісьмовым пагадненні паміж сабой устанавіць дагаворную тэрытарыяльную падсуднасць, акрамя выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 48 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 50. Падсуднасць сустрэчнага іску і грамадзянскага іску, які вынікае з крымінальнай справы**

Сустрэчны іск незалежна ад яго падсуднасці прад'яўляецца ў суд па месцы разгляду першапачатковага іску.

Грамадзянскі іск, які вынікае з крымінальнай справы, калі ён не быў заяўлены або не быў вырашаны пры вядзенні крымінальнай справы, прад'яўляецца ў парадку грамадзянскага судаводства па правілах падсуднасці, устаноўленых гэтым Кодэксам.

**Артыкул 51. Перадача справы, прынятай судом да свайго вядзення, у іншы суд**

Справа, прынятая судом да свайго вядзення з выкананнем правіл падсуднасці, павінна быць вырашана ім па сутнасці, хаця б у далейшым яна стала падсуднай іншаму суду.

Суд перадае справу на разгляд іншага суда, калі:

1) яна будзе больш хутка, поўна і ўсебакова разгледжана ў іншым судзе;

2) адказчык, месца жыхарства якога не было раней вядома, заявіць хадайніцтва аб перадачы справы ў суд па месцы яго жыхарства;

3) пры разглядзе справы ў гэтым судзе высветлілася, што яна была прынята да вядзення з парушэннем правіл падсуднасці;

4) пасля адводу аднаго або некалькіх суддзяў, а таксама з прычыны іншых абставін, якія заслугоўваюць увагі, замена суддзяў або разгляд справы ў гэтым судзе немагчымыя;

5) прад'яўлены іск да суда.

На вызначэнне аб перадачы справы ў іншы суд можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

Перадача справы з аднаго суда ў іншы праводзіцца па сканчэнні тэрміну на абскарджанне або апратэставанне гэтага вызначэння, а ў выпадку падачы прыватнай скаргі або прынясення прыватнага пратэсту – пасля пакідання вышэйстаячым судом прыватнай скаргі або прыватнага пратэсту без задавальнення.

Справа, накіраваная з аднаго суда ў іншы ў парадку, прадугледжаным гэтым артыкулам, падлягае безумоўнаму прыняццю да вядзення судом, якому яна накіравана. Спрэчкі аб падсуднасці паміж судамі не дапускаюцца.

**Артыкул 52. Перадача спраў абласнымі, Мінскім гарадскім судамі або Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь з аднаго суда ў іншы**

У асобных выпадках з мэтай найбольш хуткага і правільнага разгляду спраў, а таксама з мэтай найлепшага забеспячэння выхаваўчай ролі судовага разбору справа да пачатку яе разгляду ў судовым пасяджэнні можа быць перададзена з аднаго суда, якому яна падсудная, у іншы.

Пытанне аб перадачы справы па ўказаных падставах з аднаго суда ў іншы ў межах вобласці, горада Мінска вырашаецца старшынёй адпаведнага абласнога, Мінскага гарадскога судоў, Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі.

Пытанне аб перадачы справы па ўказаных падставах у суд іншай вобласці, горада Мінска вырашаецца Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі.

**Артыкул 53. Падсуднасць спраў, па якіх адным з бакоў з'яўляецца грамадзянін або юрыдычная асоба іншай дзяржавы**

Падсуднасць спраў, па якіх адным з бакоў з'яўляецца грамадзянін або юрыдычная асоба іншай дзяржавы, вызначаецца артыкуламі 544–549 гэтага Кодэкса.

## РАЗДЗЕЛ III
## УДЗЕЛЬНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА

### ГЛАВА 6
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 54. Удзельнікі грамадзянскага судаводства**

Удзельнікамі грамадзянскага судаводства з'яўляюцца юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы і асобы, якія такой зацікаўленасці не маюць.

Да юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб адносяцца:

бакі, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы, трэція асобы, заяўнікі, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і іншыя арганізацыі, службовыя асобы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца, зацікаўленыя грамадзяне і юрыдычныя асобы – па справах асаблівага вядзення;

пракурор, дзяржаўныя органы, якія маюць дзяржаўны, грамадскі або іншы інтарэс у зыходзе справы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія ад уласнага імені абараняюць правы іншых асоб; дзяржаўныя органы, якія ўступілі ў працэс з мэтай дачы заключэння па справе; прадстаўнікі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, акрамя пракурора.

Юрыдычнай зацікаўленасці ў зыходзе справы не маюць сведкі, эксперты, спецыялісты, перакладчыкі, панятыя, захавальнікі арыштаванай або спрэчнай маёмасці.

Удзельнікамі грамадзянскага судаводства ў загадным вядзенні і выканаўчым вядзенні з'яўляюцца спагнаннікі, даўжнікі і іх прадстаўнікі, адносна якіх правілы, устаноўленыя раздзеламі III–V гэтага Кодэкса, прымяняюцца ў частцы, што не супярэчыць сутнасці загаднага і выканаўчага вядзення.

**Артыкул 55. Пазіцыі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб**

Кожная юрыдычна зацікаўленая ў зыходзе справы асоба займае і абараняе ў вядзенні гэтай справы самастойную пазіцыю, якая выражаецца ў адпаведных працэсуальных дакументах, заявах і дзеяннях.

Пазіцыя ўключае пэўныя патрабаванні або пярэчанні супраць патрабаванняў разам з іх фактычным і прававым абгрунтаваннем.

### Артыкул 56. Правы і абавязкі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права падаваць заявы, знаёміцца з матэрыяламі справы, рабіць выпіскі з іх, здымаць копіі прадстаўленых дакументаў, заяўляць адводы, прадстаўляць доказы, удзельнічаць у даследаванні доказаў, задаваць пытанні іншым удзельнікам судаводства па справе, заяўляць хадайніцтвы, даваць вусныя і пісьмовыя тлумачэнні суду, прадстаўляць свае доказы і меркаванні, пярэчыць супраць хадайніцтваў, доказаў і меркаванняў іншых асоб, абскарджваць (апратэстоўваць) судовыя пастановы, а таксама ажыццяўляць іншыя працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы абавязаны добрасумленна карыстацца прыналежнымі ім працэсуальнымі правамі. Усякія спробы зацягнуць працэс або адхіліцца ад сутнасці справы спыняюцца судом.

Аб’ём правоў і абавязкаў юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобы (яе статус) у працэсе па канкрэтнай справе залежыць ад працэсуальнага становішча гэтай асобы.

У справах, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, справах асаблівага вядзення юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы карыстаюцца вызначанымі гэтым артыкулам правамі і нясуць абавязкі з выключэннямі, якія вынікаюць з сутнасці адпаведнага віду вядзення або прама ўстаноўлены гэтым Кодэксам і іншымі законамі.

### Артыкул 57. Правы і абавязкі юрыдычна не зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Правы і абавязкі юрыдычна не зацікаўленых у зыходзе справы асоб вызначаюцца мэтамі, для дасягнення якіх яны ўдзельнічаюць у працэсе, і рэгулююцца главой 12 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 57[1]. Асаблівасці ажыццяўлення ўдзельнікамі грамадзянскага судаводства асобных правоў па грамадзянскіх справах, у матэрыялах якіх утрымліваюцца звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты

Азнаямленне з матэрыяламі грамадзянскіх спраў, якія ўтрымліваюць звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты, выпіскі з іх, зняцце копій з дакументаў, якія не ўтрымліваюць звестак, што складаюць дзяржаўныя сакрэты, ажыццяўляюцца ўдзельнікамі грамадзянскага судаводства з выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

Суд абавязаны вызначыць месца і тэрмін азнаямлення ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства з працэсуальнымі дакументамі або іх копіямі, якія ўтрымліваюць звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты, і забяспечыць такое азнаямленне з выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

### Артыкул 58. Грамадзянская працэсуальная праваздольнасць

Здольнасць мець грамадзянскія працэсуальныя правы і несці абавязкі боку і трэцяй асобы (грамадзянская працэсуальная праваздольнасць) прызнаецца ў роўнай меры за ўсімі грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, за Рэспублікай Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, а ў прадугледжаных законам выпадках – таксама за арганізацыямі, якія не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

Замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя юрыдычныя асобы, замежныя дзяржавы і іх адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі валодаюць грамадзянскай працэсуальнай праваздольнасцю ў адпаведнасці з палажэннямі главы 41 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 59. Грамадзянская працэсуальная дзеяздольнасць**

Здольнасць сваімі дзеяннямі ажыццяўляць свае правы, выконваць абавязкі ў судзе, даручаць вядзенне справы прадстаўніку (грамадзянская працэсуальная дзеяздольнасць) належыць у поўным аб'ёме грамадзянам, якія дасягнулі паўналецця, непаўналетнім – у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншым заканадаўствам, юрыдычным асобам, якія валодаюць грамадзянскай працэсуальнай правадольнасцю (частка першая артыкула 58 гэтага Кодэкса).

Правы і ахаваныя законам інтарэсы непаўналетніх ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, а таксама грамадзян, прызнаных абмежавана дзеяздольнымі, абараняюцца ў судзе іх бацькамі, усынаўляльнікамі або апекавальнікамі. Суд абавязаны прыцягваць да ўдзелу ў такіх справах непаўналетніх або грамадзян, прызнаных абмежавана дзеяздольнымі, за выключэннем выпадкаў, калі прыцягненне непаўналетняга да ўдзелу ў справе супярэчыць яго інтарэсам.

Непаўналетнія, якія дасягнулі чатырнаццаці гадоў, маюць права асабіста звярнуцца ў суд з заявай аб абароне сваіх правоў і ахаваных законам інтарэсаў і карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў у судзе без згоды бацькоў, усынаўляльнікаў, апекавальнікаў. Пытанне аб прыцягненні да ўдзелу ў такіх справах бацькоў, усынаўляльнікаў або апекавальнікаў непаўналетніх для аказання ім дапамогі вырашаецца судом.

Правы і ахаваныя законам інтарэсы непаўналетніх, якія не дасягнулі чатырнаццаці гадоў, а таксама грамадзян, прызнаных недзеяздольнымі, абараняюцца ў судзе іх законнымі прадстаўнікамі – бацькамі, усынаўляльнікамі або апекунамі.

## ГЛАВА 7
## БАКІ

**Артыкул 60. Ісцец і адказчык**

Бакамі ў справах іскавага вядзення з'яўляюцца ісцец і адказчык.

Ісцец мае права на зварот па судовую абарону. Ён фармулюе сваю працэсуальную пазіцыю ў іскавай заяве. Асоба, у інтарэсах якой у прадугледжаных законам выпадках справу ўзбуджаюць пракурор, дзяржаўны орган, юрыдычная асоба або грамадзянін, апавяшчаецца судом аб узніклым працэсе і ўдзельнічае ў ім у якасці істца.

Адказчыку належыць права на абарону супраць прад'яўленага іску. Ён можа фармуляваць сваю пазіцыю ў пярэчаннях супраць іску або прад'яўляць сустрэчны іск.

**Артыкул 61. Працэсуальныя правы бакоў**

Бакі карыстаюцца роўнымі працэсуальнымі правамі.

Бакам прадастаўляецца права ва ўстаноўленых законам межах свабодна распараджацца сваімі правамі (артыкул 18 гэтага Кодэкса).

Ісцец мае права змяніць падставу або прадмет іску, павялічыць або зменшыць памер іскавых патрабаванняў або адмовіцца ад іску. Адказчык мае права змяніць падставу пярэчанняў супраць іску, цалкам або часткова прызнаць іск. Бакі могуць скончыць справу міравым пагадненнем, у тым ліку шляхам правядзення медыяцыі ў тэрмін, устаноўлены судом.

Суд не прымае адмовы істца ад іску, прызнання іску адказчыкам і не зацвярджае міравога пагаднення бакоў, калі гэтыя дзеянні супярэчаць закону або парушаюць чые-небудзь правы і ахаваныя законам інтарэсы.

Пры змяненні падставы або прадмета іску, павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў цячэнне прадугледжанага гэтым Кодэксам тэрміну разгляду справы пачынаецца з дня ажыццяўлення адпаведнага працэсуальнага дзеяння.

Бакі маюць права ажыццяўляць працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя артыкулам 56 і іншымі артыкуламі гэтага Кодэкса.

### Артыкул 62. Удзел у справе некалькіх істцоў або адказчыкаў (працэсуальны саўдзел)

У грамадзянскім судаводстве дапускаецца працэсуальны саўдзел, па якім іск можа быць прад’яўлены сумесна некалькімі істцамі або да некалькіх адказчыкаў, калі:

1) прадметам спрэчкі з’яўляюцца агульныя для іх правы або абавязкі;

2) іх правы і абавязкі маюць адну фактычную і прававую падставу;

3) прадметам спрэчкі з’яўляюцца аднародныя правы і абавязкі, якія маюць аднолькавыя фактычныя і прававыя падставы.

Кожны з істцоў або адказчыкаў у дачыненні да іншага боку выступае ў працэсе самастойна.

Працэсуальны саўдзел можа ўзнікнуць як па ініцыятыве бакоў, так і па ініцыятыве суда. Вызначэнне суда аб недапушчэнні асобы да ўдзелу ў справе ў якасці саўдзельніка можа быць абскарджана або апратэставана.

Саўдзельнікі могуць даручыць вядзенне справы аднаму з іх.

Пасля прыцягнення суадказчыка (суадказчыкаў) да ўдзелу ў справе цячэнне прадугледжанага гэтым Кодэксам тэрміну разгляду справы пачынаецца з дня вынясення судом вызначэння аб прыцягненні суадказчыка (суадказчыкаў) да ўдзелу ў справе.

### Артыкул 63. Замена неналежнага боку

Суд, устанавіўшы падчас папярэдняга судовага пасяджэння або разбору справы, што іск прад’яўлены не той асобай, якой належыць права патрабавання, або не да той асобы, якая павінна адказваць па іску, можа са згоды істца, не спыняючы справы, дапусціць замену першапачатковага істца або адказчыка належным істцом або адказчыкам.

Калі ісцец не згодны на замену яго іншай асобай, то гэта асоба можа ўступіць у справу ў якасці трэцяй асобы, якая заяўляе самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі.

Калі ісцец не згодны на замену адказчыка іншай асобай, суддзя можа прыцягнуць гэту асобу ў якасці іншага адказчыка.

Пасля замены неналежнага боку разгляд справы пачынаецца з самага пачатку.

Замена неналежнага боку афармляецца вынясеннем матываванага вызначэння суддзі.

Пасля замены неналежнага боку цячэнне прадугледжанага гэтым Кодэксам тэрміну разгляду справы пачынаецца з дня вынясення вызначэння аб замене неналежнага боку.

### Артыкул 64. Працэсуальная правапераемнасць

У выпадку выбыцця боку са справы (смерць грамадзяніна, рэарганізацыя юрыдычнай асобы, уступка права патрабавання, перавод абавязку і іншыя выпадкі перамены асоб у матэрыяльных праваадносінах) суд дапускае замену гэтага боку яго правапераемнікам. Правапераемнасць магчымая на любой стадыі працэсу. З надыходам правапераемнасці працэс аднаўляецца з таго працэсуальнага дзеяння, на якім ён быў прыпынены.

Для правапераемніка ўсе дзеянні, ажыццёўленыя ў працэсе да яго ўступлення ў справу, абавязковыя ў той меры, у якой яны былі б абавязковыя для асобы, якую правапераемнік замяніў.

## ГЛАВА 8
## ТРЭЦІЯ АСОБЫ

### Артыкул 65. Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі

Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі ва ўжо пачатым вядзенні справы, могуць уступіць у справу да вынясення судом рашэння шляхам прад’яўлення іску да аднаго або абодвух бакоў. Яны маюць усе правы і абавязкі істца.

Пры ўступленні ў справу трэцяй асобы цячэнне прадугледжанага гэтым Кодэксам тэрміну разгляду справы пачынаецца з дня ўступлення ў справу гэтай асобы.

Калі суд прызнае, што іск трэцяй асобы не датычыцца да справы, якая разглядаецца, ён выносіць вызначэнне аб адхіленні хадайніцтва трэцяй асобы аб разглядзе яе іску сумесна з першапачатковым іскам. У такім выпадку гэта трэцяя асоба не пазбаўляецца права падаць заяву аб узбуджэнні новай справы.

Вызначэнне суда аб адхіленні хадайніцтва трэцяй асобы аб разглядзе яе іску сумесна з першапачатковым можа быць абскарджана (апратэставана) адначасова з абскарджаннем (апратэставаннем) рашэння суда.

### Артыкул 66. Апавяшчэнне судом асоб, якія могуць заявіць самастойныя патрабаванні

Калі суд у ходзе вядзення справы ўстановіць, што маюцца асобы, якія могуць заявіць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі паміж першапачатковымі бакамі, ён апавяшчае іх аб справе і растлумачвае ім іх права на прад'яўленне іску ў дзесяцідзённы тэрмін з моманту атрымання апавяшчэння. У такім выпадку вядзенне справы адкладваецца.

### Артыкул 67. Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі

Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, могуць уступіць у справу на баку істца або адказчыка да вынясення суддзёй рашэння, калі рашэнне па справе можа паўплываць на іх правы і абавязкі ў дачыненні да аднаго з бакоў.

Аб уступленні ў справу такая трэцяя асоба падае заяву, у якой указвае, па якіх матывах і да якога боку яна далучаецца. Копіі заявы павінны быць уручаны абодвум бакам. Трэцяя асоба можа быць прыцягнута да ўдзелу ў справе таксама па хадайніцтве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або па ініцыятыве суда. Кожны з бакоў можа пярэчыць супраць уступлення ў справу трэцяй асобы.

Вызначэнне суда аб недапушчэнні да ўдзелу ў справе ў якасці трэцяй асобы, якая не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, можа быць абскарджана (апратэставана) гэтай асобай адначасова з абскарджаннем (апратэставаннем) рашэння суда.

### Артыкул 68. Правы і абавязкі трэціх асоб, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі

Трэція асобы, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, карыстаюцца працэсуальнымі правамі і нясуць працэсуальныя абавязкі боку, у інтарэсах якога яны выступаюць, акрамя права на змяненне прадмета і падставы іску, павелічэнне або змяншэнне памеру іскавых патрабаванняў, а таксама на адмову ад іску, на прызнанне іску або заключэнне міравога пагаднення, пагаднення аб прымяненні медыяцыі, медыяцыйнага пагаднення, патрабаванне прымусовага выканання судовай пастановы.

### Артыкул 69. Наступствы непрыцягнення ў справу трэціх асоб, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі

Бок, у якога ў выніку вынесенага рашэння ўзнікае права патрабавання да трэцяй асобы, што не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, або якому ў такім выпадку можа прад'явіць патрабаванне сама трэцяя асоба, абавязаны паведаміць гэтай асобе аб узбуджэнні справы і заявіць хадайніцтва суду аб прыцягненні яе да ўдзелу ў справе. З гэтай мэтай бок падае суду матываваную заяву, копія якой неадкладна ўручаецца трэцяй асобе з растлумачэннем ёй права ўступіць у справу ў дзесяцідзённы тэрмін.

Факты, устаноўленыя рашэннем суда па справе, разгледжанай без прыцягнення трэцяй асобы, што не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, якое ўступіла ў законную сілу, могуць быць аспрэчаны пры разглядзе справы па рэгрэсным іску, прад'яўленым да гэтай асобы.

## ГЛАВА 9
## ПРАДСТАЎНІКІ

### Артыкул 70. Вядзенне спраў грамадзянамі, юрыдычнымі асобамі, а таксама арганізацыямі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, праз прадстаўнікоў

Грамадзяне маюць права весці свае справы ў судзе асабіста або праз прадстаўнікоў. Асабісты ўдзел у справе грамадзян не пазбаўляе іх права мець па гэтай справе прадстаўнікоў. Законныя прадстаўнікі могуць даручыць вядзенне справы іншай асобе, выбранай імі ў якасці прадстаўніка.

Справы юрыдычных асоб вядуць у судзе іх органы або іншыя прадстаўнікі юрыдычных асоб, якія дзейнічаюць у межах правоў, прадастаўленых ім заканадаўствам і ўстаноўчымі дакументамі ці даверанасцю. Калегіяльныя органы кіравання юрыдычных асоб вядуць справы ў судзе праз прадстаўнікоў.

Кіраўнікі юрыдычных асоб, якія выступаюць у якасці органаў юрыдычных асоб, прад'яўляюць у судзе дакументы, што сведчаць іх службовае становішча, а пры ажыццяўленні распарадчых дзеянняў – устаноўчыя дакументы, якія пацвярджаюць іх права на ажыццяўленне гэтых дзеянняў.

Ад імені арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, справы ў судзе вядуць іх кіраўнікі або прадстаўнікі кіраўнікоў.

### Артыкул 71. Вядзенне спраў Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак

Справы Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак вядуць у судзе ўпаўнаважаныя ва ўстаноўленым заканадаўчымі актамі парадку прадстаўнікі дзяржаўных органаў.

### Артыкул 72. Асобы, якія могуць быць прадстаўнікамі ў судзе

Прадстаўніком у судзе можа быць дзеяздольная асоба, якая мае належным чынам афармленае паўнамоцтва на вядзенне спраў у судзе, за выключэннем асоб, пералічаных у артыкуле 73 гэтага Кодэкса.

Прадстаўнікамі ў судзе могуць быць:

1) адвакаты;

2) работнікі юрыдычных асоб – па справах гэтых асоб;

3) упаўнаважаныя грамадскіх аб'яднанняў (арганізацый), якім законам прадастаўлена права прадстаўляць і абараняць у судзе правы і законныя інтарэсы членаў гэтых грамадскіх аб'яднанняў (арганізацый) і іншых асоб;

4) упаўнаважаныя арганізацый, якім заканадаўствам прадастаўлена права прадстаўляць і абараняць у судзе правы і законныя інтарэсы іншых асоб;

5) законныя прадстаўнікі;

6) блізкія родзічы, муж (жонка);

7) прадстаўнікі, прызначаныя судом;

8) адзін з працэсуальных саўдзельнікаў – па даручэнні гэтых саўдзельнікаў;

9) патэнтны паверaны.

### Артыкул 73. Асобы, якія не могуць быць прадстаўнікамі ў судзе

Прадстаўнікамі ў судзе не могуць быць:

1) асобы, якія не дасягнулі паўналеццця, акрамя непаўналетніх бацькоў – па справах сваіх дзяцей;

2) асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;

3) суддзі, следчыя і пракуроры, акрамя тых выпадкаў, калі яны ўдзельнічаюць у справе ў якасці законных прадстаўнікоў недзеяздольных асоб, або прадстаўнікоў суда, пракуратуры, або іншага органа расследавання.

### Артыкул 74. Законныя прадстаўнікі

Правы і ахаваныя законам інтарэсы недзеяздольных грамадзян, грамадзян, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю, і грамадзян, прызнаных абмежавана дзеяздольнымі, абараняюць у судзе іх бацькі, усынаўляльнікі, апекуны і апекавальнікі. Законныя прадстаўнікі ажыццяўляюць ад імені прадстаўляемых усе працэсуальныя дзеянні, права ажыццяўлення якіх належыць прадстаўляемым, з абмежаваннямі, прадугледжанымі законамі.

Законныя прадстаўнікі прад'яўляюць суду дакументы, якія пацвярджаюць іх права прадстаўляць інтарэсы падапечных.

Па справе, у якой павінен удзельнічаць грамадзянін, прызнаны ва ўстаноўленым парадку адсутным без вестак, у якасці яго прадстаўніка выступае апякун, прызначаны для аховы маёмасці адсутнага без вестак.

Па справе, у якой павінен удзельнічаць спадчыннік асобы, памерлай або аб'яўленай ва ўстаноўленым законам парадку нябожчыкам, калі спадчына яшчэ нікім не прынята, у якасці прадстаўніка спадчынніка выступае асоба, прызначаная для аховы і кіравання спадчыннай маёмасцю.

Паўнамоцтвы законных прадстаўнікоў непаўналетняга, якія прымаюць удзел у справе, спыняюцца ў выпадку, калі непаўналетні набыў грамадзянскую працэсуальную дзеяздольнасць у поўным аб'ёме ў ходзе разгляду справы.

### Артыкул 75. Прадстаўнікі па даверанасці і прадстаўнікі калегіяльных органаў кіравання юрыдычных асоб

Прадстаўнікі па даверанасці дапускаюцца судом да ўдзелу ў справе толькі пры наяўнасці належна афармленай даверанасці.

Даверанасць можа быць выдадзена на ажыццяўленне асобных працэсуальных дзеянняў, вядзенне канкрэтнай грамадзянскай справы, некалькіх спраў або на прадстаўленне інтарэсаў даверніка ў судзе па любой справе на працягу пэўнага тэрміну.

Адвакат прадстаўляе суду пасведчанне адваката і даверанасць, афармленую ў простай пісьмовай форме, або ордар.

Патэнтны паверанны разам з даверанасцю прадстаўляе суду пасведчанне аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверанага.

Прадстаўнікі калегіяльных органаў кіравання юрыдычных асоб пацвярджаюць свае паўнамоцтвы ў судзе выпіскай з пратакола пасяджэння адпаведнага органа кіравання.

Арыгіналы дакументаў, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўнікоў, або копіі з іх далучаюцца да справы.

### Артыкул 76. Афармленне даверанасці на вядзенне справы ў судзе

Пісьмовыя даверанасці, якія выдаюцца грамадзянамі, сведчацца ў натарыяльным парадку або кіраўнікамі юрыдычных асоб, у якіх працуе або вучыцца давернік;

арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) прадастаўляе жыллёва-камунальныя паслугі, па яго месцы жыхарства (месцы знаходжання); адміністрацыяй установы сацыяльнага абслугоўвання, што ажыццяўляе стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне, у якой пражывае дарослы грамадзянін; адміністрацыяй арганізацыі аховы здароўя, што аказвае медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, у якой ён знаходзіцца на лячэнні; камандзірамі (начальнікамі) воінскіх часцей і ўстаноў, калі даверанасць выдаецца ваеннаслужачым. Даверанасці, выдадзеныя асобамі, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, сведчацца начальнікамі папраўчых устаноў.

Даверанасць ад імені юрыдычнай асобы выдаецца за подпісам яе кіраўніка або іншай асобы, упаўнаважанай на гэта ўстаноўчым дакументам гэтай арганізацыі.

Дзеянне даверанасці, якая пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка ў судзе, спыняецца пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных грамадзянскім заканадаўствам.

Грамадзяне могуць упаўнаважваць сваіх прадстаўнікоў на ўдзел у справе вуснай заявай, зробленай у судзе. Паўнамоцтвы прадстаўніка, прадугледжаныя часткай другой артыкула 79 гэтага Кодэкса, павінны быць агавораны асобна.

**Артыкул 77. Прадстаўнікі, прызначаныя судом**

Суд прызначае прадстаўніка боку або трэцяй асобе ў выпадках:

1) адсутнасці прадстаўніка ў недзеяздольнага боку або трэцяй асобы;

2) адсутнасці прадстаўніка ў адказчыка, месца жыхарства (месца знаходжання) якога невядома;

3) калі прадстаўнік не мае права весці судовую справу па падставах, устаноўленых Кодэксам аб шлюбе і сям'і Рэспублікі Беларусь;

4) у іншых устаноўленых законам выпадках.

Пры наяўнасці абставін, устаноўленых пунктамі 1 і 3 часткі першай гэтага артыкула, прадстаўніком можа быць прызначаны работнік органа апекі і апекавальніцтва, а ў выпадку, устаноўленым пунктам 2 часткі першай гэтага артыкула, могуць быць прызначаны родзічы і іншыя грамадзяне з іх згоды.

Паўнамоцтвы прадстаўнікоў, прызначаных судом, афармляюцца вызначэннем.

**Артыкул 78. Прадстаўнікі грамадскасці**

Перадачу меркаванняў грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў па справе ажыццяўляюць прадстаўнікі грамадскасці.

Прадстаўнікі грамадскасці (грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў і інш.) сведчаць свае паўнамоцтвы выпіскамі з пастановы агульнага сходу або выбарнага органа, прынятай у сувязі са справай, якая разглядаецца.

Прадстаўнікі грамадскасці маюць правы, прадугледжаныя артыкулам 56 гэтага Кодэкса, за выключэннем права заяўляць адводы, абскарджваць судовыя пастановы.

**Артыкул 79. Паўнамоцтвы прадстаўніка**

Паўнамоцтвы на вядзенне справы ў судзе даюць прадстаўніку права на ажыццяўленне ад імені прадстаўляемага ўсіх працэсуальных дзеянняў.

Правы прадстаўніка на падпісанне іскавай заявы, прад'яўленне іску, перадачу справы ў трацейскі суд, поўную або частковую адмову ад іску, прызнанне іску, заключэнне міравога пагаднення, пагаднення аб прымяненні медыяцыі, медыяцыйнага пагаднення, змяненне прадмета або падставы іску, а таксама памеру іскавых патрабаванняў, перадачу паўнамоцтваў іншай асобе (перадавер'е), заяву хадайніцтваў аб прыпыненні вядзення справы па пагадненні бакоў, аб забеспячэнні іску, аб вынясенні дадатковага рашэння, аб адтэрміноўцы або аб растэрміноўцы выканання рашэння, аб змяненні спосабу і парадку яго выкананні, абскарджанне судовай пастановы, дачу тлумачэнняў на скаргу (пратэст),

прад’яўленне выканаўчага дакумента да спагнання, атрыманне прысуджанай маёмасці, у тым ліку грошай, падачу заявы аб пераглядзе рашэння па новых абставінах павінны быць спецыяльна агавораны ў даверанасці, выдадзенай прадстаўляемым.

Прадстаўнік, які з’яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, што ўтрымліваюць звесткі, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

## ГЛАВА 10
## ПРАКУРОР

### Артыкул 80. Заканадаўства, якое рэгулюе дзейнасць пракурора ў грамадзянскім судаводстве

Правы і парадак дзейнасці пракурора ў грамадзянскім судаводстве вызначаюцца гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 81. Права пракурора звярнуцца ў суд з заявай аб узбуджэнні справы або ўступіць у справу

Пракурор мае права звярнуцца ў суд з заявай аб узбуджэнні грамадзянскай справы, падведамнай суду, калі гэта трэба для абароны правоў і ахаваных законам інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама юрыдычных асоб і грамадзян.

Пракурор мае права ўступіць у справу на любой яе стадыі, калі гэтага патрабуюць інтарэсы дзяржавы, а таксама з мэтай абароны правоў і ахаваных законам інтарэсаў грамадзян.

Заява аб абароне гонару і годнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падаецца ў суд Генеральным пракурорам, пракурорамі абласцей, горада Мінска са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 82. Заява пракурора аб узбуджэнні справы

Пры падачы пракурорам у суд заявы ў абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў грамадзяніна або юрыдычнай асобы гэтыя грамадзянін або юрыдычная асоба з’яўляюцца істцамі (заяўнікамі). Да падачы ў суд заявы пракурор абавязаны выслаць указаным асобам копію іскавай заявы, а пры неабходнасці – і копіі прыкладзеных да яе дакументаў.

Па справах, якія ўзбуджаюцца пракурорам у інтарэсах дзяржавы, у якасці істца выступаюць Рэспубліка Беларусь або яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі.

### Артыкул 83. Абавязковы ўдзел пракурора ў грамадзянскім судаводстве

Удзел пракурора ў разборы грамадзянскай справы абавязковы:

1) у выпадках, калі справа ўзбуджана па заяве пракурора;

2) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

У выпадках, указаных у частцы першай гэтага артыкула, суд абавязаны загадзя паведаміць пракурору пра час і месца разгляду справы.

### Артыкул 84. Працэсуальныя правы пракурора

Пракурор, які ўдзельнічае ў справе, мае правы і нясе абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 56 гэтага Кодэкса. Пракурор выказвае меркаванні па пытаннях, што ўзнікаюць

падчас разбору справы, і па сутнасці справы ў цэлым, а таксама ажыццяўляе іншыя працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

Адмова пракурора ад сваёй заявы не пазбаўляе асобу, у абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў якой ён звярнуўся ў суд, права патрабаваць разгляду справы па сутнасці. Калі ісцец адмаўляецца ад іску, заяўленага пракурорам, суд мае права спыніць вядзенне справы з улікам патрабаванняў часткі чацвёртай артыкула 61 гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 11
## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ, ЮРЫДЫЧНЫЯ АСОБЫ І ГРАМАДЗЯНЕ, ЯКІЯ АД УЛАСНАГА ІМЕНІ АБАРАНЯЮЦЬ ПРАВЫ ІНШЫХ АСОБ

### Артыкул 85. Права дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб на зварот у суд

Дзяржаўныя органы і юрыдычныя асобы могуць ад уласнага імені звяртацца ў суд з заявамі ў абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў іншых асоб па справах:

1) аб адмене ўсынаўлення;

2) аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў;

3) аб спагнанні аліментаў;

$3^1$) аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

4) аб абароне іншых інтарэсаў непаўналетніх, а таксама інтарэсаў недзеяздольных;

5) па іншых справах у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 86. Права грамадскіх аб’яднанняў, у тым ліку прафесійных саюзаў, на зварот у суд

Прафесійныя саюзы могуць звяртацца ў суд з заявамі ў абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў іх членаў па спрэчках, што вынікаюць з працоўных праваадносін, і справах, указаных у артыкуле 85 гэтага Кодэкса.

Такія ж правы маюць і іншыя грамадскія аб’яднанні адносна абароны правоў і інтарэсаў членаў гэтых аб’яднанняў, што адпавядаюць статутным мэтам, калі гэта прадугледжана законам.

### Артыкул 87. Права грамадзян на зварот у суд у абарону правоў і інтарэсаў іншых асоб

Грамадзяне могуць звяртацца ў суд з заявамі ў абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў іншых асоб у выпадках, прадугледжаных пунктам 4 артыкула 85 гэтага Кодэкса, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 88. Заява аб узбуджэнні справы дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай або грамадзянінам у абарону правоў іншых асоб

У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, дзяржаўны орган, юрыдычная асоба або грамадзянін могуць звяртацца ў суд з іскам (заявай) у абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў іншых асоб, якія затым удзельнічаюць у справе ў якасці істца (заяўніка), па іх просьбе або з іх згоды. Копію заявы, а пры неабходнасці і копіі прыкладзеных да яе дакументаў суд высылае такой асобе.

Іскі ў абарону непаўналетніх і недзеяздольных грамадзян прад’яўляюцца незалежна ад іх просьбы або згоды.

Адмова дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы або грамадзяніна ад сваёй заявы не пазбаўляе асобу, у абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў якой яна была пададзена, права патрабаваць разгляду справы па сутнасці.

### Артыкул 89. Працэсуальныя правы дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб і грамадзян, якія ад уласнага імені абараняюць правы іншых асоб

Дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія ад уласнага імені абараняюць правы іншых асоб, маюць правы і нясуць абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 56 і іншымі артыкуламі гэтага Кодэкса.

### Артыкул 90. Заключэнні дзяржаўных органаў

У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, дзяржаўныя органы да вынясення судовай пастановы могуць уступіць у працэс па сваёй ініцыятыве або ініцыятыве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб для дачы заключэння па справе.

У неабходных выпадках суд мае права прыцягнуць дзяржаўны орган да ўдзелу ў справе па сваёй ініцыятыве.

Заключэнні, якія даюцца дзяржаўнымі органамі, могуць тычыцца як усёй справы ў цэлым, так і асобных фактаў і пытанняў.

## ГЛАВА 12
## УДЗЕЛЬНІКІ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА, ЯКІЯ НЕ МАЮЦЬ ЮРЫДЫЧНАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦІ Ў ЗЫХОДЗЕ СПРАВЫ

### Артыкул 91. Сведкі

Сведкам з’яўляецца асоба, якой могуць быць вядомыя якія-небудзь звесткі аб абставінах, што маюць значэнне для справы.

### Артыкул 92. Асобы, якія не могуць быць сведкамі

Сведкамі не могуць быць:

1) асобы, якія з прычыны фізічных або псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць факты і даваць аб іх правільныя паказанні;

2) прадстаўнікі па грамадзянскай і эканамічнай справе, медыятары, прымірыцелі, а таксама абаронцы па крымінальнай справе – адносна абставін, якія ім сталі вядомыя ў сувязі з выкананнем абавязкаў прадстаўніка, медыятара, прымірыцеля або абаронцы;

3) свяшчэннаслужыцелі – аб абставінах, звесткі аб якіх яны атрымалі падчас споведзі;

4) суддзі – аб пытаннях, якія ўзнікалі ў дарадчым пакоі ў сувязі з абмеркаваннем абставін пры вынясенні судовай пастановы па грамадзянскай або крымінальнай справе.

### Артыкул 93. Абавязкі сведкі

Сведка абавязаны:

1) прыбыць у суд ва ўказаны час;

2) праўдзіва і поўна расказаць суду аб усім, што яму вядома па справе, адказаць на пастаўленыя пытанні.

За дачу заведама няпраўдзівых паказанняў, за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў сведка нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Перашкода яўцы сведкі або дачы ім паказанняў, а таксама прымус да адмовы ад дачы паказанняў або да дачы няпраўдзівых паказанняў караюцца ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 94. Права сведкі адмовіцца ад дачы паказанняў**

Сведка мае права адмовіцца ад дачы паказанняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям'і, блізкіх родзічаў.

**Артыкул 95. Іншыя правы сведкі**

Сведка мае права:

1) даваць паказанні на роднай мове і карыстацца паслугамі перакладчыка; заяўляць адвод перакладчыку;

2) уласнаручна выкладаць пісьмова свае паказанні для далучэння да сціслага пратакола, пратакола;

3) карыстацца дакументамі і пісьмовымі нататкамі, калі яго паказанні звязаны з якімі-небудзь лічбавымі або іншымі данымі, якія цяжка ўтрымаць у памяці. Гэтыя нататкі прад'яўляюцца суду па яго патрабаванні і могуць быць далучаны да справы;

4) атрымаць пакрыццё выдаткаў, звязаных з яўкай у суд для дачы паказанняў, прадугледжаных артыкулам 125 гэтага Кодэкса. Па заяве сведкі суд можа даць распараджэнне аб выплаце сведку авансу на згаданыя выдаткі.

**Артыкул 96. Эксперт**

У якасці эксперта можа быць прызначана любая асоба, якая валодае спецыяльнымі ведамі ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства і іншых сферах дзейнасці.

**Артыкул 97. Правы эксперта**

Эксперт мае права:

1) знаёміцца з матэрыяламі грамадзянскай справы ў частцы, датычнай прадмета экспертызы, і выпісваць з іх неабходныя для яе правядзення звесткі;

2) заяўляць хадайніцтвы аб прадастаўленні яму дадатковых матэрыялаў, аб'ектаў (доступу да іх), неабходных для дачы заключэння эксперта; аб растлумачэнні зместу пастаўленых перад экспертам пытанняў; аб прыцягненні да правядзення экспертызы іншых экспертаў; аб дазволе прымяняць метады, якія могуць пацягнуць поўнае або частковае знішчэнне аб'ектаў экспертызы або змяненне іх знешняга выгляду або асноўных уласцівасцей; аб адмене дазволу ўдзельнікам грамадзянскага судаводства прысутнічаць пры правядзенні экспертызы;

3) удзельнічаць у судовым разборы, а таксама з дазволу суда прысутнічаць пры вядзенні асобных працэсуальных дзеянняў, задаваць удзельнікам грамадзянскага судаводства, якія ўдзельнічаюць у гэтых дзеяннях, пытанні, датычныя прадмета экспертызы;

4) даваць заключэнне эксперта як па пастаўленых пытаннях, так і па абставінах, што ўваходзяць у яго кампетэнцыю, выяўленых пры правядзенні экспертызы;

5) знаёміцца з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння, у якім ён удзельнічаў, і рабіць падлеглыя ўнясенню ў сціслы пратакол, пратакол заўвагі адносна паўнаты і правільнасці запісу яго дзеянняў і заключэння эксперта;

6) карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка;

7) атрымліваць пакрыццё выдаткаў, панесеных пры правядзенні экспертызы;

8) атрымліваць пакрыццё панесеных ім выдаткаў і ўзнагароджанне за выкананую ім працу, якая не ўваходзіць у кола яго прамых службовых абавязкаў.

Эксперт, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, што ўтрымліваюць звесткі, якія складаюць

дзяржаўныя сакрэты, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

Эксперт не мае права:

1) весці перагаворы з удзельнікамі грамадзянскага судаводства па пытаннях, звязаных з правядзеннем экспертызы;

2) самастойна збіраць аб'екты экспертызы;

3) праводзіць даследаванні, якія могуць пацягнуць поўнае або частковае знішчэнне аб'ектаў экспертызы або змяненне іх знешняга выгляду ці асноўных уласцівасцей, калі на гэта не было пісьмовага дазволу суда.

**Артыкул 98. Абавязкі эксперта**

Эксперт абавязаны:

1) даць абгрунтаванае і аб'ектыўнае заключэнне эксперта па пастаўленых перад ім пытаннях з выкананнем патрабаванняў гэтага Кодэкса;

2) скласці матываванае паведамленне аб немагчымасці дачы заключэння эксперта, калі ў ходзе правядзення экспертызы ён установіць, што пастаўленыя пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў або прадастаўленыя яму матэрыялы, аб'екты непрыдатныя або недастатковыя для адказу на гэтыя пытанні і не могуць быць папоўнены, ці калі стан навукі і практыкі не дазваляе на іх адказаць;

3) прадставіць суду дакументы, якія пацвярджаюць яго спецыяльную кваліфікацыю;

4) паведаміць па патрабаванні суда, а таксама бакоў у судовым пасяджэнні звесткі аб сваім прафесійным вопыце і дачыненнях з удзельнікамі грамадзянскага судаводства;

5) з'яўляцца па выкліках суда для растлумачэння і ўдакладнення зместу дадзенага ім заключэння эксперта па пытаннях, зададзеных судом, удзельнікамі грамадзянскага судаводства;

6) прадставіць па патрабаванні суда каштарыс выдаткаў на правядзенне экспертызы, а таксама справаздачу аб панесеных выдатках;

7) захоўваць парадак пры вядзенні працэсуальных дзеянняў і падчас судовага пасяджэння;

8) не разгалошваць звесткі аб абставінах грамадзянскай справы і іншыя звесткі, якія сталі яму вядомымі ў сувязі з правядзеннем экспертызы, калі слуханне грамадзянскай справы праводзіцца ў закрытым судовым пасяджэнні.

За дачу заведама няпраўдзівага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў эксперт нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 99. Спецыяліст**

Спецыялістам з'яўляецца асоба, якая валодае ведамі эксперта. Суд мае права выклікаць не зацікаўленага ў зыходзе справы спецыяліста, калі выкарыстанне яго ведаў неабходна для забеспячэння эфектыўнасці агляду або іншага працэсуальнага дзеяння, а таксама высвятлення пытанняў прымянення нормаў замежнага права.

Выклік судом спецыяліста накладае на кіраўніка юрыдычнай асобы, дзе спецыяліст працуе, абавязак забяспечыць яму магчымасць прыбыць у суд для выканання свайго абавязку.

Асоба, якая ўдзельнічае ў справе ў якасці спецыяліста, у далейшым можа быць прызначана ў гэтай справе экспертам.

**Артыкул 100. Правы спецыяліста**

Спецыяліст мае права:

1) ведаць мэту выкліку;

2) задаваць пытанні ўдзельнікам працэсуальнага дзеяння або судовага разбору, іншымі спосабамі атрымліваць неабходную інфармацыю;

3) атрымліваць узнагароджанне за дачу заключэння і пакрыццё выдаткаў, звязаных з яўкай у суд.

Спецыяліст, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, што ўтрымліваюць звесткі, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 101. Абавязкі спецыяліста**

На спецыяліста ўскладаюцца абавязкі:

1) прыбыць па выкліку суда;

2) удзельнічаць у вядзенні асобных працэсуальных дзеянняў або судовым разборы;

3) даваць тлумачэнні адносна сэнсу фактаў, якія разглядаюцца, і ўласных дзеянняў у галіне тых спецыяльных ведаў, якія ён мае, а па патрабаванні суда – і пісьмовыя тлумачэнні;

4) адмовіцца ад удзелу ў вядзенні асобнага працэсуальнага дзеяння або судовым разборы, калі ён не валодае неабходнымі ведамі.

**Артыкул 102. Перакладчык і яго правы**

Перакладчыкам з'яўляецца асоба, прызначаная судом для перакладу з мовы судаводства на мову юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобы або сведкі, а таксама з мовы, якой валодае адпаведная асоба, на мову судаводства. Перакладчыкам можа быць толькі той, хто свабодна валодае абедзвюма мовамі. Да перакладчыка прыраўноўваецца асоба, якая разумее знакі глухога або нямога і пацвердзіла гэта.

Удзельнікі грамадзянскага судаводства не могуць выступаць у якасці перакладчыка.

Перакладчык мае права:

1) задаваць пытанні ўдзельнікам грамадзянскага судаводства з мэтай удакладнення сэнсу слоў і выразаў, якія перакладаюцца;

2) атрымліваць узнагароджанне за пераклад і пакрыццё выдаткаў, звязаных з яўкай у суд;

3) знаёміцца з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, у якіх ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі, што падлягаюць занясенню ў сціслы пратакол, пратакол.

Перакладчык, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, што ўтрымліваюць звесткі, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 103. Абавязкі перакладчыка**

Перакладчык абавязаны:

1) з'явіцца па выкліку суда;

2) дакладна і поўна выканаць дačручаны яму пераклад;

3) засведчыць дакладнасць перакладу сваім подпісам у сціслым пратаколе, пратаколе асобнага працэсуальнага дзеяння або судовага пасяджэння, праведзенага з яго ўдзелам, а таксама ў працэсуальных дакументах, якія ўручаюцца ўдзельнікам працэсу ў перакладзе на мову, якой яны карысталіся ў гэтым працэсе;

4) адмовіцца ад удзелу ў вядзенні справы, калі ён не валодае ведамі, неабходнымі для перакладу.

За заведама няправільны пераклад, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў перакладчык нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 104. Паняты, яго правы і абавязкі**

У якасці панятых запрашаюцца не зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы (у колькасці не менш за дзве) для сведчання ходу і вынікаў працэсуальнага дзеяння ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Паняты мае права:

1) рабіць у сувязі з працэсуальным дзеяннем, у якім ён удзельнічаў, заявы і заўвагі, якія падлягаюць занясенню ў пратакол у выпадку, калі ён складаецца;

2) знаёміцца з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, у якім ён удзельнічаў, і патрабаваць унясення ў сціслы пратакол, пратакол выпраўленняў і дапаўненняў.

Паняты абавязаны:

1) прымаць удзел у працэсуальным дзеянні;

2) сведчыць сваім подпісам у сціслым пратаколе, пратаколе працэсуальнага дзеяння факт вядзення гэтага дзеяння, яго ход і вынікі.

Паняты можа быць дапытаны ў якасці сведкі аб абставінах, звязаных з вядзеннем працэсуальнага дзеяння, удзельнікам якога ён быў.

Панятымі не могуць быць:

асобы, якія не дасягнулі паўналецця;

асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;

асобы, якія з-за фізічных або псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць факт вядзення працэсуальнага дзеяння, яго ход і вынікі.

## ГЛАВА 13
## АДВОДЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА

**Артыкул 105. Падставы для адводу пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, панятога**

Эксперт, спецыяліст, перакладчык, панятыя не маюць права ўдзельнічаць у вядзенні грамадзянскай справы і падлягаюць адводу пры наяўнасці абставін, прадугледжаных артыкулам 32 гэтага Кодэкса, а таксама з прычыны службовай або іншай залежнасці ад каго-небудзь з асоб, юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы. Пракурору на гэтых падставах можа быць заяўлены адвод.

Эксперт, спецыяліст, перакладчык падлягаюць адводу таксама ў выпадку выяўлення іх прафесійнай некампетэнтнасці.

Не маюць права ўдзельнічаць у справе ў якасці экспертаў або спецыялістаў асобы, якія праводзілі праверку, матэрыялы якой з'яўляюцца падставай для іску.

**Артыкул 106. Падставы для адводу прадстаўніка боку або трэцяй асобы**

Прадстаўнік боку або трэцяй асобы не мае права ўдзельнічаць у вядзенні грамадзянскай справы і падлягае адводу, калі ён:

1) раней удзельнічаў у справе ў якасці суддзі, пракурора, сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), сведкі, эксперта, спецыяліста, перакладчыка або панятога;

2) знаходзіцца ў сваяцкіх адносінах з суддзёй, пракурорам або сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі), які прымаў або прымае ўдзел у разглядзе гэтай справы судом, або знаходзіцца ў сваяцкіх адносінах з асобай, інтарэсы якой супярэчаць інтарэсам даверніка гэтага прадстаўніка;

3) з'яўляецца суддзёй, следчым, пракурорам і не ўдзельнічае ў вядзенні справы ў якасці законнага прадстаўніка недзеяздольнай асобы або прадстаўніка суда, пракуратуры, іншага органа расследавання;

4) аказвае або раней аказваў юрыдычную дапамогу асобе, інтарэсы якой супярэчаць інтарэсам яе даверніка, які з'яўляецца бокам або трэцяй асобай.

### Артыкул 107. Парадак заявы і вырашэння адводу і самаадводу ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства

Пры наяўнасці абставін, указаных у артыкулах 105 і 106 гэтага Кодэкса, прадстаўнік боку або трэцяй асобы, эксперт, спецыяліст, перакладчык, паняты абавязаны заявіць самаадвод. Калі яны не заявілі самаадвод, адвод ім на тых жа падставах можа быць заяўлены бокам або іншай юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобай. На гэтых жа падставах можа заявіць самаадвод пракурор.

Пытанне аб адводзе вырашаецца ў такіх выпадках судом пасля паступлення заявы аб ім у адпаведнасці з артыкулам 35 гэтага Кодэкса.

## РАЗДЗЕЛ IV
## АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЯДЗЕННЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СПРАВЫ

## ГЛАВА 14
## ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ФАКТЫ, ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ І СУДОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 108. Працэсуальныя факты, працэсуальныя і судовыя дакументы і іх форма

Працэсуальныя факты выступаюць у форме працэсуальных дзеянняў і працэсуальных падзей.

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы і іншыя ўдзельнікі грамадзянскага судаводства ажыццяўляюць належныя ім правы, выконваюць абавязкі пры дапамозе здзяйснення працэсуальных дзеянняў. Працэсуальнымі фактамі таксама з'яўляюцца надыход або сканчэнне тэрмінаў, іншыя працэсуальныя падзеі.

Аб асноўных працэсуальных фактах складаюцца працэсуальныя і судовыя дакументы.

Форма працэсуальных дакументаў у любым выпадку надаецца тым заявам і хадайніцтвам бакоў, іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якія прызначаны для перадачы суду.

Судовымі дакументамі з'яўляюцца судовыя пастановы і пратаколы, якія складаюцца адпаведна судом або сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі), а таксама дакументы, якія складаюцца ў выканаўчым і загадным вядзенні.

### Артыкул 109. Рэквізіты працэсуальных дакументаў

Кожны працэсуальны дакумент павінен утрымліваць:

1) найменне суда, у які ён падаецца;

2) найменне і месца жыхарства (месца знаходжання) падаўца дакумента, а таксама яго прадстаўніка, калі працэсуальны дакумент падаецца прадстаўніком, іх кантактныя тэлефоны, факсы і электронныя адрасы (пры іх наяўнасці);

3) найменне і месца жыхарства (месца знаходжання), кантактныя тэлефоны, факсы і электронныя адрасы (пры іх наяўнасці) асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы (абзац другі часткa другая артыкула 54 гэтага Кодэкса);

4) найменне дакумента (іскавая заява, скарга, пярэчанне супраць іску і г.д.);

5) сутнасць заяўленага патрабавання або хадайніцтва, а таксама іх абгрунтаванне;

6) пералік дадаткаў;

7) подпіс падаўца дакумента або яго прадстаўніка і дату падачы.

У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, працэсуальныя дакументы павінны ўтрымліваць і іншыя абавязковыя рэквізіты, а таксама дадаткі да працэсуальных дакументаў, у тым ліку тыя, якія пацвярджаюць выплату дзяржаўнай пошліны.

**Артыкул 110. Копіі працэсуальных дакументаў**

Працэсуальны дакумент падаецца ў суд з копіямі па ліку асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы. Суддзя можа ў залежнасці ад складанасці і характару справы запатрабаваць ад падаўца працэсуальнага дакумента таксама копіі прыкладзеных да яго дакументаў для перадачы іншым асобам, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы.

**Артыкул 111. Выпраўленне недахопаў працэсуальнага дакумента**

Суд, устанавіўшы, што працэсуальны дакумент пададзены без выканання патрабаванняў, выкладзеных у пунктах 1–3, 5 і 7 часткі першай артыкула 109, артыкуле 110, частках першай і трэцяй артыкула 243, частках першай, другой і чацвёртай артыкула $458^2$ і частках першай, другой і чацвёртай артыкула $458^7$ гэтага Кодэкса, або не аплачаны прадугледжанай заканадаўчымі актамі дзяржаўнай пошлінай, выносіць матываванае вызначэнне аб пакіданні дакумента без руху, аб чым паведамляе падаўцу дакумента і дае яму тэрмін для выпраўлення недахопаў.

Дакумент, выпраўлены ў адпаведнасці з указаннем суда, лічыцца пададзеным у дзень першапачатковага яго прадстаўлення ў суд, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам. У адваротным выпадку дакумент лічыцца непададзеным і вяртаецца падаўцу.

**Артыкул 112. Структура судовай пастановы**

Судовая пастанова складаецца з уступнай, апісальнай, матывавальнай і рэзалюцыйнай частак.

Матывавальная частка судовай пастановы складаецца:

у выпадках, непасрэдна прадугледжаных гэтым Кодэксам;

судом па ўласнай ініцыятыве.

**Артыкул 113. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем**

Ход кожнага судовага пасяджэння суда першай інстанцыі, а таксама ход ажыццяўлення кожнага асобнага працэсуальнага дзеяння суда першай інстанцыі па-за пасяджэннем фіксуюцца з выкарыстаннем сродкаў гука- або відэазапісу і стварэннем сціслага пратакола ў пісьмовай форме з выкананнем патрабаванняў частак першай і чацвёртай артыкула 174 гэтага Кодэкса.

У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне ўсіх удзельнікаў грамадзянскага судаводства гука- або відэазапіс не вядзецца.

Пры адсутнасці тэхнічнай магчымасці весці гука- або відэазапіс, а таксама ў выпадку, прадугледжаным часткай другой гэтага артыкула, ход судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем фіксуецца

складаннем пратакола ў пісьмовай форме з выкананнем патрабаванняў частак другой і чацвёртай артыкула 174 гэтага Кодэкса. У прыватнасці, у пратаколе павінны выкладацца працэсуальныя дзеянні ў тым парадку, у якім яны мелі месца, а таксама ўстаноўленыя пры іх вядзенні істотныя для справы факты і заявы асоб, якія ўдзельнічалі ў гэтых дзеяннях.

У судзе апеляцыйнай інстанцыі ход судовага пасяджэння фіксуецца ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Па справах, якія разглядаюцца ў парадку нагляду, ход судовага пасяджэння не фіксуецца.

## ГЛАВА 15
## СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ

### Артыкул 114. Судовыя выдаткі

Судовыя выдаткі складаюцца з дзяржаўнай пошліны і выдаткаў, звязаных з разглядам справы.

### Артыкул 115. Выключаны

### Артыкул 116. Выдаткі, звязаныя з разглядам справы

Да выдаткаў, звязаных з разглядам справы, адносяцца:

1) сумы, якія падлягаюць выплаце сведкам, судова-экспертным арганізацыям, экспертам, спецыялістам і перакладчыкам;

2) выдаткі, звязаныя з вядзеннем агляду на месцы;

3) выдаткі па вышуку адказчыка ў прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншым заканадаўствам выпадках;

4) выдаткі, звязаныя з выкананнем рашэння суда, і паштовыя выдаткі;

5) выдаткі бакоў і трэціх асоб на праезд і найм жылых памяшканняў, панесеныя імі ў сувязі з яўкай у суд;

6) выдаткі на аплату дапамогі прадстаўнікоў;

7) кампенсацыя бакам за страту працоўнага часу;

8) іншыя выдаткі, прызнаныя судом неабходнымі.

### Артыкул 117. Абскарджанне (апратэставанне) судовых пастаноў па пытаннях, звязаных з судовымі выдаткамі

На судовыя пастановы па пытаннях, звязаных з судовымі выдаткамі, можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

### Артыкул 118. Выключаны

### Артыкул 119. Выключаны

### Артыкул 120. Цана іску

Цана іску вызначаецца:

1) у існах аб спагнанні грошай – сумай, якая спаганяецца;

2) у існах аб выпатрабаванні маёмасці – коштам маёмасці, якая выпатрабуецца;

3) у існах аб спагнанні аліментаў – сукупнасцю ўсіх выплат, але не больш чым за адзін год;

4) у існах аб тэрміновых выплатах і выдачах – сукупнасцю ўсіх выплат або выдач, але не больш чым за тры гады;

5) у існах аб бестэрміновых або пажыццёвых выплатах і выдачах – сукупнасцю выплат або выдач за тры гады;

6) у ісках аб змяншэнні або павелічэнні выплат або выдач – сумай, на якую змяншаюцца або павялічваюцца выплаты або выдачы, але не больш чым за адзін год;

7) у ісках аб спыненні выплат або выдач – сукупнасцю выплат або выдач, якія засталіся, але не больш чым за адзін год;

8) у ісках аб датэрміновым скасаванні дагавора арэнды (маёмаснага найму) – сукупнасцю выплат за карыстанне маёмасцю на працягу тэрміну дзеяння дагавора, які застаўся, але не больш чым за тры гады, а ў ісках аб прызнанні дагавораў несапраўднымі – зыходзячы з кошту маёмасці;

9) у ісках аб праве ўласнасці на капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), незавершаныя закансерваваныя капітальныя пабудовы, ізаляваныя памяшканні (далей – пабудовы), якія належаць грамадзянам на праве ўласнасці, – коштам пабудоў; для пабудоў, якія належаць юрыдычным асобам, – коштам пабудоў, але не ніжэйшым за астаткавы кошт пабудоў; для зямельных участкаў – коштам зямельных участкаў;

10) у ісках, якія складаюцца з некалькіх самастойных патрабаванняў, – агульнай сумай усіх патрабаванняў.

Цана іску ўказваецца істцом. У выпадку відавочнай неадпаведнасці ўказанай цаны сапраўднаму кошту маёмасці кошт іску вызначае суддзя падчас прыняцця іскавай заявы.

**Артыкул 121. Выключаны**

**Артыкул 122. Выключаны**

**Артыкул 123. Выключаны**

**Артыкул 124. Пакрыццё выдаткаў на аплату дапамогі прадстаўніка**

Боку, на карысць якога адбылося рашэнне, суд прысуджвае пакрыццё панесеных ім выдаткаў на аплату дапамогі прадстаўніка за кошт другога боку зыходзячы са складанасці справы і часу, затрачанага на яе разгляд.

У выпадку, калі ў адпаведнасці з устаноўленым парадкам дапамога адваката была аказана боку, на карысць якога адбылося рашэнне, за кошт сродкаў калегіі адвакатаў або рэспубліканскага бюджэту, указаная сума спаганяецца з другога боку на карысць калегіі адвакатаў або рэспубліканскага бюджэту.

**Артыкул 125. Сумы, якія падлягаюць выплаце сведкам, экспертам, спецыялістам і перакладчыкам**

За асобай, выкліканай у якасці сведкі, эксперта, спецыяліста або перакладчыка, захоўваецца сярэдні заробак па месцы яго працы за ўвесь час, затрачаны ім у сувязі з выклікам у суд. Асобам, якія не маюць асноўнага месца працы, выплачваецца ўзнагароджанне зыходзячы з сярэдняй заработнай платы ў гэтай мясцовасці.

Акрамя таго, усе ўказаныя асобы маюць права на пакрыццё панесеных выдаткаў у сувязі з яўкай у суд (выдаткі на праезд, найм жылога памяшкання, выплату сутачных).

Эксперт, спецыяліст і перакладчык маюць права на ўзнагароджанне за выкананне сваіх абавязкаў, акрамя тых выпадкаў, калі гэтыя абавязкі выконваліся ў парадку службовага задання.

**Артыкул 126. Унясенне бакамі сум, якія падлягаюць выплаце сведкам, судова-экспертнай арганізацыі, экспертам і спецыялістам**

Сумы, якія падлягаюць выплаце сведкам, судова-экспертнай арганізацыі, экспертам і спецыялістам або неабходныя для аплаты выдаткаў на вядзенне агляду на месцы, уносяцца папярэдне на дэпазітны рахунак суда бакам, які заявіў адпаведную просьбу. Калі ўказаная

просьба заяўлена абодвума бакамі або выклік сведак, экспертаў, агляд на месцы праводзяцца па ініцыятыве суда, то патрэбныя сумы ўносяцца бакамі пароўну.

Сумы, якія падлягаюць выплаце судова-экспертнай арганізацыі, пасля вынясення вызначэння аб прызначэнні экспертызы могуць паводле рашэння суда ўносіцца бакамі на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак гэтай арганізацыі, аб чым указваецца ў гэтым вызначэнні. Парадак звароту сум, залішне ўнесеных бакамі на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак судова-экспертнай арганізацыі, устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Бок, які выступае ў судзе ад імя Рэспублікі Беларусь або адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, у абавязак якога ўваходзіць выплата сум, належных судова-экспертнай арганізацыі і экспертам, уносіць адпаведныя сумы на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак гэтай арганізацыі або на дэпазітны рахунак суда пасля вынясення судом рашэння па справе.

Прадугледжаныя гэтым артыкулам сумы не ўносяцца бокам, вызваленым ад выплаты судовых выдаткаў.

### Артыкул 127. Выплата сум, належных сведкам, экспертам, спецыялістам і перакладчыкам

Сумы, належныя сведкам, экспертам, спецыялістам, выплачваюцца судом пасля выканання імі сваіх абавязкаў. Гэтыя сумы выплачваюцца незалежна ад спагнання іх з бакоў. Выплата сум, належных перакладчыкам, праводзіцца за кошт бюджэту.

Парадак выплаты і памеры сум, якія падлягаюць выплаце, устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 128. Выключаны

### Артыкул 129. Вызваленне ад выплаты выдаткаў, звязаных з разглядам справы

Ад выплаты выдаткаў, звязаных з разглядам справы, вызваляюцца пракурор, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія звярнуліся з заявай у суд у абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў іншых асоб, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

### Артыкул 130. Вызваленне ад выплаты судовых выдаткаў у даход дзяржавы

Суд або суддзя маюць права поўнасцю або часткова вызваліць:

ад выплаты дзяржаўнай пошліны па судовых справах фізічных асоб зыходзячы з іх маёмаснага становішча па аб’ектах абкладання дзяржаўнай пошлінай, не звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці;

ад выплаты звязаных з разглядам справы выдаткаў у даход дзяржавы фізічных асоб зыходзячы з іх маёмаснага становішча.

Пракурор, які мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, зыходзячы з маёмаснага становішча фізічнай асобы мае права поўнасцю або часткова вызваліць яго ад выплаты дзяржаўнай пошліны пры падачы наглядной скаргі на судовую пастанову па справе, не звязанай з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

### Артыкул 131. Заява аб вызваленні ад выплаты судовых выдаткаў

Заява аб вызваленні ад выплаты судовых выдаткаў падаецца ў пісьмовай форме суду, якому падсудная гэтая справа. Пасля ўзбуджэння справы заява можа быць зроблена таксама ў вуснай форме з занясеннем у пратакол судовага пасяджэння ў выпадку, калі ён складаецца.

Да заявы аб вызваленні ад судовых выдаткаў грамадзянін абавязаны прыкласці дакументы, якія сведчаць пра яго матэрыяльнае і сямейнае становішча.

### Артыкул 132. Адмена вызначэння аб вызваленні ад судовых выдаткаў

Суд або суддзя абавязаны адмяніць сваё вызначэнне аб вызваленні ад судовых выдаткаў, калі пераканаецца, што абставіны, пакладзеныя ў аснову гэтага вызначэння, не адпавядаюць рэчаіснасці. У такіх выпадках адпаведны бок аплачвае ўсе выдаткі па справе ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул 133. Абавязак боку, вызваленага ад судовых выдаткаў, па іх пакрыцці

Вызваленне боку ад судовых выдаткаў не вызваляе яго ад абавязку кампенсаваць другому боку, на карысць якога адбылося рашэнне, панесеныя судовыя выдаткі.

### Артыкул 134. Адтэрміноўка або растэрміноўка выплаты судовых выдаткаў і змяншэнне іх памераў

Суд або суддзя, зыходзячы з маёмаснага становішча бакоў, можа адтэрмінаваць або растэрмінаваць аднаму або абодвум бакам выплату судовых выдаткаў, якія спаганяюцца ў даход дзяржавы, або зменшыць памер гэтых выдаткаў.

### Артыкул 135. Размеркаванне судовых выдаткаў паміж бакамі

Боку, на карысць якога адбылося рашэнне, суд прысуджвае за кошт другога боку пакрыццё ўсіх панесеных ім судовых выдаткаў па справе, хоць бы гэты бок і быў вызвалены ад выплаты іх у даход дзяржавы. Калі іск задаволены часткова, то ўказаныя ў гэтым артыкуле сумы прысуджваюцца істцу прапарцыянальна памеру задаволеных судом іскавых патрабаванняў, а адказчыку – прапарцыянальна той часткі іскавых патрабаванняў, у якой істцу адмоўлена.

Правілы, выкладзеныя ў гэтым артыкуле, датычацца таксама дзяржаўнай пошліны, унесенай бакамі пры падачы апеляцыйных і наглядных скарг.

Калі вышэйстаячы суд зменіць рашэнне, якое адбылося, або вынесе новае рашэнне, ён адпаведна змяняе размеркаванне судовых выдаткаў.

Размеркаванне судовых выдаткаў паміж бакамі, калі адзін з іх прызнаны нядобрасумленным, праводзіцца з улікам патрабаванняў артыкула 139 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 136. Размеркаванне судовых выдаткаў паміж працэсуальнымі саўдзельнікамі

Працэсуальныя саўдзельнікі нясуць судовыя выдаткі па справе ў роўных долях, калі іншае не абумоўлена адрозненнем у кошце іх патрабаванняў.

Калі салідарная адказнасць вынікае з прыроды спрэчных матэрыяльных праваадносін, суд салідарна спаганяе з суадказчыкаў і выдаткі па справе.

Выдаткі, панесеныя ў сувязі з працэсуальнымі дзеяннямі, якія былі праведзены па патрабаванні працэсуальнага саўдзельніка толькі ў яго інтарэсах, іншымі працэсуальнымі саўдзельнікамі не кампенсуюцца.

### Артыкул 137. Размеркаванне судовых выдаткаў пры адмове ад іску і міравым пагадненні

Пры адмове істца ад іску панесеныя ім судовыя выдаткі адказчык не кампенсуе. Аднак адмова ад іску ў сувязі з добраахвотным задавальненнем іскавых патрабаванняў адказчыкам пасля прад'яўлення іску не перашкаджае спагнанню па патрабаванні істца панесеных ім судовых выдаткаў.

У выпадку заключэння міравога пагаднення судовыя выдаткі па справе ўзаемна пагашаюцца, калі бакі не дамовіліся аб іншым.

### Артыкул 138. Спагнанне кампенсацыі за страту працоўнага часу

На бок, які нядобрасумленна заявіў негрунтоўны іск або спрэчку супраць іску або сістэматычна процідзейнічаў правільнаму і хуткаму разгляду і вырашэнню справы, суд можа ўскласці выплату на карысць другога боку кампенсацыі за фактычную страту працоўнага часу. Памер кампенсацыі вызначаецца судом у разумных межах і з улікам канкрэтных абставін.

### Артыкул 139. Спагнанне судовых выдаткаў з нядобрасумленнага боку або трэціх асоб

Незалежна ад вынікаў разгляду справы суд можа абавязаць нядобрасумленны бок, трэцюю асобу кампенсаваць судовыя выдаткі другому боку або ў даход дзяржавы, калі яны выкліканы ўхіленнем ад тлумачэнняў, дачай ілжывых тлумачэнняў, утойваннем, а таксама занадта познім прад'яўленнем доказаў ці іншымі нядобрасумленнымі або яўна няправільнымі дзеяннямі.

У выпадку ўхілення адказчыка ад яўкі ў суд, нясвоечасовага накіравання ў суд пярэчанняў супраць іску або сустрэчнага іску судовыя выдаткі па першапачатковым і паўторным разглядзе справы ўскладаюцца на адказчыка, нават калі яго скарга была поўнасцю задаволена. Ён вызваляецца ад судовых выдаткаў, калі дакажа, што не вінаваты ў няяўцы або што своечасова выслаў суду пярэчанні супраць іску ці сустрэчны іск, якія не былі далучаны да справы.

### Артыкул 140. Спагнанне выдаткаў, звязаных з разглядам справы, са сведкі, судова-экспертнай арганізацыі, эксперта, перакладчыка, спецыяліста або прадстаўніка

Суд можа сыскаць са сведкі, судова-экспертнай арганізацыі, эксперта, перакладчыка, спецыяліста або прадстаўніка на карысць боку або ў даход дзяржавы выдаткі, звязаныя з разглядам справы, якія ўзніклі па іх віне.

### Артыкул 141. Пакрыццё бакам судовых выдаткаў са сродкаў бюджэту

Пры адмове поўнасцю або часткова ў іску пракурору, дзяржаўным органам і іншым асобам, вызваленым у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ад выплаты дзяржаўнай пошліны пры ўзбуджэнні справы ў абарону правоў і ахаваных законам інтарэсаў іншых асоб, адказчыку кампенсуюцца са сродкаў бюджэту панесеныя ім судовыя выдаткі поўнасцю або прапарцыянальна той частцы іскавых патрабаванняў, у якой істцу адмоўлена.

Адказчыку, які прыцягнуты судом у парадку замены неналежнага боку і на карысць якога пастаноўлена рашэнне, панесеныя ім судовыя выдаткі кампенсуюцца са сродкаў бюджэту.

У выпадку задавальнення іску аб вызваленні маёмасці ад арышту істцу кампенсуюцца са сродкаў бюджэту панесеныя ім судовыя выдаткі.

### Артыкул 142. Пакрыццё дзяржаве судовых выдаткаў

Судовыя выдаткі, ад выплаты якіхісцец быў вызвалены, спаганяюцца з адказчыка ў даход дзяржавы прапарцыянальна задаволенай частцы іскавых патрабаванняў. Пры адмове ў іску выдаткі, звязаныя з разглядам справы, спаганяюцца з істца ў даход дзяржавы.

Калі іск задаволены часткова, а адказчык вызвалены ад выплаты судовых выдаткаў, выдаткі, звязаныя з разглядам справы, спаганяюцца ў даход дзяржавы з істца, не вызваленага ад выплаты судовых выдаткаў, прапарцыянальна той частцы іскавых патрабаванняў, у задавальненні якіх адмоўлена.

Калі абодва бакі вызвалены ад выплаты судовых выдаткаў, то выдаткі, звязаныя з разглядам справы, адносяцца на рахунак дзяржавы.

У выпадку абвяшчэння вышуку ў парадку, прадугледжаным артыкулам 149 гэтага Кодэкса, суд пры разглядзе справы спаганяе з асобы, якая адшукваецца, выдаткі на вядзенне вышуку ў даход дзяржавы.

## ГЛАВА 16
## СУДОВАЯ КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ

### Артыкул 143. Судовыя павесткі і судовыя паведамленні

Апавяшчэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб пра час і месца судовага пасяджэння або ажыццяўлення працэсуальных дзеянняў, а таксама выклік у суд сведак, экспертаў, спецыялістаў і перакладчыкаў праводзяцца судовымі павесткамі.

У неабходных выпадках удзельнікі грамадзянскага судаводства могуць быць апавешчаны або выкліканы заказным пісьмом з паведамленнем аб яго ўручэнні, тэлефанаграмай або тэлеграмай, СМС-паведамленнем, з выкарыстаннем факсімільнай сувязі, глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт, у тым ліку электроннай пошты, а таксама іншых сродкаў сувязі, якія забяспечваюць фіксаванне апавяшчэння або выкліку.

Павестка або іншае паведамленне дастаўляюцца поштай асобе, якая апавяшчаецца або выклікаецца па адрасе, указаным бокам або ўдзельнікам грамадзянскага судаводства, які ўдзельнічае ў справе. Калі па паведамленым суду адрасе грамадзянін фактычна не пражывае, павестка або іншае паведамленне могуць быць накіраваны па месцы яго працы.

Павестка або іншае паведамленне, адрасаваныя юрыдычнай асобе, накіроўваюцца па месцы яго знаходжання.

Павесткі і паведамленні павінны быць уручаны з такім разлікам, каб удзельнікі грамадзянскага судаводства мелі неабходны час для своечасовай яўкі ў суд у прызначаны тэрмін і падрыхтоўкі да справы.

### Артыкул 144. Змест судовай павесткі і іншых паведамленняў

Судовая павестка павінна ўтрымліваць:

1) найменне суда і яго адрас;

2) указанне месца і часу яўкі;

3) найменне справы, па якой праводзіцца выклік;

4) указанне асобы, якая выклікаецца ў суд, яе адрас, а таксама ў якасці каго яна выклікаецца;

5) пры неабходнасці – прапановы ўдзельнікам грамадзянскага судаводства прадставіць усе доказы па справе, якія ёсць у іх;

6) указанне на абавязак асобы, якая прыняла павестку ў сувязі з адсутнасцю адрасата, пры першай магчымасці ўручыць яе адрасату;

7) указанне на наступствы няяўкі.

Адначасова з судовай павесткай суддзя накіроўвае адказчыку копію іскавай заявы, а ў неабходных выпадках – і копіі прыкладзеных да заявы дакументаў. Пры судовай павестцы, адрасаванай істцу, суддзя пасылае копіі пісьмовых тлумачэнняў адказчыка, калі яны паступілі ў суд.

Іншыя паведамленні суда павінны ўтрымліваць даныя, выкладзеныя ў пунктах 1–4 часткі першай гэтага артыкула.

### Артыкул 145. Дастаўка і ўручэнне судовай карэспандэнцыі

Судовая карэспандэнцыя – судовыя павесткі і паведамленні, працэсуальныя і судовыя дакументы – дастаўляецца па пошце заказным пісьмом (або праз упаўнаважаную судом

асобу) і ўручаецца асабіста адрасату пад распіску на паведамленні аб уручэнні, якое падлягае вяртанню ў суд з адзнакай аб часе ўручэння.

Судовая карэспандэнцыя для юрыдычных асоб уручаецца іх работнікам, у службовыя абавязкі якіх уваходзіць атрыманне паштовых адпраўленняў.

Суддзя можа выдаць судовую павестку або паведамленне на рукі аднаго з бакоў з яго згоды для ўручэння другому боку, сведкам і іншым асобам, якія апавяшчаюцца або выклікаюцца ў суд.

Працэсуальныя і судовыя дакументы, судовыя павесткі і паведамленні могуць уручацца адрасатам таксама ў памяшканні суда.

Прадстаўнікі бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб могуць уручаць адзін аднаму працэсуальныя дакументы пад распіску аб уручэнні з указаннем часу ўручэння.

У прадугледжаных законам выпадках паведамленне або выклік у суд праводзяцца шляхам публікацыі ў друку. Публікацыя ў друку з'яўляецца належным паведамленнем або выклікам.

**Артыкул 146. Дзеянні асобы, якая ўручае судовую карэспандэнцыю, пры адсутнасці адрасата**

Калі асоба, якая дастаўляе судовую павестку або іншую карэспандэнцыю з суда, не застае грамадзяніна па месцы яго жыхарства або працы, то судовая павестка або іншая карэспандэнцыя ўручаецца каму-небудзь з дарослых членаў яго сям'і, якія пражываюць сумесна з ім, або адміністрацыі па месцы працы грамадзяніна.

Пры часовым выбыцці грамадзяніна асоба, якая дастаўляе судовую павестку або іншую карэспандэнцыю з суда, адзначае на належным вяртанню ў суд паведамленні аб уручэнні, куды выбыў адрасат і калі чакаецца яго вяртанне.

Пры адмове грамадзяніна або члена яго сям'і прыняць судовую павестку, іншую карэспандэнцыю з суда асоба, якая іх дастаўляе, робіць аб гэтым адзнаку на павестцы або канверце і вяртае іх у суд.

Калі ўручыць судовую павестку, паведамленне, працэсуальны або судовы дакумент адным з указаных вышэй спосабаў не аказалася магчымым, судовая карэспандэнцыя застаецца ў мясцовым аддзяленні сувязі, а паведамленне апускаецца ў паштовую скрынку адрасата, аб чым паведамляецца суду.

Калі ўручыць судовую павестку або іншую карэспандэнцыю з суда юрыдычнай асобе не аказваецца магчымым (не атрымліваецца) з прычыны яе адсутнасці па адрасе, указаным у судовай павестцы або іншай карэспандэнцыі з суда, або ў сувязі з адмовай яе работніка ад іх атрымання, судовая карэспандэнцыя вяртаецца ў суд з адпаведнай адзнакай.

**Артыкул 146$^1$. Наступствы адмовы ад прыняцця судовай павесткі або іншай карэспандэнцыі з суда**

Адрасат, які адмовіўся прыняць судовую павестку або іншую карэспандэнцыю з суда, лічыцца належным чынам апавешчаным пра час і месца судовага разбору або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага або выканаўчага дзеяння.

**Артыкул 147. Перамена адраса ў час вядзення справы**

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы абавязаны паведамляць суду аб перамене свайго адраса падчас вядзення справы. Пры адсутнасці такога паведамлення любы працэсуальны або судовы дакумент пасылаецца па апошнім вядомым суду адрасе і лічыцца дастаўленым, хоць бы адпаведная асоба па гэтым адрасе больш не пражывала (не знаходзілася).

### Артыкул 148. Дзеянні суда пры невядомасці месца знаходжання адказчыка

Пры невядомасці фактычнага месца знаходжання адказчыка суд прыступае да разгляду справы пасля паступлення судовай павесткі або паведамлення з адзнакай, якая сведчыць іх атрыманне арганізацыяй, што ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) прадастаўляе жыллёва-камунальныя паслугі, органам мясцовага кіравання або самакіравання па апошнім вядомым месцы жыхарства адказчыка або адміністрацыяй юрыдычнай асобы – па апошнім вядомым месцы яго працы.

### Артыкул 149. Вышук адказчыка праз органы ўнутраных спраў

Калі невядома месца знаходжання адказчыка паісках аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна, і па патрабаваннях, прад'яўленых у інтарэсах дзяржавы, суддзя абавязаны абвясціць вышук адказчыка праз тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў. Спагнанне выдаткаў на вышук адказчыка ў гэтых выпадках праводзіцца па заяве органа ўнутраных спраў.

Пры невядомасці месца знаходжання адказчыка па іншых справах суддзя можа абвясціць вышук адказчыка праз тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў.

## ГЛАВА 17
## ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ

### Артыкул 150. Падлік працэсуальных тэрмінаў

Працэсуальныя дзеянні ажыццяўляюцца ў тэрміны, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, або ў тэрміны, устаноўленыя судом.

Працэсуальныя тэрміны вылічваюцца гадамі, месяцамі і днямі. Тэрміны могуць вызначацца таксама ўказаннем на падзею, якая абавязкова павінна надысці.

Цячэнне працэсуальных тэрмінаў пачынаецца на наступны дзень пасля каляндарнай даты або надыходу падзеі, якімі вызначаны іх пачатак. Калі працэсуальны тэрмін устаноўлены судом, яго падлік пачынаецца з наступнага дня пасля ўручэння судовай пастановы аб гэтым.

### Артыкул 151. Заканчэнне працэсуальных тэрмінаў

Тэрмін, які вылічваецца гадамі, заканчваецца ў адпаведныя месяц і чысло апошняга года тэрміну. Тэрмін, які вылічваецца месяцамі, заканчваецца ў адпаведнае чысло апошняга месяца тэрміну. Калі канец тэрміну, які вылічваецца месяцамі, даводзіцца на такі месяц, які адпаведнага чысла не мае, то тэрмін заканчваецца ў апошні дзень гэтага месяца.

У выпадку, калі апошні дзень тэрміну падае на непрацоўны дзень, днём заканчэння тэрміну лічыцца найбліжэйшы працоўны дзень, які ідзе следам за ім.

Працэсуальныя дзеянні, для ажыццяўлення якіх вызначаны тэрмін, могуць быць выкананы да 24 гадзін апошняга дня тэрміну. Калі заява, скарга, пратэст, іншы працэсуальны дакумент або грашовая сума былі здадзены на пошту або тэлеграф да 24 гадзін апошняга дня тэрміну, то тэрмін не лічыцца прапушчаным.

Калі працэсуальнае дзеянне павінна быць ажыццёўлена непасрэдна ў судзе або іншай арганізацыі, то тэрмін выходзіць у тую гадзіну, калі ў гэтых арганізацыях па ўстаноўленых правілах заканчваецца праца або спыняюцца адпаведныя аперацыі.

**Артыкул 152. Прыпыненне працэсуальных тэрмінаў**

Цячэнне ўсіх працэсуальных тэрмінаў, якія не скончыліся, прыпыняецца адначасова з прыпыненнем вядзення справы. З дня аднаўлення вядзення справы цячэнне працэсуальных тэрмінаў працягваецца.

**Артыкул 153. Прадаўжэнне або скарачэнне працэсуальнага тэрміну**

Суд або суддзя, якія ўстанавілі працэсуальны тэрмін, могуць па ўважлівай прычыне прадоўжыць або скараціць яго, калі юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі пададзена адпаведная заява да сканчэння тэрміну.

Вызначэнне суда або суддзі аб прадаўжэнні або скарачэнні працэсуальнага тэрміну выносіцца з паведамленнем юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам.

Няяўка гэтых асоб, належна апавешчаных пра час і месца судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай для разгляду гэтага пытання.

**Артыкул 154. Аднаўленне прапушчаных працэсуальных тэрмінаў**

Калі працэсуальны тэрмін, устаноўлены гэтым Кодэксам або іншымі актамі заканадаўства, прапушчаны з прычыны, прызнанай уважлівай, суд можа аднавіць яго.

Няяўка гэтых асоб, належна апавешчаных пра час і месца судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай для разгляду гэтага пытання.

Адначасова з падачай заявы аб аднаўленні працэсуальнага тэрміну павінна быць ажыццёўлена працэсуальнае дзеянне, у дачыненні да якога прапушчаны тэрмін.

Заявы аб аднаўленні працэсуальнага тэрміну не прымаюцца да разгляду, калі гэты тэрмін у адпаведнасці з гэтым Кодэксам або іншым актам заканадаўства не падлягае аднаўленню.

**Артыкул 155. Наступствы пропуску працэсуальных тэрмінаў**

Сканчэнне прадугледжанага гэтым Кодэксам або іншымі актамі заканадаўства, а таксама ўстаноўленага судом тэрміну пагашае права на ажыццяўленне адпаведнага працэсуальнага дзеяння. Сканчэнне працэсуальнага тэрміну не вызваляе ад выканання працэсуальнага абавязку.

Працэсуальныя дакументы, пададзеныя пасля сканчэння працэсуальных тэрмінаў, калі не пададзена заяў аб прадаўжэнні або аднаўленні прапушчаных тэрмінаў, не разглядаюцца судом і вяртаюцца асобам, якімі яны былі пададзены.

**Артыкул 156. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэння аб прадаўжэнні, скарачэнні і аднаўленні працэсуальнага тэрміну**

На вызначэнне суда па пытаннях прадаўжэння, скарачэння або аднаўлення прапушчанага працэсуальнага тэрміну можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

**Артыкул 157. Адкладанне вядзення справы да разгляду заявы аб аднаўленні тэрміну**

Атрымаўшы заяву аб аднаўленні прапушчанага працэсуальнага тэрміну, суд па хадайніцтве юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобы і з улікам канкрэтных абставін можа адкласці разбор справы або выкананне рашэння да разгляду заявы.

### Артыкул 158. Тэрміны разгляду грамадзянскіх спраў судом першай інстанцыі

Калі іншае не вызначана гэтым Кодэксам або іншымі законамі, грамадзянскія справы па першай інстанцыі павінны разглядацца не пазней чым за два месяцы з дня паступлення заявы ў суд.

Справы аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна, і па патрабаваннях, якія вынікаюць з працоўных праваадносін, а таксама справы аб прызнанні арганізацыі, у тым ліку замежнай або міжнароднай арганізацыі, экстрэмісцкай, забароне яе дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, яе ліквідацыі, забароне выкарыстання яе сімволікі і атрыбутыкі, аб прызнанні сімволікі і атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкімі матэрыяламі павінны разглядацца судом першай інстанцыі не пазней чым за адзін месяц з дня прыняцця заявы.

Справы з удзелам замежных грамадзян, якія пражываюць за мяжой, і замежных юрыдычных асоб падлягаюць разгляду судом першай інстанцыі не пазней чым за адзін год з дня паступлення заявы ў суд.

## ГЛАВА 18
## АДКЛАДАННЕ, ПРЫПЫНЕННЕ І СПЫНЕННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ. ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ

### Артыкул 159. Адкладанне разбору справы або абвяшчэнне перапынку ў яе разборы

Суд адкладвае разбор справы ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, і пры адсутнасці падстаў для прыпынення вядзення справы.

Суд абвяшчае перапынак для адпачынку, а таксама ў выпадку немагчымасці працягу разгляду справы ў сувязі з неабходнасцю прадастаўлення дадатковых доказаў на час, неабходны для гэтага.

Суд, адкладваючы разбор справы або абвяшчаючы перапынак у яе разборы, прызначае дзень новага судовага пасяджэння або працягу пасяджэння. Месца, дзень і час пачатку наступнага судовага пасяджэння перадаюцца ўдзельнікам грамадзянскага судаводства пад распіску.

### Артыкул 160. Абавязак суда прыпыніць вядзенне справы

Суд абавязаны прыпыніць вядзенне справы ў выпадках:

1) смерці грамадзяніна або рэарганізацыі юрыдычнай асобы, якія з'яўляліся бакамі ў справе, калі спрэчныя праваадносіны дапускаюць правапераемства – да вызначэння правапераемніка асобы, якая выбыла;

2) страты бокам дзеяздольнасці – да прызначэння недзеяздольнай асобе прадстаўніка;

3) знаходжання адказчыка ў часці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, якая бярэ ўдзел у баявых дзеяннях, іншых войск або воінскіх фарміраванняў або просьбы істца, які знаходзіцца ў часці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, якая бярэ ўдзел у баявых дзеяннях, іншых войск або воінскіх фарміраванняў;

4) немагчымасці разгляду гэтай справы да вырашэння іншай справы, якая разглядаецца ў грамадзянскім, крымінальным судаводстве або адміністрацыйным парадку;

$4^1$) заключэння бакамі пагаднення аб прымяненні медыяцыі, за выключэннем выпадку, прадугледжанага пунктам 5 часткі першай артыкула 165 гэтага Кодэкса;

5) у іншых выпадках, прама прадугледжаных законам.

Калі іншая справа, якая падлягае разгляду ў грамадзянскім, крымінальным судаводстве або адміністрацыйным парадку, яшчэ не пачата, але ўзбуджэнне яе залежыць ад боку па гэтай справе, суд устанаўлівае ёй тэрмін для звароту ў суд або іншы орган.

У выпадках, названых у пунктах 1 і 2 часткі першай гэтага артыкула, справа прыпыняецца з моманту наступлення адпаведнай падзеі.

**Артыкул 161. Права суда прыпыніць вядзенне справы**

Суд можа па заяве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або па сваёй ініцыятыве прыпыніць вядзенне справы ў выпадках:

1) знаходжання боку ў складзе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войск або воінскіх фарміраванняў на тэрміновай службе, праходжання альтэрнатыўнай службы або прыцягнення яго для выканання якога-небудзь дзяржаўнага абавязку;

2) знаходжання боку ў працяглай камандзіроўцы;

3) знаходжання боку на лячэнні ў арганізацыі аховы здароўя, якая аказвае медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама цяжкага захворвання боку, пацверджанага дакументам арганізацыі аховы здароўя;

4) вышуку адказчыка ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 149 гэтага Кодэкса;

5) прызначэння судом экспертызы;

6) узаемнага пагаднення бакоў;

7) накіравання судом судовага даручэння ў адпаведнасці з артыкулам 238 гэтага Кодэкса;

8) звароту зацікаўленай асобы з пярэчаннем або скаргай у Апеляцыйны савет пры патэнтным органе ці заявай у антыманапольны орган.

**Артыкул 162. Прававыя наступствы прыпынення вядзення справы**

Пасля прыпынення вядзення справы прыпыняецца цячэнне ўсіх прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, а таксама ўстаноўленых судом тэрмінаў. Да аднаўлення вядзення суд не афармляе ніякіх працэсуальных дзеянняў, акрамя накіраваных на забеспячэнне іску і доказаў. Працэсуальныя дзеянні бакоў у гэты час, калі яны не тычацца названых пытанняў, параджаюць прававыя наступствы толькі пасля аднаўлення вядзення.

**Артыкул 163. Аднаўленне вядзення справы**

Прыпыненае вядзенне справы аднаўляецца па заяве юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобы або па ініцыятыве суддзі пасля адпадзення абставін, прадугледжаных пунктамі 3–5 часткі першай артыкула 160 і артыкулам 161 гэтага Кодэкса, якія паслужылі падставай для яго прыпынення, або пасля вызначэння правапераемніка ці прызначэння прадстаўніка пры прыпыненні вядзення справы ў адпаведнасці з пунктамі 1 або 2 часткі першай артыкула 160 гэтага Кодэкса.

Аднаўленне вядзення справы праводзіцца на падставе вызначэння суддзі.

**Артыкул 164. Спыненне вядзення справы**

Суд спыняе вядзенне справы, калі:

1) справа не падлягае разгляду ў судах з прычыны яе непадведамнасці;

2) маецца ўступіўшае ў законную сілу вынесенае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах рашэнне суда або вызначэнне суда аб спыненні вядзення справы ў сувязі з адмовай істца ад іску або зацвярджэннем міравога пагаднення бакоў;

3) істец адмовіўся ад іску і адмова прынята судом;

4) бакі заключылі міравое пагадненне і яно зацверджана судом;

5) пасля смерці грамадзяніна, а таксама ў сувязі з ліквідацыяй юрыдычнай асобы, якая з'яўлялася адным з бакоў па справе, спрэчныя праваадносіны не дапускаюць правапераемства;

6) выключаны;

7) паміж бакамі заключаны дагавор аб перадачы гэтай спрэчкі на вырашэнне трацейскага суда ў прадугледжаных законам выпадках;

8) маецца ўступіўшае ў законную сілу, прынятае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах рашэнне трацейскага суда, за выключэннем выпадкаў, калі маецца вызначэнне суда, якое ўступіла ў законную сілу, аб адмове ў выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда або аб адмене рашэння трацейскага суда.

У выпадку спынення вядзення справы паўторны зварот у суд па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах не дапускаецца.

**Артыкул 165. Пакіданне заявы без разгляду**

Суд пакідае заяву без разгляду, калі:

1) зацікаўленай асобай, якая звярнулася ў суд, не выкананы ўстаноўлены актамі заканадаўства для гэтай катэгорыі спраў парадак папярэдняга пазасудовага вырашэння справы;

2) заява пададзена недзеяздольнай асобай;

3) заява ад імя зацікаўленай асобы пададзена асобай, якая не мае паўнамоцтваў на яе падпісанне або прад’яўленне;

4) заява ў інтарэсах дзеяздольнага грамадзяніна або юрыдычнай асобы недзяржаўнай формы ўласнасці пададзена дзяржаўнымі органамі, іншымі юрыдычнымі асобамі або грамадзянамі без згоды гэтага грамадзяніна або юрыдычнай асобы;

5) бакі заявілі хадайніцтва аб пакіданні заявы без разгляду ў сувязі з заключэннем імі пагаднення аб прымяненні медыяцыі;

6) спрэчка паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах знаходзіцца на разглядзе ў тым жа або іншым судзе;

7) ісцец, належным чынам апавешчаны пра час і месца судовага пасяджэння, не з’явіўся без уважлівых прычын па выкліку суда або не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і няма яго пісьмовай заявы аб разборы справы ў яго адсутнасць, а адказчык не патрабуе разбору справы па сутнасці;

8) ісцец па справе аб скасаванні шлюбу, належным чынам апавешчаны пра час і месца судовага пасяджэння, не з’явіўся без уважлівых прычын па выкліку суда або не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і ад яго не паступіла просьба аб разборы справы ў яго адсутнасць;

9) бакі, якія не прасілі аб разборы справы ў іх адсутнасць, не з’явіліся ў суд па паўторным выкліку;

$9^1$) заяўнік не з’явіўся без уважлівых прычын на разгляд судом справы ў парадку асаблівага вядзення;

10) падчас разбору справы, якая ўзнікла з адміністрацыйна-прававых адносін, або справы асаблівага вядзення ўзнікла спрэчка аб праве, падведамная суду;

11) бакі, не вызваленыя ад выплаты судовых выдаткаў, у выпадку неабходнасці прызначэння экспертызы адмаўляюцца ад выплаты выдаткаў на яе правядзенне;

12) падчас разбору справы аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях устаноўлена, што звесткі аб такім грамадзяніне ўнесены ў пералік фізічных асоб, абмежаваных у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях.

Пасля ліквідацыі абставін, якія паслужылі падставай для пакідання заявы без разгляду, зацікаўленая асоба мае права ізноў звярнуцца з заявай у агульным парадку.

### Артыкул 166. Парадак прыпынення, спынення вядзення справы і пакідання заявы без разгляду

Прыпыненне, спыненне вядзення справы і пакіданне заявы без разгляду праводзяцца паводле вызначэння суда.

У вызначэнні аб пакіданні заявы без разгляду на падставах, прадугледжаных пунктамі 1–4, 10–11 часткі першай артыкула 165 гэтага Кодэкса, суд абавязаны паказаць, як ліквідаваць абставіны, якія перашкаджаюць разгляду справы.

### Артыкул 167. Права на абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў аб прыпыненні, спыненні вядзення справы і пакіданні заявы без разгляду

На вызначэнне суда аб прыпыненні, спыненні вядзення справы і пакіданні заявы без разгляду можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

## ГЛАВА 19
## ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПРАЦЭСУАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

### Артыкул 168. Умовы і віды працэсуальнага ўздзеяння

Удзельнікі грамадзянскага судаводства павінны добрасумленна карыстацца працэсуальнымі правамі, якія належаць ім, і выконваць працэсуальныя абавязкі.

У выпадку злоўжывання працэсуальнымі правамі або наўмыснага нездзяйснення працэсуальных абавязкаў удзельнікамі грамадзянскага судаводства і іншымі асобамі да вінаватага ў адпаведнасці з нормамі гэтага Кодэкса і іншымі законамі могуць быць прыменены наступныя віды працэсуальнага ўздзеяння:

1) папярэджанне;

2) выдаленне з залы суда;

3) прывод (прымусовае дастаўленне ў залу судовага пасяджэння або іншае месца ажыццяўлення працэсуальнага дзеяння);

4) выключаны;

5) ускладанне абавязку на нядобрасумленных удзельнікаў грамадзянскага судаводства кампенсаваць судовыя выдаткі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Пры ўчыненні правапарушэнняў, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула, у выпадках, устаноўленых законамі, да вінаватага могуць прымяняцца меры адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці.

### Артыкул 169. Прывод

Адказчыкі, сведкі і іншыя ўдзельнікі грамадзянскага судаводства, выкліканыя ва ўстаноўленым парадку ў суд для ўдзелу ў вядзенні грамадзянскай справы, абавязаны з’явіцца ва ўказаныя месца і час.

У выпадку невыканання сведкамі гэтага абавязку без уважлівых прычын яны могуць быць падвергнуты прыводу. Выкананне вызначэння суда аб прыводзе ажыццяўляецца тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў. Гэта правіла распаўсюджваецца на адказчыкаў, калі іх яўка прызнана судом абавязковай, а таксама на іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Вызначэнне аб прыводзе аб’яўляецца адказчыку, сведку і іншаму ўдзельніку грамадзянскага судаводства непасрэдна перад выкананнем.

Не падлягаюць прыводу непаўналетнія ва ўзросце да шаснаццаці гадоў, цяжарныя жанчыны, часова непрацаздольныя.

У выпадку немагчымасці прыводу супрацоўнік органаў унутраных спраў складае акт аб прычынах невыканання вызначэння і разам з вызначэннем накіроўвае яго суддзі або ў суд, які вынес вызначэнне.

**Артыкул 170. Выключаны**

**Артыкул 171. Выключаны**

**Артыкул 172. Выключаны**

**Артыкул 173. Выключаны**

## ГЛАВА 20
## ПРАТАКОЛЫ

**Артыкул 174. Змест сціслага пратакола, пратакола**

Пры разглядзе справы ў судзе першай інстанцыі ў сціслым пратаколе ўказваюцца:

1) дата і месца правядзення судовага пасяджэння, ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем;

2) час пачатку і заканчэння судовага пасяджэння, ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем;

3) найменне суда, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку суддзі і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі);

4) найменне справы;

5) звесткі аб выкарыстанні ў ходзе судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем сродкаў гука- або відэазапісу, сістэм відэаканферэнцсувязі і іншых тэхнічных сродкаў;

6) звесткі аб яўцы юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства, а таксама даныя аб іх асобе;

7) звесткі аб папярэджанні перакладчыка аб крымінальнай адказнасці за заведама няправільны пераклад, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў; эксперта – аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама няпраўдзівага заключэння эксперта, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў; сведкі – аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама ілжывых паказанняў, за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў;

8) звесткі аб вусных заявах і хадайніцтвах юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб;

9) звесткі аб допыце бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, сведак, экспертаў, спецыялістаў, аб абвяшчэнні судом даных агляду, праслухоўвання гуказапісу і прагляду відэазапісу, вынікаў апазнання і судовага эксперымента з указаннем часу вядзення гэтых дзеянняў (пры неабходнасці – назва файла, які ўтрымлівае гука- або відэазапіс);

10) распараджэнні суддзі і вызначэнні суда, вынесеныя ў судовым пасяджэнні без адыходу ў дарадчы пакой;

11) іншыя звесткі, якія падлягаюць абавязковаму занясенню ў сціслы пратакол у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, за выключэннем звестак, прадугледжаных часткамі другой і чацвёртай гэтага артыкула;

12) дата стварэння сціслага пратакола.

У выпадку, калі гука- або відэазапіс не вядзецца, складаецца пратакол у пісьмовай форме, у якім апрача звестак, указаных у пунктах 1–8 і 10 часткі першай гэтага артыкула, указваюцца:

1) прычыны немагчымасці вядзення гука- або відэазапісу;

2) звесткі аб растлумачэнні ўдзельнікам грамадзянскага судаводства іх працэсуальных правоў і абавязкаў;

3) тлумачэнні і меркаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, паказанні сведак, заключэнні экспертаў, тлумачэнні спецыялістаў, даныя агляду, праслухоўвання гуказапісу і прагляду відэазапісу, вынікі апазнання і судовага эксперымента;

4) заключэнні прадстаўнікоў дзяржаўных органаў;

5) змест судовых спрэчак і меркаванне пракурора;

6) звесткі аб абвяшчэнні судовых пастаноў, аб растлумачэнні зместу, парадку і тэрміну іх абскарджання;

7) звесткі аб растлумачэнні юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам права на азнаямленне з пратаколам і парадку прынясення заўваг на яго;

8) іншыя звесткі, якія падлягаюць абавязковаму занясенню ў пратакол у адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

9) дата складання пратакола.

Змест сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі вызначаецца правіламі, устаноўленымі гэтым артыкулам, з улікам сутнасці апеляцыйнага вядзення.

У сціслым пратаколе, пратаколе ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем апрача звестак, указаных у частках першай і другой гэтага артыкула, павінны таксама ўказвацца звесткі, якія ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам з’яўляюцца абавязковымі для канкрэтнага працэсуальнага дзеяння.

### Артыкул 175. Парадак фіксавання ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем

Выкарыстанне сродкаў гука- або відэазапісу для фіксавання ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем і складанне сціслага пратакола, пратакола забяспечвае сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі).

Гука- або відэазапіс ходу судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем вядзецца бесперапынна. Электронны носьбіт інфармацыі, які ўтрымлівае копію гука- або відэазапісу, далучаецца да справы і з’яўляецца неад’емнай часткай сціслага пратакола.

Сціслы пратакол, пратакол рыхтуюцца рукапісным спосабам або з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў і павінны быць складзены і падпісаны не пазней за наступны дзень пасля заканчэння судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, а па складаных справах – на працягу пяці дзён. Аб тэрмінах складання сціслага пратакола, пратакола, а таксама аб праве асоб, якія ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні і (або) ажыццяўленні асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, на азнаямленне з адпаведным сціслым пратаколам, пратаколам аб’яўляецца пры абвяшчэнні рашэння па справе.

Сціслы пратакол, пратакол падпісваюцца суддзёй і сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі), а сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі – старшынствуючым і сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі). Усе выпраўленні і змяненні, унесеныя ў сціслы пратакол, пратакол, павінны быць агавораны ў гэтых пратаколах і засведчаны подпісамі суддзі або старшынствуючага і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі). Рознагалоссі паміж імі наконт зместу сціслага пратакола, пратакола вырашаюцца ў парадку, устаноўленым часткамі другой і трэцяй артыкула 30 гэтага Кодэкса.

Па хадайніцтве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб за іх кошт могуць быць зроблены копіі сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння і (або) ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем. Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы таксама маюць права атрымліваць

на прадастаўленым імі электронным носьбіце інфармацыі копію гука- або відэазапісу ходу адкрытага судовага пасяджэння або ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, а таксама самастойна рабіць капіраванне з выкарыстаннем электронных і іншых устройстваў сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння і (або) ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем.

**Артыкул 176. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол**

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права знаёміцца з гука- або відэазапісам ходу судовага пасяджэння і (або) ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння і (або) ажыццяўлення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем.

На працягу пяці дзён з дня падпісання сціслага пратакола, пратакола юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы могуць падаць у суд пісьмовыя заўвагі на адпаведныя гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол з указаннем на іх непаўнату і наяўныя ў іх няправільнасці.

Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол разглядаюцца суддзёй у пяцідзённы тэрмін з дня іх паступлення ў суд. У выпадку згоды з заўвагамі суддзя выносіць вызначэнне аб далучэнні іх да сціслага пратакола, пратакола.

У выпадку нязгоды з заўвагамі суддзя выносіць вызначэнне аб іх адхіленні. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол і вызначэнне суддзі аб іх адхіленні далучаюцца да сціслага пратакола, пратакола. У гэтым выпадку юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы матывы нязгоды з вызначэннем суддзі маюць права выкласці ў апеляцыйнай або нагляднай скарзе.

Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі разглядаюцца калегіяльна. Пры гэтым старшынствуючы і хаця б адзін з суддзяў павінны ўваходзіць у склад суда, які разглядаў справу.

Пры наяўнасці акалічнасцей, якія выключаюць магчымасць разгляду заўваг на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол, такія заўвагі далучаюцца да матэрыялаў справы.

## РАЗДЗЕЛ V
## ДОКАЗЫ І ДАКАЗВАННЕ

### ГЛАВА 21
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 177. Прадмет даказвання**

Прадметам даказвання з’яўляюцца ўсе факты, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння справы.

**Артыкул 178. Доказы і сродкі даказвання**

Доказамі з’яўляюцца любыя звесткі аб фактах, якія ўваходзяць у прадмет даказвання, атрыманыя ў выніку выкарыстання ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі законамі парадку сродкаў даказвання.

Да сродкаў даказвання адносяцца тлумачэнні бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, паказанні сведак, у тым ліку атрыманыя шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі, пісьмовыя і рэчавыя доказы, заключэнні экспертаў, а таксама іншыя носьбіты інфармацыі, калі з іх дапамогай можна атрымаць звесткі аб фактах, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння справы.

Доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы.

**Артыкул 179. Размеркаванне цяжару доказвання, прадастаўленне і выпатрабаванне доказаў**

Кожны бок даказвае факты, на якія спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў або пярэчанняў.

Факты, якія, згодна з законам, лічацца ўстаноўленымі, не падлягаюць даказванню. Аднак у абвяржэнне іх могуць быць прадстаўлены доказы.

Калі доказаў, прадстаўленых юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі, недастаткова, суд прапаноўвае ім прадставіць дадатковыя доказы. Аднак калі для названых асоб прадстаўленне дадатковых доказаў немагчымае, суд на падставе іх хадайніцтваў садзейнічае ў выпатрабаванні такіх доказаў.

У хадайніцтве аб выпатрабаванні доказу павінен быць абазначаны доказ, а таксама ўказана, якія акалічнасці, што маюць значэнне для справы, могуць быць устаноўлены або абвергнуты гэтым доказам, указаны прычыны, якія перашкаджаюць самастойнаму атрыманню доказу, і месца яго знаходжання.

Пры неабходнасці суд выдае боку або іншай юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобе запыт на атрыманне доказу. Асоба, у якой знаходзіцца доказ, што выпатрабуецца судом, накіроўвае яго непасрэдна ў суд або выдае на рукі асобе, якая мае адпаведны запыт для прадстаўлення ў суд.

Службовыя асобы або грамадзяне, якія не маюць доказу, што выпатрабуецца, або не маюць магчымасці прадставіць яго ва ўстаноўлены судом тэрмін, абавязаны паведаміць аб гэтым суду ў пяцідзённы тэрмін з дня атрымання запыту суда з указаннем прычын.

**Артыкул 180. Адноснасць доказаў**

Суд прымае да разгляду толькі тыя з прадстаўленых доказаў, якія маюць значэнне для справы.

Асоба, якая прадстаўляе доказы або хадайнічае аб іх выпатрабаванні, павінна ўказаць, якія факты, што маюць значэнне для справы, могуць быць устаноўлены гэтымі доказамі.

**Артыкул 181. Дапушчальнасць доказаў**

Факты, якія па законе павінны быць пацверджаны з дапамогай пэўных сродкаў даказвання, не могуць пацвярджацца ніякімі іншымі сродкамі даказвання.

**Артыкул 182. Падстава вызвалення ад даказвання**

Не падлягаюць даказванню факты, прызнаныя судом агульнавядомымі.

Факты, устаноўленыя ўступіўшым у законную сілу рашэннем суда па адной грамадзянскай справе, абавязковыя для суда і не даказваюцца зноў пры разборы іншых грамадзянскіх спраў, у якіх удзельнічаюць тыя самыя асобы або іх правапераемнікі.

Факты, устаноўленыя ўступіўшым у законную сілу рашэннем суда, які разглядае эканамічныя справы, і маючыя значэнне для разглядаемай судом грамадзянскай справы, не даказваюцца зноў асобамі – удзельнікамі ў справе, разгледжанай судом, які разглядае эканамічныя справы.

Прыгавор суда па крымінальнай справе, што ўступіў у законную сілу, абавязковы для суда, які разглядае справу аб грамадзянска-прававых наступствах дзеянняў асобы, у дачыненні да якой адбыўся прыгавор суда, толькі па пытаннях, ці мелі месца гэтыя дзеянні і ці ажыццёўлены яны гэтай асобай.

## ГЛАВА 22
## СРОДКІ ДАКАЗВАННЯ

### § 1. Тлумачэнні бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

#### Артыкул 183. Змест тлумачэнняў бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы паведамляюць суду звесткі аб прадмеце даказвання, аб кожным з фактаў, якія ўваходзяць у прадмет даказвання, аб доказах, з дапамогай якіх можна пацвердзіць або абвергнуць існаванне гэтых фактаў.

Прызнанне бокам фактаў, на якіх іншы бок засноўвае свае патрабаванні або пярэчанні, для суда не з’яўляецца абавязковым.

Суд можа лічыць прызнаны факт устаноўленым, калі ў яго няма сумненняў у тым, што прызнанне адпавядае акалічнасцям справы.

#### Артыкул 184. Асобы, якія даюць тлумачэнні ў якасці боку

Калі бокам, трэцяй асобай або заяўнікам з’яўляецца юрыдычная асоба, тлумачэнні ў якасці боку, трэцяй асобы або заяўніка дае кіраўнік гэтай юрыдычнай асобы, надзелены правам распарадчых і выканаўчых дзеянняў, або ўпаўнаважаны гэтым кіраўніком прадстаўнік. Калі кіруючы орган юрыдычнай асобы з’яўляецца калегіяльным, тлумачэнні дае яго прадстаўнік.

Калі бокам, трэцяй асобай або заяўнікам з’яўляецца непаўналетні, суд з улікам акалічнасцей атрымлівае тлумачэнні ад самога непаўналетняга, яго законнага прадстаўніка або іх абодвух.

#### Артыкул 185. Парадак допыту бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы даюць суду тлумачэнні аб падлеглых устанаўленню фактах у вуснай форме і могуць хадайнічаць аб далучэнні да справы сваіх пісьмовых тлумачэнняў. Доказнае значэнне маюць таксама тлумачэнні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якія ўтрымліваюцца ў заявах і іншых працэсуальных дакументах.

#### Артыкул 185[1]. Удзел у судовым пасяджэнні шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі

Бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, сведкі могуць удзельнічаць у судовым пасяджэнні, у тым ліку ў падрыхтоўчым судовым пасяджэнні, шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі.

Суд можа адмовіць у прымяненні сістэм відэаканферэнцсувязі пры разглядзе справы ў выпадках, калі:

адсутнічае тэхнічная магчымасць для ўдзелу ў судовым пасяджэнні з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі;

разбор справы ажыццяўляецца ў закрытым судовым пасяджэнні.

Суд можа адкласці судовы разбор у выпадку ўзнікнення тэхнічных непаладак у рабоце сістэм відэаканферэнцсувязі.

Доказы, прадстаўленыя ў судовым пасяджэнні ў судзе, які ажыццяўляе арганізацыю відэаканферэнцсувязі, накіроўваюцца ў суд, што разглядае справу, не пазней за дзень, наступны за днём правядзення судовага пасяджэння.

## § 2. Паказанні сведак

### Артыкул 186. Прадмет допыту сведкі

Сведка можа быць дапытаны аб вядомых яму фактах, падлеглых даказванню па справе.

Асоба, якая хадайнічае аб выкліку сведкі, абавязана ўказаць суду факты, якія сведка можа пацвердзіць або абвергнуць, а таксама яго прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і месца жыхарства.

### Артыкул 187. Дзеянні суда да допыту сведкі

Перад допытам суд:

1) упэўніваецца ў асобе сведкі;

2) растлумачвае сведку яго права адмовіцца ў прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі законамі выпадках ад дачы паказанняў;

3) папярэджвае сведку аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама ілжывых паказанняў, за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў.

### Артыкул 188. Парадак допыту сведкі

Кожны сведка дапытваецца асобна. Сведкі, якія яшчэ не далі паказанняў, не могуць знаходзіцца ў зале судовага пасяджэння падчас разбору справы. Дапытаныя сведкі застаюцца ў зале пасяджэння да заканчэння разбору справы, калі суд не дазваляе ім выйсці раней, выслухаўшы аб гэтым меркаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

Сведка можа быць дапытаны судом у месцы свайго знаходжання, калі ён з прычыны хваробы, старасці, інваліднасці або іншых уважлівых прычын не ў стане з’явіцца па выкліку суда.

Суд высвятляе адносіны сведкі да юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб і прапаноўвае сведку паведаміць суду ўсё, што яму вядома па справе, пасля чаго сведку могуць быць зададзены пытанні судом, асобай, па ініцыятыве якой выкліканы сведка, пракурорам і іншымі юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі.

Сведка можа быць паўторна дапытаны ў тым самым або ў новым пасяджэнні па ініцыятыве суда або па яго ўласнай заяве, а таксама па просьбе юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

### Артыкул 189. Допыт непаўналетняга сведкі

Пры допыце сведак ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, а паводле меркавання суда і пры допыце сведак ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў павінен прысутнічаць педагагічны работнік з вышэйшай адукацыяй. У выпадку неабходнасці ў суд выклікаюцца таксама законныя прадстаўнікі непаўналетняга. Педагагічны работнік з вышэйшай адукацыяй і законныя прадстаўнікі могуць з дазволу суда задаваць непаўналетняму сведку пытанні.

У выключных выпадках, калі гэта неабходна для ўстанаўлення ісціны, на час допыту непаўналетняга сведкі з залы судовага пасяджэння па вызначэнні суда можа быць выдалена тая або іншая юрыдычна зацікаўленая ў зыходзе справы асоба (акрамя пракурора і адваката). Пасля вяртання гэтай асобы ў залу пасяджэння ёй павінны быць паведамлены паказанні непаўналетняга сведкі і прадастаўлена магчымасць задаць гэтаму сведку пытанні.

Сведка, які не дасягнуў шаснаццаці гадоў, па заканчэнні допыту выходзіць з залы судовага пасяджэння, акрамя выпадкаў, калі суд прызнае неабходным прысутнасць гэтага сведкі ў зале пасяджэння.

**Артыкул 190. Абвяшчэнне паказанняў сведкі**

Паказанні сведак, атрыманыя ў парадку выканання судовага даручэння, забеспячэння доказаў, а таксама допыту сведак па месцы іх знаходжання або допыту ў папярэднім судовым пасяджэнні з адкладаннем разбору справы або прыпыненнем вядзення яе, падлягаюць абвяшчэнню ў судовым пасяджэнні, пасля чаго юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права даць па іх тлумачэнні.

**Артыкул 191. Вочная стаўка**

Суд у судовым пасяджэнні можа правесці вочную стаўку паміж бакамі, іншымі маючымі непасрэдны інтарэс у зыходзе справы асобамі і сведкамі, у паказаннях і тлумачэннях якіх ёсць істотныя супярэчнасці.

Калі вочная стаўка праводзіцца паміж асобамі, якія былі папярэджаны аб крымінальнай адказнасці, суддзя нагадвае гэтым асобам аб гэтым.

Пачынаючы вочную стаўку, суд высвятляе, ці ведаюць дапытваныя адзін аднаго і ў якіх адносінах знаходзяцца паміж сабой. Затым дапытваным ва ўстаноўленай судом чарговасці прапануецца даць паказанні (тлумачэнні) па тых фактах, для высвятлення якіх праводзіцца вочная стаўка. Пасля дачы дапытванымі паказанняў (тлумачэнняў) суд можа задаць ім пытанні. З дазволу суда ўдзельнікі вочнай стаўкі могуць задаваць пытанні адзін аднаму. Паставіць пытанні ўдзельнікам вочнай стаўкі маюць права таксама юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы.

У выпадку, калі складаецца пратакол судовага пасяджэння, паказанні (тлумачэнні) дапытваных запісваюцца ў пратаколе ў той чарговасці, у якой яны даваліся.

## § 3. Пісьмовыя доказы

**Артыкул 192. Пісьмовыя доказы**

Пісьмовымі доказамі з'яўляюцца афіцыйныя і прыватныя дакументы, а таксама агульнадаступная інфармацыя, запісаная літарамі або выкананая ў форме лічбавага, графічнага запісу, размешчаная ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, атрыманая ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, перапіска і запісы дзелавога або асабістага характару, якія ўтрымліваюць звесткі аб фактах, што маюць значэнне для справы. Дакументы, атрыманыя з дапамогай электроннай, вылічальнай і іншай тэхнікі, з'яўляюцца доказамі пры ўмове іх належнага афармлення.

Калі пісьмовы доказ валодае прыкметамі, указанымі ў артыкуле 201 гэтага Кодэкса, ён адначасова з'яўляецца і рэчавым доказам.

**Артыкул 193. Афіцыйныя і прыватныя дакументы**

Афіцыйныя дакументы выдаюць дзяржаўныя органы ў межах іх кампетэнцыі з выкананнем устаноўленых правіл. Калі афіцыйны дакумент аспрэчваецца бокам або іншай юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобай, службовыя асобы дзяржаўных органаў прадстаўляюць суду наяўныя ў іх доказы правамернасці выдачы дакумента і праўдзівасці яго зместу. Пакуль не даказана адваротнае, змест афіцыйнага дакумента лічыцца праўдзівым.

Прыватны дакумент пацвярджае, што грамадзянін, які падпісаў яго, або кіраўнік юрыдычнай асобы сапраўды зрабіў заяву, якая ўтрымліваецца ў гэтым дакуменце. Адпаведнасць заявы рэчаіснасці падлягае праверцы з дапамогай іншых доказаў у выпадку яе аспрэчвання.

**Артыкул 194. Дакументы, якія афармляюць заключэнне здзелкі**

Дакументы, якія афармляюць заключэнне здзелкі, пацвярджаюць факт заключэння і зместу гэтай здзелкі. Заключэнне і змест здзелкі пацвярджаюцца дакументам, падпісаным абодвума бакамі, а таксама дакументамі, якімі абмяняліся бакі пры дапамозе паштовай, тэлеграфнай, тэлетайпнай, электроннай сувязі, якая дазваляе дакладна ўстанавіць, што дакумент зыходзіць ад боку паводле дагавора.

Незахаванне пісьмовай формы здзелкі, калі такая форма ўстаноўлена законам, пазбаўляе бакі права ў выпадку спрэчкі спасылацца ў пацвярджэнне здзелкі і яе ўмоў на паказанні сведак, але не пазбаўляе іх права прыводзіць пісьмовыя і іншыя доказы.

**Артыкул 195. Абавязак прадстаўлення суду пісьмовых доказаў**

Любы дзяржаўны орган, юрыдычная асоба, грамадзянін па патрабаванні суда абавязаны ва ўказаны ім тэрмін прадставіць дакументы, іншыя пісьмовыя доказы, якія знаходзяцца ў іх, не патрабуючы аплаты выдаткаў па іх прадстаўленні.

**Артыкул 196. Парадак выпатрабавання і прадстаўлення пісьмовых доказаў**

Па патрабаванні суда пісьмовыя доказы накіроўваюцца іх трымальнікамі непасрэдна ў суд.

Суд можа таксама выдаць асобе, якая хадайнічае аб выпатрабаванні пісьмовага доказу, запыт на права яго атрымання для прадстаўлення ў суд.

Пісьмовыя доказы прадстаўляюцца ў арыгінале. Пры цяжкасці прадстаўлення арыгінала трымальнік можа са згоды суда прадставіць належным чынам засведчаную копію дакумента або выпіску з яго.

Пры цяжкасці або немагчымасці прадстаўлення арыгінала суд можа таксама зрабіць агляд і даследаванне пісьмовага доказу ў месцы яго захоўвання.

**Артыкул 197. Абвяшчэнне і прад’яўленне пісьмовых доказаў**

Пісьмовыя доказы або пратаколы іх агляду, складзеныя ў ходзе падрыхтоўкі справы да судовага разбору, у парадку выканання судовага даручэння або забеспячэння доказаў, абвяшчаюцца ў судовым пасяджэнні і прад’яўляюцца юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, а ў выпадку неабходнасці – таксама сведкам, экспертам, спецыялістам. Пасля гэтага суд выслухоўвае тлумачэнні згаданых асоб, сведак, экспертаў, спецыялістаў.

**Артыкул 198. Абвяшчэнне асабістай перапіскі і тэлеграфных паведамленняў грамадзян**

З мэтай аховы тайны перапіскі і тэлеграфных паведамленняў асабістая перапіска і асабістыя тэлеграфныя паведамленні грамадзян могуць быць абвешчаны ў адкрытым судовым пасяджэнні толькі са згоды асоб, паміж якімі гэта перапіска і тэлеграфныя паведамленні мелі месца. У адваротным выпадку такая перапіска і тэлеграфныя паведамленні абвяшчаюцца і даследуюцца ў закрытым судовым пасяджэнні. Гэта правіла прымяняецца і пры абвяшчэнні асабістых запісаў грамадзян.

**Артыкул 199. Даказванне падложнасці пісьмовых доказаў**

Падложнасць пісьмовых доказаў, у тым ліку і афіцыйнага дакумента, можа даказвацца з дапамогай любых доказаў, уключаючы паказанні сведак.

Улічваючы канкрэтныя акалічнасці справы, суд вызначае, ці захаваў пісьмовы доказ і ў якой меры доказнае значэнне, нягледзячы на падчысткі і іншыя прыёмы фальсіфікацыі тэксту.

Асобам, што прадставілі пісьмовыя доказы, падложнасць якіх устаноўлена ў працэсе, прадастаўляецца права даказвання без выкарыстання гэтых доказаў.

Пры ўстанаўленні падложнасці пісьмовых доказаў суд у неабходных выпадках накіроўвае інфармацыю аб гэтым пракурору для вырашэння пытання аб прыцягненні вінаватых да крымінальнай адказнасці.

**Артыкул 200. Вяртанне сапраўдных дакументаў**

Сапраўдныя дакументы, якія маюцца ў справе, па просьбе асоб, якія прадставілі гэтыя дакументы, могуць быць ім вернуты пасля ўступлення судовай пастановы ў законную сілу. У гэтым выпадку ў справе пакідаецца засведчаная суддзёй копія дакумента.

## § 4. Рэчавыя доказы. Агляды. Асведчанне. Апазнанне. Судовы эксперымент

**Артыкул 201. Рэчавыя доказы**

Рэчавымі доказамі з'яўляюцца прадметы, якія дзякуючы слядам уздзеяння, што захаваліся на іх, форме, іншым уласцівасцям і якасцям або месцу знаходжання могуць служыць сродкам устанаўлення фактаў, якія маюць значэнне для справы.

**Артыкул 202. Выпатрабаванне і прадстаўленне рэчавых доказаў**

Выпатрабаванне і прадстаўленне рэчавых доказаў праводзяцца па правілах, выкладзеных у артыкуле 179 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 203. Захоўванне рэчавых доказаў**

Рэчавыя доказы захоўваюцца ў справе або асобна ад яе ў памяшканні суда. Прадметы, якія з прычыны іх груvasткасці або па іншых прычынах не могуць быць дастаўлены ў суд, пакідаюцца па месцы іх знаходжання і перадаюцца на захоўванне ўладальнікам або іншым асобам. У любым выпадку рэчавы доказ павінен быць падрабязна апісаны ў пратаколе агляду з указаннем месца яго знаходжання і па магчымасці сфатаграфаваны.

Як правіла, рэчавыя доказы захоўваюцца да ўступлення ў законную сілу судовай пастановы.

**Артыкул 204. Вяртанне рэчавых доказаў**

Пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы рэчавыя доказы вяртаюцца асобам, ад якіх яны былі атрыманы, або перадаюцца асобам, за якімі суд прызнаў права на гэтыя прадметы.

У асобных выпадках рэчавыя доказы пасля агляду і даследавання іх судом могуць быць вернуты асобам, ад якіх яны былі атрыманы, яшчэ да ўступлення судовай пастановы ў законную сілу, калі згаданыя асобы аб гэтым хадайнічаюць і задавальненне такога хадайніцтва магчымае без урону для разгляду справы або выканання рашэння.

Рэчавыя доказы, якія падвяргаюцца хуткаму псаванню, неадкладна аглядаюцца і даследуюцца судом па месцы іх знаходжання, пасля чаго вяртаюцца асобе, якая прадставіла іх для агляду.

Пра месца і час агляду і даследавання такіх рэчавых доказаў паведамляецца юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, калі яны могуць прыбыць па месцы знаходжання рэчавых доказаў да моманту іх агляду. Няяўка юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб не перашкаджае агляду і даследаванню рэчавых доказаў.

Даныя агляду і даследавання рэчавых доказаў, якія падвяргаюцца хуткаму псаванню, заносяцца ў пратакол.

Дакументы, якія з’яўляюцца рэчавымі доказамі, застаюцца ў справе на працягу ўсяго тэрміну захоўвання апошняга, але могуць таксама перадавацца зацікаўленым грамадзянам і юрыдычным асобам з пакіданнем у справе іх копій.

**Артыкул 205. Даследаванне рэчавых доказаў**

Рэчавыя доказы аглядаюцца ў судовым пасяджэнні судом, прад’яўляюцца для агляду юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, а ў выпадку неабходнасці – таксама экспертам, спецыялістам і сведкам.

Асобы, якім прад’яўлены рэчавыя доказы, могуць выказваць свае заўвагі аб тых або іншых асаблівасцях і ўласцівасцях указаных доказаў і даваць неабходныя тлумачэнні. Гэтыя заўвагі і тлумачэнні заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння ў выпадку, калі ён складаецца.

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы выказваюць свае заўвагі і даюць тлумачэнні таксама пасля абвяшчэння пратаколаў агляду рэчавых доказаў, складзеных у парадку выканання судовых даручэнняў, забеспячэння доказаў або падрыхтоўкі справы да судовага разбору.

**Артыкул 206. Агляд на месцы**

Суд па хадайніцтве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або па ўласнай ініцыятыве можа правесці агляд мясцовасці, памяшкання, транспартнага сродку, а таксама прадмета, калі апошні не можа быць дастаўлены ў суд. Аб правядзенні агляду на месцы суд выносіць вызначэнне.

**Артыкул 207. Парадак вядзення агляду**

Пра час і месца агляду паведамляецца юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, аднак іх няяўка не перашкаджае агляду.

У неабходных выпадках для ўдзелу ў аглядзе прыцягваюцца панятыя, сведкі, перакладчыкі, спецыялісты, эксперты. Спецыялісты пры аглядзе могуць рабіць вымярэнні, фатаграфаванне, кіназдымку, відэазапіс, складаць планы і схемы, а таксама ажыццяўляць іншыя неабходныя дзеянні.

Падчас агляду дапускаюцца таксама прад’яўленне прадметаў або асоб для апазнання, правядзенне судовага эксперымента.

У выпадку неабходнасці прадметы, якія аглядаюцца, забіраюцца, упакоўваюцца і апячатваюцца.

**Артыкул 208. Асаблівасці агляду памяшканняў**

Пры неабходнасці агляду жылога, службовага, вытворчага або іншага памяшкання суд выносіць аб гэтым вызначэнне, якое прад’яўляецца грамадзяніну ці кіраўніку або прадстаўніку юрыдычнай асобы. Агляд месцаў, дзе захоўваюцца матэрыяльныя каштоўнасці, праводзіцца ў прысутнасці матэрыяльна адказных асоб.

**Артыкул 209. Асведчанне**

Суд мае права правесці асведчанне боку або трэцяй асобы для ўстанаўлення на іх целе слядоў правапарушэння, наяўнасці асаблівых прыкмет і да т.п., калі пры гэтым не патрабуецца судова-медыцынская экспертыза. Асведчанне сведкі магчымае толькі для праверкі праўдзівасці яго паказанняў.

Вызначэнне суда аб вядзенні асведчання з’яўляецца абавязковым для асобы, у дачыненні да якой яно вынесена.

Асведчанне праводзіцца ў прысутнасці панятых, а ў неабходных выпадках – і з удзелам урача. Калі гэта працэсуальнае дзеянне суправаджаецца агаленнем асведчваемай асобы, яно праводзіцца ў прысутнасці панятых таго самага полу. Суддзя не можа прысутнічаць пры асведчанні асоб іншага полу, калі для асведчання патрабуецца агаленне. У гэтым выпадку працэсуальнае дзеянне праводзіць урач у прысутнасці панятых.

Пры асведчанні не дапускаюцца дзеянні, якія прыніжаюць годнасць або небяспечныя для здароўя асведчваемай асобы.

**Артыкул 210. Сціслы пратакол, пратакол агляду або асведчання**

Аб правядзенні агляду або асведчання складаюцца сціслы пратакол, пратакол з выкананнем патрабаванняў артыкулаў 174 і 175 гэтага Кодэкса.

У сціслым пратаколе, пратаколе апісваюцца ўмовы агляду або асведчання, усе працэсуальныя дзеянні суда, а таксама ўсё выяўленае пры аглядзе і асведчанні ў той паслядоўнасці, у якой праводзілася адпаведнае працэсуальнае дзеянне, і ў тым выглядзе, у якім выяўленаеназіралася ў момант агляду або асведчання. У сціслым пратаколе, пратаколе пералічваецца і апісваецца таксама ўсё забранае пры аглядзе або асведчанні.

Асобы, якія ўдзельнічаюць у аглядзе або асведчанні, могуць патрабаваць, каб у сціслы пратакол, пратакол былі ўнесены іх заўвагі.

Пасля абвяшчэння сціслы пратакол, пратакол падпісваюцца ўсімі асобамі, якія ўдзельнічалі ў аглядзе або асведчанні.

Да сціслага пратакола, пратакола прыкладаюцца складзеныя, зробленыя або звераныя пры ажыццяўленні адпаведнага працэсуальнага дзеяння планы, чарцяжы, фотаздымкі і да т.п.

**Артыкул 211. Прад'яўленне для апазнання**

У выпадку неабходнасці суд можа прад'явіць для апазнання сведку або боку асобу, прадмет або жывёлу.

Асобы, якія апазнаюць, папярэдне апытваюцца аб акалічнасцях, пры якіх яны назіралі адпаведныя асобу, прадмет або жывёлу, а таксама аб прыкметах і асаблівасцях, па якіх яны могуць правесці апазнанне.

**Артыкул 212. Парадак прад'яўлення для апазнання**

Асоба, чыё апазнанне праводзіцца, прад'яўляецца асобе, якая апазнае, разам з іншымі асобамі, падобнымі па знешнасці з асобай, якая апазнаецца. Агульная колькасць асоб, якія прад'яўляюцца для апазнання, павінна быць не меншай за тры.

Перад пачаткам працэсуальнага дзеяння асобе, якая апазнаецца, у адсутнасць асобы, якая апазнае, прапануецца заняць любое месца сярод прад'яўляемых асоб, што адзначаецца ў пратаколе ў выпадку, калі ён складаецца.

Пры немагчымасці прад'яўлення асобы апазнанне можа быць праведзена па яе фатаграфіі, якая прад'яўляецца адначасова з фатаграфіямі не менш за трох іншых асоб, падобных па знешнасці.

Прадмет або жывёла прад'яўляюцца ў групе аднародных прадметаў, жывёл.

Калі асобай, якая апазнае, з'яўляецца сведка, ён перад апазнаннем папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама ілжывых паказанняў, за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў. Сведку, які ўжо папярэджаны аб адказнасці, суддзя нагадвае аб гэтым.

Асобе, якая апазнае, прапануецца ўказаць асобу, прадмет або жывёлу, аб якіх яна дала паказанні. Навадныя пытанні не дапускаюцца.

Калі асоба, якая апазнае, паказала на адну з прад'яўленых ёй асоб або адзін з прадметаў, адну з жывёл, ёй прапануецца растлумачыць, па якіх прыкметах або асаблівасцях яна пазнала гэтых асобу, прадмет або жывёлу.

У выпадку няяўкі бакоў прад'яўленне для апазнання праводзіцца ў прысутнасці панятых.

У выключных выпадках з мэтай захавання асабістай бяспекі асобы, якая апазнае, яна можа апазнаваць, з'яўляючыся нябачнай для асобы, якая апазнаецца.

**Артыкул 213. Сціслы пратакол, пратакол прад'яўлення для апазнання**

Аб прад'яўленні для апазнання складаюцца сціслы пратакол, пратакол, у якіх указваюцца звесткі аб асобе таго, хто апазнае, аб асобах, прадметах або жывёлах, прад'яўленых для апазнання, аб панятых, якія прынялі ўдзел у працэсуальным дзеянні, і па магчымасці даслоўна выкладаюцца паказанні асобы, якая апазнае, а таксама іншыя звесткі, прадугледжаныя артыкуламі 174 і 175 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 214. Мэты і падставы правядзення судовага эксперымента**

Судовы эксперымент праводзіцца судом з мэтай праверкі і ўдакладнення фактаў, якія маюць значэнне для справы. Ён праводзіцца па патрабаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або па ініцыятыве самога суда шляхам узнаўлення абстаноўкі, у якой адбывалася пэўная падзея, і дзеянняў, з якіх гэта падзея складалася.

**Артыкул 215. Парадак правядзення судовага эксперымента**

У выпадку няяўкі бакоў судовы эксперымент праводзіцца ў прысутнасці панятых. Да ўдзелу ў судовым эксперыменце могуць быць прыцягнуты спецыялісты і асобы, якія аднаўляюць дзеянні ўдзельнікаў падзеі.

Да ўзнаўлення дзеянняў павінна быць адноўлена абстаноўка, у якой па кожнай з версій, якія правяраюцца, адбывалася падзея. Кожнаму ўдзельніку судовага эксперымента суддзя прапаноўвае самастойна ўзнавіць абстаноўку падзеі і ажыццявіць дзеянні, удзельнікам або сведкам якіх ён быў.

Правядзенне судовага эксперымента магчымае толькі пры ўмове, што пры гэтым не будуць зняважаны гонар і годнасць асоб, якія ўдзельнічаюць у ім, і навакольных і не ўзнікне небяспека для іх здароўя.

Калі судовы эксперымент можа пацягнуць прычыненне маёмаснага ўрону грамадзянам або юрыдычным асобам, суддзя вызначае, за чый кошт гэты ўрон будзе кампенсаваны.

Аб правядзенні судовага эксперымента і яго выніках складаюцца сціслы пратакол, пратакол з выкананнем патрабаванняў артыкулаў 174 і 175 гэтага Кодэкса.

### § 5. Правядзенне экспертыз

**Артыкул 216. Мэты правядзення экспертызы**

Экспертыза праводзіцца для растлумачэння пытанняў, якія ўзнікаюць пры разглядзе справы і патрабуюць спецыяльных ведаў у галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства або іншых сферах дзейнасці. Экспертыза можа быць прызначана ў парадку забеспячэння доказаў, пры падрыхтоўцы справы да слухання або ў ходзе судовага разбору.

Пытанні, пастаўленыя эксперту, і яго заключэнне не могуць выходзіць за межы спецыяльных ведаў эксперта.

**Артыкул 216$^{1}$. Заключэнне эксперта**

Заключэнне эксперта – гэта працэсуальны дакумент, які сведчыць факт і ход даследавання экспертам матэрыялаў, аб'ектаў экспертызы, прадастаўленых судом, і ўтрымлівае вывады па пастаўленых перад экспертам пытаннях, заснаваныя

на спецыяльных ведах эксперта ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства і іншых сферах дзейнасці.

**Артыкул 217. Віды экспертыз**

Экспертызы праводзяцца па-за судом. Але калі дазваляе характар даследавання, яны могуць быць праведзены і непасрэдна ў судовым пасяджэнні.

Экспертызы праводзяцца асобнымі экспертамі або іх групамі. Групавая экспертыза можа быць камісійнай або комплекснай.

Па справе можа быць прызначана дадатковая або паўторная экспертыза.

**Артыкул 218. Камісійная экспертыза**

Складаныя экспертызы могуць праводзіцца камісіямі экспертаў адной спецыяльнасці. У такіх выпадках заключэнні падпісваюць усе эксперты разам. Пры рознагалоссях паміж экспертамі кожны з іх дае асобнае заключэнне па ўсіх пытаннях, якія выклікалі рознагалоссі.

**Артыкул 219. Комплексная экспертыза**

Комплексная экспертыза прызначаецца, калі зрабіць які-небудзь вывад, які мае значэнне для справы, можна толькі шляхам правядзення некалькіх даследаванняў з выкарыстаннем розных галін ведаў або розных навуковых дысцыплін у межах адной галіны ведаў.

Кожны эксперт праводзіць даследаванне самастойна, нясе за яго адказнасць і дае заключэнне толькі ў межах сваёй кампетэнцыі. Эксперт не мае права падпісваць тую частку заключэння комплекснай экспертызы, якая не адносіцца да яго кампетэнцыі.

**Артыкул 220. Правы юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб у сувязі з экспертызай**

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права:

1) патрабаваць прызначэння экспертызы;

2) заяўляць адводы экспертам;

3) прадстаўляць пытанні для пастаноўкі іх перад экспертам;

4) прадстаўляць для экспертнага даследавання дадатковыя дакументы і іншыя матэрыялы;

5) знаёміцца з вызначэннем аб прызначэнні экспертызы і заключэннем эксперта;

6) з дазволу суда прысутнічаць пры правядзенні экспертызы і даваць тлумачэнні экспертам.

**Артыкул 221. Прызначэнне экспертызы судом**

Прызнаўшы правядзенне экспертызы неабходным, суд растлумачвае бакам і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам змест артыкула 220 гэтага Кодэкса і прадастаўляе ім магчымасць заявіць адпаведныя патрабаванні.

Права канчатковага вырашэння ўсіх пытанняў, звязаных з прызначэннем экспертызы, належыць суду. Адхіленне адпаведных патрабаванняў, заяўленых юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі, павінна быць матывавана ў вызначэнні суда.

Аб прызначэнні экспертызы выносіцца вызначэнне, у якім указваюцца падставы правядзення экспертызы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) эксперта (экспертаў) або найменне судова-экспертнай арганізацыі (падраздзялення), у якой павінна быць праведзена экспертыза, пытанні, пастаўленыя перад экспертам, і матэрыялы, аб’екты,

прадастаўленыя ў распараджэнне эксперта. Правядзенне экспертызы юрыдычнай асобай, якая не з’яўляецца судова-экспертнай арганізацыяй, не дапускаецца.

Калі экспертыза праводзіцца па-за судова-экспертнай арганізацыяй (падраздзяленнем), суд высвятляе неабходныя даныя аб спецыяльнасці і кампетэнтнасці асобы, якой даручаецца вядзенне экспертызы.

Вызначэнне аб прызначэнні экспертызы і заключэнне эксперта не прадастаўляюцца для азнаямлення асобе, у дачыненні да якой праводзіцца судова-псіхіятрычная экспертыза, калі яе псіхічны стан робіць гэта немагчымым.

Калі бок адхіляецца ад удзелу ў правядзенні экспертызы або стварае перашкоды для яе правядзення (не з’яўляецца на экспертызу, не прадстаўляе экспертам неабходных прадметаў даследавання і да т.п.), а па акалічнасцях справы без удзелу гэтага боку экспертызу правесці немагчыма, то суд у залежнасці ад таго, які бок ухіляецца ад экспертызы, а таксама якое для яго яна мае значэнне, мае права прызнаць факт, для высвятлення якога экспертыза была прызначана, устаноўленым або абвергнутым.

**Артыкул 222. Узоры і матэрыялы для экспертнага даследавання**

Суд мае права атрымаць у бакоў па справе і перадаць эксперту або судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленню) узоры почырку або іншыя ўзоры, неабходныя для экспертнага даследавання.

Узяцце ў даследуемых асоб біялагічных узораў (крыві, сліны і да т.п.) дапускаецца толькі з іх згоды, а калі яны недзеяздольныя – са згоды або па хадайніцтве іх законных прадстаўнікоў і праводзіцца экспертамі ў экспертных падраздзяленнях Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз або арганізацыях аховы здароўя.

Суд прадстаўляе эксперту ў неабходных выпадках таксама матэрыялы справы, прыцягвае яго да ўдзелу ў допытах бакоў, сведак, да агляду рэчавых доказаў і да т.п.

**Артыкул 223. Правядзенне экспертызы ў судова-экспертнай арганізацыі**

Пры даручэнні правядзення экспертызы судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленню) суд накіроўвае ў гэту судова-экспертную арганізацыю (падраздзяленне) сваё вызначэнне разам з неабходнымі матэрыяламі і аб’ектамі.

Пасля атрымання вызначэння кіраўнік судова-экспертнай арганізацыі (падраздзялення) даручае правядзенне экспертызы аднаму або некальkім экспертам гэтай судова-экспертнай арганізацыі (падраздзялення), растлумачвае ім правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 97 і 98 гэтага Кодэкса, і папярэджвае аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама няпраўдзівага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў, што сведчыцца подпісамі экспертаў у заключэнні эксперта.

**Артыкул 224. Размяшчэнне даследуемага ў арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар**

Калі пры вядзенні судова-медыцынскай або судова-псіхіятрычнай экспертызы ўзнікае неабходнасць у стацыянарным назіранні за даследуемым, суд са згоды даследуемага змяшчае яго адпаведна ў арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар, аб чым указвае ў вызначэнні аб прызначэнні экспертызы.

Без згоды даследуемага апошні можа быць змешчаны для стацыянарнага назірання ў арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар толькі ў выпадках і парадку, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі законамі.

**Артыкул 225. Правядзенне экспертызы па-за судова-экспертнай арганізацыяй**

Калі экспертыза праводзіцца па-за судова-экспертнай арганізацыяй, суддзя выклікае да сябе асобу, якой можа быць даручана экспертыза, упэўніваецца ў яе асобе, спецыяльнасці і кваліфікацыі, устанаўлівае яе адносіны да бакоў, а таксама правярае, ці няма падстаў да адводу, пасля чаго выносіць вызначэнне аб прызначэнні экспертызы.

Затым суддзя ўручае эксперту вызначэнне аб прызначэнні экспертызы, растлумачвае яму правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 97 і 98 гэтага Кодэкса, папярэджвае яго аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама няпраўдзівага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў. Аб выкананні гэтых дзеянняў суддзя робіць запіс, які сведчыцца подпісам эксперта, у вызначэнні аб прызначэнні экспертызы.

Калі эксперт робіць якія-небудзь заявы або хадайніцтвы, складаюцца сціслы пратакол, пратакол з выкананнем патрабаванняў артыкулаў 174 і 175 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 226. Змест заключэння эксперта**

Пасля правядзення даследавання з улікам яго вынікаў эксперт (эксперты) ад свайго імені складае і падпісвае заключэнне эксперта.

Заключэнне эксперта павінна складацца з уводнай, даследчай частак і матываваных вывадаў.

Ва ўводнай частцы заключэння эксперта ўказваюцца:

1) звесткі аб судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленні), эксперце (прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць), займаная пасада, адукацыя, стаж экспертнай працы па экспертнай спецыяльнасці, вучоная ступень, вучонае званне, іншыя звесткі);

2) дата пачатку і заканчэння правядзення экспертызы (пры неабходнасці час);

3) падстава правядзення экспертызы, дата вынясення вызначэння аб прызначэнні экспертызы;

4) адзнака, засведчаная подпісам эксперта, аб тым, што ён папярэджаны аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама няпраўдзівага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў;

5) звесткі аб асобах, прысутных пры правядзенні экспертызы;

6) пытанні, пастаўленыя перад экспертам;

7) звесткі аб матэрыялах і аб'ектах, прадастаўленых для правядзення экспертызы;

8) звесткі аб хадайніцтвах эксперта.

У даследчай частцы заключэння эксперта ўтрымліваюцца наступныя звесткі:

1) апісанне аб'ектаў і іх упакоўкі;

2) умовы правядзення экспертызы, якія маюць значэнне для экспертнага даследавання;

3) прымененыя сродкі, метады, праведзеныя эксперыменты, выяўленыя істотныя ўласцівасці (адзнакі) аб'ектаў, атрыманыя вынікі;

4) звесткі аб зрасходаваных (знішчаных) аб'ектах з указаннем іх наймення і колькасці;

5) тлумачэнні асоб, прысутных пры правядзенні экспертызы;

6) спасылкі на выкарыстоўваемыя метадычныя матэрыялы або іншыя матэрыялы з навукова-практычным абгрунтаваннем прымененых метадаў;

7) іншыя звесткі, якія маюць значэнне для правядзення экспертызы.

Матываваныя вывады ў заключэнні эксперта фармулююцца на аснове аб'ектыўнага, усебаковага і поўнага аналізу вынікаў, атрыманых пры даследаванні матэрыялаў, аб'ектаў экспертызы. Калі пры правядзенні экспертызы эксперт установіць акалічнасці, што маюць значэнне для справы, наконт якіх яму не былі пастаўлены пытанні, ён мае права ўказаць на іх у сваім заключэнні.

Да заключэння эксперта павінны быць прыкладзены аб'екты, узоры, атрыманыя эксперыментальным шляхам, якія засталіся пасля даследавання і выкарыстоўваюцца для

параўнання, а таксама фатаграфіі, схемы, графікі, табліцы і іншыя матэрыялы, якія пацвярджаюць вывады, электронныя носьбіты адпаведнай інфармацыі. Дадатак да заключэння эксперта на папяровых носьбітах падпісваецца экспертам, на электронных носьбітах упакоўваецца і апячатваецца.

Калі эксперт установіць, што пастаўленыя пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў або прадастаўленыя яму матэрыялы, аб'екты непрыдатныя або недастатковыя для адказу на гэтыя пытанні і не могуць быць дапоўнены, або калі стан навукі і практыкі не дазваляе на іх адказаць, ён складае матываванае паведамленне аб немагчымасці дачы заключэння эксперта і накіроўвае яго ў суд, які прызначыў экспертызу.

Заключэнне эксперта не з'яўляецца абавязковым для суда, аднак нязгода з ім павінна быць матывавана.

**Артыкул 227. Даследаванне экспертнага заключэння**

Суд можа абмежавацца абвяшчэннем пісьмовага заключэння эксперта, не выклікаючы яго ў судовае пасяджэнне. Але, будучы выкліканым у суд, эксперт выкладае сваё заключэнне вусна.

Пасля выступлення эксперт можа быць дапытаны для растлумачэння і ўдакладнення зместу заключэння. Пытанні эксперту задаюць суд, асоба, па заяве якой была прызначана экспертыза, пракурор і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы.

Бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць таксама права непасрэдна азнаёміцца з заключэннем эксперта або яго матываваным паведамленнем аб немагчымасці дачы заключэння эксперта.

Пасля азнаямлення са зместам заключэння эксперта і допыту эксперта юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права даць свае тлумачэнні і заявіць пярэчанні, а таксама хадайнічаць аб пастаноўцы дадатковых пытанняў і прызначэнні дадатковай або паўторнай экспертызы.

**Артыкул 228. Правядзенне дадатковай і паўторнай экспертыз**

У выпадку недастатковай яснасці або непаўнаты экспертнага заключэння можа быць прызначана дадатковая экспертыза, якая даручаецца таму самаму або іншаму эксперту.

Пры нязгодзе з заключэннем эксперта па матыве неабгрунтаванасці, сумненняў у правільнасці заключэння, а таксама пры супярэчлівасці заключэнняў розных экспертаў суд можа прызначыць паўторную экспертызу, даручыўшы яе іншаму эксперту або іншым экспертам.

## § 6. Іншыя сродкі доказвання

**Артыкул 229. Гуказапіс, відэазапіс, кіна- і відэафільмы і іншыя носьбіты інфармацыі**

Суд з улікам акалічнасцей справы можа дапусціць у якасці сродкаў доказвання гуказапіс, відэазапіс, кіна- і відэафільмы, а таксама запісы на іншых носьбітах інфармацыі. Іх даследаванне ажыццяўляецца па правілах, прадугледжаных для пісьмовых і рэчавых доказаў. Асобы, якія хадайнічаюць аб допуску такіх сродкаў доказвання, абавязаны ўказаць тэхнічныя даныя аб сістэмах запісу і ўзнаўлення, што дазваляюць суду ўспрыняць інфармацыю.

Атрыманыя з дапамогай згаданых запісаў і фільмаў звесткі ацэньваюцца ў сукупнасці з іншымі доказамі па справе.

Не можа быць выкарыстаны ў якасці доказу гука- або відэазапіс, атрыманы скрытым шляхам, за выключэннем выпадкаў, калі такі запіс дапускаецца законам.

### Артыкул 230. Заключэнні дзяржаўных органаў

Сродкамі даказвання з'яўляюцца заключэнні і звязаныя з імі акты, іншыя дакументы дзяржаўных органаў, якія ўдзельнічаюць у справе, у частцы, што ўтрымлівае інфармацыю аб фактах, маючых значэнне для справы. Названыя заключэнні і акты абвяшчаюцца ў судовым пасяджэнні, пасля чаго суд і юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы могуць задаваць прадстаўнікам дзяржаўных органаў пытанні з мэтай растлумачэння і дапаўнення згаданай інфармацыі.

### Артыкул 231. Пратаколы працэсуальных дзеянняў як сродкі даказвання

Пратаколы, якія сведчаць факты і акалічнасці, устаноўленыя пры аглядзе, асведчанні, прад'яўленні для апазнання і судовым эксперыменце, з'яўляюцца крыніцамі інфармацыі для даказвання, калі яны складзены ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.

## ГЛАВА 23
## ЗБОР, ПРАВЕРКА І АЦЭНКА ДОКАЗАЎ

### Артыкул 232. Суб'екты збору доказаў

Доказы збіраюцца і прадстаўляюцца суду бакамі і іншымі юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі з улікам правіл, устаноўленых артыкулам 20 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 233. Вырашэнне хадайніцтваў аб ажыццяўленні доказных дзеянняў

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы могуць заяўляць хадайніцтвы аб забеспячэнні доказаў, збору іх з дапамогай судовых даручэнняў, прымяненні для замацавання доказаў тэхнічных сродкаў, а таксама аб ажыццяўленні іншых працэсуальных дзеянняў з мэтай атрымання доказнай інфармацыі. Пісьмовыя хадайніцтвы далучаюцца да справы, вусныя заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Хадайніцтва падлягае разгляду і вырашэнню адразу пасля яго заявы. Аб выніках разгляду хадайніцтва суд выносіць матываванае вызначэнне.

### Артыкул 234. Забеспячэнне доказаў

Асобы, якія маюць падставы апасацца, што прадстаўленне неабходных для іх доказаў стане ў далейшым немагчымым або цяжкім, могуць хадайнічаць перад судом аб забеспячэнні гэтых доказаў як да, так і пасля ўзбуджэння справы ў судзе. Да ўзбуджэння справы ў судзе забеспячэнне пісьмовых доказаў таксама можа праводзіцца натарыусамі ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

Забеспячэнне доказаў, неабходных для вядзення спраў у органах замежных дзяржаў, праводзіцца натарыусамі ў парадку, прадугледжаным актамі заканадаўства.

### Артыкул 235. Заява аб забеспячэнні доказаў

У заяве аб забеспячэнні доказаў павінны быць указаны:

1) доказы, якія неабходна забяспечыць;

2) факты, для пацвярджэння якіх неабходны гэтыя доказы;

3) прычыны, якія прымусілі заяўніка звярнуцца з хадайніцтвам аб забеспячэнні доказаў.

Заява падаецца ў суд, у якім разглядаецца справа або ў раёне дзейнасці якога павінны быць ажыццёўлены працэсуальныя дзеянні па забеспячэнні доказаў.

**Артыкул 236. Парадак забеспячэння доказаў судом**

З мэтай забеспячэння доказаў суддзя ажыццяўляе працэсуальныя дзеянні, накіраваныя на замацаванне і захаванне гэтых доказаў.

Заяўніку і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам паведамляецца пра час і месца разгляду заявы, аднак іх няяўка не з'яўляецца перашкодай да разгляду заявы аб забеспячэнні доказаў і ажыццяўленні неабходных працэсуальных дзеянняў.

Пратаколы допыту сведак, агляду пісьмовых і рэчавых доказаў, іншыя сабраныя ў парадку забеспячэння матэрыялы перадаюцца ў суд, які разглядае справу, з паведамленнем юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам.

**Артыкул 237. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў па пытанні забеспячэння доказаў**

Вызначэнне суда па пытанні забеспячэння доказаў можа быць абскарджана юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі або апратэставана пракурорам.

Падача прыватнай скаргі або прыватнага пратэсту на вызначэнне аб прыняцці мер да забеспячэння доказаў не прыпыняе яго выканання.

**Артыкул 238. Судовыя даручэнні**

Суд, які разглядае справу, у выпадку неабходнасці збору доказаў у іншым горадзе або раёне даручае адпаведнаму суду ажыццявіць пэўныя працэсуальныя дзеянні.

У вызначэнні аб судовым даручэнні сцісла выкладаецца сутнасць разглядаемай справы, указваюцца факты, што падлягаюць высвятленню, доказы, якія павінен сабраць суд, што выконвае даручэнне. Гэта вызначэнне абавязковае для суда, якому яно адрасавана, і павінна быць выканана ў тэрмін да дваццаці дзён з моманту яго атрымання.

Выкананне судовага даручэння праводзіцца ў судовым пасяджэнні. Юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам паведамляецца пра час і месца пасяджэння, аднак іх няяўка не з'яўляецца перашкодай да выканання даручэння.

Пратаколы і ўсе сабраныя пры выкананні даручэння матэрыялы неадкладна перасылаюцца ў суд, які разглядае справу.

**Артыкул 239. Выключаны**

**Артыкул 240. Праверка доказаў**

У аснову рашэння па справе могуць быць пакладзены толькі доказы, падвергнутыя ўсебаковай і аб'ектыўнай праверцы.

Звесткі, атрыманыя з парушэннем парадку, устаноўленага гэтым Кодэксам, не могуць служыць доказам па справе.

**Артыкул 241. Ацэнка доказаў**

Суд ацэньвае доказы па сваім унутраным перакананні, заснаваным на ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным даследаванні ў судовым пасяджэнні ўсіх фактаў, якія ўваходзяць у прадмет доказвання, кіруючыся пры гэтым толькі законам.

Кожны доказ ацэньваецца з пункта гледжання адносінасці, дапушчальнасці, верагоднасці, а ўсе доказы ў сукупнасці – таксама з пункта гледжання дастатковасці для вырашэння справы.

Ні адзін з доказаў не мае для суда загадзя ўстаноўленай сілы.

## РАЗДЗЕЛ VI
## ІСКАВАЕ ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

### ГЛАВА 24
### УЗБУДЖЭННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ

**Артыкул 242. Падача іскавай заявы**

Іскавая заява аб узбуджэнні справы падаецца ў суд у пісьмовай форме.

Іскавая заява прадстаўляецца ў суд з копіямі па колькасці адказчыкаў. Суддзя можа ў залежнасці ад складанасці і характару справы патрабаваць ад асобы, якая звярнулася ў суд, прадстаўлення таксама копій дакументаў, якія прыкладаюцца да заявы.

**Артыкул 243. Змест іскавай заявы**

Змест іскавай заявы аб узбуджэнні справы павінен адпавядаць агульным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да працэсуальных дакументаў (артыкул 109 гэтага Кодэкса). У ёй павінны быць таксама ўказаны:

1) дакладнае абазначэнне патрабаванняў істца, а калі патрабаванні з'яўляюцца маёмаснымі, то і цана іску;

2) факты, якімі існец абгрунтоўвае свае патрабаванні;

3) доказы, якія пацвярджаюць кожны са згаданых фактаў;

4) іншыя даныя, якія вынікаюць з гэтага Кодэкса і іншых заканадаўчых актаў, неабходныя для вырашэння пытання аб прыняцці іскавай заявы (захаванне дасудовага парадку вырашэння справы і да т.п.).

Акрамя таго, іскавая заява аб узбуджэнні справы можа ўключаць патрабаванні аб забеспячэнні іску, аб ажыццяўленні суддзёй дзеянняў, неабходных для падрыхтоўкі справы да судовага разбору, аб разглядзе справы ў адсутнасць істца, аб неадкладным выкананні рашэння і да т.п.

Калі прадстаўніком падаецца іскавая заява, да яе павінен быць прыкладзены дакумент, які сведчыць паўнамоцтвы прадстаўніка.

**Артыкул 244. Узбуджэнне справы**

Іскавую заяву аб узбуджэнні справы разглядае суддзя на працягу трох дзён пасля паступлення яе ў суд. Калі адсутнічаюць падставы для адмовы ва ўзбуджэнні справы (артыкулы 245 і 246 гэтага Кодэкса), суддзя ва ўказаны тэрмін, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам або іншымі законамі, выносіць вызначэнне аб узбуджэнні справы і аб падрыхтоўцы яе да судовага разбору.

**Артыкул 245. Адмова ва ўзбуджэнні справы ў сувязі з адсутнасцю права на зварот у суд**

Суддзя адмаўляе ва ўзбуджэнні справы ў сувязі з адсутнасцю ў заяўніка права на зварот у суд, калі:

1) іскавая заява не падлягае разгляду ў судах з прычыны яе непадведамнасці;

2) пасля смерці грамадзяніна, а таксама ў сувязі з ліквідацыяй юрыдычнай асобы, якая з'яўлялася адным з бакоў па справе, спрэчныя праваадносіны не дапускаюць правапераемнасці;

3) маецца рашэнне суда, якое ўступіла ў законную сілу, вынесена па спрэчцы паміж тымі самымі бакамі, аб тым самым прадмеце і па тых самых падставах, або вызначэнне суда аб спыненні вядзення справы ў сувязі з адмовай істца ад іску або зацвярджэннем міравога пагаднення бакоў;

4) іскавая заява аб узбуджэнні справы пададзена зацікаўленай асобай, якая заключыла з адказчыкам дагавор аб перадачы гэтай спрэчкі на вырашэнне трацейскага суда;

5) маецца рашэнне трацейскага суда, якое ўступіла ў законную сілу, прынята па спрэчцы паміж тымі самымі бакамі, аб тым самым прадмеце і па тых самых падставах, за выключэннем выпадкаў, калі маецца вызначэнне суда, якое ўступіла ў законную сілу, аб адмове ў выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда або аб адмене рашэння трацейскага суда.

**Артыкул 246. Адмова ва ўзбуджэнні справы ў сувязі з наяўнасцю да гэтага перашкод**

Суддзя адмаўляе ва ўзбуджэнні справы ў сувязі з наяўнасцю да гэтага перашкод, калі:

1) справа непадсудная гэтаму суду;

2) істцом не захаваны ўстаноўлены для гэтай катэгорыі спраў парадак папярэдняга пазасудовага вырашэння справы;

3) справа па спрэчцы паміж тымі самымі бакамі, аб тым самым прадмеце і па тых самых падставах знаходзіцца на разглядзе ў тым самым або іншым судзе;

4) іскавая заява пададзена недзеяздольнай асобай;

5) іскавая заява ад імя зацікаўленай асобы пададзена асобай, якая не мае паўнамоцтваў на яе падпісанне або прад'яўленне;

6) іскавая заява ў інтарэсах дзеяздольнага грамадзяніна або юрыдычнай асобы недзяржаўнай формы ўласнасці пададзена дзяржаўнымі органамі, іншымі юрыдычнымі асобамі або грамадзянамі без згоды гэтага грамадзяніна або юрыдычнай асобы;

7) выключаны;

8) заява аб узбуджэнні спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, і спраў асаблівага вядзення звязана са спрэчкай аб праве, падведамным суду.

**Артыкул 247. Наступствы адмовы ва ўзбуджэнні справы**

Суддзя, адмаўляючы ва ўзбуджэнні справы, выносіць вызначэнне аб гэтым і вяртае іскавую заяву разам з прыкладзенымі да яе дакументамі і копіяй вызначэння пасля сканчэння тэрміну на яе абскарджанне (апратэставанне). У вызначэнні павінна быць указана, у які орган або суд трэба звярнуцца істцу, калі справа непадведамная суду або непадсудная гэтаму суду, або як устараніць акалічнасці, якія перашкаджаюць узбуджэнню справы.

У выпадках, прадугледжаных артыкулам 245 гэтага Кодэкса, паўторны зварот у суд не дапускаецца. Адмова суддзі ва ўзбуджэнні справы па падставах, пералічаных у артыкуле 246 гэтага Кодэкса, не перашкаджае паўторнаму звароту ў суд з заявай па той самай справе, калі будзе ўстаранёна адпаведная перашкода.

На вызначэнне суддзі аб адмове ва ўзбуджэнні справы можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст, які разам з вызначэннем, заявай і іншымі матэрыяламі накіроўваецца ў суд апеляцыйнай інстанцыі.

**Артыкул 248. Пакіданне іскавай заявы без руху**

Суддзя, устанавіўшы, што ў іскавай заяве аб узбуджэнні справы маюцца недахопы, выкладзеныя ў артыкуле 111 гэтага Кодэкса, выносіць вызначэнне аб пакіданні заявы без руху, аб чым паведамляе падаўцу дакумента і прадастаўляе яму тэрмін для выпраўлення недахопаў.

Іскавая заява, выпраўленая ў адпаведнасці з указаннямі суддзі, лічыцца пададзенай у дзень яе першапачатковага прадстаўлення ў суд. Тэрмін разгляду справы ў гэтым выпадку вылічваецца з дня паступлення ў суд дакументаў, якія пацвярджаюць выпраўленне недахопаў. У адваротным выпадку іскавая заява лічыцца непададзенай і вяртаецца істцу.

На вызначэнне суддзі аб пакіданні іскавай заявы без руху можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

### Артыкул 249. Адмова ад пададзенай іскавай заявы аб узбуджэнні справы

Ісцец можа адмовіцца ад пададзенай іскавай заявы да ўзбуджэння справы суддзёй.

Адмова ад іскавай заявы, пададзенай на падставе гэтага Кодэкса і іншых заканадаўчых актаў, у абарону правоў іншай асобы не пазбаўляе апошнюю права патрабаваць разгляду справы па сутнасці.

На падставе хадайніцтва аб адмове ад пададзенай іскавай заявы суддзя вяртае заяўніку пададзеныя ім працэсуальныя дакументы.

### Артыкул 250. Злучэнне і раз'яднанне некалькіх іскавых патрабаванняў

Ісцец мае права злучыць у адной іскавай заяве некалькі ўзаемазвязаных патрабаванняў, акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

У адной іскавай заяве могуць быць аб'яднаны патрабаванні некалькіх асоб, якія звярнуліся ў суд, а таксама патрабаванні, накіраваныя да некалькіх адказчыкаў.

Аб'яднанне некалькіх іскавых патрабаванняў для іх сумеснага разгляду ў адным іскавым вядзенні можа быць праведзена таксама суддзёй, калі такое аб'яднанне неабходнае для больш хуткага і правільнага разгляду спрэчак.

Дапускаецца аб'яднанне толькі такіх іскавых патрабаванняў, якія адносяцца да аднаго віду вядзення.

Суддзя мае права вылучыць з аб'яднаных іскавых патрабаванняў адно або некалькі ў асобнае вядзенне, калі прызнае неабходным асобны разгляд іскавых патрабаванняў, а ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках абавязаны ажыццявіць гэта працэсуальнае дзеянне.

Пры злучэнні іскавых патрабаванняў, для разгляду якіх устаноўлены скарочаныя і агульныя тэрміны, прымяняюцца агульныя тэрміны.

Пры злучэнні некалькіх іскавых патрабаванняў для іх сумеснага разгляду ў адным іскавым вядзенні тэрмін разгляду справы, прадугледжаны гэтым Кодэксам, вылічваецца з дня паступлення ў суд апошняй іскавай заявы.

### Артыкул 251. Абарона супраць іску

Адказчыку належыць права на абарону супраць іску. Сродкамі абароны з'яўляюцца пярэчанні супраць іску і сустрэчны іск.

### Артыкул 252. Пярэчанні супраць іску

Пасля атрымання копіі іскавай заявы адказчык мае права прадставіць суду пісьмовыя пярэчанні супраць іску.

Па складаных справах, а таксама па справах, звязаных са значным аб'ёмам разлікаў, суддзя можа абавязаць адказчыка прадставіць да пачатку судовага разбору пісьмовыя пярэчанні супраць іску.

Калі гэта неабходна для складання пярэчанняў, адказчык мае права запатрабаваць копіі далучаных да іскавай заявы дакументаў.

Адказчык мае права пярэчыць супраць іску, спасылаючыся на:

1) незаконнасць патрабаванняў істца;

2) неабгрунтаванасць гэтых патрабаванняў;

3) адсутнасць у істца права на зварот у суд або наяўнасць перашкод да ўзбуджэння справы (артыкулы 245 і 246 гэтага Кодэкса).

### Артыкул 253. Прад'яўленне сустрэчнага іску

Адказчык мае права да вынясення суддзёй рашэння прад'явіць да істца сустрэчны іск для сумеснага разгляду з першапачатковым, акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Сумесны разгляд сустрэчнага іску з першапачатковым з’яўляецца абавязковым, калі:

1) сустрэчны іск накіраваны ў залік першапачатковага;

2) задавальненне сустрэчнага іску выключае поўнасцю або ў частцы задавальненне першапачатковага;

3) паміж сустрэчным і першапачатковым іскамі маецца ўзаемная сувязь і іх сумесны разгляд вядзе да больш хуткага і правільнага разгляду спрэчак.

Прад’яўленне сустрэчнага іску праводзіцца па агульных правілах.

## ГЛАВА 25
## ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ІСКУ

### Артыкул 254. Падставы забеспячэння іску

Суд па заяве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або па сваёй ініцыятыве можа прыняць меры да забеспячэння іску. Меры па забеспячэнні іску прымяняюцца толькі судом першай інстанцыі і дапускаюцца ва ўсякім стане справы, калі непрыняцце мер забеспячэння можа абцяжарыць або зрабіць немагчымым выкананне рашэння суда.

### Артыкул 255. Меры па забеспячэнні іску

Мерамі па забеспячэнні іску могуць быць:

1) накладанне арышту на маёмасць, у тым ліку на грашовыя сродкі ў межах цаны іску, якія належаць адказчыку і знаходзяцца ў яго або ў іншых асоб;

2) забарона адказчыку ажыццяўляць пэўныя дзеянні;

3) забарона іншым асобам перадаваць маёмасць адказчыку або выконваць у дачыненні да яе іншыя абавязацельствы;

4) прыпыненне рэалізацыі маёмасці ў выпадку прад’яўлення іску аб вызваленні яе ад арышту;

5) прыпыненне спагнання па выканаўчым дакуменце, які аспрэчваецца даўжніком у судовым парадку;

6) часовае абмежаванне права адказчыка на выезд з Рэспублікі Беларусь – на тэрмін, устаноўлены судом, але не больш чым да заканчэння вядзення справы.

Суд можа дапусціць адначасова некалькі мер забеспячэння іску з тым, каб агульная сума забеспячэння не перавышала цаны іску.

Ісцец мае права патрабаваць з асоб, якія парушылі патрабаванні, указаныя ў пунктах 2 і 3 часткі першай гэтага артыкула, пакрыццё страт, прычыненых невыкананнем вызначэння аб забеспячэнні іску.

### Артыкул 256. Вырашэнне пытання аб забеспячэнні іску

Пытанне аб забеспячэнні іску вырашаецца судом, які разглядае справу, без апавяшчэння адказчыка і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб. Заява аб забеспячэнні іску разглядаецца ў дзень паступлення, а ў выпадку, калі заява аб забеспячэнні іску ўтрымліваецца ў заяве аб узбуджэнні справы, – у дзень вынясення вызначэння аб узбуджэнні справы. Вызначэнне суда аб забеспячэнні іску прыводзіцца ў выкананне неадкладна ў парадку, устаноўленым раздзелам IX гэтага Кодэкса.

### Артыкул 257. Замена адной меры забеспячэння іску іншай і адмена забеспячэння іску

Забеспячэнне іску можа быць зменена або адменена судом. Дапускаецца замена адной меры забеспячэння іску іншай.

Пытанне аб змяненні або адмене забеспячэння іску, а таксама аб замене адной меры забеспячэння іску іншай вырашаецца з апавяшчэннем юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, аднак іх няяўка не перашкаджае разгляду гэтых пытанняў.

У выпадку адмовы ў іску меры забеспячэння іску захоўваюцца да ўступлення рашэння ў законную сілу. Аднак суд можа адначасова з рашэннем або пасля яго пастановы вынесці вызначэнне аб адмене забеспячэння іску.

Пры забеспячэнні іску аб спагнанні грашовай сумы адказчык мае права замест дапушчаных мер забеспячэння іску ўнесці на дэпазітны рахунак суда суму, якая выпатрабуецца істцом.

**Артыкул 258. Пакрыццё адказчыку страт, прычыненых забеспячэннем іску**

Суд, дапускаючы забеспячэнне іску, можа запатрабаваць ад істца прадастаўлення забеспячэння магчымых для адказчыка страт.

Адказчык пасля ўступлення ў законную сілу рашэння, якім у іску адмоўлена, мае права патрабаваць ад істца пакрыцця страт, прычыненых яму мерамі па забеспячэнні іску, прынятымі па просьбе істца.

**Артыкул 259. Абскарджанне вызначэнняў па пытаннях забеспячэння іску**

На вызначэнне суда па пытаннях забеспячэння іску можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

Калі вызначэнне аб забеспячэнні іску было вынесена без апавяшчэння асобы, якая падала скаргу, тэрмін для падачы скаргі вылічваецца з дня, калі ёй стала вядома аб гэтым.

Падача прыватнай скаргі або прыватнага пратэсту на вызначэнне аб забеспячэнні іску не прыпыняе выканання гэтага вызначэння.

Падача прыватнай скаргі або прыватнага пратэсту на вызначэнне аб змяненні або адмене забеспячэння іску, а таксама аб замене адной меры забеспячэння іску іншай прыпыняе выкананне гэтага вызначэння.

## ГЛАВА 26
## ПАДРЫХТОЎКА СПРАВЫ ДА СУДОВАГА РАЗБОРУ

**Артыкул 260. Вызначэнне аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору**

Калі вызначэнне аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору не было вынесена адначасова з вызначэннем аб узбуджэнні справы, суддзя выносіць яго ў якасці асобнага дакумента. Такое вызначэнне выносіцца суддзёй без апавяшчэння юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

Суддзя выносіць вызначэнне аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору таксама перад разглядам справы пасля адмены раней вынесенай судовай пастановы.

**Артыкул 260$^1$. Дзеянні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору**

Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору існец, трэцяя асоба на баку істца або іх прадстаўнікі:

1) прадстаўляюць суду ў пацвярджэнне сваіх патрабаванняў доказы;

2) перадаюць адказчыку копіі пісьмовых доказаў, якія абгрунтоўваюць фактычныя падставы іску;

3) заяўляюць хадайніцтвы аб выпатрабаванні доказаў, якія яны не могуць атрымаць самастойна без дапамогі суда.

Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору адказчык, трэцяя асоба на баку адказчыка або іх прадстаўнікі:

1) удакладняюць іскавыя патрабаванні і фактычныя падставы гэтых патрабаванняў;

2) прадстаўляюць суду пярэчанні ў пісьмовай форме адносна іскавых патрабаванняў і доказы, якія абгрунтоўваюць пярэчанні супраць іску;

3) перадаюць істцу, трэцяй асобе на баку істца або іх прадстаўнікам копіі пярэчанняў супраць іску і доказаў, якія абгрунтоўваюць гэтыя пярэчанні;

4) заяўляюць хадайніцтвы аб выпатрабаванні доказаў, якія яны не могуць атрымаць самастойна без дапамогі суда.

**Артыкул 261. Задачы па падрыхтоўцы справы да судовага разбору**

Да задач па падрыхтоўцы справы да судовага разбору адносяцца:

1) удакладненне прадмета даказвання;

2) вызначэнне нормаў права, якія падлягаюць прымяненню пры вырашэнні справы;

3) вызначэнне складу юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб і ўдакладненне іх пазіцый;

4) вызначэнне складу юрыдычна не зацікаўленых у зыходзе справы асоб;

5) забеспячэнне атрымання неабходных доказаў;

6) прыняцце мер да прымірэння бакоў, у тым ліку з удзелам медыятара (медыятараў).

Для рэалізацыі названых задач суддзя выконвае дзеянні, указаныя ў артыкуле 262 гэтага Кодэкса, а таксама ажыццяўляе іншыя неабходныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

**Артыкул 262. Дзеянні суддзі пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору**

Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору з мэтай забеспячэння своечасовага і правільнага вырашэння справы суддзя ажыццяўляе наступныя дзеянні:

1) апытвае істца або яго прадстаўніка аб змесце іскавых патрабаванняў, прадмеце даказвання, доказах, якія ісцец можа прадставіць, а таксама высвятляе ў іх магчымыя пярэчанні адказчыка;

2) апытвае адказчыка або яго прадстаўніка па акалічнасцях справы, высвятляе наяўныя ў іх пярэчанні супраць іску і доказы, якімі яны могуць быць пацверджаны;

3) растлумачвае бакам іх працэсуальныя правы і абавязкі, у тым ліку права на добраахвотнае ўрэгуляванне спрэчкі шляхам заключэння міравога пагаднення або прымянення медыяцыі, якую бакі маюць права праводзіць на любой стадыі судовага разбору, або на зварот па вырашэнне спрэчкі ў трацейскі суд, а таксама наступствы такіх дзеянняў;

$3^1$) вырашае пытанне аб перадачы спрэчкі для ўрэгулявання бакамі з удзелам медыятара (медыятараў);

4) прыцягвае да справы або дазваляе ўступіць у яе суістцам, суадказчыкам, трэцім асобам; апытвае іх, калі гэта неабходна;

5) прымае меры да замены неналежнага боку або боку, які выбыў са справы;

6) забяспечвае ўдзел у справе юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб;

7) у выпадку неабходнасці прапаноўвае істцу і адказчыку прадставіць дадатковыя доказы і растлумачвае ім, што непрадстаўленне доказаў ва ўстаноўлены суддзёй тэрмін не перашкаджае разгляду справы па наяўных у справе доказах;

8) па складаных справах абавязвае адказчыка прадставіць пісьмовыя тлумачэнні па справе;

9) вырашае пытанне аб выкліку сведак у судовае пасяджэнне або пастанаўляе дапытаць іх у месцы знаходжання. Пры вырашэнні пытання аб выкліку ў судовае пасяджэнне непаўналетняга сведкі таксама вырашае пытанне аб выкліку ў судовае

пасяджэнне педагагічнага работніка з вышэйшай адукацыяй, бацькоў або іншых законных прадстаўнікоў гэтага непаўналетняга;

$9^1$) вырашае пытанне аб прымяненні сістэм відэаканферэнцсувязі;

10) па хадайніцтве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб садзейнічае ў выпатрабаванні ад грамадзян і юрыдычных асоб доказаў, калі прадстаўленне такіх доказаў для юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб немагчымае;

11) у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, выпатрабуе пісьмовыя і рэчавыя доказы;

12) вырашае пытанне аб правядзенні экспертызы, а таксама аб выкліку спецыяліста, перакладчыка;

13) накіроўвае грамадзян на асведчанне ў арганізацыі аховы здароўя;

14) у выпадку неабходнасці праводзіць агляд доказаў на месцы;

15) накіроўвае іншым судам судовыя даручэнні;

16) у неабходных выпадках вырашае пытанне аб правядзенні папярэдняга судовага пасяджэння, пра яго час і месца шляхам вынясення вызначэння;

17) накіроўвае або ўручае адказчыку копію іскавай заявы, у неабходных выпадках – і копіі дакументаў, якія прыкладаюцца да іскавай заявы, а таксама прапаноўвае прадставіць ва ўстаноўлены ім тэрмін доказы для абгрунтавання сваіх пярэчанняў;

18) паведамляе адказчыку аб прад'яўленні да яго іску без накіравання копій іскавай заявы і дакументаў, якія прыкладаюцца да яе, калі яны ўтрымліваюць звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты. Азнаямленне з такімі іскавай заявай і дакументамі, якія прыкладаюцца да яе, выпіскі з іх ажыццяўляюцца з выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах;

19) ажыццяўляе іншыя неабходныя працэсуальныя дзеянні.

**Артыкул 263. Мэта папярэдняга судовага пасяджэння**

Папярэдняе судовае пасяджэнне мае на сваёй мэце працэсуальнае замацаванне распарадчых дзеянняў бакоў, ажыццёўленых пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору, вызначэнне акалічнасцей, якія маюць значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы, вызначэнне дастатковасці доказаў па справе, даследаванне фактаў пропуску тэрміну звароту ў суд або тэрміну іскавай даўнасці, прымірэнне бакоў.

**Артыкул 264. Папярэдняе судовае пасяджэнне**

Папярэдняе судовае пасяджэнне праводзіцца суддзёй па правілах судовага разбору, за выключэннямі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

Бакам і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам паведамляецца пра час і месца папярэдняга судовага пасяджэння.

Бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы ў папярэднім судовым пасяджэнні маюць правы, прадугледжаныя артыкулам 56 гэтага Кодэкса.

Пры наяўнасці акалічнасцей, прадугледжаных артыкуламі 160, 164, часткай першай артыкула 165 гэтага Кодэкса, вядзенне справы ў папярэднім судовым пасяджэнні прыпыняецца або спыняецца або заява застаецца без разгляду. Вядзенне справы ў папярэднім судовым пасяджэнні можа быць прыпынена пры наяўнасці акалічнасцей, прадугледжаных артыкулам 161 гэтага Кодэкса.

Аб прыпыненні або спыненні вядзення справы або аб пакіданні заявы без разгляду выносіцца вызначэнне суда. На вызначэнне суда можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

У папярэднім судовым пасяджэнні могуць разглядацца заявы бакоў аб прымяненні тэрміну звароту ў суд або тэрміну іскавай даўнасці ў дачыненні да патрабаванняў істца аб абароне парушанага права.

Пры ўстанаўленні факта пропуску без уважлівых прычын тэрміну звароту ў суд або тэрміну іскавай даўнасці суддзя прымае рашэнне аб адмове ў іску без даследавання іншых фактычных акалічнасцей па справе. Рашэнне суда можа быць абскарджана і апратэставана ў апеляцыйным парадку.

Пры падрыхтаванасці справы да судовага разбору са згоды бакоў суддзя выносіць вызначэнне аб судовым разборы справы і разглядае справу па сутнасці. У гэтым выпадку падрыхтоўчая частка судовага разбору не праводзіцца.

Ход папярэдняга судовага пасяджэння фіксуецца па правілах, устаноўленых артыкулам 113 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 265. Прызначэнне справы да судовага разбору**

Суддзя, прызнаўшы справу падрыхтаванай, выносіць вызначэнне аб прызначэнні яе да судовага разбору, паведамляе бакам і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам пра час і месца разгляду справы.

## ГЛАВА 27
## СУДОВЫ РАЗБОР

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 266. Мэта судовага разбору**

Судовы разбор па справе праводзіцца з мэтай забеспячэння вынясення законнага і абгрунтаванага рашэння або іншай судовай пастановы.

Для дасягнення мэты ў ходзе судовага разбору неабходна канчаткова:

1) вызначыць склад і пазіцыі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб;

2) устанавіць прадмет даказвання, а таксама атрымаць, даследаваць і правільна ацаніць усе неабходныя доказы;

3) правільна выбраць і скарыстаць адпаведную норму права.

**Артыкул 267. Судовае пасяджэнне**

Разбор грамадзянскай справы адбываецца ў адкрытым судовым пасяджэнні. Пра час і месца правядзення судовага пасяджэння паведамляецца бакам і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам.

Справы аб скасаванні шлюбу з асобамі, прызнанымі ва ўстаноўленым парадку адсутнымі без вестак, недзеяздольнымі, разглядаюцца без выкліку адказчыка ў суд.

Асобы, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы, маюць права хадайнічаць аб разглядзе справы ў іх адсутнасць.

У прадугледжаных гэтым Кодэксам выпадках разбор справы або яе часткі можа быць праведзены ў закрытым судовым пасяджэнні.

З мэтай абароны звестак, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты або іншую ахаваную законам тайну і ўтрымліваюцца ў матэрыялах справы, суд папярэджвае асоб, якія ўдзельнічаюць у закрытым судовым пасяджэнні, аб адказнасці за разгалошванне такіх звестак, аб чым у іх бярэцца падпіска.

У выпадку неабходнасці выкарыстання ў ходзе судовага пасяджэння сродкаў гука- або відэазапісу, сістэм відэаканферэнцсувязі і іншых тэхнічных сродкаў суд папярэджвае аб гэтым асоб, якія ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні.

**Артыкул 268. Час і месца правядзення судовага пасяджэння**

Час і месца правядзення судовага пасяджэння прызначае суддзя ў межах тэрміну на разгляд справы.

Справа разглядаецца ў памяшканні суда. Правядзенне судовага пасяджэння або яго часткі па-за будынкам адпаведнага суда дапускаецца ў выпадках, калі гэта неабходна для павышэння выхаваўчага ўздзеяння судовага разбору, істотнага зніжэння судовых выдаткаў, дасягнення іншай працэсуальнай эканоміі, а таксама калі ажыццяўленне працэсуальнага дзеяння звязана з пэўным месцам.

**Артыкул 269. Прынцыпы судовага разбору**

Кожная справа павінна быць разгледжана бесстароннім судом у адным і тым жа складзе пры строгім захаванні прынцыпаў непасрэднасці, вуснасці і бесперапыннасці судовага разбору.

Суд непасрэдна заслухоўвае тлумачэнні бакоў, іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, паказанні сведак, тлумачэнні спецыялістаў, заключэнні экспертаў, аглядае рэчавыя доказы, абвяшчае пісьмовыя доказы і пратаколы і даследуе іншыя доказы. Суд забяспечвае роўныя магчымасці юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам для непасрэднага ўдзелу ў даследаванні доказаў.

Судовае пасяджэнне па справе адбываецца бесперапынна, акрамя перапынкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 270. Старшынствуючы ў судовым пасяджэнні**

Суддзя, які разглядае справу асабіста, выконвае абавязкі старшынствуючага.

Старшынствуючы забяспечвае рэалізацыю мэт судовага разбору, падтрымлівае парадак у зале, каардынуе дзейнасць усіх удзельнікаў грамадзянскага судаводства і ўстараняе з судовага разбору ўсё, што не мае дачынення да разглядаемай справы.

У выпадку пярэчанняў каго-небудзь з удзельнікаў грамадзянскага судаводства супраць дзеянняў старшынствуючага гэтыя пярэчанні заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння ў выпадку, калі ён складаецца.

**Артыкул 271. Парадак у судовым пасяджэнні**

Пры ўваходзе суда ў залу судовага пасяджэння ўсе прысутныя ўстаюць. Удзельнікі грамадзянскага судаводства звяртаюцца да суда са словамі «Высокі суд», даюць тлумачэнні, паказанні і робяць заявы стоячы. Адступленне ад апошняга правіла дапускаецца толькі з дазволу старшынствуючага.

Удзельнікі грамадзянскага судаводства, а таксама ўсе грамадзяне, якія знаходзяцца ў зале судовага пасяджэння, абавязаны захоўваць у судовым пасяджэнні ўстаноўлены парадак і безадгаворачна падпарадкоўвацца адпаведным распараджэнням старшынствуючага.

Грамадзяне ва ўзросце да шаснаццаці гадоў у залу судовага пасяджэння не дапускаюцца, за выключэннем выпадкаў, калі яны асабіста звярнуліся ў суд з заявай аб абароне сваіх правоў і ахаваных законам інтарэсаў або выкліканы судом ці калі іх прысутнасць суд прызнае неабходнай.

Удзельнікі грамадзянскага судаводства, якія прысутнічаюць на адкрытым судовым пасяджэнні, маюць права фіксаваць пісьмова або з выкарыстаннем магнітафоннага запісу ход судовага разбору справы з месцаў, займаных імі ў зале пасяджэння. Кіна- і фотаздымка, відэазапіс, прамая радыё- і тэлетрансляцыя дапускаюцца з дазволу суда і з улікам меркавання юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Гэтыя дзеянні не павінны перашкаджаць нармальнаму ходу судовага разбору справы і могуць быць абмежаваны ў часе.

### Артыкул 272. Меры, якія прымаюцца ў дачыненні да парушальнікаў парадку ў судовым пасяджэнні

Асобе, якая парушае парадак падчас судовага пасяджэння, старшынствуючы ад імя суда робіць папярэджанне.

Пры паўторным парушэнні парадку ў судовым пасяджэнні ўдзельнікі грамадзянскага судаводства (акрамя пракурора) могуць быць выдалены з залы судовага пасяджэння па вызначэнні суда, а грамадзяне, якія прысутнічаюць пры разборы справы, – па распараджэнні старшынствуючага.

Пры парушэнні парадку ў судовым пасяджэнні юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі суд можа таксама адкласці разбор справы.

У выпадку выдалення з залы пасяджэння юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб не на ўвесь час судовага разбору старшынствуючы знаёміць асобу, зноў дапушчаную ў залу судовага пасяджэння, з працэсуальнымі дзеяннямі, ажыццёўленымі ў яе адсутнасць.

Пры парушэнні парадку ў судовым пасяджэнні пракурорам або адвакатам суд таксама мае права адкласці справу і паведаміць аб гэтым адпаведна вышэйстаячаму пракурору, савету тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў.

Акрамя таго, праяўленне непавагі да суда ўдзельнікамі грамадзянскага судаводства (акрамя пракурора і адваката) і грамадзянамі, прысутнымі ў судовым пасяджэнні, якое выявілася ў непадпарадкаванні распараджэнню старшынствуючага, парушэнне імі парадку падчас судовага пасяджэння, а таксама ажыццяўленне кім бы то ні было дзеянняў, якія сведчаць аб відавочнай пагардзе да суда або ўстаноўленых у судзе правіл, цягнуць прымяненне мер, прадугледжаных Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 273. Межы судовага разбору

Суд разглядае справу толькі ў межах заяўленага іскавага патрабавання. У адпаведных выпадках суддзя абавязаны растлумачыць істцу яго права заявіць дадатковыя патрабаванні. Аднак праводзіць па ўласнай ініцыятыве судовы разбор у дачыненні да незаяўленага патрабавання суд можа толькі ў выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

## § 2. Падрыхтоўчая частка судовага разбору

### Артыкул 274. Адкрыццё судовага пасяджэння

У прызначаны для разгляду справы час старшынствуючы адкрывае судовае пасяджэнне і аб’яўляе, якая справа падлягае разгляду.

### Артыкул 275. Праверка яўкі і ўстанаўленне асобы ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства

Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) дакладвае суду, хто з выкліканых па гэтай справе з’явіўся, ці ўручаны паведамленні і павесткі асобам, што не з’явіліся, і якія ёсць звесткі аб прычынах іх няяўкі.

Старшынствуючы ўстанаўлівае асобу тых, якія з’явіліся, правярае дакументы, што сведчаць іх асобу, паўнамоцтвы кіраўнікоў юрыдычных асоб і іх прадстаўнікоў.

### Артыкул 276. Праверка своечасовасці ўручэння адказчыку копіі іскавай заявы

Пасля ўстанаўлення асобы адказчыка старшынствуючы пытаецца, ці ўручана яму і калі іменна копія іскавай заявы, а ў адпаведных выпадках – і копіі дакументаў, якія прыкладаюцца да гэтай заявы.

У выпадках, калі адказчыку згаданыя копіі ўручаны не былі, разбор справы адкладваецца. Разгляд справы ў гэтым пасяджэнні можа быць працягнуты толькі са згоды адказчыка.

### Артыкул 277. Растлумачэнне перакладчыку яго абавязкаў

Старшынствуючы растлумачвае перакладчыку яго абавязак перакладаць тлумачэнні, паказанні, заявы асоб, якія не валодаюць мовай, на якой вядзецца судаводства, а гэтым асобам – змест тлумачэнняў, паказанняў, заяў удзельнікаў грамадзянскага судаводства і сведак, дакументаў, гуказапісаў, заключэнняў экспертаў, тлумачэнняў спецыялістаў, якія ёсць у справе і якія абвяшчаюцца, а таксама распараджэнняў старшынствуючага, судовых пастаноў.

Перакладчык папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за заведама няправільны пераклад, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў. Падпіска перакладчыка аб гэтым далучаецца да сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння.

### Артыкул 278. Выхад сведак з залы пасяджэння суда

Сведкі, якія з’явіліся, выходзяць з залы судовага пасяджэння пасля ўстанаўлення іх асобы.

Старшынствуючы прымае меры да таго, каб дапытаныя сведкі не мелі зносін з недапытанымі сведкамі.

### Артыкул 279. Аб’яўленне складу суда, іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства і растлумачэнне права адводу

Старшынствуючы аб’яўляе склад суда, затым паведамляе, хто ўдзельнічае ў якасці пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), і растлумачвае юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам іх права заяўляць адводы.

Заяўленыя адводы вырашаюцца паводле правіл, устаноўленых артыкулам 35 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 280. Растлумачэнне юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, эксперту і спецыялісту іх правоў і абавязкаў

Старшынствуючы растлумачвае бакам іх права заключыць міравое пагадненне, прымяніць медыяцыю або звярнуцца па вырашэнне спрэчкі ў трацейскі суд і наступствы такіх дзеянняў.

Затым старшынствуючы растлумачвае юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам іх працэсуальныя правы і абавязкі, а таксама пытаецца, ці маюцца ў іх хадайніцтвы. Асоба, якая заявіла хадайніцтва, абавязана ўказаць, для ўстанаўлення якіх іменна фактаў неабходны дадатковыя доказы або для вырашэння якіх пытанняў заяўлена хадайніцтва.

Эксперту і спецыялісту растлумачваюцца правы і абавязкі ў працэсе. Эксперт папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама непраўдзівага заключэння эксперта, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў.

### Артыкул 281. Вырашэнне заяўленых хадайніцтваў

Суд выслухоўвае па заяўленых хадайніцтвах меркаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб і выносіць вызначэнні.

Асоба, якой адмоўлена ў задавальненні хадайніцтва, мае права заявіць яго зноў да самага вынясення судом рашэння.

Хадайніцтва аб павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў павінна быць аформлена ў выглядзе працэсуальнага дакумента ў адпаведнасці з артыкуламі 108–110 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 282. Наступствы няяўкі ў судовае пасяджэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, сведкі, эксперта, спецыяліста або перакладчыка**

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы абавязаны паведаміць суду аб прычынах няяўкі і прадставіць доказы паважлівасці гэтых прычын.

У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне каго-небудзь з юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, у дачыненні да якіх адсутнічаюць звесткі аб іх апавяшчэнні, разбор справы адкладваецца.

Калі юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам належным чынам паведамлена пра час і месца судовага пасяджэння, суд адкладвае разбор справы ў выпадку прызнання прычын іх няяўкі ўважлівымі.

Суд мае права разгледзець справу ў выпадку няяўкі каго-небудзь з юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якім належным чынам паведамлена пра час і месца судовага пасяджэння, калі прызнае прычыны іх няяўкі няўважлівымі.

Бакі маюць права прасіць суд аб разглядзе справы ў іх адсутнасць.

Суд мае права разгледзець справу ў адсутнасць адказчыка (адказчыкаў) у парадку завочнага вядзення па правілах, устаноўленых главой $28^1$ гэтага Кодэкса.

Калі ісцец, якому належным чынам паведамлена пра час і месца судовага пасяджэння, не з'явіўся без уважлівых прычын па выкліку суда або не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і няма яго пісьмовай заявы аб разборы справы ў яго адсутнасць, а адказчык не патрабуе разбору справы па сутнасці, суд пакідае заяву без разгляду. Па справе аб скасаванні шлюбу іск пакідаецца без разгляду ў выпадку няяўкі без уважлівых прычын істца, якому належным чынам паведамлена пра час і месца судовага пасяджэння, або калі ён не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і ад яго не паступіла просьбы аб разборы справы ў яго адсутнасць.

У выпадку няяўкі перакладчыка ў суд разгляд справы ва ўсіх выпадках адкладваецца.

У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне сведак, экспертаў або спецыялістаў суд выслухоўвае меркаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб аб магчымасці разгляду справы ў іх адсутнасць і выносіць вызначэнне аб працягу судовага разбору або аб адкладанні разбору справы.

Аб няяўцы пракурора без уважлівых прычын суд паведамляе вышэйстаячаму пракурору.

**Артыкул 283. Допыт сведак, эксперта або спецыяліста пры адкладанні разбору справы**

Пры адкладанні разбору справы суд можа дапытаць сведак, эксперта, спецыяліста, якія з'явіліся, калі ў судовым пасяджэнні прысутнічаюць абодва бакі.

Калі пасля адкладання разбору справа разглядаецца тым самым суддзёй, паўторны выклік гэтых асоб праводзіцца толькі ў выпадку неабходнасці.

## § 3. Разгляд справы па сутнасці

**Артыкул 284. Даклад старшынствуючага**

Разгляд справы па сутнасці пачынаецца сціслым дакладам старшынствуючага. У дакладзе называюцца ісцец і адказчык, выкладаюцца сутнасць заяўленых патрабаванняў, факты, на якіх заснаваны патрабаванні, указваюцца пярэчанні, калі яны вядомы, сутнасць патрабаванняў па заяўленым сустрэчным іску.

### Артыкул 285. Адмова ад іску, прызнанне іску, міравое пагадненне бакоў, правядзенне медыяцыі

Пасля даклада справы старшынствуючы высвятляе, ці падтрымлівае істец свае патрабаванні і ў якім аб’ёме, ці прызнае адказчык патрабаванні істца і ці не жадаюць бакі заключыць міравое пагадненне або правесці медыяцыю.

Заява істца аб адмове ад іску, прызнанне іску адказчыкам або ўмовы міравога пагаднення бакоў, заява бакоў аб заключэнні пагаднення аб прымяненні медыяцыі заносяцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння і падпісваюцца адпаведна істцом, адказчыкам або бакамі, а таксама іх прадстаўнікамі, калі яны ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні.

У выпадку заключэння бакамі пагаднення аб прымяненні медыяцыі суд устанаўлівае тэрмін правядзення медыяцыі.

Кіруючыся часткай чацвёртай артыкула 61 гэтага Кодэкса, суд вырашае пытанне аб прыняцці адмовы істца ад іску, прызнанні іску адказчыкам або зацвярджэнні міравога пагаднення і растлумачвае бакам наступствы гэтых распарадчых дзеянняў.

Калі суд не знойдзе магчымым прыняць адмову істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам або зацвердзіць міравое пагадненне бакоў, ён выносіць аб гэтым вызначэнне і пераходзіць да разгляду справы па сутнасці.

Нягледзячы на прызнанне іску адказчыкам, любая юрыдычна зацікаўленая ў зыходзе справы асоба мае права запатрабаваць правядзення даследавання доказаў. Даследаванне доказаў можа быць праведзена таксама па ініцыятыве суда.

Прыняцце судом прызнання іску адказчыкам з’яўляецца падставай для вынясення рашэння аб яго задавальненні.

### Артыкул 285$^{1}$. Наступствы заключэння бакамі медыяцыйнага пагаднення па спрэчцы, якая знаходзіцца на вырашэнні суда

У выпадку заключэння бакамі медыяцыйнага пагаднення і паступлення ў сувязі з гэтым у суд заявы аб зацвярджэнні міравога пагаднення, адмове істца ад іску, прызнанні іску адказчыкам суд аднаўляе вядзенне справы, прыпыненае ў адпаведнасці з пунктам 4$^{1}$ часткі першай артыкула 160 гэтага Кодэкса, і разглядае заяву, якая паступіла, аб зацвярджэнні міравога пагаднення, адмове істца ад іску, прызнанні іску адказчыкам.

### Артыкул 286. Тлумачэнні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Суд распачынае высвятленне пазіцый бакоў і трэціх асоб. З гэтай мэтай суд заслухоўвае тлумачэнні істца і трэцяй асобы, якая ўдзельнічае на яго баку, і адпаведна іх прадстаўнікоў, адказчыка і трэцяй асобы, якая ўдзельнічае на яго баку, і адпаведна іх прадстаўнікоў, іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб. Пракурор, а таксама дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія звярнуліся ад уласнага імені ў суд з заявай у абарону правоў і законных інтарэсаў іншых асоб, даюць тлумачэнні першымі. Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права задаваць адна адной пытанні.

У выпадку няяўкі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб у судовае пасяджэнне іх пісьмовыя тлумачэнні абвяшчаюцца старшынствуючым.

Пры неабходнасці ўдакладнення пазіцыі боку суд можа прызнаць яго яўку абавязковай.

У выпадку аднаўлення прыпыненага вядзення справы або працягу судовага разбору пасля аб’яўлення перапынку суд мае права прадаставіць юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам магчымасць пацвердзіць у новым судовым пасяджэнні дадзеныя раней тлумачэнні без іх паўторнага заслухоўвання, дапоўніць іх і задаць дадатковыя пытанні, калі юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы не заяўляюць аб паўторным заслухоўванні

ўсіх іх тлумачэнняў, знаёмыя з матэрыяламі справы, у тым ліку з тлумачэннямі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, дадзенымі раней, і склад суда не змяніўся.

**Артыкул 287. Устанаўленне парадку прадстаўлення і даследавання доказаў**

Старшынствуючы, заслухаўшы тлумачэнні бакоў і іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, устанаўлівае парадак допыту сведак, экспертаў і даследавання іншых доказаў.

Доказы прадстаўляюцца і даследуюцца па правілах раздзела V гэтага Кодэкса.

**Артыкул 288. Процідзеянне злоўжыванню правамі ў працэсе даказвання**

Старшынствуючы адхіляе хадайніцтвы аб даследаванні доказаў, калі яны не адносяцца да справы, з'яўляюцца недапушчальнымі або калі спрэчныя факты ўжо ўстаноўлены з дапамогай іншых доказаў, а бакі настойваюць на іх даследаванні толькі з мэтай зацягвання працэсу па справе.

**Артыкул 289. Заканчэнне судовага даследавання доказаў**

Пасля даследавання ўсіх доказаў старшынствуючы растлумачвае юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам іх права заявіць хадайніцтвы аб дапаўненні матэрыялаў справы. Пры адсутнасці такіх хадайніцтваў суддзя аб'яўляе даследаванне доказаў па справе закончаным і пераходзіць да заслухоўвання судовых спрэчак.

## § 4. Заключная частка судовага разбору

**Артыкул 290. Судовыя спрэчкі**

У судовых спрэчках бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы падводзяць вынікі даследавання фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне, доказаў, што іх пацвярджаюць, нормаў права, якія падлягаюць прымяненню, і даюць ім сваю ацэнку. Пры гэтым яны маюць права спасылацца на факты і доказы, разгледжаныя ў судовым пасяджэнні, і ўказваць на недаследаванасць, на іх думку, асобных фактаў і доказаў.

Спачатку выступаюць істец і яго прадстаўнік, затым – адказчык і яго прадстаўнік. Трэцяя асоба, якая заяўляе самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, і яе прадстаўнік выступаюць пасля бакоў па першапачатковым іску. Трэцяя асоба, якая не заяўляе самастойнага патрабавання, і яе прадстаўнік выступаюць пасля істца і яго прадстаўніка або адказчыка і яго прадстаўніка, на баку якога гэта трэцяя асоба ўдзельнічае ў справе.

Пракурор, службовыя асобы або прадстаўнікі дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб, асобныя грамадзяне, якія звярнуліся ад уласнага імені ў суд па абарону правоў іншых асоб, выступаюць у судовых спрэчках першымі.

Прадстаўнікі дзяржаўных органаў, прыцягнутыя судом да ўдзелу ў працэсе для дачы заключэння па справе, а таксама пракурор, які ўступіў у справу, выступаюць у судовых спрэчках апошнімі.

Старшынствуючы не можа абмежаваць працягласць судовых спрэчак пэўным часам, але абавязаны перапыняць асоб, якія ўдзельнічаюць у спрэчках, калі яны гавораць аб фактах, што не маюць дачынення да разглядаемай справы.

**Артыкул 291. Судовыя рэплікі**

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права выступаць паўторна з рэплікамі наконт сказанага іншымі асобамі. Права апошняй рэплікі заўсёды належыць адказчыку або яго прадстаўніку.

### Артыкул 292. Аднаўленне разбору справы па сутнасці

Калі старшынствуючы падчас або пасля судовых спрэчак прызнае неабходным высветліць новыя факты, якія маюць значэнне для справы, або даследаваць новыя доказы, ён выносіць вызначэнне аб аднаўленні разбору справы па сутнасці. Пасля заканчэння разбору судовыя спрэчкі і рэплікі праводзяцца нанава ў агульным парадку.

### Артыкул 293. Выхад суда для вынясення рашэння

Пасля спрэчак і рэплік суд выходзіць у дарадчы пакой для вынясення рашэння, аб чым старшынствуючы аб'яўляе прысутным у зале пасяджэння.

## ГЛАВА 28
## СУДОВЫЯ ПАСТАНОВЫ СУДОЎ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

### § 1. Агульныя палажэнні

### Артыкул 294. Віды судовых пастаноў суда першай інстанцыі

Суд першай інстанцыі ў ходзе вядзення справы прымае судовыя пастановы ў выглядзе рашэнняў і вызначэнняў.

### Артыкул 295. Паняцце рашэння суда першай інстанцыі

Пастанова суда першай інстанцыі, якой справа вырашаецца па сутнасці, выносіцца ў выглядзе рашэння.

Суд выносіць рашэнне іменем Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 296. Паняцце вызначэння суда першай інстанцыі

Вызначэннямі з'яўляюцца судовыя пастановы суда першай інстанцыі, якімі вырашаюцца асобныя пытанні, што ўзнікаюць у ходзе вядзення справы, а ў прадугледжаных гэтым Кодэксам выпадках заканчваецца вядзенне справы без вынясення рашэння.

Вызначэнні выносяцца ад імені суда.

### Артыкул 297. Законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў

Судовыя пастановы павінны быць законнымі і абгрунтаванымі.

Суд засноўвае рашэнне і вызначэнне толькі на тых доказах, якія былі даследаваны ў судовым пасяджэнні.

### § 2. Парадак вынясення і змест рашэння суда першай інстанцыі

### Артыкул 298. Абавязак суда не выходзіць за межы іскавых патрабаванняў

Пры вынясенні рашэння суд не мае права па сваёй ініцыятыве без згоды істца змяніць прадмет і падставы іску, акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

Суд можа ў залежнасці ад высветленых акалічнасцей справы выйсці за межы памеру заяўленых патрабаванняў, калі гэта неабходна для правільнага вырашэння спрэчкі.

**Артыкул 299. Тайна дарадчага пакоя**

Суд выносіць рашэнне па справе ў дарадчым пакоі. Падчас прыняцця рашэння ў дарадчым пакоі можа знаходзіцца толькі суддзя (суддзі), які разглядае справу. Прысутнасць іншых асоб не дапускаецца.

Пасля заканчэння працоўнага часу, а таксама на працягу працоўнага часу дапускаецца перапынак для адпачынку з выхадам з дарадчага пакоя. Разгалошванне меркаванняў, якія мелі месца ў дарадчым пакоі, не дапускаецца.

**Артыкул 300. Пытанні, якія вырашаюцца пры вынясенні рашэння**

Пры вынясенні рашэння суд павінен разгледзець наступныя пытанні:

1) якія факты ўваходзяць у прадмет доказвання кожнага з бакоў, трэцяй асобы, якая заяўляе самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі;

2) якія з гэтых фактаў устаноўлены з дапамогай дакладных доказаў і якія не ўстаноўлены;

3) чаму адхіляюцца тыя або іншыя доказы;

4) чые патрабаванні або пярэчанні ў выніку аказаліся абгрунтаванымі поўнасцю або часткова;

5) якія акты заканадаўства павінны быць прыменены па гэтай справе;

6) як павінна быць вырашана справа.

**Артыкул 301. Парадак работы суда ў дарадчым пакоі**

Суд у дарадчым пакоі абавязаны:

1) разгледзець ва ўстаноўленай паслядоўнасці пытанні, указаныя ў артыкуле 300 гэтага Кодэкса, і зрабіць неабходныя вывады;

2) падрыхтаваць тэкст рашэння.

**Артыкул 302. Змест рашэння**

Рашэнне па справе складаецца з уводнай, апісальнай, матывавальнай і рэзалюцыйнай частак. Матывавальная частка (абгрунтаванне) рашэння складаецца ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 305 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 303. Уводная частка рашэння**

Ва ўводнай частцы рашэння ўказваюцца час і месца вынясення рашэння, найменне суда, які вынес рашэнне, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку суддзі і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), бакі і іх прадстаўнікі, пракурор, іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, прадмет спрэчкі.

Працэсуальнае становішча юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб указваецца па стане на момант выхаду суда ў дарадчы пакой.

**Артыкул 304. Апісальная частка рашэння**

Апісальная частка рашэння павінна ўтрымліваць у сабе ўказанні на тое, што патрабуюць або супраць чаго пярэчаць бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы і на якіх падставах. Тут адлюстроўваюцца таксама змяненні істцом прадмета, памеру або падставы іску, калі яны мелі месца, прызнанне або непрызнанне іску адказчыкам.

**Артыкул 305. Патрабаванне аб складанні матывавальнай часткі (абгрунтавання) рашэння**

Матывавальная частка (абгрунтаванне) рашэння складаецца:

1) па патрабаванні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб. Такое патрабаванне можа быць заяўлена да выхаду суда ў дарадчы пакой для вынясення рашэння і на працягу дзесяці дзён пасля яго абвяшчэння;

2) у сувязі з абскарджаннем або апратэставаннем рашэння ў апеляцыйным парадку;

3) у выпадках, калі гэтым Кодэксам устаноўлена, што рашэнне не падлягае апеляцыйнаму абскарджанню або апратэставанню;

4) у выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Матывавальная частка рашэння павінна ўтрымліваць адказы на пытанні, прадугледжаныя пунктамі 1–5 артыкула 300 гэтага Кодэкса, а ў выпадку складання яе не ў дарадчым пакоі павінна быць выкладзена ў выглядзе асобнага дакумента і ўтрымліваць указанне на рашэнне, у дачыненні да якога яна складзена.

**Артыкул 306. Рэзалюцыйная частка рашэння**

Рэзалюцыйная частка рашэння павінна ўтрымліваць у сабе вывад суда аб задавальненні іску або аб адмове ў іску поўнасцю або ў частцы, указанне на размеркаванне судовых выдаткаў, а таксама на тэрмін і парадак абскарджання рашэння.

Акрамя таго, у неабходных выпадках у рэзалюцыйнай частцы рашэння ўказваюцца тэрмін і парадак выканання рашэння, а таксама аб дапушчэнні неадкладнага выканання або забеспячэння выканання рашэння, аб павароце выканання рашэння.

Калі рашэнне вынесена на карысць або супраць некалькіх асоб, суд указвае, у якой частцы рашэнне адносіцца да кожнай з іх і ці з'яўляюцца адказнасць або права спагнання салідарнымі.

Умоўныя і альтэрнатыўныя рашэнні не дапускаюцца.

**Артыкул 307. Рэзалюцыйная частка рашэння па некаторых катэгорыях спраў**

Рэзалюцыйная частка рашэння па справе аб скасаванні шлюбу павінна адпавядаць агульным патрабаванням артыкула 306 гэтага Кодэкса, а таксама ўтрымліваць указанне сумы, падлеглай выплаце адным або абаімі сужэнцамі пры рэгістрацыі скасавання шлюбу.

У рэзалюцыйнай частцы рашэння аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў або аб адабранні дзіцяці без пазбаўлення бацькоўскіх правоў, калі дзіця знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, вырашаюцца пытанні спагнання выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзіцяці, якое знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, а таксама пытанні працаўладкавання асоб, абавязаных пакрываць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзіцяці, якое знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, непрацуючых або працуючых, але якія не ў поўным аб'ёме на працягу шасці месяцаў пакрываюць у добраахвотным парадку па іх заяве ўказаныя выдаткі.

**Артыкул 308. Рашэнне аб присуджэнні маёмасці**

Пры прысуджэнні маёмасці ў натуры суд указвае ў рэзалюцыйнай частцы рашэння кошт гэтай маёмасці, які павінен быць спагнаны з адказчыка, калі пры выкананні рашэння прысуджанай маёмасці ў наяўнасці не акажацца, а таксама з якога банкаўскага рахунка адказчыка павінна быць спісана ў гэтым выпадку грашовая сума за невяртанне істцу прысуджанай маёмасці.

### Артыкул 309. Рашэнне, якое абавязвае адказчыка ажыццявіць пэўныя дзеянні

Пры вынясенні рашэння, якое абавязвае адказчыка ажыццявіць пэўныя дзеянні, не звязаныя з перадачай маёмасці, у тым ліку грашовых сум, суд у рэзалюцыйнай частцы рашэння можа ўказаць, што калі адказчык не выканае рашэння на працягу ўстаноўленага тэрміну, то істец мае права зрабіць гэтыя дзеянні за кошт адказчыка са спагнаннем з яго неабходных выдаткаў.

Калі ўказаныя дзеянні могуць быць ажыццёўлены толькі адказчыкам, суд устанаўлівае ў рашэнні тэрмін, на працягу якога рашэнне павінна быць выканана.

Пры вынясенні рашэння аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, і працаўладкаванні асобы, абавязанай пакрываць указаныя выдаткі, суд у рэзалюцыйнай частцы рашэння абавязвае адказчыка на працягу шасці працоўных дзён з дня вынясення рашэння з’явіцца ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па яго месцы жыхарства для працаўладкавання.

### Артыкул 310. Падрыхтоўка рашэння

Пасля вырашэння пытанняў, указаных у артыкуле 300 гэтага Кодэкса, суд распачынае падрыхтоўку рукапіснага або друкаванага тэксту рашэння, якое рыхтуецца на мове судовага разбору па справе з выкананнем правіл, выкладзеных у артыкулах 301–309 гэтага Кодэкса.

Рашэнне падпісваецца суддзёй (суддзямі), які вынес яго.

Выпраўленні ў тэксце рашэння павінны быць агавораны, а агаворкі падпісаны суддзёй (суддзямі) да выхаду з дарадчага пакоя для абвяшчэння рашэння.

### Артыкул 311. Абвяшчэнне рашэння

Адразу пасля падпісання рашэння суд вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і абвяшчае яго. Па грамадзянскіх справах, у матэрыялах якіх утрымліваюцца звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты, суд абвяшчае толькі ўводную і рэзалюцыйную часткі рашэння. Адсутнасць каго-небудзь з удзельнікаў грамадзянскага судаводства ў зале судовага пасяджэння не перашкаджае абвяшчэнню рашэння.

Пры адсутнасці ў рашэнні матывавальнай часткі суд абвяшчае яго рэзалюцыйную частку і выкладае вуснае абгрунтаванне рашэння. Паведамленне матываў рашэння не абавязковае, калі справа разглядалася ў закрытым судовым пасяджэнні.

Пры складанні рашэння з матывавальнай часткай са згоды юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якія прысутнічаюць пры абвяшчэнні рашэння, дапускаецца абвяшчэнне толькі рэзалюцыйнай часткі рашэння.

Затым суд высвятляе, ці зразумелы змест рашэння, дае неабходныя растлумачэнні па парадку абскарджання і апратэставання, азнаямлення з гука- або відэазапісам судовага пасяджэння ў выпадку, калі ён вядзецца, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння і аб’яўляе судовае пасяджэнне па гэтай справе закрытым.

Юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, у адсутнасць якіх разгледжана справа, суд у трохдзённы тэрмін з моманту абвяшчэння рашэння высылае яго копію.

Па грамадзянскіх справах, у матэрыялах якіх утрымліваюцца звесткі, што складаюць дзяржаўныя сакрэты, накіроўваецца або ўручаецца выпіска з рашэння, якая складаецца з уводнай і рэзалюцыйнай частак, не ўтрымлівае звестак, што складаюць дзяржаўныя сакрэты. Азнаямленне з апісальнай і матывавальнай часткамі рашэння ажыццяўляецца з выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

**Артыкул 312. Складанне матывавальнай часткі рашэння**

Матывавальная частка рашэння складаецца ў сямідзённы тэрмін з дня падачы заявы аб гэтым і паступлення апеляцыйнай скаргі або апеляцыйнага пратэсту на рашэнне, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам. У выпадку пропуску тэрміну на падачу заявы аб складанні матывавальнай часткі рашэння па ўважлівай прычыне гэты тэрмін можа быць адноўлены суддзёй, які вынес рашэнне.

Матывавальную частку рашэння падпісвае суддзя, які вынес рашэнне.

**§ 3. Неадкладнае выкананне і законная сіла рашэння, індэксацыя прысуджаных грашовых сум**

**Артыкул 313. Рашэнні, якія падлягаюць неадкладнаму выкананню**

Неадкладнаму выкананню падлягаюць рашэнні:

1) аб прысуджэнні аліментаў;

$1^1$) аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

2) аб прысуджэнні перыядычных выплат на пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна;

3) аб прысуджэнні работніку заработнай платы, але не больш чым за адзін месяц;

4) аб аднаўленні на працы незаконна звольненага або пераведзенага работніка;

$4^1$) аб працаўладкаванні асобы, абавязанай пакрываць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, непрацуючай або працуючай, але якая не ў поўным аб'ёме на працягу шасці месяцаў пакрывае ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі;

$4^2$) аб прызнанні забастоўкі незаконнай;

5) у іншых выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 314. Права суда дапусціць неадкладнае выкананне рашэння**

Суд можа дапусціць неадкладнае выкананне рашэння поўнасцю або ў частцы, калі з прычыны асаблівых акалічнасцей замаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнага ўрону для спагнанніка або зрабіць немагчымым само выкананне.

**Артыкул 315. Забеспячэнне інтарэсаў адказчыка пры неадкладным выкананні рашэння**

Пры дапушчэнні неадкладнага выканання рашэння суд можа запатрабаваць ад істца забеспячэння павароту яго выканання на выпадак адмены рашэння суда.

Забеспячэнне інтарэсаў адказчыка пры неадкладным выкананні рашэння можа заключацца таксама ў адкладанні перадачы істцу спагнаных грашовых сум або іншай маёмасці да ўступлення рашэння ў законную сілу.

**Артыкул 316. Забеспячэнне выканання рашэння, не накіраванага да неадкладнага выканання**

Суд можа забяспечыць выкананне рашэння, не накіраванага да неадкладнага выканання, па правілах, устаноўленых главой 25 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 317. Уступленне рашэння суда ў законную сілу**

Рашэнне суда ўступае ў законную сілу па сканчэнні тэрміну на апеляцыйнае абскарджанне і апратэставанне, калі яно не было абскарджана або апратэставана.

У выпадку падачы апеляцыйнай скаргі або прынясення апеляцыйнага пратэсту рашэнне, калі яно не адмененае, уступае ў законную сілу пасля разгляду справы вышэйстаячым судом.

Рашэнне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, а таксама іншых судоў у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, уступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння.

**Артыкул 318. Наступствы ўступлення рашэння суда ў законную сілу**

Пасля ўступлення рашэння суда ў законную сілу бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, а таксама іх правапераемнікі не могуць зноў заяўляць у судзе тыя ж іскавыя патрабаванні, на той жа падставе, а таксама аспрэчваць у судаводстве па іншай справе ўстаноўленыя судом факты і праваадносіны.

Калі пасля ўступлення ў законную сілу рашэння суда па праваадносінах бакоў, якія працягваюцца (прысуджэнне перыядычных выплат і да т.п.), мяняюцца акалічнасці, на якіх заснавана рашэнне, кожны бок мае права шляхам прад’яўлення новага іску патрабаваць вынясення новага рашэння.

**Артыкул 318$^{1}$. Судовая пастанова аб працаўладкаванні**

Судовая пастанова аб працаўладкаванні асобы, абавязанай кампенсаваць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, якая не працуе або працуе, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку паводле яе заявы ўказаныя выдаткі ці якая спыніла знаходжанне ў лячэбна-працоўным прафілакторыі або вызвалена з месцаў пазбаўлення волі і падлягае працаўладкаванню, выносіцца адзін раз, далучаецца да выканаўчага дакумента і з’яўляецца яго неад’емнай часткай.

Судовая пастанова аб працаўладкаванні на працягу трох працоўных дзён пасля яе вынясення накіроўваецца ў орган унутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства асобы, указанай у частцы першай гэтага артыкула, а ў выпадку, калі яе месца жыхарства адсутнічае, – па апошнім вядомым месцы жыхарства для падбору арганізацыі (арганізацый) з мэтай працаўладкавання гэтай асобы.

**Артыкул 318$^{2}$. Індэксацыя прысуджаных грашовых сум**

Па заяве спагнанніка або даўжніка суд, які разгледзеў справу, можа правесці індэксацыю спагнаных судом грашовых сум на дзень выканання рашэння.

Заява аб індэксацыі прысуджаных грашовых сум разглядаецца ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб. Няяўка гэтых асоб у судовае пасяджэнне не перашкаджае вырашэнню пытання аб індэксацыі прысуджаных грашовых сум.

На вызначэнне суда аб індэксацыі прысуджаных грашовых сум можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

**§ 4. Парадак вынясення і змест вызначэння суда першай інстанцыі**

**Артыкул 319. Парадак вынясення вызначэння**

Пастановы суда першай інстанцыі, якімі справа не вырашаецца па сутнасці, выносяцца ў форме вызначэнняў.

Пры вырашэнні нескладаных пытанняў вызначэнні могуць выносіцца судом без выхаду ў дарадчы пакой і заносяцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння (пратакольнае вызначэнне).

Пры вырашэнні складаных пытанняў (аб спыненні, прыпыненні вядзення справы, пакіданні заявы без разгляду і без руху, падрыхтоўцы справы да судовага разбору, прызначэнні экспертызы і інш.) суд выносіць вызначэнне ў выглядзе асобнага дакумента.

Па складаных пытаннях, якія ўзніклі падчас судовага разбору, вызначэнні выносяцца ў дарадчым пакоі.

**Артыкул 320. Змест вызначэння**

У вызначэнні павінны быць указаны:

1) час і месца вынясення вызначэння;

2) найменне суда, які вынес вызначэнне, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку суддзі і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі);

3) юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы і прадмет спрэчкі;

4) пытанне, па якім выносіцца вызначэнне;

5) матывы, па якіх суд прыйшоў да сваіх вывадаў, і спасылка на акты заканадаўства, якімі суд кіраваўся;

6) пастанова суда;

7) парадак і тэрмін абскарджання або апратэставання вызначэння, калі яно падлягае абскарджанню або апратэставанню.

Пратакольнае вызначэнне павінна ўтрымліваць звесткі, указаныя ў пунктах 4 і 6 часткі першай гэтага артыкула.

**Артыкул 321. Абвяшчэнне або ўручэнне вызначэння**

Калі вызначэнне было вынесена ў ходзе судовага пасяджэння, яно падлягае абвяшчэнню неадкладна пасля вынясення. Копіі вызначэння, якое можа быць абскарджана або апратэставана асобна ад рашэння, суд адпраўляе па пошце бакам і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, якія не прысутнічалі ў судовым пасяджэнні, у трохдзённы тэрмін з моманту вынясення вызначэння.

**Артыкул 322. Абгрунтаванне вызначэння**

Падлягаюць абгрунтаванню толькі тыя вызначэнні, якія могуць быць абскарджаны або апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 323. Законная сіла вызначэння**

Вызначэнні, акрамя тых, якія падлягаюць абскарджанню або апратэставанню асобна ад рашэнняў, уступаюць у законную сілу адразу пасля абвяшчэння, а калі вызначэнне не абвяшчалася – пасля падпісання яго суддзёй (суддзямі).

**Артыкул 324. Прымяненне да вызначэння нормаў аб рашэнні**

Да вызначэння прымяняюцца нормы, якія рэгулююць змест, парадак і наступствы вынясення рашэння, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам або не супярэчыць сутнасці вызначэння.

**Артыкул 325. Прыватнае вызначэнне суда**

Суд, выявіўшы пры разглядзе справы парушэнні законнасці асобнымі службовымі асобамі або грамадзянамі ці істотныя недахопы або парушэнні ў дзейнасці юрыдычных

асоб, выносіць прыватнае вызначэнне і накіроўвае яго адпаведным юрыдычным асобам або іх службовым асобам, якія абавязаны ў месячны тэрмін паведаміць суду аб прынятых імі мерах.

Калі пры разглядзе справы суд выявіць прыкметы злачынства ў дзеяннях грамадзяніна, ён паведамляе аб гэтым пракурору прыватным вызначэннем.

Прыватнае вызначэнне суда можа быць абскарджана (апратэставана).

За пакіданне без разгляду прыватнага вызначэння суда або непрыняцце мер да ліквідацыі ўказаных у ім парушэнняў, а таксама нясвоечасовы адказ на прыватнае вызначэнне службовыя асобы нясуць адказнасць, прадугледжаную Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

## § 5. Дадатковае рашэнне. Растлумачэнне і выпраўленне рашэння суда першай інстанцыі

### Артыкул 326. Дадатковае рашэнне

Пытанне аб вынясенні дадатковага рашэння можа быць пастаўлена да ўступлення рашэння ў законную сілу па ініцыятыве суда, які вынес рашэнне, або па заяве юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобы. Дадатковае рашэнне выносіцца па патрабаванні, разгледжаным у судовым пасяджэнні, але не вырашаным судом або вырашаным не поўнасцю, а таксама ў дачыненні да судовых выдаткаў.

Дадатковае рашэнне выносіцца тым жа судом, які вынес рашэнне з выкананнем патрабаванняў, прадугледжаных артыкуламі 298–312 гэтага Кодэкса. Дадатковае рашэнне можа быць абскарджана і апратэставана ў апеляцыйным парадку.

### Артыкул 327. Растлумачэнне рашэння

У выпадку няяснасці рашэння суд, які вынес рашэнне па справе, мае права па сваёй ініцыятыве або па заяве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб растлумачыць рашэнне, не змяняючы яго зместу.

Растлумачэнне рашэння дапускаецца, калі яно яшчэ не прыведзена ў выкананне і не скончыўся тэрмін, на працягу якога рашэнне можа быць прымусова выканана.

### Артыкул 328. Выпраўленне апісак і відавочных падліковых памылак у рашэнні

Суд, які вынес рашэнне, можа па сваёй ініцыятыве або па заяве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб выправіць допушчаныя ў рашэнні апіскі і відавочныя падліковыя памылкі.

### Артыкул 329. Права суда адтэрмінаваць або растэрмінаваць выкананне рашэння суда, а таксама змяніць спосаб і парадак яго выканання

Зыходзячы з маёмаснага стану бакоў або іншых акалічнасцей, суд мае права па хадайніцтве боку, пададзеным да сканчэння тэрміну, устаноўленага для прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання, адтэрмінаваць або растэрмінаваць выкананне рашэння суда, а таксама змяніць спосаб і парадак яго выканання.

Пытанне аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы, змяненні спосабу і парадку выканання разглядаецца судом, які вынес рашэнне.

**Артыкул 330. Парадак вынясення дадатковага рашэння, растлумачэння рашэння, выпраўлення апісак і відавочных падліковых памылак, адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, а таксама змянення спосабу і парадку выканання рашэння**

Пытанні аб вынясенні дадатковага рашэння, растлумачэнні рашэння, выпраўленні апісак і відавочных падліковых памылак у рашэнні, адтэрміноўцы і растэрміноўцы выканання рашэння або змяненні спосабу і парадку выканання рашэння вырашаюцца ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

Няяўка гэтых асоб, якім належным чынам паведамілі пра час і месца судовага пасяджэння, не з'яўляецца перашкодай для разгляду пастаўленага перад судом пытання.

**Артыкул 331. Права на абскарджанне вызначэння суда аб адмове ў вынясенні дадатковага рашэння, а таксама па пытаннях растлумачэння рашэння, выпраўлення ў рашэнні апісак і падліковых памылак, аб адтэрміноўцы і растэрміноўцы выканання рашэння, а таксама змяненні спосабу і парадку выканання рашэння**

На вызначэнне суда аб адмове ў вынясенні дадатковага рашэння, а таксама па пытаннях растлумачэння рашэння, выпраўлення ў рашэнні апісак і падліковых памылак, аб адтэрміноўцы і растэрміноўцы выканання рашэння, а таксама змяненні спосабу і парадку выканання рашэння можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

**§ 6. Перагляд судом першай інстанцыі судовых пастаноў суда першай інстанцыі**

**Артыкул 332. Права суда перагледзець вынесеную ім судовую пастанову, вынесці новую судовую пастанову**

Суд, які вынес судовую пастанову па першай інстанцыі, можа адмяніць або змяніць яе, а таксама вынесці новую судовую пастанову толькі ў выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 333. Вынясенне новага рашэння пасля змянення акалічнасцей**

Калі пасля ўступлення ў законную сілу рашэння па праваадносінах бакоў, якія працягваюцца (прысуджэнне перыядычных выплат і да т.п.), мяняюцца акалічнасці, на якіх заснавана рашэнне, суд па новым іску любога боку выносіць новае рашэнне без адмены ранейшага.

**Артыкул 334. Адмена або змяненне вызначэння судом, які яго вынес**

Вызначэнні, акрамя тых, якія могуць быць абскарджаны або апратэставаны, могуць адмяняцца або змяняцца судом, які іх вынес, як у выпадку памылковасці, так і ў сувязі са змяненнем акалічнасцей справы. Адмена або змяненне вызначэння ў такіх выпадках праводзіцца па хадайніцтве бакоў або іншай юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы асобы.

## ГЛАВА 28$^{1}$
## ЗАВОЧНАЕ ВЯДЗЕННЕ

**Артыкул 334$^{1}$. Падставы для завочнага вядзення**

Справа можа быць разгледжана судом у парадку завочнага вядзення ў выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне адказчыка, а пры ўдзеле ў справе некалькіх адказчыкаў – у выпадку

няяўкі ў судовае пасяджэнне ўсіх адказчыкаў, калі яны былі належным чынам апавешчаны пра час і месца судовага пасяджэння, але не паведамілі аб уважлівых прычынах няяўкі і не прасілі разгледзець справу ў выпадку іх адсутнасці або суд прызнае, што адказчыкі наўмысна зацягваюць вядзенне справы.

Аб разглядзе справы ў парадку завочнага вядзення суд выносіць вызначэнне.

У выпадку, калі ісцец не згодны на разгляд справы ў парадку завочнага вядзення, суд адкладвае разбор справы і прызначае дзень новага судовага пасяджэння.

Пры змяненні істцом прадмета або падставы іску, павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў суд не мае права разглядаць справу ў гэтым судовым пасяджэнні ў парадку завочнага вядзення.

### Артыкул 334$^{2}$. Парадак завочнага вядзення, змест завочнага рашэння суда і ўступленне яго ў законную сілу

Пры разглядзе справы ў парадку завочнага вядзення суд праводзіць судовы разбор у адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі главой 27 гэтага Кодэкса.

Па выніках разгляду справы суд выносіць рашэнне, якое называецца завочным.

Змест завочнага рашэння суда вызначаецца артыкуламі 302–306 гэтага Кодэкса. Пры гэтым у рэзалюцыйнай частцы завочнага рашэння суда ўказваюцца тэрмін і парадак падачы заявы аб яго адмене.

Рашэнне, вынесенае ў парадку завочнага вядзення, уступае ў законную сілу па сканчэнні тэрміну на апеляцыйнае абскарджанне, калі яно не было абскарджана. У выпадку падачы апеляцыйнай скаргі рашэнне, калі яно не адменена, уступае ў законную сілу пасля разгляду справы вышэйстаячым судом.

### Артыкул 334$^{3}$. Высылка копіі завочнага рашэння суда

Копія завочнага рашэння суда высылаецца адказчыку, істцу і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, якія не прысутнічалі ў судовым пасяджэнні, не пазней за тры дні з дня прыняцця гэтага рашэння з паведамленнем аб яе ўручэнні.

### Артыкул 334$^{4}$. Адмена завочнага рашэння суда

Адказчык мае права падаць у суд, які прыняў завочнае рашэнне, заяву аб адмене гэтага рашэння на працягу дзесяці дзён з дня ўручэння яму копіі рашэння.

### Артыкул 334$^{5}$. Змест заявы аб адмене завочнага рашэння суда

Заява аб адмене завочнага рашэння суда павінна ўтрымліваць рэквізіты, устаноўленыя артыкулам 109 гэтага Кодэкса.

У заяве аб адмене завочнага рашэння суда павінны быць указаны акалічнасці, якія сведчаць аб уважлівасці прычын няяўкі адказчыка ў судовае пасяджэнне, аб якіх адказчык не меў магчымасці своечасова паведаміць суду, і доказы, якія пацвярджаюць гэтыя акалічнасці, а таксама доказы, якія могуць паўплываць на змест рашэння суда, або хадайніцтва аб выпатрабаванні такіх доказаў, калі іх прадстаўленне для адказчыка немагчымае.

### Артыкул 334$^{6}$. Разгляд заявы аб адмене завочнага рашэння суда

Заява аб адмене завочнага рашэння суда разглядаецца ў судовым пасяджэнні не пазней за дзесяць дзён з дня яе паступлення ў суд з апавяшчэннем юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб. Няяўка гэтых асоб у судовае пасяджэнне не перашкаджае разгляду заявы.

Па выніках разгляду заявы суд выносіць вызначэнне аб адмове ў задавальненні заявы або аб адмене завочнага рашэння суда і аднаўленні разгляду справы гэтым жа або іншым суддзёй.

Завочнае рашэнне падлягае адмене, калі суд установіць, што няяўка адказчыка ў судовае пасяджэнне была выклікана ўважлівымі прычынамі, аб якіх адказчык не меў магчымасці своечасова паведаміць суду, і пры гэтым адказчык прадставіў доказы, якія могуць паўплываць на змест рашэння суда, або заявіў хадайніцтва аб выпатрабаванні такіх доказаў, калі іх прадстаўленне для адказчыка немагчымае.

**Артыкул 334$^{7}$. Аднаўленне разгляду справы**

Пасля вынясення вызначэння аб адмене завочнага рашэння суда і аб аднаўленні разгляду справы справа разглядаецца судом на агульных падставах.

У выпадку няяўкі адказчыка пры новым разглядзе справы яна не можа быць перагледжана ў парадку завочнага вядзення.

## ГЛАВА 28$^{2}$
## ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ АБ ВЯРТАННІ ДЗІЦЯЦІ АБО АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ПРАВОЎ ДОСТУПУ

**Артыкул 334$^{8}$. Падача заявы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу**

Заява аб вяртанні дзіцяці, якое неправамерна перамешчана ў Рэспубліку Беларусь або неправамерна ўтрымліваецца ў Рэспубліцы Беларусь, ці аб ажыццяўленні ў дачыненні да такога дзіцяці правоў доступу на падставе Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года (далей – заява аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу) падаецца бацькам (маці) або іншай асобай, якія мяркуюць, што адказчыкам парушаны іх правы апекі або правы доступу* ў дачыненні да дзіцяці (далей у гэтай главе – заяўнік).

Заява аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу падаецца праз Міністэрства юстыцыі ў суд па месцы жыхарства (месцы знаходжання) дзіцяці або непасрэдна ў суд па месцы жыхарства (месцы знаходжання) дзіцяці.

Заява аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу з’яўляецца працэсуальным дакументам. Патрабаванні да зместу заявы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу ўстаноўлены Канвенцыяй аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года.

---

* Для мэт гэтай главы пад правамі апекі і правамі доступу разумеюцца паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года.

**Артыкул 334$^{9}$. Парадак разгляду і вырашэння спраў аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу**

Справы аб вяртанні дзіцяці, якое неправамерна перамешчана ў Рэспубліку Беларусь або неправамерна ўтрымліваецца ў Рэспубліцы Беларусь, ці аб ажыццяўленні ў дачыненні да такога дзіцяці правоў доступу на падставе Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года (далей – справы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу) на падставе заявы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу разглядаюцца судом па правілах іскавага вядзення з улікам палажэнняў гэтай главы і Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года.

Справы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу разглядаюцца судом з абавязковым удзелам пракурора і прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва.

Справы аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу разглядаюцца судом у тэрмін, які не перавышае сарака двух дзён з дня прыняцця заявы судом, уключаючы тэрмін на падрыхтоўку справы да судовага разбору.

Пра час і месца судовага пасяджэння або ажыццяўлення працэсуальных дзеянняў заяўніку паведамляецца праз Міністэрства юстыцыі.

**Артыкул 334[10]. Забеспячальныя меры**

У неабходных выпадках нароўні з іншымі мерамі ў адпаведнасці з главой 25 гэтага Кодэкса суд можа забараніць адказчыку да ўступлення ў законную сілу рашэння суда па справе аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу змяняць месца жыхарства (месца знаходжання) дзіцяці і часова абмежаваць права адказчыка і (або) дзіцяці на выезд з Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 334[11]. Адкладанне і прыпыненне вядзення справы, звязанай са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці)**

Суд, у вядзенні якога знаходзіцца справа, звязаная са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці), абавязаны адкласці на трыццаць дзён разбор гэтай справы ў выпадку паступлення пісьмовага паведамлення ад Міністэрства юстыцыі аб атрыманні ім заявы аб неправамерным перамяшчэнні гэтых дзяцей (дзіцяці) у Рэспубліку Беларусь або іх (яго) неправамерным утрыманні ў Рэспубліцы Беларусь з прыкладаннем копіі такой заявы.

Вядзенне справы, звязанай са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці), прыпыняецца да ўступлення ў законную сілу рашэння суда па справе аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу, ці вызначэння суда аб спыненні вядзення гэтай справы, або вызначэння суда аб пакіданні заявы без разгляду.

**Артыкул 334[12]. Недапушчальнасць злучэння патрабаванняў і прад’яўлення сустрэчнага іску**

Злучэнне некалькіх патрабаванняў, за выключэннем выпадку аб’яднання заяўнікам патрабаванняў аб вяртанні дваіх і больш дзяцей або ажыццяўленні ў дачыненні да дваіх і больш дзяцей правоў доступу, і прад’яўленне сустрэчнага іску па справе аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу не дапускаюцца.

**Артыкул 334[13]. Рашэнне суда па справе аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу**

Рашэнне суда па справе аб вяртанні дзіцяці павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым главой 28 гэтага Кодэкса, і ўтрымліваць абгрунтаванне неабходнасці вяртання дзіцяці ў дзяржаву пастаяннага пражывання ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года, пры неабходнасці – парадак і тэрміны вяртання дзіцяці і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў, звязаных з разглядам справы аб вяртанні дзіцяці, або абгрунтаванне адмовы ў вяртанні дзіцяці ў дзяржаву пастаяннага пражывання ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў.

Рашэнне суда па справе аб ажыццяўленні правоў доступу павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым главой 28 гэтага Кодэкса, і ўтрымліваць абгрунтаванне ажыццяўлення заяўнікам правоў доступу ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года, пры неабходнасці – меры па забеспячэнні ажыццяўлення заяўнікам правоў доступу і ўказанне на размеркаванне

судовых выдаткаў, звязаных з разглядам справы аб ажыццяўленні правоў доступу, або абгрунтаванне адмовы ў ажыццяўленні правоў доступу ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў.

**Артыкул 334$^{14}$. Накіраванне копій судовых пастаноў**

Копіі судовых пастаноў па справе аб вяртанні дзіцяці або ажыццяўленні правоў доступу накіроўваюцца судом у Міністэрства юстыцыі ў трохдзённы тэрмін з дня вынясення гэтых пастаноў.

## РАЗДЗЕЛ VII
## ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ, ЯКІЯ ЎЗНІКАЮЦЬ З АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ПРАВАВЫХ АДНОСІН. АСАБЛІВАЕ ВЯДЗЕННЕ. ЗАГАДНАЕ ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

### ГЛАВА 29
### ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ, ЯКІЯ ЎЗНІКАЮЦЬ З АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ПРАВАВЫХ АДНОСІН

#### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 335. Агульныя правілы падведамнасці суду спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін**

Суд разглядае справы:

1) па скаргах на дзеянні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата (далей, калі не ўказана іншае, – камісія), а таксама на рашэнне органаў, якія ўтварылі адпаведную камісію, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

2) выключаны;

3) па скаргах на адмову органаў, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, унесці выпраўленні або змяненні ў запісы актаў грамадзянскага стану;

4) па скаргах на натарыяльныя дзеянні або на адмову ў іх ажыццяўленні;

5) па скаргах на дзеянні (бяздзейнасць) дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб, а таксама арганізацый, што не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асоб, якія ўшчамляюць правы грамадзян, а ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства, – і правы юрыдычных асоб;

6) па скаргах на рашэнні Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе;

6$^{1}$) па скаргах (пратэстах) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, за выключэннем спраў па ўказаных скаргах (пратэстах), разгляд якіх гаспадарчым працэсуальным заканадаўствам ускладзены на суды, якія разглядаюць эканамічныя справы;

7) іншыя справы, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, у выпадках, прадугледжаных законам.

**Артыкул 336. Парадак разгляду і вырашэння спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін**

Справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, разглядаюцца судамі па правілах іскавага вядзення з улікам палажэнняў гэтай главы і сутнасці вядзення спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін.

### Артыкул 337. Агульныя палажэнні вядзення спраў, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін

Справы, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, разглядаюцца судом не пазней за месячны тэрмін з дня паступлення заявы ў суд, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

У выпадках, калі судовыя выдаткі ўскладаюцца на арганізацыі, якія не валодаюць правамі юрыдычнай асобы, гэтыя абавязкі па рашэнні суда нясе юрыдычная асоба, у структуру якой яны ўваходзяць.

Па справах, указаных у пункце 1 артыкула 335 гэтага Кодэкса, выдаткі, звязаныя з разглядам гэтых спраў, не спаганяюцца.

### Артыкул 338. Правы і абавязкі заяўнікаў, а таксама дзяржаўных органаў, арганізацый і службовых асоб, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца

Заяўнікі, а таксама дзяржаўныя органы, арганізацыі і службовыя асобы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца, карыстаюцца правамі і нясуць абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 56 гэтага Кодэкса.

Заяўнік мае права адмовіцца ад скаргі, змяніць матывы скаргі ў межах дзеяння, якое абскарджваецца. Дзяржаўныя органы, арганізацыі і службовыя асобы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца, маюць права прызнаць скаргу ў выпадках, калі яны ў межах сваёй кампетэнцыі могуць уносіць змяненні ў дзеянне, якое абскарджваецца.

### Артыкул 339. Абавязак даказвання і прадстаўлення доказаў

Суд правярае законнасць і абгрунтаванасць дзеянняў дзяржаўных органаў, арганізацый і службовых асоб, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца, а ў выпадках, прадугледжаных законам, – толькі іх законнасць.

Дзяржаўныя органы, арганізацыі і службовыя асобы абавязаны прадставіць суду матэрыялы, якія паслужылі падставай для адпаведных дзеянняў (бяздзейнасці).

Заяўнікі, дзяржаўныя органы, арганізацыі і службовыя асобы, а таксама іншыя зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права прадстаўляць суду доказы і іншыя матэрыялы.

### Артыкул 340. Скарга і сродкі яе забеспячэння

Справы, якія ўзнікаюць з адміністрацыйна-прававых адносін, узбуджаюцца ў судзе па скарзе. Прадметам скаргі з’яўляюцца нязгода заяўніка або пракурора з дзеяннямі (бяздзейнасцю) дзяржаўнага органа, арганізацыі або службовай асобы. Матывамі (падставамі) скаргі могуць служыць юрыдычныя факты і іншыя акалічнасці, якія сведчаць аб незаконнасці або неабгрунтаванасці дзеянняў дзяржаўных органаў, арганізацый або службовых асоб. У скарзе можа таксама ўтрымлівацца ўказанне на пэўныя сродкі абароны правоў заяўніка або іншых асоб праз адмену, змяненне дзеянняў дзяржаўнага органа, арганізацыі або службовай асобы, устанаўленне яе абавязку ажыццявіць пэўнае дзеянне або іншым прадугледжаным законам спосабам.

Сродкамі забеспячэння скаргаў з’яўляюцца:

забарона выканання дзеянняў дзяржаўнага органа, арганізацыі або службовай асобы да сканчэння тэрміну на судовае абскарджанне (апратэставанне) у выпадках, прадугледжаных законам;

абавязковае прыпыненне выканання абскарджанага дзеяння ў выпадках, прадугледжаных законам.

Суд мае права і ў іншых выпадках па ўласнай ініцыятыве або хадайніцтве заяўніка прыпыніць выкананне абскарджанага дзеяння ў любым стане справы.

Копія вызначэння суда аб прыпыненні выканання накіроўваецца ў дзяржаўны орган, арганізацыю або службовай асобе, дзеянні якіх абскарджваюцца, а таксама асобе, якая ажыццяўляе выкананне.

### § 2. Асаблівасці разгляду скаргаў на дзеянні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, на рашэнне органаў, якія стварылі камісію

**Артыкул 341. Падача скаргі**

Асоба, не згодная з рашэннем камісіі, можа падаць скаргу ў суд у выпадках і ў парадку, прадугледжаных законам.

У выпадку, калі законам устаноўлены папярэдні зварот з заявай у камісію і гэты парадак заяўнікам не захаваны, суддзя накіроўвае скаргу ў адпаведную камісію.

Суб’екты, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі, маюць права падаць скаргу на рашэнне органаў, што стварылі камісію, у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння ў парадку, прадугледжаным законам.

**Артыкул 342. Разгляд скаргі**

Скарга на дзеянні камісіі павінна быць разгледжана суддзёй не пазней чым у пяцідзённы тэрмін з моманту яе падачы, калі іншае не прадугледжана законам, а на рашэнне органаў, што стварылі камісію, – у трохдзённы тэрмін.

Скарга разглядаецца судом з выклікам заяўніка, а таксама прадстаўніка адпаведнай камісіі, прадстаўніка органа, што стварыў камісію.

Няяўка асоб, указаных у частцы другой гэтага артыкула, не з’яўляецца перашкодай для вырашэння справы. Справу па скарзе на дзеянні камісіі, на рашэнне органаў, што стварылі камісію, суд разглядае з удзелам пракурора.

**Артыкул 343. Рашэнне суда па скарзе**

Па выніках разгляду скаргі суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

аб пакіданні рашэння, якое абскарджваецца, без змянення, а скаргі – без задавальнення;

аб абгрунтаванасці скаргі і абавязку ліквідаваць дапушчанае парушэнне.

Рашэнне суда ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння і абскарджанню або апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае. Пасля вынясення рашэння суд неадкладна накіроўвае копію гэтага рашэння ўсім юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам.

### § 3. Выключаны

**Артыкул 344. Выключаны**

**Артыкул 345. Выключаны**

**Артыкул 346. Выключаны**

**Артыкул 347. Выключаны**

### § 4. Асаблівасці разгляду скаргаў на адмову органаў, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, унесці выпраўленні ў запісы актаў грамадзянскага стану

**Артыкул 348. Падсуднасць**

Скаргі на адмову органаў, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, пры адсутнасці спрэчкі аб праве ў выпраўленні або змяненні запісу актаў грамадзянскага стану разглядае суд па месцы жыхарства заяўніка.

**Артыкул 349. Змест скаргі**

У скарзе павінна быць указана, якім органам быў зроблены запіс, у чым заключаецца яго няправільнасць і якімі доказамі гэта пацвярджаецца, па якіх прычынах было адмоўлена ў выпраўленні або змяненні запісу. Да скаргі павінны быць прыкладзены копія адпаведнага запісу і выдадзеных на яго аснове пасведчанняў, заключэнне органа, што рэгіструе акты грамадзянскага стану, аб адмове ў змяненні або выпраўленні запісу і іншыя неабходныя па справе дакументы.

**Артыкул 350. Рашэнне суда па скарзе**

Рашэнне суда павінна быць матывавана.

У рашэнні суда, якім задаволена скарга на адмову ў выпраўленні або змяненні запісу акта грамадзянскага стану, указваецца, у які запіс (якім органам, што рэгіструе акты грамадзянскага стану, і ў дачыненні да якіх асоб складзены, яго нумар і дата) і якія канкрэтна змяненні або выпраўленні неабходна ўнесці.

Рашэнне суда, якім устаноўлена няправільнасць запісу ў кнізе рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, служыць падставай для выпраўлення такога запісу органамі, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану.

### § 5. Асаблівасці разгляду скаргаў на натарыяльныя дзеянні або на адмову ў іх ажыццяўленні

**Артыкул 351. Падача скаргі. Разгляд скаргі**

Асобы, якія звярнуліся па ажыццяўленне натарыяльнага дзеяння і лічаць няправільным ажыццёўленае натарыяльнае дзеянне або неправамернай адмову ў ажыццяўленні натарыяльнага дзеяння, а таксама асобы, інтарэсы якіх ушчэмлены ў сувязі з ажыццяўленнем натарыяльнага дзеяння, маюць права падаць скаргу ў суд па месцы знаходжання натарыяльнай канторы, натарыяльнага бюро або дзяржаўнага органа, юрыдычных асоб, іншых арганізацый, службовыя асобы якіх паводле закона маюць права ажыццяўляць натарыяльныя дзеянні.

Скаргі на няправільнае сведчанне тастамента або на адмову ў яго сведчанні капітанам марскога судна або судна ўнутранага плавання, што плавае пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, падаюцца ў суд па месцы порта прыпіскі судна або па месцы ўліку судна ў Рэспубліцы Беларусь.

Скарга падаецца ў суд у дзесяцідзённы тэрмін, які вылічваецца з дня, калі заяўніку стала вядома аб ажыццёўленым натарыяльным дзеянні або адмове ў яго ажыццяўленні.

Скарга разглядаецца суддзёй з удзелам заяўніка, натарыуса або іншай службовай асобы, якая ажыццявіла натарыяльнае дзеянне, што абскарджваецца, або адмовіла ў ажыццяўленні натарыяльнага дзеяння, аднак іх няяўка не з’яўляецца перашкодай для вырашэння справы.

**Артыкул 352. Рашэнне суда па скарзе**

Пасля разбору справы суд выносіць матываванае рашэнне, якім можа прызнаць:

дзеянні, ажыццёўленыя натарыусам або службовай асобай, якая ажыццяўляе натарыяльныя дзеянні, правільнымі і адхіліць скаргу;

скаргу абгрунтаванай і абавязаць натарыуса або іншую службовую асобу, якая ажыццяўляе натарыяльнае дзеянне, выканаць пэўныя дзеянні;

скаргу абгрунтаванай і абавязаць натарыуса або іншую службовую асобу, якая ажыццяўляе натарыяльнае дзеянне, унесці выпраўленні ў ажыццёўленае натарыяльнае дзеянне (ліквідаваць дапушчаныя пры ажыццяўленні натарыяльнага дзеяння парушэнні);

скаргу абгрунтаванай і адмяніць ажыццёўленае натарыяльнае дзеянне.

## § 6. Асаблівасці разгляду і вырашэння скаргаў на дзеянні (бяздзейнасць) дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб, а таксама арганізацый, што не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асоб, якія ўшчамляюць правы грамадзян, а ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства, – і правы юрыдычных асоб

**Артыкул 353. Права на зварот са скаргай у суд**

Грамадзянін мае права звярнуцца ў суд са скаргай, калі лічыць, што неправамернымі дзеяннямі (бяздзейнасцю) дзяржаўных органаў, іншых юрыдычных асоб, а таксама арганізацый, што не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асоб ушчэмлены яго правы, акрамя выпадкаў, калі для вырашэння асобных скаргаў заканадаўствам устаноўлены іншы, несудовы, парадак абскарджання.

Да дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўных органаў, іншых юрыдычных асоб і арганізацый, службовых асоб, якія падлягаюць судоваму абскарджанню, адносяцца калегіяльнае і асабістае дзеянні (бяздзейнасць), у выніку якіх грамадзянін незаконна пазбаўлены магчымасці поўнасцю або часткова ажыццявіць права, прадастаўленае яму нарматыўным прававым актам, або на грамадзяніна незаконна ўскладзены які-небудзь абавязак.

**Артыкул 354. Падача скаргі**

Скарга, у адпаведнасці з гэтым параграфам, акрамя выпадкаў, калі заканадаўствам устаноўлены іншы парадак, падаецца ў суд пасля абскарджання дзеяння дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы, а таксама арганізацыі, што не з’яўляецца юрыдычнай асобай, службовай асобы вышэйстаячаму ў парадку падпарадкаванасці дзяржаўнаму органу, юрыдычнай асобе, арганізацыі, службовай асобе, якая павінна разгледзець яе і аб выніках разгляду паведаміць грамадзяніну ў месячны тэрмін.

Скарга можа быць пададзена ў суд грамадзянінам, правы якога парушаны, або яго прадстаўніком.

Калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, скарга падаецца ў суд па месцы знаходжання дзяржаўнага органа, іншай юрыдычнай асобы, іншай арганізацыі або па месцы працы службовай асобы, чые дзеянні абскарджваюцца.

**Артыкул 355. Тэрміны для звароту ў суд са скаргай**

Скарга можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін, які вылічваецца з дня атрымання грамадзянінам адмовы вышэйстаячага дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы, арганізацыі або службовай асобы ў задавальненні скаргі або з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі, калі заяўнікам не быў атрыманы на яе адказ, а пры адсутнасці абавязковага пазасудовага парадку абскарджання – з дня, калі грамадзяніну стала вядома аб парушэнні яго права.

Для асобных відаў праваадносін заканадаўчымі актамі могуць устанаўлівацца іншыя тэрміны для звароту ў суд са скаргай.

Прапушчаны па ўважлівых прычынах тэрмін для падачы скаргі можа быць адноўлены судом. Суд мае права таксама прыпыніць выкананне дзеяння, якое абскарджваецца, да вырашэння скаргі.

**Артыкул 356. Разгляд скаргі**

Скарга разглядаецца судом з удзелам грамадзяніна, які падаў скаргу, і кіраўніка дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы, іншай арганізацыі або службовай асобы, дзеянні якіх абскарджваюцца, або іх прадстаўнікоў.

Няяўка ў судовае пасяджэнне па няўважлівай прычыне асоб, указаных у частцы першай гэтага артыкула, не служыць перашкодай да разгляду скаргі. Суд можа прызнаць яўку названых асоб абавязковай, на што ўказвае ў паведамленні аб выкліку ў судовае пасяджэнне.

**Артыкул 357. Рашэнне суда па скарзе. Выкананне рашэння**

Па выніках разгляду скаргі суд выносіць рашэнне.

Суд, прызнаўшы дзеянні (бяздзейнасць), якія абскарджваюцца, неправамернымі, такімі, што ўшчамляюць правы грамадзяніна, выносіць рашэнне аб абгрунтаванасці скаргі і абавязку ліквідаваць дапушчанае парушэнне.

Суд, устанавіўшы, што дзеянні, якія абскарджваюцца, былі ажыццёўлены ў адпаведнасці з законам, у межах паўнамоцтваў дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы, арганізацыі або службовай асобы, выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні скаргі.

Рашэнне суда па скарзе для ліквідацыі дапушчаных парушэнняў накіроўваецца кіраўніку дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы, арганізацыі, службовай асобе, дзеянні якіх былі абскарджаны, або ў вышэйстаячы ў парадку падпарадкаванасці дзяржаўны орган, юрыдычнай асобе, у арганізацыю, службовай асобе на працягу трох дзён з дня ўступлення рашэння ў законную сілу.

Аб выкананні рашэння суда па скарзе павінна быць паведамлена суду і заяўніку не пазней чым у месячны тэрмін з дня атрымання рашэння суда.

**Артыкул 358. Права на зварот у суд юрыдычных асоб**

Юрыдычныя асобы, якія лічаць, што неправамернымі дзеяннямі (бяздзейнасцю) дзяржаўных органаў, юрыдычных асоб, а таксама арганізацый, што не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, і службовых асоб ушчэмлены іх правы, маюць права звярнуцца ў суд са скаргай у парадку, прадугледжаным гэтым параграфам, і ў выпадках, прама прадугледжаных заканадаўствам.

**§ 6$^1$. Асаблівасці разгляду і вырашэння скаргаў асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, на прымяненне да іх мер спагнання і скаргаў адміністрацыйна арыштаваных на прымяненне да іх відаў дысцыплінарных спагнанняў**

**Артыкул 358$^1$. Падсуднасць**

Скаргі асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, на прымяненне да іх мер

спагнання і скаргі адміністрацыйна арыштаваных на прымяненне да іх відаў дысцыплінарных спагнанняў разглядае суд па месцы знаходжання заяўніка.

**Артыкул 358². Падача і разгляд скаргі**

Скарга можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін, які вылічваецца з дня, калі асуджанаму да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, непаўналетняму, асуджанаму з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, асобе, якая ўтрымліваецца пад вартай, адміністрацыйна арыштаванаму стала вядома аб парушэнні яго права, або пасля абскарджання накладзенага спагнання вышэйстаячай службовай асобе з дня атрымання адмовы ў задавальненні скаргі або з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі вышэйстаячай службовай асобе.

Па скаргах асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, суд неадкладна пасля ўзбуджэння справы выпатрабуе ў органа, службовай асобы, якія маюць права накладаць спагнанне, усе неабходныя дакументы, што характарызуюць асобу гэтых асуджаных, а таксама копіі матэрыялаў па спагнаннях, што абскарджваюцца. Па скаргах асуджаных да арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, адміністрацыйна арыштаваных такія дакументы і копіі матэрыялаў прыкладаюцца да скаргаў тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, адміністрацыяй устаноў, што выконваюць пакаранне, месцаў утрымання пад вартай, месцаў адбывання адміністрацыйнага арышту.

Падача скаргі асобамі, указанымі ў частцы першай гэтага артыкула, не прыпыняе выкананне рашэння, што абскарджваецца, да вырашэння скаргі.

Скаргі асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, на прымяненне да іх мер спагнання разглядаюцца судом не пазней за дзесяць дзён з дня паступлення ў суд дакументаў і копій матэрыялаў, указаных у частцы другой гэтага артыкула. Скаргі асуджаных да арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, на прымяненне да іх мер спагнання і скаргі адміністрацыйна арыштаваных на прымяненне да іх відаў дысцыплінарных спагнанняў разглядаюцца судом не пазней за дзесяць дзён з дня іх паступлення ў суд.

Скарга разглядаецца з удзелам заяўніка ў выпадку прызнання судом яго яўкі ў судовае пасяджэнне абавязковай, прадстаўніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, установы, што выконвае пакаранне, спецыяльнай вучэбна-выхаваўчай або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы, у якой знаходзіцца непаўналетні, асуджаны з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, або месца адбывання адміністрацыйнага арышту. Заяўнікам, асуджаным да папраўчых работ, абмежавання волі, непаўналетнім, асуджаным з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, паведамляецца пра час і месца судовага пасяджэння, але іх няяўка пры ўмове належнага паведамлення не перашкаджае разгляду справы.

**Артыкул 358³. Рашэнне суда па скарзе**

Па выніках разгляду скаргі суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

аб пакіданні рашэння, што абскарджваецца, без змянення, а скаргі – без задавальнення;

аб абгрунтаванасці скаргі і адмене спагнання.

Рашэнне суда аб абгрунтаванасці скаргі і адмене спагнання падлягае неадкладнаму выкананню.

## § 6[2]. Асаблівасці разгляду і вырашэння скаргаў грамадзян на вынесенае ў дачыненні да іх папярэджанне аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый і скаргаў грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, на пастанову аб прымяненні да іх мер спагнання

### Артыкул 358[4]. Падсуднасць

Скаргі грамадзян на вынесенае ў дачыненні да іх папярэджанне аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядае суд па месцы жыхарства (месцы знаходжання) заяўніка.

Скаргі грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, на пастанову аб прымяненні да іх мер спагнання разглядае суд па месцы знаходжання лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

### Артыкул 358[5]. Падача і разгляд скаргі

Скарга, указаная ў частцы першай артыкула 358[4] гэтага Кодэкса, можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін, які вылічваецца з дня аб'яўлення грамадзяніну папярэджання аб магчымасці накіравання яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый, або з дня атрымання адмовы ў задавальненні скаргі пры абскарджанні папярэджання вышэйстаячай службовай асобе (пракурору), або з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі вышэйстаячай службовай асобе (пракурору), калі заяўнікам не быў атрыманы на яе адказ. Да скаргі грамадзянінам прыкладаецца копія папярэджання аб магчымасці накіравання яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый.

Скарга, указаная ў частцы другой артыкула 358[4] гэтага Кодэкса, можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін, што вылічваецца з дня Азнаямлення грамадзяніна, які знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, з пастановай аб прымяненні да яго меры спагнання, або з дня атрымання адмовы ў задавальненні скаргі пры абскарджанні пастановы вышэйстаячай службовай асобе (пракурору), або з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі вышэйстаячай службовай асобе (пракурору), калі заяўнікам не быў атрыманы на яе адказ. Скарга падаецца праз адміністрацыю лячэбна-працоўнага прафілакторыя. Да скаргі лячэбна-працоўным прафілакторыем прыкладаюцца дакументы, што характарызуюць асобу грамадзяніна, які знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, яго паводзіны падчас знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, копіі дакументаў па матэрыялах пастановы, якая абскарджваецца. Падача скаргі не прыпыняе выканання пастановы, якая абскарджваецца, да вырашэння скаргі. Скарга павінна быць разгледжана судом не пазней за дзесяць дзён з дня паступлення яе ў суд. Скарга разглядаецца судом з удзелам заяўніка ў выпадку прызнання судом яго яўкі ў судовае пасяджэнне абавязковай, прадстаўніка лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

### Артыкул 358[6]. Рашэнне суда па скарзе

Па выніках разгляду скаргі суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

аб пакіданні папярэджання аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый або пастановы аб прымяненні меры спагнання, якія абскарджваюцца, без змянення, а скаргі – без задавальнення;

аб абгрунтаванасці скаргі і адмене папярэджання аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый або пастановы аб прымяненні меры спагнання.

Рашэнне суда аб абгрунтаванасці скаргі і адмене папярэджання аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый або пастановы аб прымяненні меры спагнання падлягае неадкладнаму выкананню.

## § 7. Асаблівасці разгляду скаргаў на рашэнні Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе

### Артыкул 359. Падача і разгляд скаргі

Асоба, не згодная з рашэннем Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе, можа падаць скаргу ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

Скарга разглядаецца судовай калегіяй па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у складзе трох суддзяў.

### Артыкул 360. Рашэнне суда па скарзе

Па выніках разгляду скаргі на рашэнне Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе суд прымае адно з наступных матываваных рашэнняў:

аб адмове ў задавальненні скаргі на рашэнне Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе;

аб прызнанні скаргі абгрунтаванай і адмене рашэння Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе.

Рашэнне суда па выніках разгляду скаргі абскарджанню або апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае.

## § 8. Асаблівасці разгляду скаргаў на рашэнні аб спыненні разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадаўжэнні тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь

### Артыкул 360[1]. Падача скаргі. Разгляд скаргі

Асоба, не згодная з рашэннямі дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь аб спыненні разгляду яе хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадаўжэнні тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, мае права падаць скаргу ў суд па месцы знаходжання дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь, рашэнні якога абскарджваюцца.

Скарга на рашэнне аб спыненні разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь у выпадку разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь у паскораным парадку падаецца ў суд у сямідзённы тэрмін з дня азнаямлення заяўніка з такім рашэннем.

Скарга на рашэнне аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, акрамя выпадку, прадугледжанага часткай другой гэтага артыкула, аб адмове ў прадаўжэнні тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь падаецца ў суд у пятнаццацідзённы тэрмін з дня азнаямлення заяўніка з такім рашэннем.

Скарга разглядаецца судом з удзелам заяўніка або яго прадстаўніка і кіраўніка дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь, дзеянні якога абскарджваюцца, або іншага прадстаўніка гэтага дзяржаўнага органа, аднак іх няяўка не з'яўляецца перашкодай для вырашэння справы.

#### Артыкул 360[2]. Рашэнне суда па скарзе

Пасля разбору справы суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

аб пакіданні рашэння, якое абскарджваецца, без змянення, а скаргі – без задавальнення;

аб абгрунтаванасці скаргі і абавязку ліквідаваць дапушчанае парушэнне.

Па выніках разгляду скаргі, указанай у частцы другой артыкула 360[1] гэтага Кодэкса, суд выносіць рашэнне, якое ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння і абскарджанню або апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае.

### § 9. Асаблівасці разгляду скаргаў (пратэстаў) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання

#### Артыкул 360[3]. Падача скаргі (пратэсту)

Бакі выканаўчага вядзення, іншыя асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны пры выкананні выканаўчага дакумента, маюць права абскардзіць, а пракурор – апратэставаць пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання ў выпадку прызнання скаргі (пратэсту) абгрунтаванай поўнасцю ці часткова.

Скарга (пратэст) падаецца ў суд па месцы знаходжання адпаведнага органа прымусовага выканання.

Скарга на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, за выключэннем скаргі на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) Галоўнага судовага выканаўцы Рэспублікі Беларусь, можа быць пададзена ў суд пасля абскарджання ў пазасудовым парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, на працягу дзесяці дзён з дня атрымання пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання.

Скарга на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання аб прызнанні скаргі (пратэсту) абгрунтаванай поўнасцю або часткова можа быць пададзена непасрэдна ў суд на працягу дзесяці дзён з дня атрымання адпаведнай пастановы.

Скарга на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) Галоўнага судовага выканаўцы Рэспублікі Беларусь можа быць пададзена непасрэдна ў суд на працягу дзесяці дзён з дня атрымання адпаведнай пастановы, або з дня ажыццяўлення гэтых дзеянняў (устанаўлення факта гэтай бяздзейнасці), або з дня, калі асоба, якая падае скаргу і якой не было паведамлена належным чынам пра час і месца ажыццяўлення гэтых дзеянняў, даведалася або павінна была даведацца пра іх ажыццяўленне.

Пракурор мае права прынесці пратэст на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, а таксама на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання аб прызнанні скаргі (пратэсту) абгрунтаванай поўнасцю ці часткова непасрэдна ў суд на працягу дзесяці дзён з дня атрымання адпаведнай пастановы, або з дня ажыццяўлення гэтых дзеянняў (устанаўлення факта гэтай бяздзейнасці), або з дня, калі пракурор даведаўся або павінен быў даведацца пра іх ажыццяўленне.

**Артыкул $360^4$. Змест скаргі (пратэсту)**

Скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, а таксама на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкуламі 109 і 110 гэтага Кодэкса.

У скарзе (пратэсце) таксама павінны быць указаны:

найменне выканаўчага дакумента, у сувязі з выкананнем якога абскарджваюцца (апратэстоўваюцца) пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, нумар выканаўчага дакумента і дата яго выдачы, патрабаванні, што змяшчаюцца ў выканаўчым дакуменце;

найменне суда, іншага ўпаўнаважанага органа, прозвішча і ініцыялы службовай асобы, якая выдала выканаўчы дакумент.

**Артыкул $360^5$. Разгляд скаргі (пратэсту)**

Скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, а таксама на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання разглядаюцца не пазней за адзін месяц з дня паступлення ў суд.

Пра час і месца разгляду скаргі (пратэсту) паведамляецца асобе, якая падала скаргу, пракурору, які прынёс пратэст, бакам выканаўчага вядзення, судоваму выканаўцу, іншаму работніку органа прымусовага выканання, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджваюцца (апратэстоўваюцца), а таксама кіраўніку органа прымусовага выканання, які вынес пастанову па выніках разгляду скаргі (пратэсту) у пазасудовым парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні. Няяўка ўказаных асоб, якім паведамілі належным чынам пра час і месца разгляду скаргі (пратэсту), не з’яўляецца перашкодай для разгляду скаргі (пратэсту).

**Артыкул $360^6$. Рашэнне суда па скарзе (пратэсце)**

Па выніках разгляду скаргі (пратэсту) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, а таксама на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання суд выносіць рашэнне.

У выпадку прызнання скаргі (пратэсту) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання абгрунтаванай суд у рэзалюцыйнай частцы рашэння вызначае меры, якія павінны быць прыняты судовым выканаўцам, іншым работнікам органа прымусовага выканання, пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) якіх абскарджаны (апратэставаны), для ліквідавання дапушчаных імі парушэнняў.

Суд адмаўляе ў задавальненні скаргі (прастэсту), калі ўстановіць, што пастановы або дзеянні, якія абскарджваюцца (апратэстоўваюцца), вынесены ці ажыццёўлены судовым выканаўцам, іншым работнікам органа прымусовага выканання ў адпаведнасці з законам, у межах іх паўнамоцтваў і правы і законныя інтарэсы бакоў выканаўчага вядзення, іншых асоб не былі парушаны пры выкананні выканаўчых дакументаў.

Калі пры разглядзе скаргі (прастэсту) на пастановы судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання аб замене боку выканаўчага вядзення або адмове ў такой замене, а таксама на пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, вынесеныя па выніках разгляду скаргі (пратэсту) на такія пастановы, узнікла спрэчка аб праве, падведамная суду, суд пакідае такую скаргу (пратэст) без разгляду і растлумачвае асобе права на зварот з іскам у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

## ГЛАВА 30
## АСАБЛІВАЕ ВЯДЗЕННЕ

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 361. Справы, якія разглядаюцца судом у парадку асаблівага вядзення**

У парадку асаблівага вядзення разглядаюцца наступныя справы:

1) аб устанаўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне;

2) аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак і аб'яўленні грамадзяніна памерлым;

3) аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, а таксама аб прызнанні грамадзяніна дзеяздольным або адмене абмежавання дзеяздольнасці;

$3^1$) аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях;

4) аб аб'яўленні непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыя);

5) аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай маёмасці на нерухомую рэч;

$5^1$) аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

6) аб прызнанні спадчыны вымарачнай;

7) аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка;

8) аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзян, прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзян;

9) аб усынаўленні дзіцяці;

10) аб змяшчэнні непаўналетніх у спецыяльныя вучэбна-выхаваўчыя ўстановы або спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 5 часткі 2 артыкула 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, аб пераводзе непаўналетніх са спецыяльных вучэбна-выхаваўчых устаноў у спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб спыненні знаходжання непаўналетніх ва ўказаных установах да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў іх, аб прадаўжэнні гэтага тэрміну, а таксама аб змяшчэнні непаўналетніх у прыёмнікі-размеркавальнікі для непаўналетніх, аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання непаўналетніх у прыёмніках-размеркавальніках для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетніх з прыёмнікаў-размеркавальнікаў для непаўналетніх;

11) аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый, прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

У парадку асаблівага вядзення разглядаюцца і іншыя справы ў выпадках, прадугледжаных законамі.

**Артыкул 362. Парадак разгляду спраў асаблівага вядзення**

Справы асаблівага вядзення разглядаюцца судамі па правілах іскавога вядзення з улікам палажэнняў гэтай главы і сутнасці асаблівага вядзення.

Справы асаблівага вядзення суддзя разглядае з удзелам заяўніка, зацікаўленых грамадзян і юрыдычных асоб. Зацікаўленыя грамадзяне і юрыдычныя асобы могуць быць прыцягнуты да справы па хадайніцтве заяўніка, пракурора, па ініцыятыве суда або могуць уступіць у справу па сваёй ініцыятыве.

Пры звароце ў суд асоб, не ўказаных у артыкулах 373, $376^1$, 377, 379, $380^1$, 381, 391, $392^1$, $393^1$, $393^6$, $393^9$ і $393^{11}$ гэтага Кодэкса, суд адмаўляе ім у прыняцці заявы, а калі яна прынята, спыняе вядзенне справы.

Калі пры разглядзе справы ў парадку асаблівага вядзення ўзнікла спрэчка аб праве, падведамная суду, суддзя пакідае заяву без разгляду і растлумачвае зацікаўленым грамадзянам і юрыдычным асобам, што яны маюць права прад’явіць іск на агульных падставах.

## § 2. Асаблівасці разгляду спраў аб устанаўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне

### Артыкул 363. Умовы ўстанаўлення фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне, у судовым парадку

Справы аб устанаўленні фактаў, ад якіх залежыць узнікненне, змяненне або спыненне асабістых ці маёмасных правоў грамадзян (фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне), падлягаюць разгляду судом, калі заканадаўствам не прадугледжаны іншы (несудовы) парадак іх устанаўлення і заяўнік не мае іншай магчымасці атрымаць або аднавіць належныя дакументы, якія сведчаць гэтыя факты.

Пры невыкананні ўказаных умоў суд адмаўляе ў прыняцці заявы ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 246 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 364. Справы аб устанаўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне

Суд разглядае справы аб устанаўленні фактаў:

роднасных адносін асоб;

знаходжання асоб на ўтрыманні;

рэгістрацыі нараджэння, усынаўлення, заключэння шлюбу, скасавання шлюбу, смерці, устанаўлення мацярынства і (або) бацькоўства;

прыналежнасці прававызначальных дакументаў (за выключэннем дакументаў, якія пацвярджаюць членства ў грамадскіх аб’яднаннях, воінскіх дакументаў, пашпартоў і пасведчанняў, якія выдаюцца органамі, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану) асобе, уласнае імя, імя па бацьку або прозвішча якой, указаныя ў дакуменце, не супадаюць з уласным іменем, іменем па бацьку або прозвішчам гэтай асобы па пашпарце або пасведчанні аб нараджэнні;

прыняцця спадчыны і месца адкрыцця спадчыны;

няшчаснага выпадку;

нараджэння або смерці асобы ў пэўны час і пры пэўных акалічнасцях пры адмове органаў, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, у рэгістрацыі нараджэння або смерці;

знаходжання ў фактычных шлюбных адносінах ва ўстаноўленых законам выпадках, калі рэгістрацыя заключэння шлюбу ў органах, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, не можа быць выканана з прычыны смерці аднаго з сужэнцаў;

валодання, карыстання і распараджэння нерухомай маёмасцю, калі дакументы аб рэгістрацыі такой маёмасці страчаны і ў аднаўленні іх адмоўлена;

прызнання мацярынства і (або) бацькоўства ці факта мацярынства і (або) бацькоўства;

неадпаведнасці рэчаіснасці звестак, што зневажаюць гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю грамадзяніна, калі ўстанавіць асобу, якая распаўсюдзіла такія звесткі, немагчыма.

Пры выкананні ўмоў, прадугледжаных артыкулам 363 гэтага Кодэкса, суд устанаўлівае і іншыя факты, якія маюць юрыдычнае значэнне.

### Артыкул 365. Падсуднасць

Заява па справах аб устанаўленні фактаў, якія маюць юрыдычнае значэнне, падаецца ў суд па месцы жыхарства заяўніка, за выключэннем заявы аб устанаўленні факта валодання, карыстання і распараджэння нерухомай маёмасцю, заявы аб устанаўленні факта

прыняцця спадчыны і месца адкрыцця спадчыны, якія падаюцца адпаведна ў суд па месцы знаходжання нерухомай маёмасці або па месцы адкрыцця спадчыны.

Пры наяўнасці па справе некалькіх заяўнікаў, якія пражываюць у розных месцах, заява падаецца ў суд па месцы жыхарства аднаго з іх па выбары.

**Артыкул 366. Змест заявы**

У заяве павінна быць указана, з якой мэтай заяўніку неабходна ўстанавіць гэты факт, а таксама павінны быць прыведзены доказы, што пацвярджаюць немагчымасць атрымання ці аднаўлення дакументаў, якія сведчаць гэты факт.

**Артыкул 367. Рашэнне суда па справе**

Рашэнне суда аб устанаўленні факта, які падлягае рэгістрацыі ў органах, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, або афармленню ў іншых органах, служыць падставай для такой рэгістрацыі або афармлення, не замяняючы сабой дакументаў, якія выдаюцца гэтымі органамі.

Указанне ў рашэнні суда на мэту ўстанаўлення гэтага факта не перашкаджае яго выкарыстанню ва ўсіх іншых выпадках, калі з гэтым фактам звязваецца ўзнікненне, змяненне або спыненне правоў.

## § 3. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб’яўленні грамадзяніна памерлым

**Артыкул 368. Падсуднасць**

Заява аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб’яўленні грамадзяніна памерлым падаецца ў суд па месцы жыхарства заяўніка.

**Артыкул 369. Падача заявы. Змест заявы.**

Вядзенне аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб’яўленні грамадзяніна памерлым узбуджаецца па заяве зацікаўленых асоб.

Суд прыступае да вядзення справы аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб’яўленні грамадзяніна памерлым па сканчэнні тэрмінаў, устаноўленых Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

У заяве павінна быць указана, з якой мэтай неабходна прызнаць грамадзяніна адсутным без вестак або аб’явіць грамадзяніна памерлым, а таксама павінны быць выкладзены акалічнасці, што пацвярджаюць адсутнасць грамадзяніна без вестак, або акалічнасці, што даюць падставы меркаваць пра смерць грамадзяніна.

**Артыкул 370. Падрыхтоўка справы да судовага разбору. Разгляд заявы**

Суд пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору выносіць вызначэнне аб публікацыі за кошт заяўніка ў мясцовай і рэспубліканскай газеце аб’явы аб заяве, што паступіла ў суд, з просьбай да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі аб грамадзяніне, у дачыненні да якога ставіцца пытанне аб прызнанні яго адсутным без вестак або аб’яўленні яго памерлым, паведаміць іх суду.

Публікацыя павінна ўтрымліваць:

найменне суда, у які паступіла заява;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, дату і месца нараджэння грамадзяніна, апошняе месца яго жыхарства і апошняе вядомае месца яго знаходжання;

прапанову на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі паведаміць пра гэтага грамадзяніна наяўныя звесткі.

На тэрмін, указаны ў публікацыі, вядзенне справы прыпыняецца.

Суд высвятляе таксама, якія грамадзяне (родзічы, суседзі, саслужыўцы і інш.) могуць даць звесткі аб адсутным, і вырашае пытанне аб выкліку іх у якасці сведак, запрошвае звесткі аб ім у юрыдычных асоб па апошнім вядомым месцы яго жыхарства і месцы працы.

Пры наяўнасці даных, якія сведчаць аб пагрозе раскрадання або пашкоджання маёмасці адсутнага, суд выносіць вызначэнне, якім прапаноўвае органу апекі і апекавальніцтва прызначыць апекуна над маёмасцю для яе аховы.

Пра час разгляду справы суд паведамляе пракурору, удзел якога ў гэтых справах абавязковы.

Суд аднаўляе вядзенне справы па сканчэнні двух месяцаў з дня публікацыі ў газетах аб'явы і прыступае да яе разгляду, калі не атрымае ў гэты тэрмін дакладных звестак аб месцы знаходжання адсутнага грамадзяніна.

Пры атрыманні такіх звестак суд разглядае справу і, калі заяўнік адмаўляецца ад заяўленага патрабавання, спыняе вядзенне справы.

Калі па справе аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак суд установіць акалічнасці, якія даюць падставы абвясціць грамадзяніна памерлым, ён мае права вынесці рашэнне аб гэтым толькі ў тым выпадку, калі заяўнік зменіць сваё патрабаванне.

**Артыкул 371. Рашэнне суда па справе**

Разгледзеўшы справу, суд выносіць матываванае рашэнне аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак ці аб'яўленні грамадзяніна памерлым або адмове ў гэтым.

Рашэнне суда павінна ўтрымліваць прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку грамадзяніна, дату і месца яго нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства. Пры задавальненні патрабавання суд указвае ў рашэнні пачатак адсутнасці без вестак або дату смерці грамадзяніна, калі ўстаноўлены акалічнасці, якія пагражаюць яму смерцю або даюць падставы меркаваць аб яго гібелі ад пэўнага няшчаснага выпадку.

Пры наяўнасці акалічнасцей, указаных у частцы пятай артыкула 370 гэтага Кодэкса, адначасова з прызнаннем грамадзяніна адсутным без вестак суд можа паставіць пытанне аб прызначэнні апекуна над яго маёмасцю, калі гэта пытанне не было вырашана пры падрыхтоўцы справы. Копія рашэння суда ў гэтым выпадку ў трохдзённы тэрмін пасля ўступлення рашэння ў законную сілу накіроўваецца ў адпаведны орган апекі і апекавальніцтва.

У гэты ж тэрмін пасля ўступлення рашэння суда ў законную сілу ў выпадку аб'яўлення грамадзяніна памерлым суд паведамляе органу, які рэгіструе акты грамадзянскага стану, па месцы знаходжання суда для рэгістрацыі смерці грамадзяніна і пры наяўнасці маёмасці ў такой асобы паведамляе натарыяльнай канторы, натарыяльнаму бюро па месцы адкрыцця спадчыны для прыняцця пры неабходнасці мер па ахове спадчыннай маёмасці.

Суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб'яўленні грамадзяніна памерлым, калі дзеці ўказанай асобы застаюцца без апекавання бацькоў, паведамляе аб гэтым упраўленню (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (бацькі або маці) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.

**Артыкул 372. Дзеянні суда ў выпадку яўкі або выяўлення грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак або аб'яўленага памерлым**

У выпадку яўкі або выяўлення месца знаходжання грамадзяніна, прызнанага адсутным без вестак або аб'яўленага памерлым, суд новым рашэннем адмяняе сваё раней вынесенае рашэнне. Гэта рашэнне з'яўляецца падставай для зняцця апекі з маёмасці адсутнага без вестак або для анулявання запісу акта аб смерці грамадзяніна, аб'яўленага памерлым, у кнізе рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, а таксама для адмены мер па ахове яго маёмасці.

## § 4. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, а таксама аб прызнанні грамадзяніна дзеяздольным ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці

### Артыкул 373. Падача заявы. Змест заявы

Справа аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі можа быць пачата па заяве членаў яго сям'і, пракурора, органа апекі і апекавальніцтва, а таксама грамадскага аб'яднання, статутам якога прадастаўлена такое права. Заява аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна.

Справа аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) можа быць пачата па заяве членаў яго сям'і, а ў выпадку іх адсутнасці – па заяве блізкіх родзічаў. Такая справа можа быць пачата таксама па заяве пракурора, органа апекі і апекавальніцтва, псіхіятрычнай (псіханеўралагічнай) арганізацыі. Заява аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна, а калі такі грамадзянін змешчаны ў псіхіятрычную (псіханеўралагічную) арганізацыю – па месцы знаходжання гэтай арганізацыі.

Справа аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, можа быць пачата па заяве членаў яго сям'і, а ў выпадку іх адсутнасці – па заяве блізкіх родзічаў. Такая справа можа быць пачата таксама па заяве пракурора, органа апекі і апекавальніцтва, арганізацыі аховы здароўя, іншай арганізацыі, якая ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць. Заява аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна, а калі такі грамадзянін змешчаны ў арганізацыю аховы здароўя, іншую арганізацыю, якая ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць, – па месцы знаходжання гэтай арганізацыі.

У заяве аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць, што гэты грамадзянін ставіць сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча.

У заяве аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць аб псіхічным расстройстве (захворванні), з прычыны якога ў гэтага грамадзяніна абмежавана здольнасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі.

У заяве аб прызнанні грамадзяніна недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць аб псіхічным расстройстве (захворванні), з прычыны якога гэты грамадзянін не можа разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі.

У заяве аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць аб стане гэтага грамадзяніна, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, а таксама пацвярджаюць неабходнасць устанаўлення над гэтым грамадзянінам апекі.

**Артыкул 374. Прызначэнне экспертызы**

Суддзя пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) пры наяўнасці дастатковых даных аб псіхічным расстройстве (захворванні) гэтага грамадзяніна для вызначэння яго псіхічнага стану прызначае судова-псіхіятрычную экспертызу. У выключных выпадках пры відавочным ухіленні грамадзяніна, у дачыненні да якога ўзбуджана справа аб прызнанні яго абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), ад праходжання судова-псіхіятрычнай экспертызы суд пры ўдзеле пракурора і ўрача-спецыяліста ў галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі ў судовым пасяджэнні можа вынесці вызначэнне аб прымусовым накіраванні гэтага грамадзяніна на судова-псіхіятрычную экспертызу.

**Артыкул 375. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе**

Справа аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі суд разглядае з абавязковым удзелам самога грамадзяніна, а таксама пракурора і прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва. Калі з прычын, прызнаных судом няўважлівымі, грамадзянін не з'явіцца ў судовае пасяджэнне, ён можа быць па вызначэнні суда падвергнуты прыводу.

Справа аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) ці аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, суд разглядае з абавязковым удзелам пракурора і прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва. Грамадзянін, у дачыненні да якога разглядаецца справа аб прызнанні яго абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), выклікаецца ў судовае пасяджэнне, калі суд прызнае гэта магчымым па стане яго здароўя. Суддзя пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, запрошвае ў арганізацыі аховы здароўя, іншай арганізацыі, якая ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць, у якой гэтаму грамадзяніну аказваецца медыцынская дапамога, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, што пацвярджае такі стан грамадзяніна.

Рашэнне суда, якім грамадзянін прызнаны недзеяздольным або абмежавана дзеяздольным, павінна быць матываваным. У рашэнні суда аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным указваецца аб'ём абмежаванняў дзеяздольнасці, прадугледжаны Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Судовыя выдаткі па справе аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з заяўніка не спаганяюцца. Устанавіўшы, што заяўнікі дзейнічалі нядобрасумленна з мэтай заведама неабгрунтаванага абмежавання або пазбаўлення дзеяздольнасці грамадзяніна, суд спаганяе з іх усе судовыя выдаткі.

Прызнаўшы грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, суд абавязаны на працягу трох дзён пасля ўступлення рашэння ў законную сілу паведаміць аб гэтым органу апекі і апекавальніцтва, накіраваўшы копію рашэння па месцы жыхарства гэтай асобы для ўстанаўлення над ёй апекі або апекавальніцтва.

Суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, калі дзеці ўказанай асобы застаюцца без апекавання бацькоў, паведамляе аб гэтым упраўленню (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (бацькі або маці) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.

**Артыкул 376. Прызнанне недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным або абмежавана дзеяздольным. Адмена абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна**

Справа аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным або аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна, які быў прызнаны абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), можа быць пачата па заяве апекуна (апекавальніка), а таксама асоб, указаных у частках другой і трэцяй артыкула 373 гэтага Кодэкса. Суддзя пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным або аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) прызначае судова-псіхіятрычную экспертызу. Пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні дзеяздольным грамадзяніна, які быў прызнаны недзеяздольным з прычыны знаходжання яго ў сувязі з захворваннем у непрытомным стане, што выключае магчымасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, суддзя запрошвае ў арганізацыі аховы здароўя, іншай арганізацыі, якая ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць, у якой гэтаму грамадзяніну аказваецца медыцынская дапамога, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, якое пацвярджае такі стан грамадзяніна.

Справа аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна, які быў прызнаны абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напіткамі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі, можа быць пачата па заяве самога грамадзяніна або яго апекавальніка, а таксама асоб, указаных у частцы першай артыкула 373 гэтага Кодэкса.

Заява аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным або адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна пры наступленні ўмоў, прадугледжаных Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна незалежна ад таго, якім судом вынесена рашэнне аб прызнанні такога грамадзяніна недзеяздольным або абмежавана дзеяздольным.

Рашэнне суда аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным або адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна павінна быць матываваным і з’яўляецца падставай для адмены ўстаноўленых над ім апекі або апекавальніцтва.

## § $4^1$. Асаблівасці разгляду спраў аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях

**Артыкул $376^1$. Падача заявы. Змест заявы**

Заява аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях падаецца ў суд па месцы жыхарства (месцы знаходжання) гэтага грамадзяніна яго блізкімі родзічамі, апекунамі, апекавальнікамі, мужам (жонкай), а таксама іншымі асобамі, якія пражываюць сумесна з ім і вядуць агульную гаспадарку, пракурорам, органам апекі і апекавальніцтва.

У заяве аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць, што грамадзянін у выніку ўдзелу ў азартных гульнях ставіць сябе і (або) сваю сям’ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, а таксама ўказаны прапанаваны тэрмін абмежавання грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях у межах тэрміну, устаноўленага заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 376$^{2}$. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе**

Справа аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях суд разглядае з абавязковым удзелам самога грамадзяніна і заяўніка. Калі па прычынах, прызнаных судом няўважлівымі, грамадзянін не з'явіцца ў судовае пасяджэнне, ён можа быць па вызначэнні суда падвергнуты прыводу.

Разгледзеўшы справу, суд выносіць матываванае рашэнне аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях з указаннем тэрміну гэтага абмежавання ці аб адмове ў такім абмежаванні.

Цячэнне тэрміну абмежавання грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях пачынаецца з даты ўступлення ў законную сілу рашэння суда, калі іншы тэрмін не ўказаны ў рашэнні суда.

Копія рашэння суда аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях, што ўступіла ў законную сілу, выдаецца судом заяўніку і накіроўваецца ў арганізацыю, упаўнаважаную ў адпаведнасці з заканадаўствам на ўнясенне ва ўстаноўленым парадку звестак аб грамадзяніне ў пералік фізічных асоб, абмежаваных у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях.

## § 5. Асаблівасці разгляду спраў аб аб'яўленні непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыя)

**Артыкул 377. Падача заявы. Разгляд заявы**

Непаўналетні, які дасягнуў шаснаццаці гадоў, можа звярнуцца ў суд па месцы свайго жыхарства з заявай аб аб'яўленні яго поўнасцю дзеяздольным у выпадку, прадугледжаным Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Заява прымаецца судом пры адсутнасці згоды аднаго з бацькоў, усынаўляльнікаў або апекавальніка ці ў выпадку адмовы органаў апекі і апекавальніцтва аб'явіць непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным.

Заява разглядаецца судом з абавязковым удзелам заяўніка, аднаго або абодвух бацькоў, усынаўляльнікаў, апекавальніка, а таксама прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва.

**Артыкул 378. Рашэнне суда па заяве**

Суд, разгледзеўшы заяву па сутнасці, выносіць рашэнне, якім задавальняе або адхіляе просьбу заяўніка.

Пры задавальненні заяўленай просьбы непаўналетні, які дасягнуў шаснаццаці гадоў, аб'яўляецца поўнасцю дзеяздольным (эмансіпаваным) з моманту ўступлення рашэння суда аб эмансіпацыі ў законную сілу.

## § 6. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай уласнасці на нерухомую рэч

**Артыкул 379. Падача заявы. Змест заявы**

Заява аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай падаецца ў суд па месцы жыхарства грамадзяніна або месцы знаходжання юрыдычнай асобы, якія ўступілі ў валоданне і (або) карыстанне гэтай рэччу.

Заява аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч і заява аб прызнанні матэрыялаў, з якіх узведзена самавольная пабудова, безгаспадарнымі

і прызнанні права камунальнай уласнасці на іх падаюцца ў суд па месцы знаходжання гэтай рэчы, матэрыялаў, з якіх узведзена самавольная пабудова, органам, упаўнаважаным кіраваць камунальнай маёмасцю.

Суд адмаўляе ў прыняцці заявы аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч, калі орган, упаўнаважаны кіраваць камунальнай маёмасцю, звяртаецца ў суд з такой заявай да сканчэння аднаго года з дня прыняцця гэтай рэчы на ўлік органам, які ажыццяўляе дзяржаўную рэгістрацыю нерухомай маёмасці.

У заяве аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай указваецца, якая рэч падлягае прызнанню безгаспадарнай, апісваюцца яе асноўныя адметныя прыкметы, а таксама прыводзяцца доказы, якія сведчаць аб пакіданні рэчы ўласнікам без намеру захаваць права ўласнасці на яе і аб уступленні заяўніка ў валоданне рэччу.

У заяве органа, упаўнаважанага кіраваць камунальнай маёмасцю, аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч указваецца, кім і калі безгаспадарная нерухомая рэч пастаўлена на ўлік як безгаспадарная, а таксама прыводзяцца доказы, якія сведчаць аб пакіданні гэтай рэчы ўласнікам без намеру захаваць права ўласнасці на яе.

У заяве аб прызнанні матэрыялаў, з якіх узведзена самавольная пабудова, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на такія матэрыялы прыводзяцца доказы, якія сведчаць аб факце ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва і адмове асобы, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва на зямельным участку, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (за выключэннем зямельнага ўчастка, прадастаўленага ў пажыццёвае ўспадкаванае валоданне), выканаць рашэнне абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта аб зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан або прывядзенні самавольнай пабудовы ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан або невыкананні гэтага рашэння ва ўстаноўлены тэрмін.

**Артыкул 380. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе**

Справа аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч, матэрыялы, з якіх узведзена самавольная пабудова, разглядаецца судом з удзелам усіх зацікаўленых па справе асоб.

Суд, прызнаўшы, што рухомая рэч не мае ўласніка або пакінута ім без намеру захаваць права ўласнасці на яе, выносіць рашэнне аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і перадачы яе ва ўласнасць асобы, якая ўступіла ў валоданне ёю.

Суд, прызнаўшы, што нерухомая рэч не мае ўласніка або пакінута ім без намеру захаваць права ўласнасці на яе і прынята на ўлік ва ўстаноўленым парадку, выносіць рашэнне аб прызнанні нерухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай уласнасці на гэту рэч.

Суд, прызнаўшы, што асоба, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва на зямельным участку, які знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (за выключэннем зямельнага ўчастка, прадастаўленага ў пажыццёвае ўспадкаванае валоданне), адмовілася ад выканання рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа аб зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан або прывядзенні самавольнай пабудовы ў ранейшы, да ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва, стан або што такое рашэнне не выканана ва ўстаноўлены тэрмін, а таксама ўстанавіўшы адсутнасць істотных парушэнняў горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правіл, вызначаных падпунктам 3 часткі першай пункта 1 артыкула 223 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, выносіць рашэнне аб прызнанні матэрыялаў, з якіх узведзена самавольная пабудова, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на такія матэрыялы.

## § 6[1]. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі

### Артыкул 380[1]. Падача заявы. Змест заявы

Заява аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі падаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам у суд па месцы выяўлення неэксплуатуемага транспартнага сродку.

Суд адмаўляе ў прыняцці заявы аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, калі мясцовы выканаўчы і распарадчы орган звяртаецца ў суд з такой заявай да сканчэння трох месяцаў з дня ўручэння акта агляду гэтага транспартнага сродку яго ўласніку (уладальніку), а пры адсутнасці звестак аб уласніку (уладальніку) такога транспартнага сродку – да сканчэння трох месяцаў з дня прымусовага перамяшчэння ўказанага транспартнага сродку на ахаваную стаянку.

У заяве аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі павінны быць указаны звесткі аб неэксплуатуемым транспартным сродку, яго ўласніку (уладальніку) (пры наяўнасці такіх звестак), аб датах выяўлення неэксплуатуемага транспартнага сродку, накіравання і ўручэння ўласніку (уладальніку) паведамлення аб неабходнасці на працягу трыццаці каляндарных дзён перамясціць транспартны сродак на ахаваную стаянку, прывесці яго ў належны стан або ўтылізаваць, прымусовага перамяшчэння гэтага транспартнага сродку на ахаваную стаянку і ўручэння акта агляду гэтага транспартнага сродку.

### Артыкул 380[2]. Разгляд заявы. Рашэнне суда па заяве

Заява аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі разглядаецца судом з удзелам усіх зацікаўленых па справе асоб.

Суд, прызнаўшы, што неэксплуатуемы транспартны сродак не мае ўласніка (уладальніка), або ўстанавіўшы, што ўласнікам (уладальнікам) неэксплуатуемага транспартнага сродку не прыняты меры па перамяшчэнні гэтага транспартнага сродку на ахаваную стаянку, прывядзенні яго ў належны стан або яго ўтылізацыі, выносіць рашэнне аб прызнанні неэксплуатуемага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

## § 7. Асаблівасці разгляду спраў аб прызнанні спадчыны вымарачнай

### Артыкул 381. Падача заявы. Змест заявы

Заява аб прызнанні спадчыны вымарачнай падаецца органам мясцовага кіравання або самакіравання ў суд па месцы адкрыцця спадчыны па сканчэнні аднаго года з дня адкрыцця спадчыны або да сканчэння ўказанага тэрміну, калі выдаткі, звязаныя з аховай спадчыны і кіраваннем ёй, перавышаюць яе вартасць.

У заяве аб прызнанні спадчыны вымарачнай павінна быць указана маёмасць, якая ўваходзіць у склад спадчыны, а таксама прыведзены доказы, што пацвярджаюць адсутнасць спадчыннікаў, або адмову іх усіх ад спадчыны, або адсутнасць у іх права ўспадкавання.

**Артыкул 382. Разгляд заявы. Рашэнне суда па заяве**

Заява разглядаецца судом з удзелам прадстаўніка органа мясцовага кіравання або самакіравання з прыцягненнем усіх зацікаўленых па справе асоб.

Пры ўстанаўленні акалічнасцей, прадугледжаных Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, суд выносіць рашэнне аб прызнанні спадчыны вымарачнай і аб перадачы яе ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі па месцы знаходжання адпаведнай маёмасці, якая ўваходзіць у склад спадчыны.

## § 8. Асаблівасці разгляду спраў аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка

**Артыкул 383. Падача заявы**

Асоба, якая страціла дакумент на прад'яўніка або валодае дакументам на прад'яўніка, што страціў прыкметы плацежнасці, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, можа прасіць суд аб аднаўленні правоў па такім дакуменце.

Суд разглядае справы аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка, якія страцілі прыкметы плацежнасці, пры адмове асобы, якая выдала дакумент, праводзіць па ім аперацыі.

Заява па справах аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка падаецца ў суд па месцы знаходжання асобы, якая выдала дакумент.

**Артыкул 384. Змест заявы**

У заяве павінны быць указаны адметныя прыкметы дакумента, імя (найменне) асобы, якая выдала дакумент, а таксама выкладзены акалічнасці, пры якіх адбылася страта дакумента або страта ім прыкмет плацежнасці.

**Артыкул 385. Падрыхтоўка справы да судовага разбору**

Пры ўзбуджэнні справы ў сувязі са стратай дакумента на прад'яўніка суддзя ў парадку падрыхтоўкі справы выносіць вызначэнне:

аб публікацыі ў мясцовай газеце за кошт заяўніка аб'явы аб выкліку трымальніка дакумента ў суд;

аб забароне асобе, якая выдала дакумент, рабіць па ім выплаты і выдачы.

Публікацыя павінна ўтрымліваць:

найменне суда, у які паступіла заява аб страце дакумента;

імя (найменне) асобы, якая падала заяву, і яе адрас;

найменне і адметныя прыкметы дакумента;

прапанову трымальніку дакумента, аб страце якога заяўлена, у трохмесячны тэрмін з дня публікацыі падаць у суд заяву аб сваіх правах на гэты дакумент.

Вызначэнне аб забароне праводзіць выплаты і выдачы выносіцца суддзёй неадкладна пасля прыняцця заявы і адразу ж накіроўваецца асобе, якая выдала дакумент на прад'яўніка. На тэрмін, указаны ў публікацыі, вядзенне справы прыпыняецца.

Вызначэнне аб адмове ў публікацыі ў газеце і забароне праводзіць па страчаным дакуменце аперацыі можа быць абскарджана (апратэставана).

**Артыкул 386. Заява трымальніка дакумента**

Трымальнік дакумента, аб страце якога заяўлена, абавязаны да сканчэння трохмесячнага тэрміну з дня публікацыі падаць у суд, які вынес вызначэнне, заяву аб наяўнасці ў яго гэтага дакумента, аб падставе, на якой ён валодае дакументам, і прадставіць дакумент у арыгінале.

### Артыкул 387. Дзеянні суда пасля паступлення заявы ад трымальніка дакумента

У выпадку паступлення ў суд да сканчэння трохмесячнага тэрміну ад трымальніка дакумента заявы аб яго правах на дакумент суд пакідае заяву асобы, якая страціла дакумент, без разгляду, растлумачвае заяўніку яго права прад'явіць у месячны тэрмін да трымальніка дакумента іск у агульным парадку аб выпатрабаванні гэтага дакумента.

Трымальніку дакумента растлумачваецца яго права на спагнанне з заяўніка страт, прычыненых прынятымі забароннымі мерамі.

Калі ва ўстаноўлены тэрмін заяўнік не прад'явіць іск да трымальніка дакумента, забарона праводзіць выплаты і выдачы па ім губляе сілу, пра што паведамляецца асобе, якая выдала дакумент.

У выпадку паступлення ад трымальніка дакумента да сканчэння трохмесячнага тэрміну заявы аб тым, што ён не прад'яўляе права на дакумент, суд выносіць вызначэнне аб вяртанні дакумента заяўніку, аб адмене забароны праводзіць па ім выплаты і выдачы і аб спыненні вядзення справы.

На вызначэнне суда па пытаннях, указаных у гэтым артыкуле, можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

### Артыкул 388. Дзеянні суда пры адсутнасці заявы трымальніка дакумента

Калі ў трохмесячны тэрмін трымальнік дакумента не звернецца ў суд з заявай, справа аб аднаўленні правоў па страчаным дакуменце на прад'яўніка прызначаецца да судовага разбору.

Паступленне ў суд заявы ад трымальніка дакумента па сканчэнні трохмесячнага тэрміну, але да разгляду справы па сутнасці цягне за сабой наступствы, прадугледжаныя артыкулам 387 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 389. Рашэнне суда па справе

У выпадку задавальнення просьбы заяўніка суд выносіць матываванае рашэнне, якім прызнае страчаны дакумент або дакумент, што страціў прыкметы плацежнасці, несапраўдным. Гэта рашэнне з'яўляецца падставай для выдачы заяўніку новага дакумента замест прызнанага несапраўдным.

### Артыкул 390. Права трымальніка дакумента прад'явіць іск аб беспадстаўным набыцці або захаванні маёмасці

Трымальнік дакумента, які не заявіў па якіх-небудзь прычынах своечасова аб сваіх правах на гэты дакумент, пасля ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб прызнанні дакумента несапраўдным можа прад'явіць да асобы, якая атрымала на падставе рашэння суда маёмасць або новы дакумент замест страчанага, іск аб беспадстаўным набыцці або захаванні маёмасці.

## § 9. Асаблівасці разгляду спраў аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзян, прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзян

### Артыкул 391. Падача і разгляд заявы аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні

У выпадку, калі законам прадугледжаны прымусовая шпіталізацыя і лячэнне грамадзян паводле рашэння суда, заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні падаецца ў суд дзяржаўнай арганізацыяй аховы здароўя па месцы яе знаходжання або месцы жыхарства (месцы знаходжання) грамадзяніна.

Да заявы аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні дадаецца заключэнне аб неабходнасці прымусовай шпіталізацыі і лячэння, вынесенае ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні разглядаецца судом на працягу пяці дзён з дня яе паступлення з абавязковым удзелам прадстаўніка дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя, грамадзяніна, заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні якога разглядаецца, або яго законнага прадстаўніка.

У выпадку ўхілення грамадзяніна, заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні якога разглядаецца, ад яўкі ў суд ён можа быць падвергнуты прыводу.

Суд можа разгледзець справу аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна ў яго адсутнасць, калі ўдзел грамадзяніна ў судовым пасяджэнні немагчымы па стане яго здароўя.

**Артыкул 392. Рашэнне суда па заяве аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні**

Разгледзеўшы заяву аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні па сутнасці, суд выносіць матываванае рашэнне, якім адхіляе або задавальняе гэту заяву.

Рашэнне суда аб задавальненні заявы аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні з'яўляецца падставай для прымусовай шпіталізацыі і лячэння.

**Артыкул 392[1]. Падача і разгляд заявы аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння**

Заява аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння падаецца ў суд дзяржаўнай арганізацыяй аховы здароўя па месцы яе знаходжання.

Да заявы аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння дадаецца заключэнне аб неабходнасці прадаўжэння тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння, вынесенае ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Заява аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння разглядаецца судом на працягу трох дзён з дня яе паступлення з абавязковым удзелам прадстаўніка дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

**Артыкул 393. Рашэнне суда па заяве аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння**

Разгледзеўшы заяву аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння па сутнасці, суд выносіць матываванае рашэнне, якім адхіляе або задавальняе гэту заяву.

Рашэнне суда аб задавальненні заявы аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння з'яўляецца падставай для прадаўжэння тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна на тэрмін, устаноўлены законам.

Рашэнне суда аб адхіленні заявы аб прадаўжэнні тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння з'яўляецца падставай для выпіскі грамадзяніна з дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

## § 10. Асаблівасці разгляду спраў аб усынаўленні дзіцяці

**Артыкул 393[1]. Падача заявы**

Заява аб усынаўленні дзіцяці падаецца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, жадаюць усынавіць дзіця, якое з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, у раённы (гарадскі) суд па месцы свайго жыхарства або па месцы жыхарства (знаходжання) дзіцяці, якое ўсынаўляецца.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, замежныя грамадзяне або асобы без грамадзянства, якія жадаюць усынавіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіця, якое з’яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне або асобы без грамадзянства, якія жадаюць усынавіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіця, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам або асобай без грамадзянства і пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаюць заяву аб усынаўленні дзіцяці ў абласны суд па месцы жыхарства (знаходжання) дзіцяці, якое ўсынаўляецца, а ў горадзе Мінску – у Мінскі гарадскі суд. Заява падаецца праз установу «Нацыянальны цэнтр усынаўлення Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь» (далей – Нацыянальны цэнтр усынаўлення), якая ў пятнаццацідзённы тэрмін з дня паступлення заявы накіроўвае яе ва ўстаноўленым парадку ў адпаведны суд.

**Артыкул 393$^{2}$. Змест заявы і пералік дакументаў, якія дадаюцца да яе**

У заяве аб усынаўленні дзіцяці павінны быць указаны:

1) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, дата нараджэння і месца жыхарства ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў);

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, дата нараджэння і месца жыхарства (знаходжання) дзіцяці, якое ўсынаўляецца;

3) акалічнасці, якія абгрунтоўваюць просьбу ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) аб усынаўленні дзіцяці.

У заяве аб усынаўленні дзіцяці можа ўтрымлівацца просьба аб змяненні прозвішча, уласнага імені, імені па бацьку дзіцяці, якое ўсынаўляецца, даты яго нараджэння, месца нараджэння дзіцяці, якое ўсынаўляецца, а таксама аб запісе ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) у запісе акта аб нараджэнні дзіцяці ў якасці бацькі або маці (бацькоў).

Да заявы аб усынаўленні дзіцяці павінны быць прыкладзены:

1) копія пасведчання аб шлюбе ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) – пры ўсынаўленні дзіцяці асобай (асобамі), якая знаходзіцца (якія знаходзяцца) у шлюбе;

2) дакумент, які пацвярджае згоду аднаго з сужэнцаў на ўсынаўленне, – пры ўсынаўленні дзіцяці другім сужэнцам;

3) медыцынскае заключэнне аб стане здароўя ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў);

4) акт абследавання органа апекі і апекавальніцтва ўмоў жыцця ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў), які ўтрымлівае ў ліку іншых звестак інфармацыю пра тое, ці меў усынаўляльнік на момант усынаўлення непагашаную або нязнятую судзімасць за наўмысныя злачынствы, ці асуджаўся за наўмысныя цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы супраць чалавека, ці прызнавалася дзіця ўсынаўляльніка маючым патрэбу ў дзяржаўнай абароне ў сувязі з невыкананнем або неналежным выкананнем гэтай асобай сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзіцяці, ці пазбаўляўся бацькоўскіх правоў або быў абмежаваны ў іх, ці прызнаваўся недзеяздольным або абмежавана дзеяздольным, ці адхіляўся ад абавязкаў апекуна, апекавальніка за неналежнае выкананне ўскладзеных на яго абавязкаў, ці не было раней у дачыненні да яго адменена ўсынаўленне;

5) даведка з месца працы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) аб займанай пасадзе і заработнай плаце або копія дэкларацыі аб даходах ці іншы дакумент аб даходах за год, што папярэднічае ўсынаўленню;

6) дакумент, які пацвярджае права карыстання ўсынаўляльнікам (усынаўляльнікамі) жылым памяшканнем або права ўласнасці на жылое памяшканне;

7) дакумент, які ўтрымлівае дазвол Міністра адукацыі на ўсынаўленне, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з’яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства, а таксама пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам або асобай без грамадзянства і пражывае на тэрыторыі Рэспублікі

Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства;

7[1]) дакумент, які ўтрымлівае дазвол кампетэнтнага органа дзяржавы, на тэрыторыі якой пастаянна пражываюць усынаўляльнікі, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, а таксама дзіцяці, якое з'яўляецца замежным грамадзянінам або асобай без грамадзянства і пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства;

8) дакумент, які ўтрымлівае дазвол кампетэнтнага органа дзяржавы, грамадзянінам якой з'яўляецца дзіця, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з'яўляецца замежным грамадзянінам і пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

8[1]) дакумент, які пацвярджае згоду дзіцяці на ўсынаўленне, калі гэта патрабуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з'яўляецца замежным грамадзянінам і пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

9) заключэнне Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення аб адсутнасці кандыдатаў ва ўсынаўляльнікі – грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, або родзічаў дзіцяці незалежна ад грамадзянства і месца жыхарства гэтых родзічаў, якія выказалі намер усынавіць гэтае дзіця, што ўключае таксама звесткі аб пастаноўцы дзіцяці, якое ўсынаўляецца, на цэнтралізаваны ўлік у рэспубліканскі банк даных аб усынаўленні (удачарэнні) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, – пры ўсынаўленні грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў і з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 393$^{3}$. Падрыхтоўка справы да судовага разбору**

Суд пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору выносіць вызначэнне аб прадастаўленні органамі апекі і апекавальніцтва па месцы жыхарства (знаходжання) дзіцяці, якое ўсынаўляецца, заключэння аб абгрунтаванасці і адпаведнасці ўсынаўлення інтарэсам дзіцяці з указаннем звестак аб факце асабістых зносін усынаўляльніка (усынаўляльнікаў) з дзіцем, якое ўсынаўляецца. Да заключэння органа апекі і апекавальніцтва павінны быць прыкладзены:

1) пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці, якое ўсынаўляецца;

2) медыцынскае заключэнне аб стане здароўя, фізічным і разумовым развіцці дзіцяці, якое ўсынаўляецца;

3) дакумент, што пацвярджае згоду дзіцяці, якое ўсынаўляецца і дасягнула ўзросту дзесяці гадоў, на ўсынаўленне, а таксама на магчымыя змяненні яго прозвішча, уласнага імені, імені па бацьку і запіс усынаўляльніка (усынаўляльнікаў) у якасці яго бацькі або маці (бацькоў), за выключэннем выпадкаў, калі такая згода ў адпаведнасці з законам не патрабуецца;

4) дакумент, што пацвярджае згоду бацькоў дзіцяці на яго ўсынаўленне (пры ўсынаўленні дзіцяці непаўналетніх бацькоў, якія не набылі поўную дзеяздольнасць, – таксама дакумент, які пацвярджае згоду іх законных прадстаўнікоў, апекуна, апекавальніка), або дакумент, што пацвярджае наяўнасць адной з акалічнасцей, пры якіх у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ўсынаўленне дзіцяці дапускаецца без згоды яго бацькоў;

5) дакумент, што пацвярджае згоду на ўсынаўленне дзіцяці яго апекуна, апекавальніка, прыёмных бацькоў або кіраўніка ўстановы, у якой знаходзіцца дзіця, якое засталося без апекавання бацькоў;

6) звесткі аб наяўнасці і месцы знаходжання братоў і сясцёр у дзіцяці, якое ўсынаўляецца.

Пры ўсынаўленні дзіцяці адной асобай суд у інтарэсах дзіцяці высвятляе таксама магчымасць захавання асабістых немаёмасных і маёмасных правоў і абавязкаў дзіцяці з адным з бацькоў або з родзічамі аднаго з памерлых бацькоў.

**Артыкул 393[4]. Разгляд заявы**

Заява аб усынаўленні дзіцяці разглядаецца судом на працягу пятнаццаці дзён з дня:

1) падачы ў суд заявы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) – пры ўсынаўленні дзіцяці, якое з’яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

2) паступлення ў суд заявы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) з Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення – пры ўсынаўленні дзіцяці, якое з’яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства, а таксама пры ўсынаўленні дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам або асобай без грамадзянства і пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства.

Справы аб усынаўленні дзіцяці суд разглядае з абавязковым удзелам самога ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў), прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва, пракурора, а па справах аб міжнародным усынаўленні – таксама з удзелам прадстаўніка Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.

Справы аб усынаўленні разглядаюцца судом у закрытым судовым пасяджэнні.

**Артыкул 393[5]. Рашэнне суда па заяве**

Суд, разгледзеўшы заяву аб усынаўленні дзіцяці па сутнасці, выносіць матываванае рашэнне аб задавальненні заявы аб усынаўленні дзіцяці або аб адмове ў яе задавальненні. У рашэнні суда павінна быць указана аб задавальненні або адмове ў задавальненні просьбы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) аб змяненні прозвішча, уласнага імені, імені па бацьку, даты і (або) месца нараджэння дзіцяці, якое ўсынаўляецца, а таксама аб запісе ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) у запісе акта аб нараджэнні ў якасці бацькі (бацькоў) усыноўленага дзіцяці.

У інтарэсах дзіцяці пры ўсынаўленні яго адной асобай у рашэнні суда аб усынаўленні па жаданні маці, калі ўсынаўляльнік – мужчына, або па жаданні бацькі, калі ўсынаўляльнік – жанчына, а таксама калі адзін з бацькоў дзіцяці, якое ўсынаўляецца, памёр, то па просьбе бацькоў памерлага (дзядулі або бабулі дзіцяці) указваецца аб захаванні праваадносін усыноўленага дзіцяці з адным з бацькоў або з родзічамі аднаго з памерлых бацькоў.

Пры задавальненні заяўленай просьбы ўзаемныя правы і абавязкі ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) і ўсыноўленага дзіцяці ўстанаўліваюцца з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб устанаўленні ўсынаўлення дзіцяці.

Суд абавязаны на працягу трох дзён з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб устанаўленні ўсынаўлення дзіцяці накіраваць выпіску з гэтага рашэння ў орган, які рэгіструе акты грамадзянскага стану, па месцы вынясення рашэння, а таксама ў орган апекі і апекавальніцтва па месцы жыхарства ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) і Нацыянальны цэнтр усынаўлення.

## § 11. Асаблівасці разгляду спраў аб змяшчэнні непаўналетніх у спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы або спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб пераводзе непаўналетніх са спецыяльных навучальна-выхаваўчых устаноў у спецыяльныя лячэбна-выхаваўчыя ўстановы, аб спыненні знаходжання непаўналетніх ва ўказаных установах да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў іх, аб прадаўжэнні гэтага тэрміну, а таксама аб змяшчэнні непаўналетніх у прыёмнікі-размеркавальнікі для непаўналетніх, аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання непаўналетніх у прыёмніках-размеркавальніках для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетніх з прыёмнікаў-размеркавальнікаў для непаўналетніх

### Артыкул 393$^{6}$. Падача заявы

Заява аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову падаецца камісіяй па справах непаўналетніх у суд па месцы жыхарства непаўналетняга.

Заявы аб пераводзе непаўналетняга са спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы ў спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову, аб спыненні знаходжання непаўналетняга ва ўказаных установах да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў іх, а таксама аб прадаўжэнні гэтага тэрміну падаюцца кіраўніком спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы або кіраўніком спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы ў суд па месцы знаходжання спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы.

Заява аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх падаецца начальнікам органа ўнутраных спраў або яго намеснікам у суд па месцы затрымання непаўналетняга або па месцы знаходжання прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх, заява аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх або аб вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх – у суд па месцы знаходжання прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх.

Да заявы дадаюцца матэрыялы, якія прадугледжаны заканадаўствам і пацвярджаюць неабходнасць змяшчэння непаўналетняга ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову ці ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх.

### Артыкул 393$^{7}$. Разгляд заявы

Заявы, указаныя ў частцы першай артыкула 393$^{6}$ гэтага Кодэкса, разглядаюцца судом на працягу пятнаццаці дзён з дня іх паступлення ў суд, указаныя ў частках другой і трэцяй гэтага артыкула, – на працягу трох дзён.

Суд перад разглядам заявы аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову абавязаны выпатрабаваць крымінальную справу ў дачыненні да гэтага непаўналетняга, вядзенне якой спынена, або матэрыялы аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы ці матэрыялы спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Удзел непаўналетняга, у дачыненні да якога ўзбуджана справа асаблівага вядзення, яго законных прадстаўнікоў, прадстаўнікоў камісіі па справах непаўналетніх, органаў унутраных спраў, па чыёй ініцыятыве ўзбуджана справа, прадстаўнікоў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы, у якой знаходзіцца непаўналетні, а таксама пракурора і прадстаўнікоў органа апекі і апекавальніцтва ў судовым пасяджэнні з’яўляецца абавязковым.

Непаўналетнія, якія дасягнулі ўзросту шаснаццаці гадоў, а таксама законныя прадстаўнікі непаўналетніх, якія ўхіляюцца ад яўкі ў суд, могуць быць па вызначэнні суда падвергнуты прыводу.

**Артыкул 393$^{8}$. Рашэнне (вызначэнне) суда па заяве**

Разгледзеўшы заяву па сутнасці, суд выносіць матываванае рашэнне, а ў выпадках, прадугледжаных законам, – вызначэнне, якім задавальняе заяву або адмаўляе ў яе задавальненні.

Рашэнне суда аб задавальненні заявы, якое ўступіла ў законную сілу, з'яўляецца падставай для змяшчэння непаўналетняга ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову на тэрмін, устаноўлены судом, ці для пераводу непаўналетняга са спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы ў спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову, ці для спынення знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў ёй, а таксама для прадаўжэння гэтага тэрміну.

Вызначэнне суда аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх, прадаўжэнні тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх або вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх падлягае неадкладнаму выкананню.

## § 12. Асаблівасці разгляду спраў аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі, прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі

**Артыкул 393$^{9}$. Падача і разгляд заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый**

Заява аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый падаецца ў суд органам унутраных спраў па месцы знаходжання органа ўнутраных спраў.

У заяве аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый павінны быць указаны падставы для накіравання яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі.

Да заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый прыкладаюцца дакументы, пералік якіх вызначаны заканадаўчымі актамі.

Заява аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца на працягу дзесяці дзён з дня яе паступлення ў суд з абавязковым удзелам прадстаўніка органа ўнутраных спраў, грамадзяніна, заява аб накіраванні якога ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца судом.

У разглядзе заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый могуць удзельнічаць прадстаўнікі арганізацый, члены сям'і грамадзяніна, заява аб накіраванні якога ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца судом, і іншыя грамадзяне.

У выпадку ўхілення грамадзяніна, заява аб накіраванні якога ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца судом, ад яўкі ў суд ён можа быць падвергнуты прыводу.

**Артыкул 393$^{10}$. Рашэнне суда па заяве аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый**

Разгледзеўшы заяву аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый па сутнасці, суд выносіць матываванае рашэнне аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый або аб адмове ў накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый.

У рашэнні суда аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый указваецца тэрмін яго знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

Пры наяўнасці ў грамадзяніна, у дачыненні да якога судом вынесена рашэнне аб накіраванні ў лячэбна-працоўны прафілакторый, на ўтрыманні непаўналетніх дзяцей копія рашэння суда не пазней за наступны дзень пасля яго вынясення накіроўваецца ва ўпраўленне (аддзел) адукацыі гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства непаўналетніх дзяцей для забеспячэння іх дзяржаўнай абароны.

### Артыкул 393[11]. Падача і разгляд заяў аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі

Заявы аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі падаюцца лячэбна-працоўным прафілакторыем у суд па месцы знаходжання лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

Да заяў, у якіх павінны быць указаны падставы для прадаўжэння тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэння тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі, прыкладаюцца дакументы, пералік якіх вызначаны заканадаўчымі актамі.

Заявы аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі разглядаюцца на працягу трох дзён з дня іх паступлення ў суд з абавязковым удзелам прадстаўніка лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

### Артыкул 393[12]. Рашэнне суда па заявах аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі

Разгледзеўшы заявы аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі па сутнасці, суд выносіць матываваныя рашэнні аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

У рашэнні суда аб прадаўжэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі ўказваецца, на які тэрмін прадаўжаецца яго знаходжанне ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

## ГЛАВА 31
## ЗАГАДНАЕ ВЯДЗЕННЕ

### Артыкул 394. Паняцце загаднага вядзення

Загадным вядзеннем з’яўляецца вядзенне па заяве аб спагнанні грашовай сумы або выпатрабаванні рухомай маёмасці з даўжніка без правядзення судовага пасяджэння і выкліку бакоў у выпадках, калі:

1) патрабаванне заснавана на натарыяльна засведчанай здзелцы, за выключэннем натарыяльна засведчанай здзелкі, на падставе якой узнікае абавязацельства па выплаце грашовых сродкаў;

2) заяўлена патрабаванне аб спагнанні аліментаў на непаўналетніх дзяцей, але яно не звязана з устанаўленнем мацярынства і (або) бацькоўства або неабходнасцю прыцягнення трэціх асоб для ўдзелу ў справе;

3) заяўлена патрабаванне аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, з асобы, абавязанай кампенсаваць такія выдаткі, якая не працуе або працуе, але не ў поўным аб'ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку паводле яе заявы ўказаныя выдаткі. У выпадках, калі месца жыхарства (месца знаходжання) гэтай асобы невядомае, спагнанне з яе такіх выдаткаў ажыццяўляецца ў парадку іскавага вядзення;

4) патрабаванне заснавана на здзелцы, заключанай у простай пісьмовай форме.

Загаднае вядзенне заканчваецца вынясеннем суддзёй вызначэння аб судовым загадзе.

Вызначэнне аб судовым загадзе з'яўляецца адначасова выканаўчым дакументам і прыводзіцца ў выкананне ў парадку, устаноўленым для выканання судовых рашэнняў.

Не падлягаюць разгляду ў парадку загаднага вядзення патрабаванні, спагнанне па якіх у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ажыццяўляецца шляхам здзяйснення натарыусам выканаўчага надпісу.

**Артыкул 395. Падача і змест заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення**

Заява аб узбуджэнні загаднага вядзення падаецца ў суд па правілах падсуднасці, устаноўленых главой 5 гэтага Кодэкса.

У заяве павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) спагнанніка і даўжніка, іх месца жыхарства (месца знаходжання) або месца размяшчэння;

3) патрабаванні спагнанніка і акалічнасці, на якіх яны заснаваны;

4) спасылка на дакументы, якія пацвярджаюць абгрунтаванасць патрабаванняў;

5) пералік прыкладзеных дакументаў;

6) кошт рухомай маёмасці, калі патрабаванні звязаны з яе выпатрабаваннем.

Заява падпісваецца спагнаннікам або яго прадстаўніком, які мае адпаведныя паўнамоцтвы. Заява павінна быць аплачана дзяржаўнай пошлінай у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадкаў вызвалення ад выплаты дзяржаўнай пошліны. Да заявы, пададзенай прадстаўніком, прыкладаецца дакумент, які сведчыць яго паўнамоцтвы.

**Артыкул 396. Падставы для адмовы ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення**

Суддзя адмаўляе ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення па падставах, прадугледжаных артыкуламі 245 і 246 гэтага Кодэкса.

Акрамя таго, суддзя адмаўляе ў прыняцці заявы ў выпадках, калі:

1) заяўленыя патрабаванні не прадугледжаны артыкулам 394 гэтага Кодэкса;

2) месца жыхарства або месца знаходжання даўжніка знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь;

3) не прадстаўлены дакументы, што пацвярджаюць заяўленыя патрабаванні;

4) бачыцца наяўнасць спрэчкі аб праве, якую немагчыма вырашыць на падставе прадстаўленых дакументаў;

5) заява не аплачана дзяржаўнай пошлінай.

Аб адмове ў прыняцці заявы суддзя ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення заявы ў суд выносіць вызначэнне, якое абскарджанню (апратэставанню) не падлягае.

Адмова ў прыняцці заявы аб узбуджэнні загаднага вядзення не перашкаджае магчымасці прад'яўлення спагнаннікам іску па тых жа патрабаваннях у парадку іскавага

вядзення. У гэтым выпадку дзяржаўная пошліна, выплачаная спагнаннікам, залічваецца ў лік пошліны па іскавай заяве, якая падлягае выплаце.

### Артыкул 397. Парадак вынясення і змест вызначэння аб судовым загадзе

Вызначэнне аб судовым загадзе выносіцца ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення заявы ў суд.

У вызначэнні павінны быць указаны:

1) нумар вядзення і дата вынясення вызначэння, указанне аб уступленні вызначэння ў законную сілу;

2) найменне і адрас суда, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) суддзі, які вынес вызначэнне;

3) звесткі аб даўжніку і спагнанніку:

у дачыненні да грамадзяніна, індывідуальнага прадпрымальніка – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць), іх месца жыхарства (месца знаходжання). У дачыненні да даўжніка, які з’яўляецца грамадзянінам або індывідуальным прадпрымальнікам, таксама павінны быць указаны дата і месца яго нараджэння (пры наяўнасці звестак пра месца нараджэння), даныя дакумента, які сведчыць яго асобу (ідэнтыфікацыйны нумар, серыя (пры іх наяўнасці), нумар, дата выдачы, найменне органа, які выдаў дакумент), месца працы (калі яно вядомае), а ў дачыненні да даўжніка, які з’яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, акрамя ўказанага – таксама рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі, уліковы нумар плацельшчыка;

у дачыненні да юрыдычнай асобы, арганізацыі, якая не з’яўляецца юрыдычнай асобай, – іх найменне і месца знаходжання, рэгістрацыйны нумар і дата дзяржаўнай рэгістрацыі, уліковы нумар плацельшчыка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве;

у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак – найменне і адрас органа, упаўнаважанага выступаць ад іх імені бокам выканаўчага вядзення;

4) нарматыўны акт, на падставе якога задаволены патрабаванні;

5) памер грашовых сум, якія падлягаюць спагнанню, або абазначэнне рухомай маёмасці, якая падлягае выпатрабаванню, з указаннем яе кошту;

6) памер няўстойкі (штрафу, пені), калі яе спагнанне прадугледжана заканадаўствам або дагаворам;

7) сума дзяржаўнай пошліны, якая падлягае спагнанню з даўжніка на карысць спагнанніка або ў даход дзяржавы, а таксама памер выдаткаў, звязаных з разглядам справы;

8) пералік дакументаў, якія пацвярджаюць патрабаванні спагнанніка.

У вызначэнні аб судовым загадзе аб спагнанні аліментаў на непаўналетніх дзяцей, акрамя звестак, прадугледжаных пунктамі 1–4 і 7 часткі другой гэтага артыкула, указваюцца дата і месца нараджэння даўжніка, месца яго працы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і дата нараджэння кожнага дзіцяці, на ўтрыманне якога прысуджаны аліменты, памер плацяжоў, якія спаганяюцца штомесяц з даўжніка, і тэрмін іх спагнання.

У вызначэнні аб судовым загадзе аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, павінны быць вырашаны пытанні працаўладкавання асобы, абавязанай кампенсаваць гэтыя выдаткі, якая не працуе або працуе, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку паводле яе заявы выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні.

Суддзя мае права вызначэннем вырашыць пытанне аб выпраўленні апісак і відавочных падліковых памылак у вызначэнні аб судовым загадзе.

### Артыкул 398. Выкананне і адмена вызначэння аб судовым загадзе

На працягу трох дзён пасля вынясення вызначэння аб судовым загадзе суддзя накіроўвае яго копію даўжніку з паведамленнем аб уручэнні.

Паведамленне даўжніку аб вынясенні ў дачыненні да яго вызначэння аб судовым загадзе аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, накіроўваецца судом па апошнім вядомым месцы жыхарства даўжніка і лічыцца належным.

Даўжнік мае права ў дзесяцідзённы тэрмін з дня атрымання копіі вызначэння накіраваць у суд пярэчанні супраць заяўленых патрабаванняў з выкарыстаннем любых сродкаў сувязі.

Суддзя адмяняе вызначэнне аб судовым загадзе, калі ад даўжніка ва ўстаноўлены тэрмін паступяць пярэчанні супраць заяўленых патрабаванняў, аб чым выносіць вызначэнне.

Іншая асоба, правы і (або) законныя інтарэсы якой закранаюцца вызначэннем аб судовым загадзе, у дзесяцідзённы тэрмін з дня, калі гэтай асобе стала вядома аб вынясенні такога вызначэння, мае права падаць у суд матываваную заяву аб адмене вызначэння аб судовым загадзе з выкарыстаннем любых сродкаў сувязі. Па выніках разгляду такой заявы суддзя выносіць вызначэнне аб адмене вызначэння аб судовым загадзе або вызначэнне аб адмове ў адмене вызначэння аб судовым загадзе.

У вызначэнні аб адмене вызначэння аб судовым загадзе суддзя растлумачвае, што заяўленыя патрабаванні спагнанніка могуць быць прад’яўлены ў парадку іскавага вядзення.

Копіі вызначэння аб адмене вызначэння аб судовым загадзе або вызначэння аб адмове ў адмене вызначэння аб судовым загадзе накіроўваюцца бакам, а таксама іншай асобе, якая падала матываваную заяву аб адмене вызначэння аб судовым загадзе, правы і (або) законныя інтарэсы якой закранаюцца вызначэннем аб судовым загадзе, не пазней за тры дні пасля яго вынясення.

Калі ва ўстаноўлены тэрмін ад даўжніка не паступіць у суд пярэчанне, суддзя выдае спагнанніку вызначэнне аб судовым загадзе з указаннем даты ўступлення яго ў законную сілу, заверанае пячаткай суда з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, для прад’яўлення яго да выканання.

Для спагнання дзяржаўнай пошліны з даўжніка ў даход дзяржавы асобны экзэмпляр вызначэння аб судовым загадзе з указаннем даты ўступлення яго ў законную сілу, завераны пячаткай суда з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, накіроўваецца ў падатковы орган.

Вызначэнне аб судовым загадзе аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у якім вырашаны пытанні працаўладкавання асобы, абавязанай кампенсаваць указаныя выдаткі, якая не працуе або працуе, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку паводле яе заявы выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, на працягу трох працоўных дзён пасля яго вынясення накіроўваецца ў органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства гэтай асобы для падбору з мэтай яе працаўладкавання.

Калі падчас прымусовага выканання вызначэння аб судовым загадзе праведзена замена боку выканаўчага вядзення і ўтворана некалькі даўжнікоў або спагнаннікаў, суд, які выдаў вызначэнне аб судовым загадзе, на падставе прадстаўлення судовага выканаўцы і пастановы аб замене боку выканаўчага вядзення выдае неабходную колькасць экзэмпляраў вызначэння аб судовым загадзе.

## РАЗДЗЕЛ VIII
## ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ У АПЕЛЯЦЫЙНЫМ ПАРАДКУ І Ў ПАРАДКУ НАГЛЯДУ. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ПА НОВЫХ АКАЛІЧНАСЦЯХ

## ГЛАВА 32
## ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ У АПЕЛЯЦЫЙНЫМ ПАРАДКУ

### § 1. Перагляд у апеляцыйным парадку судовых пастаноў суда першай інстанцыі

#### Артыкул 399. Права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) рашэння суда, якое не ўступіла ў законную сілу

Рашэнне суда першай інстанцыі, якое не ўступіла ў законную сілу, можа быць абскарджана ў апеляцыйным парадку бакамі і іншымі юрыдычна зацікаўленымі ў зыходзе справы асобамі, а таксама іншымі асобамі, калі суд вынес рашэнне аб іх правах і абавязках.

Іншыя асобы, у дачыненні да якіх суд вынес рашэнне аб іх правах і абавязках, пры вядзенні спраў у судзе апеляцыйнай інстанцыі карыстаюцца правамі і выконваюць абавязкі, прадугледжаныя гэтай главой для юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

Пракурор або намеснік пракурора мае права прынесці пратэст на рашэнне суда незалежна ад таго, ці ўдзельнічаў ён у разглядзе гэтай справы. Памочнікі пракурораў, пракуроры структурных падраздзяленняў органаў пракуратуры прыносяць пратэсты на рашэнні суда толькі па справах, у разглядзе якіх яны ўдзельнічалі.

Рашэнне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь абскарджанню (апратэставанню) у апеляцыйным парадку не падлягае.

#### Артыкул 400. Права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда, якія не ўступілі ў законную сілу

Бакі і іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права ў апеляцыйным парадку падаць прыватную скаргу, а пракуроры – прынесці прыватны пратэст на вызначэнні суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу, у парадку і выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Вызначэнні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь абскарджанню (апратэставанню) у апеляцыйным парадку не падлягаюць.

#### Артыкул 401. Суды апеляцыйнай інстанцыі

Апеляцыйныя скаргі і (або) апеляцыйныя пратэсты на рашэнні суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу, прыватныя скаргі і (або) прыватныя пратэсты на вызначэнні суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу, разглядаюцца:

на рашэнні і вызначэнні раённых (гарадскіх) судоў – судовай калегіяй па грамадзянскіх справах адпаведнага абласнога, Мінскага гарадскога судоў;

на рашэнні і вызначэнні абласных, Мінскага гарадскога судоў – судовай калегіяй па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

### § 2. Узбуджэнне апеляцыйнага вядзення

#### Артыкул 402. Парадак падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту

Апеляцыйныя скаргі і (або) апеляцыйныя пратэсты адрасуюцца ў суд апеляцыйнай інстанцыі, але адпаведна падаюцца і (або) прыносяцца ў суд, які вынес рашэнне.

Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст, пададзеная і (або) прынесены непасрэдна ў суд апеляцыйнай інстанцыі, накіроўваюцца не пазней за наступны дзень судом апеляцыйнай інстанцыі ў суд першай інстанцыі для вырашэння пытання аб іх прыняцці ў парадку, прадугледжаным гэтым параграфам.

**Артыкул 403. Тэрміны апеляцыйнага абскарджання (апратэставання)**

Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне суда першай інстанцыі адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін з дня вынясення рашэння або ўручэння асобе, якая мае права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне), па яе патрабаванні рашэння з матывавальнай часткай.

Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне па справе, у матэрыялах якой утрымліваюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін з дня вынясення рашэння або ўручэння выпіскі з яго, а ў выпадку стварэння матывавальнай часткі рашэння – з дня азнаямлення з ёй.

Пры вынясенні судом па справе дадатковага рашэння тэрмін апеляцыйнага абскарджання (апратэставання) вылічваецца з дня вынясення дадатковага рашэння.

Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне, вынесенае ў парадку завочнага вядзення, адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін з дня сканчэння тэрміну падачы адказчыкам заявы аб адмене завочнага рашэння або з дня вынясення вызначэння суда аб адмове ў задавальненні такой заявы.

Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту можа быць адноўлены судом, які вынес рашэнне.

**Артыкул 404. Падставы да адмовы ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

Суддзя адмаўляе ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту:

1) асобам, якія не маюць права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне);

2) калі рашэнне не падлягае абскарджанню (апратэставанню) у апеляцыйным парадку;

3) асобам, якія прапусцілі тэрмін падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту, калі адмоўлена ў яго аднаўленні.

Вызначэнне суддзі аб адмове ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту можа быць абскарджана (апратэставана) у суд апеляцыйнай інстанцыі.

**Артыкул 405. Змест апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст павінны адпавядаць агульным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да працэсуальных дакументаў (артыкул 109 гэтага Кодэкса), а таксама ўтрымліваць:

1) указанне на рашэнне, якое абскарджваецца або апратэстоўваецца, межы яго абскарджання (апратэставання) і найменне суда, які вынес рашэнне;

2) абгрунтаванне таго, у чым заключаецца няправільнасць разгляду справы, незаконнасць і неабгрунтаванасць рашэння, са спасылкай на законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты, акалічнасці справы і доказы;

3) просьбу асобы, якая падае апеляцыйную скаргу, або пракурора, які прыносіць апеляцыйны пратэст, у частцы таго, абскарджваецца ці апратэстоўваецца рашэнне поўнасцю або ў частцы, якія змяненні патрабуецца ў яго ўнесці;

4) хадайніцтва аб даследаванні новых доказаў, якія маюць значэнне для справы, калі суд першай інстанцыі неабгрунтавана адмовіў у іх прыняцці або калі немагчымасць іх прадстаўлення суду першай інстанцыі была абумоўлена ўважлівымі прычынамі;

5) пералік пісьмовых матэрыялаў, якія прыкладаюцца да апеляцыйнай скаргі або апеляцыйнага пратэсту;

6) дату падачы апеляцыйнай скаргі або прынясення апеляцыйнага пратэсту.

Да апеляцыйнай скаргі, якая падаецца прадстаўніком, павінны быць прыкладзены даверанасць або іншы дакумент, які сведчыць паўнамоцтвы прадстаўніка.

Калі апеляцыйная скарга падлягае аплаце, то да яе павінен быць прыкладзены дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна выплачана пры дапамозе выкарыстання аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы (далей – сістэма АРІП) і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў апеляцыйнай скарзе або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы скаргі.

### Артыкул 406. Копіі апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту і пісьмовых матэрыялаў, якія прыкладаюцца да іх

Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст і пісьмовыя матэрыялы, якія прыкладаюцца да іх, адпаведна падаюцца і (або) прыносяцца ў суд першай інстанцыі з копіямі па колькасці юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

### Артыкул 407. Пакіданне апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без руху

Пры падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясенні апеляцыйнага пратэсту, якія не адпавядаюць патрабаванням, прадугледжаным пунктамі 1–3 часткі першай і часткай трэцяй артыкула 405, артыкулам 406 гэтага Кодэкса, суддзя выносіць вызначэнне, якім пакідае апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст без руху і прызначае тэрмін для выпраўлення недахопаў.

Калі асоба, якая падала апеляцыйную скаргу, або пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст, ва ўстаноўлены тэрмін выканаюць указанні, якія ўтрымліваюцца ў вызначэнні, апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст лічацца адпаведна пададзенай і (або) прынесеным у дзень першапачатковага прадстаўлення іх у суд. У адваротным выпадку апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст лічацца адпаведна непададзенай і (або) непрынесеным і вяртаюцца асобе, якая падала скаргу, або пракурору, які прынёс пратэст.

На вызначэнне суда першай інстанцыі аб пакіданні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без руху можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

### Артыкул 408. Дзеянні суда першай інстанцыі пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту

Пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, што пададзена і (або) прынесены ў тэрмін і адпавядаюць патрабаванням, прадугледжаным артыкуламі 402, 403, 405 і 406 гэтага Кодэкса, суддзя абавязаны:

не пазней за наступны дзень накіраваць юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам копіі апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту і прыкладзеных да іх пісьмовых матэрыялаў;

па сканчэнні тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту накіраваць справу ў суд апеляцыйнай інстанцыі.

Да ўступлення рашэння ў законную сілу справа нікім не можа быць выпатрабавана з суда. Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы маюць права знаёміцца ў судзе з матэрыяламі справы і апеляцыйнымі скаргамі і (або) апеляцыйным пратэстам, якія паступілі, прыкладзенымі да іх пісьмовымі матэрыяламі. Пракурор мае права знаёміцца з матэрыяламі справы і ў тым выпадку, калі ён у справе не ўдзельнічаў.

### Артыкул 409. Дапаўненні, змяненні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту

Асоба, якая падала апеляцыйную скаргу, пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст, маюць права дапоўніць або змяніць іх у межах тэрміну апеляцыйнага абскарджання (апратэставання).

### Артыкул 410. Далучэнне да апеляцыйнай скаргі

Суістцы, суадказчыкі і трэція асобы, якія выступаюць у працэсе на баку асобы, якая падала апеляцыйную скаргу, маюць права на далучэнне да апеляцыйнай скаргі.

Заява аб далучэнні да апеляцыйнай скаргі можа быць пададзена ў суд першай інстанцыі ў межах тэрміну апеляцыйнага абскарджання. Такая заява дзяржаўнай пошлінай не аплачваецца.

Калі патрабаванне, выкладзенае ў заяве аб далучэнні да апеляцыйнай скаргі, не супадае з патрабаваннямі апеляцыйнай скаргі, яно з’яўляецца самастойнай апеляцыйнай скаргай. Такая заява павінна быць аформлена ў адпаведнасці з патрабаваннямі, што прад’яўляюцца да апеляцыйнай скаргі, і аплачана дзяржаўнай пошлінай.

### Артыкул 411. Пярэчанні на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст

Пярэчанні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст з прыкладаннем да іх пісьмовых матэрыялаў могуць быць пададзены ў суд першай інстанцыі, які вынес рашэнне, а таксама непасрэдна ў суд апеляцыйнай інстанцыі, але не пазней чым за пяць дзён да пачатку разгляду грамадзянскай справы.

Пярэчанні на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст павінны адпавядаць патрабаванням, прадугледжаным часткамі першай і другой артыкула 405 гэтага Кодэкса. Такія пярэчанні падаюцца ў суд з копіямі па колькасці юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

### Артыкул 412. Адмова ад апеляцыйнай скаргі, адкліканне апеляцыйнага пратэсту

Асоба, якая падала апеляцыйную скаргу, мае права адмовіцца ад яе да вынясення судом апеляцыйнай інстанцыі судовай пастановы.

Пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст, мае права адклікаць яго да пачатку разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

Пры адмове ад апеляцыйнай скаргі або адкліканні апеляцыйнага пратэсту суддзя суда першай інстанцыі, калі справа знаходзіцца ў гэтым судзе, выносіць вызначэнне аб вяртанні апеляцыйнай скаргі або апеляцыйнага пратэсту, аб чым паведамляе юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам.

Аб прыняцці адмовы ад апеляцыйнай скаргі або адклікання апеляцыйнага пратэсту суд апеляцыйнай інстанцыі выносіць вызначэнне, якім спыняе вядзенне па пададзенай апеляцыйнай скарзе і (або) прынесеным апеляцыйным пратэсце.

### Артыкул 413. Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, міравое пагадненне бакоў

Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, міравое пагадненне бакоў, ажыццёўленыя пасля падачы апеляцыйнай скаргі або прынясення апеляцыйнага пратэсту, павінны быць выказаны ў пісьмовых заявах, адрасаваных суду апеляцыйнай інстанцыі.

Указаныя заявы разглядаюцца судом апеляцыйнай інстанцыі па правілах, устаноўленых артыкулам 285 гэтага Кодэкса.

Пры прыняцці адмовы істца ад іску або зацвярджэнні міравога пагаднення бакоў суд апеляцыйнай інстанцыі адмяняе вынесенае судом першай інстанцыі рашэнне і спыняе вядзенне справы ў адпаведнасці з пунктамі 3 і 4 часткі першай артыкула 164 гэтага Кодэкса.

Прызнанне іску адказчыкам можа быць прынята судом апеляцыйнай інстанцыі, калі ў судовым пасяджэнні прысутнічаюць усе асобы, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы. У гэтым выпадку суд апеляцыйнай інстанцыі можа адмяніць рашэнне суда першай інстанцыі і прыняць па справе новае рашэнне.

Калі па падставах, указаных у частцы чацвёртай артыкула 61 гэтага Кодэкса, суд апеляцыйнай інстанцыі не прымае адмовы істца ад іску, прызнання іску адказчыкам або не зацвярджае міравога пагаднення бакоў, ён выносіць аб гэтым вызначэнне і разглядае справу ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 414. Правядзенне медыяцыі**

Заява бакоў аб заключэнні пагаднення аб прымяненні медыяцыі падаецца суду апеляцыйнай інстанцыі ў пісьмовай форме або заносіцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння ў выпадку, калі яны складаюцца, і падпісваецца бакамі, а таксама іх прадстаўнікамі, якія прымаюць удзел у судовым пасяджэнні.

У выпадку заключэння бакамі пагаднення аб прымяненні медыяцыі суд устанаўлівае тэрмін правядзення медыяцыі.

Пры заключэнні бакамі медыяцыйнага пагаднення і паступленні заявы аб адмове істца ад іску, прызнанні іску адказчыкам, зацвярджэнні міравога пагаднення бакоў суд аднаўляе прыпыненае вядзенне справы і разглядае заяву, якая паступіла, па правілах, устаноўленых артыкуламі 61, 285 і 413 гэтага Кодэкса.

## § 3. Падрыхтоўка і разгляд справы судом апеляцыйнай інстанцыі

**Артыкул 415. Падрыхтоўка справы да разгляду ў апеляцыйным парадку**

Суддзя суда апеляцыйнай інстанцыі, які атрымаў справу з апеляцыйнай скаргай і (або) апеляцыйным пратэстам, правярае выкананне судом першай інстанцыі патрабаванняў, прадугледжаных артыкуламі 402–408 гэтага Кодэкса, і з улікам патрабаванняў і хадайніцтваў, выкладзеных у апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, у пярэчаннях на іх, у пятнаццацідзённы тэрмін пасля паступлення справы ў суд апеляцыйнай інстанцыі праводзіць падрыхтоўку справы да разгляду ў апеляцыйным парадку.

Пры невыкананні судом першай інстанцыі патрабаванняў, прадугледжаных часткай першай артыкула 404 і часткай першай артыкула 407 гэтага Кодэкса, справа з апеляцыйнай скаргай і (або) апеляцыйным пратэстам вяртаецца ў суд першай інстанцыі для выканання гэтых патрабаванняў.

У працэсе падрыхтоўкі справы да разгляду ў апеляцыйным парадку суддзя:

1) ажыццяўляе дзеянні, прадугледжаныя пунктамі 7, 8, $9^1$–12, 14 і 15 артыкула 262 гэтага Кодэкса;

2) па хадайніцтве бакоў або па ўласнай ініцыятыве вырашае пытанні выкліку ў судовае пасяджэнне экспертаў, а таксама дапытаных у судзе першай інстанцыі асоб для растлумачэнняў па сутнасці дадзеных імі заключэнняў і паказанняў, калі прызнае гэта неабходным;

3) вырашае хадайніцтвы бакоў аб даследаванні новых доказаў, калі бакі абгрунтавалі немагчымасць прадстаўлення гэтых доказаў у судзе першай інстанцыі па незалежных ад іх прычынах. Асобы, якія прадстаўляюць суду новыя доказы, абавязаны растлумачыць, якім шляхам яны атрыманы, у сувязі з якімі акалічнасцямі ўзнікла неабходнасць іх

прадстаўлення, і абгрунтаваць уважлівасць прычын, незалежных ад гэтых асоб, па якіх доказы не маглі быць прадстаўлены імі на разгляд суда першай інстанцыі;

4) афармляе іншыя неабходныя для забеспячэння разгляду справы працэсуальныя дзеянні з улікам патрабаванняў гэтага Кодэкса і сутнасці апеляцыйнага вядзення.

Па заканчэнні падрыхтоўкі справы суд апеляцыйнай інстанцыі паведамляе асобам, якія прымаюць удзел у справе, пра час і месца судовага пасяджэння, прапаноўвае юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам азнаёміцца да разгляду справы з дадатковымі доказамі.

Спіс спраў, прызначаных да разгляду ў апеляцыйным парадку, павінен быць размешчаны ў агульнадаступным месцы ў памяшканні суда апеляцыйнай інстанцыі, а таксама на сайце суда апеляцыйнай інстанцыі за дзень да пачатку судовага пасяджэння.

**Артыкул 416. Тэрміны разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі**

Справа ў судзе апеляцыйнай інстанцыі павінна быць разгледжана ў месячны тэрмін з дня яе паступлення. У выпадку неабходнасці даследавання новых доказаў і вынясення новага рашэння справа ў судзе апеляцыйнай інстанцыі павінна быць разгледжана не пазней за два месяцы з дня яе паступлення.

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае справу, якая паступіла па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, у тэрмін, які не перавышае трох месяцаў з дня яе паступлення.

У выключных выпадках старшыня суда апеляцыйнай інстанцыі або яго намеснік могуць прадоўжыць тэрмін, указаны ў частках першай і другой гэтага артыкула, але не больш чым на адзін месяц.

У выпадку змянення часу і месца судовага пасяджэння або прадаўжэння тэрміну разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі ўдзельнікам працэсу павінна быць своечасова і належным чынам паведамлена аб новых часе і месцы судовага пасяджэння.

**Артыкул 417. Парадак разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

Разгляд апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту ў судзе апеляцыйнай інстанцыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым Кодэксам для вядзення спраў у судзе першай інстанцыі, з улікам палажэнняў, выкладзеных у гэтай главе, і сутнасці апеляцыйнага вядзення.

У судзе апеляцыйнай інстанцыі не прымяняюцца правілы аб злучэнні і раз’яднанні некалькіх патрабаванняў, змяненні падстаў або прадмета іску, памеру іскавых патрабаванняў, прад’яўленні сустрэчнага іску, замене бакоў, прыцягненні да ўдзелу ў справе трэціх асоб, працэсуальных саўдзельнікаў, іншыя правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам толькі для разгляду справы ў судзе першай інстанцыі.

У пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 83 гэтага Кодэкса, удзельнічае пракурор, які выказвае меркаванне па сутнасці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, па пытаннях, якія ўзніклі падчас разгляду справы, а таксама па сутнасці справы ў цэлым.

**Артыкул 418. Прадмет і межы разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

Пры разглядзе апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту суд апеляцыйнай інстанцыі па наяўных у справе і дадаткова прадстаўленых матэрыялах правярае правільнасць устанаўлення судом першай інстанцыі фактычных акалічнасцей справы, прымянення нормаў матэрыяльнага і працэсуальнага права.

Суд апеляцыйнай інстанцыі разглядае справу ў межах доказаў, выкладзеных у апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, пярэчаннях на іх, і правярае законнасць і абгрунтаванасць рашэння толькі ў частцы, якая абскарджваецца (апратэстоўваецца).

Суд апеляцыйнай інстанцыі можа ўстанаўліваць новыя факты ў межах патрабаванняў, заяўленых у судзе першай інстанцыі, і даследаваць новыя доказы, якія бок не меў магчымасці прадставіць суду першай інстанцыі па прычынах, прызнаных судом апеляцыйнай інстанцыі ўважлівымі.

Калі пры праверцы рашэння суда першай інстанцыі ў частцы, якая абскарджваецца (апратэстоўваецца), устаноўлена, што судом парушаны або няправільна прыменены нормы матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права, суд апеляцыйнай інстанцыі мае права праверыць такое рашэнне ў поўным аб’ёме. У гэтым выпадку вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі павінна ўтрымліваць матывы, па якіх суд прыйшоў да высновы аб неабходнасці такой праверкі.

### Артыкул 419. Удзел у судовым пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, сведкі і іншыя ўдзельнікі грамадзянскага судаводства могуць удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі.

Суд апеляцыйнай інстанцыі прымае рашэнне аб выкарыстанні сістэм відэаканферэнцсувязі з улікам меркавання юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, калі яўка канкрэтнага ўдзельніка грамадзянскага судаводства ў судовае пасяджэнне немагчымая па аб’ектыўных прычынах.

Суд можа адмовіць у прымяненні сістэм відэаканферэнцсувязі пры разглядзе справы ў выпадках, калі:

адсутнічае тэхнічная магчымасць для ўдзелу ў судовым пасяджэнні шляхам выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі;

разбор справы ажыццяўляецца ў закрытым судовым пасяджэнні.

Звесткі аб выкарыстанні сістэм відэаканферэнцсувязі, меркаванне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб аб якасці сувязі і разуменні інфармацыі, якая трансліруецца, заносяцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння ў выпадку, калі яны складаюцца.

### Артыкул 420. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі

У выпадку неабходнасці допыту выкліканых у судовае пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі сведак, экспертаў, спецыялістаў, удзелу перакладчыка ход судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі фіксуецца па правілах, устаноўленых артыкулам 113 гэтага Кодэкса.

Суд апеляцыйнай інстанцыі мае права фіксаваць ход судовага пасяджэння па ўласнай ініцыятыве.

Змест сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння, парадак іх складання, азнаямлення з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння, прынясення заўваг на іх і разгляды такіх заўваг рэгулююцца правіламі, устаноўленымі главой 20 гэтага Кодэкса, з улікам сутнасці апеляцыйнага вядзення.

### Артыкул 421. Наступствы няяўкі ў судовае пасяджэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб

Няяўка бакоў або іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, калі ім своечасова і належным чынам паведамлена пра час і месца судовага пасяджэння, не

перашкаджае разгляду справы судом. Аднак суд мае права, прызнаўшы прычыны няяўкі ўважлівымі, адкласці разгляд справы.

### Артыкул 422. Разгляд справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі

Пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі адкрывае старшынствуючы, абавязкі якога выконвае адзін з суддзяў судовай калегіі.

Старшынствуючы абвяшчае склад суда, сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), пракурора, растлумачвае юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам іх правы і абавязкі, у тым ліку права заяўляць адводы, хадайніцтвы.

Заявы і хадайніцтвы юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб па ўсіх пытаннях, звязаных з разборам справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі, вырашаюцца судом пасля заслухоўвання меркаванняў прысутных юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

Разгляд справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі пачынаецца з даклада старшынствуючага або аднаго з суддзяў аб сутнасці справы, змесце абскарджваемага (апратэстоўваемага) рашэння суда першай інстанцыі, доказах апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, пярэчаннях на іх, а таксама з паведамлення аб прадстаўленых і сабраных у ходзе падрыхтоўкі справы да разгляду ў апеляцыйным парадку новых доказах, аб іншых звестках, неабходных для праверкі рашэння суда першай інстанцыі.

Пасля даклада суд апеляцыйнай інстанцыі заслухоўвае тлумачэнні юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, іх прадстаўнікоў, якія з’явіліся ў судовае пасяджэнне. Першым выступае асоба, якая падала апеляцыйную скаргу, або яе прадстаўнік ці пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст. У выпадку абскарджання рашэння суда абодвума бакамі першым выступае ісцец.

Пракурор, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія ад уласнага імені абараняюць правы і інтарэсы іншых асоб, выступаюць пасля асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы, іх прадстаўнікоў.

Пасля тлумачэнняў юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, іх прадстаўнікоў суд апеляцыйнай інстанцыі пры наяўнасці адпаведных хадайніцтваў абвяшчае наяўныя ў справе доказы, пасля чаго пераходзіць да даследавання прынятых ім новых доказаў па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для вядзення спраў у судзе першай інстанцыі.

Па заканчэнні высвятлення акалічнасцей справы і даследавання доказаў суд апеляцыйнай інстанцыі прадастаўляе юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам, іх прадстаўнікам магчымасць выступіць у судовых спрэчках у той жа паслядоўнасці, у якой яны давалі тлумачэнні.

### Артыкул 423. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту на рашэнне суда першай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі, разгледзеўшы апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст, мае права:

1) пакінуць рашэнне без змянення, а апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст – без задавальнення;

2) змяніць рашэнне;

3) адмяніць рашэнне поўнасцю або ў частцы і прыняць новае рашэнне па сутнасці заяўленых патрабаванняў;

4) адмяніць рашэнне поўнасцю або ў частцы і спыніць вядзенне справы або пакінуць заяву без разгляду;

5) адмяніць рашэнне поўнасцю або ў частцы і накіраваць справу на новы разгляд у суд першай інстанцыі, калі пры разглядзе справы судом апеляцыйнай інстанцыі ўстаноўлена істотнае парушэнне нормаў працэсуальнага права, якое не можа быць ліквідавана ў парадку

апеляцыйнага вядзення або перашкаджае суду апеляцыйнай інстанцыі ў даследаванні новых доказаў або ва ўстанаўленні фактаў, якія не з'яўляліся прадметам даследавання суда першай інстанцыі.

### Артыкул 424. Падставы да адмены або змянення рашэння суда першай інстанцыі

Рашэнне суда першай інстанцыі можа быць адменена або зменена ў апеляцыйным парадку, калі:

1) судом не ўлічаны ўсе факты, якія ўваходзяць у прадмет даказвання па справе;

2) факты, пакладзеныя судом у аснову рашэння, не пацверджаны дастатковымі і дакладнымі доказамі;

3) выкладзеныя ў рашэнні вывады суда не адпавядаюць устаноўленым фактам;

4) судом парушаны або няправільна прыменены нормы матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права.

Нормы матэрыяльнага права лічацца парушанымі або няправільна прыцененымі ў выпадках:

прымянення судом нормы матэрыяльнага права, якая не падлягае прымяненню;

няправільнага прымянення судом нормы матэрыяльнага права, якая падлягае прымяненню;

няправільнага тлумачэння судом нарматыўнага прававога акта.

Парушэнне або няправільнае прымяненне нормы працэсуальнага права, якая падлягае прымяненню, з'яўляюцца падставамі да адмены або змянення рашэння, калі гэта прывяло або магло прывесці да няправільнага вырашэння справы.

Рашэнне суда першай інстанцыі падлягае адмене пры істотным парушэнні норм працэсуальнага права, калі:

1) парушаны парадак разгляду заявы аб адводзе (самаадводзе) суддзі, устаноўлены артыкуламі 34 і 35 гэтага Кодэкса;

2) справа разгледжана ў адсутнасць каго-небудзь з юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якія не апавешчаны своечасова і належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння;

3) пры разглядзе справы было парушана права юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб карыстацца роднай мовай або паслугамі перакладчыка;

4) суд вырашыў пытанне аб правах і абавязках не прыцягненых да ўдзелу ў справе асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы;

5) пры вынясенні рашэння былі парушаны правілы аб тайне дарадчага пакоя;

6) рашэнне не падпісана суддзёй, які разглядаў справу, ці вынесена або падпісана не тым суддзёй, які разглядаў справу;

7) адсутнічае матывавальная частка рашэння ў выпадках, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам яна павінна быць складзена;

8) па справе адсутнічае гука-або відэазапіс ходу судовага пасяджэння або ў справе адсутнічае пратакол судовага пасяджэння ў выпадку, калі ён складаецца, або пратакол судовага пасяджэння не падпісаны асобамі, абавязанымі яго падпісаць.

### Артыкул 425. Падставы да адмены рашэння са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду

Рашэнне суда падлягае адмене са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду па падставах, прадугледжаных артыкуламі 164 і 165 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 426. Парадак разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, якія паступілі пасля разгляду справы ў апеляцыйным парадку

У выпадку, калі апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст, пададзеная і (або) прынесены ва ўстаноўлены тэрмін або пасля аднаўлення прапушчанага тэрміну, паступяць у суд апеляцыйнай інстанцыі пасля разгляду справы па іншых апеляцыйных скаргах і (або) апеляцыйным пратэсце, суд абавязаны прыняць апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст, якія паступілі, да свайго вядзення.

Калі ў выніку разгляду такіх апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту суд апеляцыйнай інстанцыі вынесе іншае вызначэнне ў дачыненні да рашэння суда першай інстанцыі, ён накіроўвае справу з асобным прадстаўленнем старшыні суда, які валодае правам прынясення пратэсту ў парадку нагляду, для вырашэння пытання аб апратэставанні аднаго або абодвух вызначэнняў суда апеляцыйнай інстанцыі.

### Артыкул 427. Вяртанне справы ў суд першай інстанцыі

Справа, разгледжаная судом апеляцыйнай інстанцыі, падлягае вяртанню ў суд першай інстанцыі.

## § 4. Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце на рашэнне суда першай інстанцыі

### Артыкул 428. Змест вызначэння суда апеляцыйнай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі, разгледзеўшы справу па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, выносіць вызначэнне.

Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі складаецца з уступнай, апісальнай, матывавальнай і рэзалюцыйнай частак.

Ва ўступнай частцы вызначэння павінны быць указаны час і месца вынясення вызначэння; найменне і склад суда апеляцыйнай інстанцыі, які вынес вызначэнне; асобы, якія падалі апеляцыйную скаргу, або пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст; асобы, якія ўдзельнічалі ў разглядзе справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

У апісальнай і матывавальнай частках вызначэння павінны быць выкладзены кароткі змест заяўленых па справе патрабаванняў; змест рашэння суда першай інстанцыі; абагульненыя доказы апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, пярэчанняў на іх; матывы неабходнасці змянення або адмены рашэння суда першай інстанцыі і вынясення новага рашэння; устаноўленыя судом апеляцыйнай інстанцыі факты і адпаведныя ім праваадносіны; звесткі аб выкарыстанні сістэм відэаканферэнцсувязі; нормы матэрыяльнага права, на падставе якіх разгледжана справа; нормы працэсуальнага права, якімі суд апеляцыйнай інстанцыі кіраваўся; матывы, па якіх суд апеляцыйнай інстанцыі прыйшоў да сваіх вывадаў у ходзе судовага разбору.

Рэзалюцыйная частка вызначэння павінна ўтрымліваць у сабе вывад суда апеляцыйнай інстанцыі па выніках разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, указанне на размеркаванне судовых выдаткаў, у тым ліку панесеных пры разглядзе справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

### Артыкул 429. Парадак вынясення вызначэння судом апеляцыйнай інстанцыі

Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі выносіцца ў дарадчым пакоі і падпісваецца складам суда, у тым ліку суддзёй, які застаўся пры асобым меркаванні.

Пасля падпісання вызначэння суд неадкладна вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і абвяшчае рэзалюцыйную частку вызначэння з вусным абгрунтаваннем прынятага рашэння. Абвяшчэнне ажыццяўляецца старшынствуючым або адным з суддзяў.

### Артыкул 430. Прыватнае вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі мае права ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 325 гэтага Кодэкса, вынесці прыватнае вызначэнне.

### Артыкул 431. Законная сіла вызначэння суда апеляцыйнай інстанцыі

Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі ўступае ў законную сілу з моманту яго вынясення.

## § 5. Перагляд у апеляцыйным парадку вызначэнняў суда першай інстанцыі

### Артыкул 432. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда першай інстанцыі

Вызначэнні суда першай інстанцыі могуць быць абскарджаны асобна ад рашэння суда першай інстанцыі ў суд апеляцыйнай інстанцыі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, а таксама калі вызначэнне суда першай інстанцыі перашкаджае магчымасці далейшага руху справы.

Вызначэнне суда першай інстанцыі ў такіх выпадках мае права апратэставаць пракурор.

На астатнія вызначэнні суда першай інстанцыі прыватныя скаргі і прыватныя пратэсты не падаюцца і не прыносяцца, але пярэчанні супраць гэтых вызначэнняў могуць быць выкладзены ў апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце.

### Артыкул 433. Парадак падачы і разгляду прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту

Падача і разгляд прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым гэтай главой для падачы і разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту.

### Артыкул 434. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту на вызначэнне суда першай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі, разгледзеўшы прыватную скаргу і (або) прыватны пратэст на вызначэнне суда першай інстанцыі, мае права:

1) пакінуць вызначэнне без змянення, а прыватную скаргу і (або) прыватны пратэст – без задавальнення;

2) змяніць вызначэнне;

3) адмяніць вызначэнне поўнасцю або ў частцы і вырашыць пытанне па сутнасці;

4) адмяніць вызначэнне поўнасцю або ў частцы і перадаць пытанне на новы разгляд у суд першай інстанцыі, калі рашэнне такіх пытанняў аднесена гэтым Кодэксам толькі да кампетэнцыі суда першай інстанцыі або судом першай інстанцыі дапушчана істотнае парушэнне норм працэсуальнага права, якое не можа быць ліквідавана ў парадку апеляцыйнага вядзення.

## ГЛАВА 33
## ВЯДЗЕННЕ СПРАЎ У СУДЗЕ НАГЛЯДНАЙ ІНСТАНЦЫІ

### Артыкул 435. Судовыя пастановы, якія могуць быць перагледжаны ў парадку нагляду

Судовыя пастановы, якія ўступілі ў законную сілу, акрамя пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, могуць быць перагледжаны ў парадку нагляду па пратэстах службовых асоб, указаных у артыкуле 439 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 436. Нагоды і падставы да выпатрабавання спраў і прынясення пратэстаў у парадку нагляду

Грамадзянская справа можа быць выпатрабавана з адпаведнага суда для праверкі ў парадку нагляду, а пратэст у парадку нагляду можа быць прынесены на судовую пастанову, якая ўступіла ў законную сілу, толькі пры наяўнасці ўстаноўленых гэтым артыкулам прычын і падстаў.

Нагодамі да выпатрабавання спраў, а таксама да прынясення пратэстаў у парадку нагляду з’яўляюцца:

наглядныя скаргі юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, а таксама асоб, чые правы або ахаваныя законам інтарэсы парушаны вынесенай па справе судовай пастановай;

прадстаўленне суддзі, які ўдзельнічаў у разглядзе гэтай справы або які разглядае іншую справу, для якой судовая пастанова, што ўступіла ў законную сілу, мае юрыдычнае значэнне;

прадстаўленні старшынь судоў;

ініцыятыва службовых асоб, якія валодаюць правам прынясення пратэстаў у парадку нагляду на судовыя пастановы, якія ўступілі ў законную сілу.

Падставамі да прынясення пратэсту ў парадку нагляду на судовыя пастановы з’яўляюцца істотныя парушэнні норм матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права, якія прывялі да вынясення незаконнай судовай пастановы.

Наглядныя скаргі падаюцца на працягу аднаго года з дня ўступлення ў законную сілу судовай пастановы.

Наглядныя скаргі, пададзеныя па сканчэнні ўказанага тэрміну, разгляду не падлягаюць, за выключэннем скаргаў адказчыкаў на судовыя пастановы, вынесеныя ў іх адсутнасць без своечасовага і належнага апавяшчэння пра час і месца разгляду справы, пры ўмове, што справа не знішчана ў сувязі са сканчэннем тэрміну яе захоўвання, устаноўленага заканадаўствам.

Наглядныя скаргі на судовыя пастановы суда першай інстанцыі, якія не абскарджваліся ў апеляцыйным парадку, прымаюцца да разгляду толькі ў тым выпадку, калі прычыны, па якіх не былі пададзены апеляцыйныя скаргі, прызнаны ўважлівымі службовай асобай, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду.

### Артыкул 437. Змест нагляднай скаргі

Наглядная скарга павінна ўтрымліваць:

1) найменне пасады, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку службовай асобы, якой адрасуецца наглядная скарга;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) асобы, якая падае наглядную скаргу, яе месца жыхарства (месца знаходжання) або месца размяшчэння і працэсуальны стан у справе;

3) указанне на змест судовай пастановы, а таксама пералік юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб з указаннем іх месца жыхарства (месца знаходжання) або месца размяшчэння;

4) указанне на суды, якія разглядалі справу ў першай і апеляцыйнай інстанцыях, і змест прынятых імі рашэнняў;

5) указанне на судовую пастанову, якая абскарджваецца;

6) указанне на тое, у чым заключаецца істотнае парушэнне заканадаўства і ў чым заключаецца просьба асобы, якая падае наглядную скаргу.

Калі судовая пастанова не абскарджвалася ў апеляцыйным парадку, у нагляднай скарзе павінны быць указаны прычыны, па якіх яна не абскарджвалася.

Калі наглядная скарга падаецца асобай, якая не з’яўляецца юрыдычна зацікаўленай у зыходзе справы, у ёй павінна быць указана, якія правы або ахаваныя законам інтарэсы гэтай асобы парушаны судовай пастановай, што ўступіла ў законную сілу.

Калі наглядная скарга раней падавалася ў суд нагляднай інстанцыі, у ёй павінна быць указана на гэта, а таксама на рашэнне, прынятае па скарзе.

Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і яго намеснікам, Генеральнаму пракурору і яго намеснікам наглядная скарга можа быць пададзена ў выпадку пакідання яе без задавальнення старшынямі абласнога, Мінскага гарадскога судоў, пракурорамі вобласці, горада Мінска.

Наглядная скарга павінна быць падпісана асобай, якая падае скаргу, або яе прадстаўніком. Да нагляднай скаргі, якая падаецца прадстаўніком, павінны быць прыкладзены даверанасць або іншы дакумент, які сведчыць паўнамоцтвы прадстаўніка.

Да нагляднай скаргі павінны быць прыкладзены завераныя судом копіі судовых пастаноў, вынесеных па справе, а таксама рашэнні ніжэйстаячай інстанцыі, калі яна разглядала пададзеную ёй наглядную скаргу, дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна заплачана шляхам выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў нагляднай скарзе або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы скаргі.

**Артыкул 438. Вяртанне нагляднай скаргі**

Наглядная скарга вяртаецца без разгляду ў выпадках, калі:

1) наглядная скарга пададзена з парушэннем патрабаванняў, прадугледжаных артыкулам 437 гэтага Кодэкса;

2) прапушчаны тэрмін абскарджання судовай пастановы ў парадку нагляду;

3) судовая пастанова не абскарджвалася ў апеляцыйным парадку і прычыны, па якіх не была пададзена апеляцыйная скарга, не прызнаны ўважлівымі службовай асобай, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду;

4) да разгляду нагляднай скаргі паступіла просьба асобы, якая падала гэту скаргу, аб яе адкліканні;

5) наглядная скарга падаецца паўторна той жа службовай асобе, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, і не ўтрымлівае новых доказаў аб незаконнасці судовай пастановы.

**Артыкул 439. Службовыя асобы, якія маюць права прынясення пратэсту ў парадку нагляду**

Пратэст у парадку нагляду мае права прыносіць:

1) Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральны пракурор – на судовыя пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

2) намеснікі Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, намеснікі Генеральнага пракурора – на судовыя пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

3) старшыні абласных, Мінскага гарадскога судоў, пракуроры абласцей, горада Мінска – на рашэнні і вызначэнні раённых (гарадскіх) судоў і вызначэнні судовых калегій па грамадзянскіх справах абласных, Мінскага гарадскога судоў па апеляцыйных (прыватных) скаргах і (або) апеляцыйных (прыватных) пратэстах.

**Артыкул 440. Суды нагляднай інстанцыі, якія разглядаюць справы па пратэстах у парадку нагляду**

Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае справы па пратэстах на пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, якія ўступілі ў законную сілу.

Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае справы па пратэстах на рашэнні і вызначэнні судовай калегіі па грамадзянскіх справах, судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, якія ўступілі ў законную сілу.

Судовая калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае справы па пратэстах на пастановы прэзідыумаў абласных, Мінскага гарадскога судоў і рашэнні і вызначэнні абласных, Мінскага гарадскога судоў, якія ўступілі ў законную сілу, што не былі абскарджаны ў апеляцыйным парадку.

Прэзідыумы абласных, Мінскага гарадскога судоў разглядаюць справы па пратэстах на рашэнні і вызначэнні раённых (гарадскіх) судоў і вызначэнні судовай калегіі па грамадзянскіх справах адпаведнага суда па апеляцыйных (прыватных) скаргах і (або) апеляцыйных (прыватных) пратэстах, якія ўступілі ў законную сілу.

Калі ў разглядзе гэтай справы ў судзе першай або апеляцыйнай інстанцыі прымала ўдзел большасць суддзяў суда, у які адрасаваны пратэст, асоба, якая прыносіць пратэст, накіроўвае справу вышэйстаячай службовай асобе суда або пракуратуры, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, для рашэння пытання аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду ў вышэйстаячую судовую інстанцыю.

**Артыкул 441. Выпатрабаванне справы. Прыпыненне выканання судовых пастаноў**

Службовыя асобы, указаныя ў артыкуле 439 гэтага Кодэкса, а таксама раённыя (гарадскія) і міжраённыя пракуроры маюць права выпатрабаваць з адпаведных судоў грамадзянскія справы для вырашэння пытання аб наяўнасці падстаў для прынясення пратэсту ў парадку нагляду.

Калі службовая асоба, якая выпатрабавала справу, не мае права прынясення пратэсту на гэтую судовую пастанову, яна ў неабходных выпадках уносіць прадстаўленне аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду вышэйстаячай службовай асобе, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду.

Пры адсутнасці падстаў для прынясення пратэсту ў парадку нагляду службовая асоба, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, паведамляе аб гэтым асобе, якая звярнулася з нагляднай скаргай, з кароткім указаннем матываў адмовы.

Службовыя асобы, якія маюць права прынясення пратэстаў у парадку нагляду, могуць прыпыняць выкананне адпаведных судовых пастаноў да заканчэння вядзення ў парадку нагляду, аб чым апавяшчаюць орган прымусовага выканання па месцы ажыццяўлення выканаўчых дзеянняў.

**Артыкул 442. Тэрміны разгляду наглядных скаргаў. Прынясенне пратэсту ў парадку нагляду**

Наглядная скарга на судовыя пастановы павінна быць разгледжана не пазней за адзін месяц з дня яе паступлення, а ў выпадку выпатрабавання справы – не пазней за адзін месяц з дня паступлення справы.

Тэрмін разгляду нагляднай скаргі, якая патрабуе дадатковага вывучэння і праверкі, а таксама пры асобай складанасці справы можа быць прадоўжаны службовай асобай, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, але не болей чым на два месяцы.

Службовая асоба, якая мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду, пры наяўнасці падстаў прыносіць пратэст у парадку нагляду і накіроўвае яго са справай у адпаведны суд для разгляду.

Пры стварэнні пратэсту ў парадку нагляду павінны захоўвацца патрабаванні, прадугледжаныя пунктамі 1–3, 5 і 6 часткі першай артыкула 405 гэтага Кодэкса.

Пратэст у парадку нагляду прыносіцца ў суд з копіямі па колькасці ўдзельнікаў у справе асоб.

**Артыкул 443. Апавяшчэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб і накіраванне ім копій пратэсту ў парадку нагляду**

Суд, у які паступіў пратэст у парадку нагляду, накіроўвае бакам і іншым юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам копіі пратэсту ў парадку нагляду, прынесенага па справе, і ў неабходных выпадках, а таксама па просьбе гэтых асоб апавяшчае іх пра час і месца разгляду справы.

Копіі пратэсту ў парадку нагляду і апавяшчэння пра час і месца разгляду справы падлягаюць накіраванню юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам з такім разлікам, каб яны мелі магчымасць прадставіць у суд пісьмовыя тлумачэнні на пратэст з прыкладаннем дакументаў, якія пацвярджаюць гэтыя тлумачэнні, да пачатку разгляду справы.

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, якія з’явіліся ў суд па паведамленні або без яго, дапускаюцца да ўдзелу ў судовым разборы.

**Артыкул 444. Адкліканне пратэсту ў парадку нагляду**

Службовая асоба, якая прынесла пратэст у парадку нагляду, мае права адклікаць яго да пачатку разгляду справы судом. У ходзе разгляду справы гэты пратэст не можа быць ні адкліканы, ні зменены.

Аб адкліканні пратэсту ў парадку нагляду суд апавяшчае юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб.

У выпадку адклікання пратэсту ў парадку нагляду пісьмовае адкліканне службовай асобы далучаецца да справы, а пратэст выключаецца са справы.

**Артыкул 445. Разгляд справы ў судзе нагляднай інстанцыі**

Пры разглядзе справы ў судзе нагляднай інстанцыі прымяняюцца правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для вядзення спраў у судзе першай інстанцыі, з выключэннямі і дапаўненнямі, прадугледжанымі гэтай главой, а таксама з улікам сутнасці нагляднага вядзення.

Суд нагляднай інстанцыі па наяўных у справе і дадаткова прадстаўленых матэрыялах правярае законнасць і абгрунтаванасць судовай пастановы ў апратэстоўваемай частцы.

Калі пры праверцы судовай пастановы ў апратэстоўваемай частцы ўстаноўлены істотныя парушэнні норм матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права, суд нагляднай інстанцыі мае права праверыць гэту пастанову ў поўным аб’ёме.

Няяўка ў судовае пасяджэнне юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, якія своечасова і належным чынам апавешчаны пра час і месца разгляду справы, не з’яўляецца перашкодай да разбору справы.

У Пленуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Прэзідыуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прэзідыумах абласнога, Мінскага гарадскога судоў справа дакладваецца старшынёй або па яго даручэнні намеснікам старшыні, суддзёй.

Юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы даюць тлумачэнні пасля даклада справы.

У разглядзе справы ў парадку нагляду прымае ўдзел пракурор, які выказвае сваё меркаванне па справе.

Справа па пратэсце ў парадку нагляду разглядаецца судом нагляднай інстанцыі ў судовым пасяджэнні не пазней за адзін месяц, а ў Пленуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – не пазней за тры месяцы з дня паступлення справы з пратэстам.

### Артыкул 446. Судовыя пастановы судоў нагляднай інстанцыі

Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прэзідыумы абласнога, Мінскага гарадскога судоў па выніках разгляду пратэсту ў парадку нагляду выносяць пастановы.

Судовая калегія па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па выніках разгляду пратэсту ў парадку нагляду выносіць вызначэнні.

Пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прэзідыумаў абласнога, Мінскага гарадскога судоў падпісваюцца старшынствуючым у судовым пасяджэнні суда нагляднай інстанцыі, а пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – старшынствуючым у судовым пасяджэнні і сакратаром Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прэзідыумаў абласнога, Мінскага гарадскога судоў прымаюцца большасцю галасоў. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных за задавальненне пратэсту і супраць задавальнення пратэсту, пратэст лічыцца адхіленым.

### Артыкул 447. Паўнамоцтвы суда нагляднай інстанцыі

Суд, разгледзеўшы справу ў парадку нагляду, сваім вызначэннем або пастановай мае права:

1) пакінуць судовую пастанову без змянення, а пратэст у парадку нагляду – без задавальнення;

2) змяніць судовую пастанову;

3) адмяніць судовую пастанову поўнасцю або ў частцы і накіраваць справу на новы разгляд у суд першай або апеляцыйнай інстанцыі;

4) адмяніць судовую пастанову поўнасцю або ў частцы і спыніць вядзенне справы або пакінуць заяву без разгляду;

5) адмяніць судовую пастанову (судовыя пастановы) і прыняць новае рашэнне або пакінуць у сіле адно з раней вынесеных па справе рашэнняў, калі акалічнасці справы вызначаны судамі першай і апеляцыйнай інстанцый поўна і правільна, збор і дадатковая праверка доказаў не патрабуюцца, але дапушчана памылка ў прымяненні норм матэрыяльнага права.

### Артыкул 448. Падставы да адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду

Падставамі да адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду з’яўляюцца істотныя парушэнні норм матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права.

Судовая пастанова не можа быць адменена толькі па фармальных меркаваннях.

Судовая пастанова падлягае адмене ў парадку нагляду поўнасцю або ў частцы са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду па падставах, указаных у артыкулах 164 і 165 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 449. Абавязковасць указанняў суда, які разглядае справу ў парадку нагляду

Указанні суда, які разглядае справу ў парадку нагляду, выкладзеныя ў яго вызначэнні або пастанове, абавязковыя для суда, які нанова разглядае гэтую справу.

Суд нагляднай інстанцыі не мае права ўстанаўліваць або лічыць даказанымі акалічнасці, якія не былі ўстаноўлены ў рашэнні або адхілены ім, папярэдне вырашаць пытанні аб дакладнасці або недакладнасці таго або іншага доказу, аб перавазе адных доказаў перад іншымі і аб тым, якое рашэнне павінна быць вынесена пры новым разглядзе справы ў судзе першай або апеляцыйнай інстанцыі.

### Артыкул 450. Змест і законная сіла судовых пастаноў судоў нагляднай інстанцыі

Змест судовых пастаноў судоў нагляднай інстанцыі вызначаецца правіламі, устаноўленымі артыкулам 428 гэтага Кодэкса, з улікам сутнасці нагляднай вытворчасці.

Судовыя пастановы судоў нагляднай інстанцыі ўступаюць у законную сілу з моманту іх вынясення.

### Артыкул 451. Прыватнае вызначэнне (пастанова) суда нагляднай інстанцыі

Суд нагляднай інстанцыі мае права ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 325 гэтага Кодэкса, вынесці прыватнае вызначэнне (пастанову).

## ГЛАВА 34
## ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ПА НОВЫХ АКАЛІЧНАСЦЯХ

### Артыкул 452. Падставы для перагляду судовых пастаноў па новых акалічнасцях

Рашэнні, вызначэнні і пастановы, якія ўступілі ў законную сілу, могуць быць перагледжаны па новых акалічнасцях.

Падставамі для перагляду судовых пастаноў па новых акалічнасцях, з'яўляюцца:

1) істотныя для справы акалічнасці, якія не былі і не маглі быць вядомы заяўніку;

2) устаноўленыя прыгаворам, які ўступіў у законную сілу, заведама непраўдзівыя паказанні сведкі, заведама непраўдзівае заключэнне эксперта або вывад спецыяліста, заведама няправільны пераклад, падложнасць дакументаў або рэчавых доказаў, якія пацягнулі за сабой вынясенне незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы;

3) устаноўленыя прыгаворам, які ўступіў у законную сілу, злачынныя дзеянні бакоў, іншых юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або злачынныя дзеянні суддзяў, якія пацягнулі за сабой вынясенне незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы;

4) адмена рашэння, прыгавору, вызначэння або пастановы суда або пастановы іншага дзяржаўнага органа, якія паслужылі падставай да вынясення перагледжаемай судовай пастановы.

### Артыкул 453. Суды, якія пераглядаюць судовыя пастановы па новых акалічнасцях

Перагляд рашэнняў суда першай інстанцыі па новых акалічнасцях ажыццяўляецца судом, які вынес гэта рашэнне, а вызначэнняў і пастаноў суда апеляцыйнай або нагляднай інстанцыі, якімі зменена рашэнне суда першай інстанцыі або вынесена новае рашэнне, – судом, які змяніў рашэнне або вынес новае рашэнне.

### Артыкул 454. Узбуджэнне вядзення па пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях

Вядзенне па пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях можа быць пачата па заяве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб або прадстаўленні пракурора або іншых службовых асоб, надзеленых правам прынясення пратэсту ў парадку нагляду.

Заява або прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях падаюцца ў суд, які вынес судовую пастанову.

Заява аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях падаецца на працягу трох месяцаў з дня ўстанаўлення новых акалічнасцей. Падача прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях не абмежавана.

У заяве або прадстаўленні аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях павінны быць указаны доказы, якія пацвярджаюць наяўнасць новых акалічнасцей.

### Артыкул 455. Вылічэнне тэрміну падачы заявы аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях

Тэрмін падачы заявы аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях вылічваецца:

1) у выпадках, прадугледжаных пунктам 1 часткі другой артыкула 452 гэтага Кодэкса, – з дня адкрыцця акалічнасцей;

2) у выпадках, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 часткі другой артыкула 452 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда;

3) у выпадках, прадугледжаных пунктам 4 часткі другой артыкула 452 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу рашэння, прыгавору, вызначэння, пастановы суда або вынясення іншым дзяржаўным органам акта, процілеглых па сваім змесце рашэнні, прыгаворы, вызначэнні або пастанове, на якіх была заснавана судовая пастанова, якая пераглядаецца.

### Артыкул 456. Разгляд заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях

Суд разглядае заяву або прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях у судовым пасяджэнні.

Заяўнік, іншыя юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы апавяшчаюцца пра час і месца судовага пасяджэння. Аднак іх няяўка не з’яўляецца перашкодай да разгляду заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях.

Заява або прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях разглядаюцца па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для вядзення спраў у судзе першай інстанцыі, з выключэннямі і дапаўненнямі, прадугледжанымі гэтай главой, а таксама з улікам сутнасці вядзення па пераглядзе судовых пастаноў па новых акалічнасцях.

### Артыкул 457. Вызначэнне суда па заяве або прадстаўленні аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях

Суд, разгледзеўшы заяву або прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях, мае права:

1) забяспечыць заяву або прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях і адмяніць судовую пастанову;

2) адмовіць у пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях.

Вызначэнне суда выносіцца ў дарадчым пакоі і ў выпадку задавальнення заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях абскарджанню або апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае.

**Артыкул 458. Разгляд справы пасля вынясення вызначэння аб задавальненні заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях**

Пасля вынясення вызначэння аб задавальненні заявы або прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па новых акалічнасцях справа разглядаецца судом на агульных падставах.

## РАЗДЗЕЛ VIII[1]
## ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ТРАЦЕЙСКАГА СУДА, ПРАЦОЎНАГА АРБІТРАЖУ

## ГЛАВА 34[1]
## ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ТРАЦЕЙСКАГА СУДА

**Артыкул 458[1]. Абскарджанне рашэння трацейскага суда**

Рашэнне трацейскага суда, прынятае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць абскарджана бакамі трацейскага разбору шляхам падачы заявы аб адмене рашэння трацейскага суда ў адпаведнасці з гэтай главой.

Заява аб адмене рашэння трацейскага суда падаецца ў раённы (гарадскі) суд, на тэрыторыі якога яна прынята, у тэрмін, што не перавышае трох месяцаў з дня атрымання аспрэчваемага рашэння бокам, які звярнуўся з заявай.

**Артыкул 458[2]. Форма і змест заявы аб адмене рашэння трацейскага суда**

Заява аб адмене рашэння трацейскага суда падаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца асобай, якая аспрэчвае рашэнне, або яе прадстаўніком.

У заяве аб адмене рашэння трацейскага суда павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) найменне і склад трацейскага суда, які прыняў рашэнне;

3) найменне бакоў трацейскага разбору, іх месца жыхарства або месца знаходжання;

4) дата і месца прыняцця рашэння трацейскага суда;

5) дата атрымання аспрэчваемага рашэння трацейскага суда бокам, які звярнуўся з заявай аб адмене ўказанага рашэння;

6) патрабаванне заяўніка аб адмене рашэння трацейскага суда і падставы, па якіх яно аспрэчваецца.

У заяве могуць быць указаны нумары тэлефонаў, факсаў, адрасы электроннай пошты і іншыя звесткі.

Да заявы аб адмене рашэння трацейскага суда дадаюцца:

1) арыгінал рашэння трацейскага суда або яго належным чынам завераная копія. Копія рашэння пастаянна дзеючага трацейскага суда завяраецца старшынёй пастаянна дзеючага трацейскага суда, копія рашэння трацейскага суда для вырашэння канкрэтнай спрэчкі павінна быць натарыяльна засведчана;

2) арыгінал або копія трацейскага пагаднення, заключанага ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аб трацейскіх судах;

3) дакументы, якія пацвярджаюць абгрунтаванне патрабавання аб адмене рашэння трацейскага суда;

4) дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана шляхам выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы;

5) копія заявы аб адмене рашэння трацейскага суда;

6) даверанасць або іншы дакумент, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы асобы на падпісанне заявы.

**Артыкул 458$^3$. Парадак разгляду заявы аб адмене рашэння трацейскага суда**

Заява аб адмене рашэння трацейскага суда разглядаецца суддзёй у тэрмін, які не перавышае аднаго месяца з дня паступлення заявы ў суд, па правілах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Бакі трацейскага разбору апавяшчаюцца судом пра час і месца судовага пасяджэння. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння, не з'яўляецца перашкодай да разгляду справы.

Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору па хадайніцтве боку суддзя можа выпатрабаваць з трацейскага суда матэрыялы справы, рашэнне па якой аспрэчваецца ў судзе, па правілах, прадугледжаных гэтым Кодэксам для выпатрабавання доказаў.

Пры разглядзе справы суд у судовым пасяджэнні ўстанаўлівае наяўнасць або адсутнасць падстаў для адмены рашэння трацейскага суда, прадугледжаных артыкулам 458$^4$ гэтага Кодэкса, шляхам даследавання прадстаўленых у суд доказаў для абгрунтавання заяўленых патрабаванняў і пярэчанняў.

**Артыкул 458$^4$. Падставы для адмены рашэння трацейскага суда**

Рашэнне трацейскага суда падлягае адмене ў выпадку, калі бок, які звярнуўся ў суд з заявай аб адмене рашэння трацейскага суда, прадставіць суду доказы таго, што:

1) трацейскае пагадненне з'яўляецца неправадзейным у сувязі з яго заключэннем з парушэннем патрабаванняў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб трацейскіх судах;

2) адзін з бакоў не быў належным чынам апавешчаны пра час і месца трацейскага разбору або па іншых уважлівых прычынах не мог рэалізаваць свае правы, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі аб трацейскіх судах;

3) рашэнне трацейскага суда вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай трацейскім пагадненнем, або па пытаннях, якія выходзяць за межы трацейскага пагаднення.

Калі ў рашэнні трацейскага суда вывады па пытаннях, якія ахопліваюцца трацейскім пагадненнем, могуць быць аддзелены ад тых, якія выходзяць за межы трацейскага пагаднення, то можа быць адменена толькі тая частка рашэння трацейскага суда, якая ўтрымлівае вывады па пытаннях, што выходзяць за межы трацейскага пагаднення;

4) склад трацейскага суда або трацейскі разбор не адпавядалі патрабаванням заканадаўчых актаў аб трацейскіх судах, рэгламенту пастаянна дзеючага трацейскага суда, трацейскаму пагадненню;

5) ёсць істотныя для справы акалічнасці, якія не былі і не маглі быць вядомы аднаму з бакоў на момант трацейскага разбору;

6) прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, установлены заведама непраўдзівыя паказанні сведкі, заведама непраўдзівае заключэнне эксперта, заведама няправільны пераклад, падложнасць дакументаў або рэчавых доказаў, якія пацягнулі за сабой прыняцце незаконнага або неабгрунтаванага рашэння трацейскага суда.

**Артыкул 458$^5$. Вызначэнне суда па заяве аб адмене рашэння трацейскага суда**

Суд па выніках разгляду заявы аб адмене рашэння трацейскага суда выносіць вызначэнне аб адмене рашэння трацейскага суда або аб адмове ў адмене рашэння трацейскага суда.

У вызначэнні суда аб адмене рашэння трацейскага суда або аб адмове ў адмене рашэння трацейскага суда павінны ўтрымлівацца:

1) звесткі аб абскарджваемым рашэнні трацейскага суда і месцы яго прыняцця;

2) найменне і склад трацейскага суда, які прыняў абскарджваемае рашэнне;

3) найменне бакоў трацейскага разбору;

4) указанне на адмену рашэння трацейскага суда поўнасцю або ў частцы або на адмову ў задавальненні патрабавання заяўніка, падставы і матывы прынятага рашэння.

Адмена рашэння трацейскага суда не перашкаджае бакам трацейскага разбору паўторна звярнуцца ў трацейскі суд.

У выпадку, калі рашэнне трацейскага суда адменена судом поўнасцю або ў частцы з прычыны неправадзейнасці трацейскага пагаднення або рашэнне трацейскага суда было вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай трацейскім пагадненнем, або па пытаннях, якія выходзяць за межы трацейскага пагаднення, бакі трацейскага разбору могуць звярнуцца па вырашэнне такой спрэчкі ў суд па агульных правілах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Вызначэнне суда аб адмене рашэння трацейскага суда або аб адмове ў адмене рашэння трацейскага суда можа быць абскарджана ў вышэйстаячы суд у парадку і тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

## ГЛАВА 34$^{2}$
## ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ПРАЦОЎНАГА АРБІТРАЖУ

### Артыкул 458$^{6}$. Абскарджанне рашэння працоўнага арбітражу

Рашэнне працоўнага арбітражу па калектыўных працоўных спрэчках аб выкананні калектыўных дагавораў, пагадненняў, а таксама ў арганізацыях, у якіх заканадаўствам устаноўлены абмежаванні ў рэалізацыі права на забастоўку, можа быць абскарджана бакамі калектыўнай працоўнай спрэчкі шляхам падачы заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу ў адпаведнасці з гэтай главой.

Заява аб адмене рашэння працоўнага арбітражу падаецца ў раённы (гарадскі) суд, на тэрыторыі якога яна вынесена, у дзесяцідзённы тэрмін з дня атрымання абскарджваемага рашэння працоўнага арбітражу бокам калектыўнай працоўнай спрэчкі, які звярнуўся з такой заявай.

### Артыкул 458$^{7}$. Форма і змест заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу

Заява аб адмене рашэння працоўнага арбітражу падаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца прадстаўніком боку калектыўнай працоўнай спрэчкі, які абскарджвае гэта рашэнне.

У заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) склад працоўнага арбітражу, які вынес абскарджваемае рашэнне;

3) найменне бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі, месца знаходжання наймальніка і прадстаўнічага органа работнікаў;

4) дата і месца вынясення рашэння працоўнага арбітражу;

5) дата атрымання абскарджваемага рашэння працоўнага арбітражу бокам калектыўнай працоўнай спрэчкі, які звярнуўся з заявай аб адмене прызначанага рашэння;

6) патрабаванне заяўніка аб адмене рашэння працоўнага арбітражу і падставы, па якіх абскарджваецца гэта рашэнне.

У заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу могуць быць указаны нумары тэлефонаў, факсаў, адрасы электроннай пошты і іншыя звесткі.

Да заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу дадаюцца:

1) арыгінал рашэння працоўнага арбітражу або яго натарыяльна засведчаная копія;

2) арыгінал або копія пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу, заключанага ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак;

3) дакументы, якія пацвярджаюць абгрунтаванне патрабавання заяўніка аб адмене рашэння працоўнага арбітражу;

4) дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы;

5) копія заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу;

6) даверанасць або іншы дакумент, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўніка боку калектыўнай працоўнай спрэчкі на падпісанне заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу.

**Артыкул 458$^{8}$. Парадак разгляду заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу**

Заява аб адмене рашэння працоўнага арбітражу разглядаецца суддзёй у тэрмін, які не перавышае аднаго месяца з дня паступлення гэтай заявы ў суд, па правілах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Бакі калектыўнай працоўнай спрэчкі апавяшчаюцца судом пра час і месца судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай да разгляду заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу.

Пры разглядзе заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу суд у судовым пасяджэнні ўстанаўлівае наяўнасць або адсутнасць падстаў для адмены рашэння працоўнага арбітражу, прадугледжаных артыкулам 458$^{9}$ гэтага Кодэкса, шляхам даследавання прадстаўленых у суд доказаў у абгрунтаванне заяўленых патрабаванняў і пярэчанняў.

**Артыкул 458$^{9}$. Падставы для адмены рашэння працоўнага арбітражу**

Рашэнне працоўнага арбітражу падлягае адмене ў выпадку, калі бок калектыўнай працоўнай спрэчкі, які звярнуўся ў суд з заявай аб адмене рашэння працоўнага арбітражу, прадставіць суду доказы таго, што:

1) пагадненне аб стварэнні працоўнага арбітражу з’яўляецца несапраўдным у сувязі з яго заключэннем з парушэннем патрабаванняў заканадаўчых актаў аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак;

2) адзін з бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі не быў належным чынам апавешчаны пра час і месца разгляду калектыўнай працоўнай спрэчкі ў працоўным арбітражы або па іншых уважлівых прычынах не мог рэалізаваць свае правы, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак;

3) рашэнне працоўнага арбітражу вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай пагадненнем аб стварэнні працоўнага арбітражу, або па пытаннях, якія выходзяць за межы пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу.

Калі ў рашэнні працоўнага арбітражу вывады па пытаннях, якія ахопліваюцца пагадненнем аб стварэнні працоўнага арбітражу, могуць быць аддзелены ад тых, якія выходзяць за межы пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу, то можа быць адменена толькі тая частка рашэння працоўнага арбітражу, якая ўтрымлівае вывады па пытаннях, што выходзяць за межы пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу;

4) склад працоўнага арбітражу або разгляд калектыўнай працоўнай спрэчкі ў працоўным арбітражы не адпавядалі патрабаванням заканадаўчых актаў аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак, пагадненню аб стварэнні працоўнага арбітражу;

5) ёсць істотныя для вырашэння працоўнай спрэчкі акалічнасці, якія не былі і не маглі быць вядомы аднаму з бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі на момант разгляду калектыўнай працоўнай спрэчкі ў працоўным арбітражы;

6) прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, устаноўлены заведама няпраўдзівыя паказанні сведкі, заведама няпраўдзівае заключэнне эксперта, заведама няправільны пераклад, падложнасць дакументаў або рэчавых доказаў, якія пацягнулі за сабой вынясенне незаконнага або неабгрунтаванага рашэння працоўнага арбітражу.

### Артыкул 458[10]. Вызначэнне суда па заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу

Суд па выніках разгляду заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу выносіць вызначэнне аб адмене рашэння працоўнага арбітражу або аб адмове ў адмене рашэння працоўнага арбітражу.

У вызначэнні суда аб адмене рашэння працоўнага арбітражу або аб адмове ў адмене рашэння працоўнага арбітражу павінны ўтрымлівацца:

1) звесткі аб абскарджваемым рашэнні працоўнага арбітражу;

2) склад працоўнага арбітражу, які вынес абскарджваемае рашэнне;

3) найменне бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі;

4) указанне на адмену рашэння працоўнага арбітражу поўнасцю або ў частцы ці на адмову ў задавальненні патрабавання заяўніка аб адмене рашэння працоўнага арбітражу, падставы і матывы прынятага судом рашэння.

Вызначэнне суда аб адмене рашэння працоўнага арбітражу або аб адмове ў адмене рашэння працоўнага арбітражу можа быць абскарджана або апратэставана ў парадку і тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

# РАЗДЗЕЛ IX
# ВЯДЗЕННЕ, ЗВЯЗАНАЕ З ВЫКАНАННЕМ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ, ІНШЫХ РАШЭННЯЎ І АКТАЎ. ВЫДАЧА ВЫКАНАЎЧАГА ЛІСТА НА ПРЫМУСОВАЕ ВЫКАНАННЕ МЕДЫЯЦЫЙНАГА ПАГАДНЕННЯ

## ГЛАВА 35
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 459. Кампетэнцыя судоў, звязаная з выкананнем судовых пастаноў, іншых рашэнняў і актаў

Суды выдаюць выканаўчыя лісты, дублікаты выканаўчых лістоў, вырашаюць пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, аднаўляюць прапушчаны тэрмін прад’яўлення выканаўчага дакумента да выканання, зацвярджаюць міравыя пагадненні, заключаныя ў рамках выканаўчага вядзення, разглядаюць хадайніцтвы аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання судовай пастановы, аб часовым абмежаванні права даўжніка – грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, службовай асобы юрыдычнай асобы, якая з’яўляецца даўжніком, на выезд з Рэспублікі Беларусь, аб часовым абмежаванні даўжніка – грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях, прадстаўленні судовага выканаўцы, скаргі (пратэсты) на пастановы, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, а таксама вырашаюць іншыя пытанні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 460. Выдача судом выканаўчага ліста

Выканаўчы ліст выдаецца на падставе рашэнняў, прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў судоў (суддзяў), міравых пагадненняў, пагадненняў аб дзецях, зацверджаных судом, медыяцыйных пагадненняў, рашэнняў трацейскіх судоў Рэспублікі Беларусь, абавязковых рашэнняў працоўных арбітражаў, рашэнняў замежных судоў, у тым ліку арбітражных (трацейскіх), калі бокам па справе з'яўляецца грамадзянін, які не з'яўляецца прадпрымальнікам, што ажыццяўляе дзейнасць без стварэння юрыдычнай асобы, шлюбных дагавораў, пагадненняў аб дзецях, пагадненняў аб раздзеле маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю сужэнцаў, пагадненняў аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, і іншых актаў, калі гэта прадугледжана заканадаўствам.

Выканаўчы ліст на падставе судовых пастаноў у межах тэрмінаў, устаноўленых заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання, выдаецца спагнанніку судом першай інстанцыі пасля ўступлення рашэння, прыгавору, вызначэння, пастановы ў законную сілу, акрамя выпадкаў неадкладнага выканання, калі выканаўчы ліст выдаецца неадкладна пасля вынясення судовай пастановы. У выпадку пропуску ўказаных тэрмінаў суд выдае выканаўчы ліст па заяве спагнанніка толькі ў выпадку іх аднаўлення, аб чым выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана (апратэставана) у апеляцыйным парадку.

Пры выдачы выканаўчага ліста на падставе медыяцыйных пагадненняў, шлюбных дагавораў, пагадненняў аб дзецях, пагадненняў аб раздзеле маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю сужэнцаў, пагадненняў аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, і іншых актаў раённы (гарадскі) суд абавязаны праверыць іх законнасць, у межах сваёй кампетэнцыі праверыць правамернасць выканання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рашэнняў замежных судоў, у тым ліку арбітражных (трацейскіх), і вынесці матываванае вызначэнне аб выдачы або аб адмове ў выдачы выканаўчага ліста. Вызначэнне аб выдачы або аб адмове ў выдачы выканаўчага ліста можа быць абскарджана (апратэставана).

Выканаўчы ліст выдаецца спагнанніку, за выключэннем выпадкаў, калі суд па сваёй ініцыятыве накіроўвае для выканання выканаўчыя лісты, выдадзеныя на падставе прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў суда па крымінальных справах у частцы маёмасных спагнанняў, аб чым апавяшчаюць спагнанніка.

### Артыкул 461. Выдача па адной судовай пастанове некалькіх выканаўчых лістоў

У выпадках, калі выкананне судовай пастановы павінна быць ажыццёўлена ў розных месцах або калі судовая пастанова вынесена на карысць некалькіх істцоў або супраць некалькіх адказчыкаў, суд можа па просьбе спагнаннікаў або па прадстаўленні судовага выканаўцы выдаць некалькі выканаўчых лістоў з дакладным указаннем часткі, якая падлягае выкананню па гэтым лісце.

Пры спагнанні грашовых сум з салідарных адказчыкаў можа быць выдадзена некалькі выканаўчых лістоў па колькасці салідарных адказчыкаў. У кожным выканаўчым лісце павінны быць указаны яго нумар, агульная сума спагнання і пералічаны ўсе адказчыкі з указаннем на іх салідарную адказнасць.

Пры субсідыярнай адказнасці аднаго з даўжнікоў выканаўчы ліст аб спагнанні з субсідыярнага даўжніка выдаецца пасля прадстаўлення спагнаннікам доказаў немагчымасці спагнання ўсёй прысуджанай сумы з асноўнага даўжніка.

Калі пры прымусовым выкананні выканаўчага ліста праведзена замена боку выканаўчага вядзення і ўтворана некалькі даўжнікоў або спагнаннікаў, суд, які выдаў выканаўчы ліст, на падставе прадстаўлення судовага выканаўцы і пастановы аб замене боку выканаўчага вядзення выдае неабходную колькасць экзэмпляраў выканаўчага ліста.

### Артыкул 462. Змест выканаўчага ліста, выдадзенага судом

У выканаўчым лісце, выдадзеным судом, павінны быць указаны:

1) найменне і адрас суда (прозвішча і ініцыялы суддзі), які выдаў выканаўчы ліст;

2) найменне і нумар справы або матэрыялаў, на падставе якіх выдадзены выканаўчы ліст;

3) дата прыняцця судовай пастановы, на падставе якой выдадзены выканаўчы ліст;

4) дата ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, на падставе якой выдадзены выканаўчы ліст, або ўказанне на яго неадкладнае выкананне;

5) звесткі аб даўжніку і спагнанніку:

у адносінах да грамадзяніна – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць), ідэнтыфікацыйны нумар, а пры адсутнасці ідэнтыфікацыйнага нумара даныя дакумента, які сведчыць асобу (серыя (пры яе наяўнасці), нумар, дата выдачы, найменне органа, які выдаў дакумент), месца яго жыхарства (месца знаходжання), дата і месца яго нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), а ў адносінах да індывідуальнага прадпрымальніка, акрамя ўказанага, – таксама ўліковы нумар плацельшчыка. У дачыненні да даўжніка – грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, таксама павінна быць указана месца працы (калі яно вядома);

у дачыненні да юрыдычнай асобы, арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, – іх найменне і месца знаходжання, уліковы нумар плацельшчыка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве;

у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак – найменне, уліковы нумар плацельшчыка і адрас органа, упаўнаважанага выступаць ад іх імені бокам выканаўчага вядзення;

6) рэзалюцыйная частка судовай пастановы, на падставе якой выдадзены выканаўчы ліст, якая ўтрымлівае патрабаванне аб ускладанні на даўжніка абавязку па перадачы спагнанніку грашовых сродкаў і (або) іншай маёмасці або па здзяйсненні на карысць спагнанніка пэўных дзеянняў або ўстрыманні ад здзяйснення пэўных дзеянняў;

7) звесткі аб мерах па забеспячэнні іску, калі такія прымаліся і не адменены на момант выдачы выканаўчага ліста;

8) дата выдачы выканаўчага ліста.

У выканаўчым лісце аб спагнанні аліментаў на непаўналетніх дзяцей, акрамя звестак, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, указваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) і дата нараджэння кожнага дзіцяці, на ўтрыманне якога прысуджаны аліменты, памер плацяжоў, якія спаганяюцца штомесяц з даўжніка, і тэрмін іх спагнання.

Калі да выдачы выканаўчага ліста прадастаўлены адтэрміноўка або растэрміноўка выканання судовай пастановы, на падставе якой выдаецца выканаўчы ліст, то ў выканаўчым лісце ўказваецца, з якога часу пачынаецца цячэнне тэрміну выканання патрабаванняў, якія ўтрымліваюцца ў гэтым выканаўчым лісце.

У выканаўчым лісце могуць быць указаны і іншыя звесткі, неабходныя для яго выканання.

Выканаўчы ліст, выдадзены судом, падпісваецца суддзёй і завяраецца пячаткай з адлюстраваннем Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 463. Растлумачэнне выканаўчага ліста або іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, выдадзеных судом, спосабу і парадку іх выканання

У выпадку няяснасці патрабаванняў выканаўчага ліста або іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, спосабу і парадку іх выканання суд, які выдаў гэты выканаўчы ліст або іншы выканаўчы дакумент, па заяве боку выканаўчага вядзення або па прадстаўленні судовага выканаўцы можа растлумачыць

выдадзены ім выканаўчы ліст або іншы выканаўчы дакумент, спосаб і парадак іх выканання.

Заява або прадстаўленне аб растлумачэнні выканаўчага ліста або іншага выканаўчага дакумента, не звязаных са спагнаннем грашовых сродкаў, спосабу і парадку іх выканання разглядаюцца судом, які выдаў выканаўчы ліст або іншы выканаўчы дакумент, у дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення заявы або прадстаўлення.

### Артыкул 464. Выдача дубліката выканаўчага ліста

У выпадку страты выканаўчага ліста суд, які вынес судовую пастанову, па заяве бакоў або прадстаўленні судовага выканаўцы можа выдаць дублікат выканаўчага ліста. Заява бакоў або прадстаўленне судовага выканаўцы могуць быць пададзены ў межах тэрмінаў, устаноўленых заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад’яўлення выканаўчага дакумента да выканання.

Заява бакоў або прадстаўленне судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканаўчага ліста разглядаюцца судом з апавяшчэннем бакоў пра час і месца судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай для разгляду заявы бакоў або прадстаўлення судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканаўчага ліста.

Па выніках разгляду заявы бакоў або прадстаўлення судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканаўчага ліста судом выносіцца вызначэнне, копіі якога накіроўваюцца бакам. На вызначэнне суда аб выдачы або аб адмове ў выдачы дубліката выканаўчага ліста бакамі можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

## ГЛАВА 35$^{1}$
## ВЫДАЧА ВЫКАНАЎЧАГА ЛІСТА НА ПРЫМУСОВАЕ ВЫКАНАННЕ МЕДЫЯТЫЎНАГА ПАГАДНЕННЯ

### Артыкул 464$^{1}$. Зварот па выдачу выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

У выпадку невыканання добраахвотна медыятыўнага пагаднення, якое адпавядае патрабаванням грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства аб міравым пагадненні, выдача выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення праводзіцца судом па заяве зацікаўленага боку медыятыўнага пагаднення.

Заява аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення па спрэчцы, падведамнай суду, падаецца ў суд па месцы знаходжання або месцы жыхарства (месцы размяшчэння) боку, які не выканаў медыятыўнае пагадненне, або па месцы знаходжання маёмасці боку, які не выканаў медыятыўнае пагадненне, калі яго (яе) месца знаходжання або месца жыхарства (месца размяшчэння) невядомыя.

Заява аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення можа быць пададзена на працягу шасці месяцаў з дня заканчэння тэрміну добраахвотнага выканання медятыўнага пагаднення.

Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення можа быць адноўлены судом у парадку, устаноўленым артыкулам 154 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 464$^{2}$. Форма і змест заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

Заява аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення падаецца ў суд у пісьмовай форме і падпісваецца асобай, якая падае заяву, або яе прадстаўніком.

У заяве аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) прозвішчы, уласныя імёны, імёны па бацьку (калі такія ёсць) або найменні бакоў медыяцыйнага пагаднення, іх месца жыхарства (месца знаходжання) або месца размяшчэння, кантактныя тэлефоны, факсы, электронныя адрасы (пры іх наяўнасці);

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) медыятара (медыятараў), яго месца знаходжання, кантактныя тэлефоны, факсы, электронныя адрасы (пры іх наяўнасці);

4) патрабаванне аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення.

Да заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення павінны быць прыкладзены:

1) арыгінал медыяцыйнага пагаднення;

2) доказы, якія пацвярджаюць факт невыканання іншым бокам медыяцыйнага пагаднення ў тэрмін, устаноўлены ў ім;

3) даверанасць або іншы дакумент, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўніка на падпісанне заявы;

4) дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы.

### Артыкул $464^3$. Вяртанне заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення

Заява аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення, пададзеная па сканчэнні тэрміну, устаноўленага часткай трэцяй артыкула $464^1$ гэтага Кодэкса (калі не была пададзена заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну), і (або) без выканання патрабаванняў, прадугледжаных артыкулам $464^2$ гэтага Кодэкса, не разглядаецца і вяртаецца асобе, якая падала такую заяву.

Аб вяртанні заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення суд не пазней за пяць дзён з дня паступлення заявы выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул $464^4$. Парадак разгляду заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення

Заява аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення разглядаецца ў судовым пасяджэнні не пазней за адзін месяц з дня паступлення заявы ў суд.

Бакі медыяцыйнага пагаднення апавяшчаюцца пра час і месца судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення.

Па выніках разгляду заявы аб выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення суд выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул $464^5$. Адмова ў выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення

Суд адмаўляе ў выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення, калі ўстановіць, што медыяцыйнага пагадненне не адпавядае патрабаванням

грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства аб міравым пагадненні і (або) медыяцыйнага пагадненне заключана з удзелам асобы, якая не мае пасведчання медыятара, выдадзенага Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Адмова ў выдачы выканаўчага ліста на прымусовае выкананне медыяцыйнага пагаднення не перашкаджае звароту ў суд для вырашэння спрэчкі па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

## ГЛАВА 36
## ПАВАРОТ ВЫКАНАННЯ СУДОВАЙ ПАСТАНОВЫ. АДНАЎЛЕННЕ ПРАПУШЧАНАГА ТЭРМІНУ ПРАД'ЯЎЛЕННЯ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА ДА ВЫКАНАННЯ. ПРЫНЯЦЦЕ МЕР ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ВЫКАНАННЯ ВЫКАНАЎЧАГА ДАКУМЕНТА. ВЫЗВАЛЕННЕ МАЁМАСЦІ АД АРЫШТУ

### Артыкул 465. Паварот выканання судовай пастановы

У выпадку адмены судовай пастановы, прыведзенай у выкананне, і вынясення пасля новага разгляду справы рашэння аб адмове ў іску або вызначэння аб спыненні вядзення справы або пакіданні заявы без разгляду, а таксама задавальнення іску ў меншым памеры адказчыку павінна быць вернута ўсё тое, што было з яго спагнана на карысць істца па адмененай судовай пастанове (паварот выканання судовай пастановы).

### Артыкул 466. Разгляд пытання аб павароце выканання судовай пастановы судом першай інстанцыі

Суд, у які справа перададзена на новы разгляд, абавязаны па сваёй ініцыятыве разгледзець пытанне аб павароце выканання судовай пастановы і вырашыць яго ў новым рашэнні або вызначэнні, якімі заканчваецца вядзенне справы.

У выпадку, калі суд, які нанова разглядае справу, не вырашыў пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, адказчык мае права падаць у гэты суд заяву аб павароце выканання судовай пастановы.

Заява аб павароце выканання судовай пастановы разглядаецца ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння, не з'яўляецца перашкодай для вырашэння пытання аб павароце выканання судовай пастановы.

Па выніках разгляду заявы аб павароце выканання судовай пастановы судом выносіцца вызначэнне, копіі якога накіроўваюцца юрыдычна зацікаўленым у зыходзе справы асобам. На вызначэнне суда па пытанні аб павароце выканання судовай пастановы можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

### Артыкул 467. Вырашэнне пытання аб павароце выканання судовай пастановы судом апеляцыйнай або нагляднай інстанцыі

Суд, які разглядае справу па апеляцыйнай скарзе (пратэсце) або па пратэсце ў парадку нагляду, калі ён сваім вызначэннем або пастановай канчаткова вырашае спрэчку, або спыняе вядзенне справы, або пакідае заяву без разгляду, абавязаны вырашыць пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, прыведзенай у выкананне, або перадаць яго на вырашэнне суда першай інстанцыі.

Калі ў вызначэнні або пастанове вышэйстаячага суда няма ніякіх указанняў па пытанні аб павароце выканання судовай пастановы, даўжнік, які выканаў судовую пастанову, мае права падаць адпаведную заяву ў суд першай інстанцыі.

У выпадку адмены ў парадку нагляду судовых пастаноў па справах аб спагнанні грашовых сум па патрабаваннях, якія вынікаюць з працоўных і звязаных з імі адносін, па патрабаваннях аб выплаце аўтарскага ўзнагароджання, аб спагнанні аліментаў, выдаткаў,

затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб спагнанні сум у пакрыццё шкоды, прычыненай грамадзяніну калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя, паварот выканання судовай пастановы дапускаецца, калі адмененая судовая пастанова была заснавана на паведамленых істцом няпраўдзівых звестках або прадстаўленых ім падложных дакументах.

У выпадку адмены ў апеляцыйным парадку судовай пастановы паварот выканання судовай пастановы праводзіцца па ўсіх справах, за выключэннем спраў аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, паварот выканання судовай пастановы, па якіх дапускаецца толькі ў тых выпадках, калі адмененая судовая пастанова была заснавана на паведамленых істцом няпраўдзівых звестках або прадстаўленых ім падложных дакументах.

### Артыкул 468. Аднаўленне прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання

Пры пропуску тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання па прычынах, прызнаных судом уважлівымі, прапушчаны тэрмін можа быць ім адноўлены па заяве спагнанніка.

Заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання падаецца ў суд, які выдаў выканаўчы дакумент, або ў суд па месцы выканання выканаўчага дакумента.

Заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання разглядаецца ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем спагнанніка і даўжніка пра месца і час судовага пасяджэння. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам пра час і месца судовага пасяджэння, не з'яўляецца перашкодай для разгляду заявы аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання.

Па выніках разгляду заявы аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання суд выносіць вызначэнне, копіі якога накіроўваюцца спагнанніку і даўжніку.

На вызначэнне суда аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання або аб адмове ў аднаўленні прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

### Артыкул 469. Прыняцце судом мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента

У выпадку, калі даўжнік не выконвае або ўхіляецца ад выканання патрабаванняў, якія ўтрымліваюцца ў выканаўчым дакуменце, або мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента, прынятых судовым выканаўцам у выканаўчым вядзенні, недастакова для своечасовага і поўнага выканання выканаўчага дакумента, суд па заяве спагнанніка або прадстаўленні судовага выканаўцы можа прыняць у дачыненні да даўжніка наступныя меры па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента, калі гэта не перашкаджае выкананню іншых абавязацельстваў даўжніка:

1) часовае абмежаванне права даўжніка, які з'яўляецца грамадзянінам або індывідуальным прадпрымальнікам, службовай асобы юрыдычнай асобы, якая з'яўляецца даўжніком, на выезд з Рэспублікі Беларусь;

2) часовае абмежаванне даўжніка – грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях.

Заява (прадстаўленне) аб прыняцці мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента разглядаецца не пазней за дзесяць дзён з дня яе паступлення ў суд у судовым пасяджэнні з апавяшчэннем бакоў выканаўчага вядзення пра час і месца судовага пасяджэння.

Па выніках разгляду заявы (прадстаўлення) аб прыняцці мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента суд выносіць вызначэнне, копіі якога накіроўваюцца бакам выканаўчага вядзення, судоваму выканаўцу, а таксама іншым асобам, на якіх ускладзены абавязак выканання адпаведных мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента.

Вызначэнне суда аб прыняцці мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента падлягае выкананню з моманту апавяшчэння даўжніка.

Дапускаецца замена адной меры па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента іншай мерай. Пытанне аб замене адной меры іншай разглядаецца судом па заяве бакоў выканаўчага вядзення або прадстаўленні судовага выканаўцы.

Выкананне вызначэння суда аб прыняцці меры, прадугледжанай пунктам 1 часткі першай гэтага артыкула, можа быць прыпынена на тэрмін, устаноўлены судом. Пытанне аб прыпыненні ўказанай меры разглядаецца судом па хадайніцтве даўжніка.

Прынятыя раней меры па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента могуць быць адменены судом па заяве бакоў выканаўчага вядзення або прадстаўленні судовага выканаўцы. Пытанне аб адмене мер па забеспячэнні выканання выканаўчага дакумента разглядаецца судом не пазней за тры дні з дня паступлення заявы (прадстаўлення).

На вызначэнні суда па пытаннях забеспячэння выканання выканаўчага дакумента можа быць пададзена прыватная скарга або прынесены прыватны пратэст.

Падача скаргі на вызначэнні суда, указаныя ў частцы восьмай гэтага артыкула, не прыпыняе выканання гэтых вызначэнняў.

### Артыкул 470. Вызваленне маёмасці ад арышту

У выпадку ўзнікнення спрэчкі, звязанай з прыналежнасцю маёмасці, якая падвергнута арышту або вопісу, асоба, чыё права закранута ў выніку такіх дзеянняў, мае права звярнуцца ў суд з іскам аб вызваленні маёмасці ад арышту або выключэнні маёмасці з акта вопісу маёмасці.

Іскі аб вызваленні маёмасці ад арышту або выключэнні маёмасці з акта вопісу маёмасці могуць прад'яўляцца як уласнікамі арыштаванай маёмасці, якая не належыць даўжніку, так і асобамі, якім такая маёмасць належыць на праве гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання.

Калі арышт на маёмасць накладзены з мэтай забеспячэння канфіскацыі маёмасці, адказчыкамі з'яўляюцца асоба, у дачыненні да якой прыменена канфіскацыя, і орган, які ажыццяўляў арышт маёмасці. Калі арыштаваная маёмасць ужо рэалізавана, іск прад'яўляецца таксама да той асобы (асоб), у якой знаходзіцца гэта маёмасць.

## ГЛАВЫ 37–40
## ВЫКЛЮЧАНЫ

# РАЗДЗЕЛ X
# МІЖНАРОДНЫ ГРАМАДЗЯНСКІ ПРАЦЭС

## ГЛАВА 41
## ПРАВІЛЫ МІЖНАРОДНАГА ГРАМАДЗЯНСКАГА ПРАЦЭСУ

### Артыкул 541. Грамадзянскія працэсуальныя правы замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, замежных юрыдычных асоб

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства маюць права бесперашкоднага звароту ў суды Рэспублікі Беларусь і карыстаюцца ў іх усімі грамадзянскімі працэсуальнымі правамі нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

Замежныя юрыдычныя асобы маюць права звяртацца ў суды Рэспублікі Беларусь і карыстаюцца грамадзянскімі працэсуальнымі правамі нароўні з юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і пагадненнямі бакоў.

Урадам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены ў адказ абмежаванні ў дачыненні да грамадзян і юрыдычных асоб тых дзяржаў, у якіх дапускаюцца спецыяльныя абмежаванні грамадзянскіх працэсуальных правоў грамадзян і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 542. Прымяненне працэсуальнага закона пры разглядзе грамадзянскіх спраў з удзелам замежных грамадзян і юрыдычных асоб**

Судаводства па грамадзянскіх справах з удзелам замежных грамадзян і юрыдычных асоб у Рэспубліцы Беларусь вядзецца па правілах гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана спецыяльнымі заканадаўчымі актамі або міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым суды Рэспублікі Беларусь акрамя агульных прынцыпаў грамадзянскага судаводства кіруюцца прынцыпамі прыярытэту міжнародных дагавораў; працэсуальнага раўнапраўя замежных грамадзян, асоб без грамадзянства і замежных юрыдычных асоб з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь; захаванні юрысдыкцыі замежных судоў і іншых правапрымяняльных органаў; узаемнасці.

**Артыкул 543. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь**

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія ўтрымліваюцца ў заканадаўстве аб грамадзянскім судаводстве Рэспублікі Беларусь, прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 544. Падсуднасць судам Рэспублікі Беларусь грамадзянскіх спраў па спрэчках, у якіх удзельнічаюць замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя юрыдычныя асобы, а таксама па спрэчках, па якіх хаця б адзін з бакоў пражывае за мяжой**

Падсуднасць судам Рэспублікі Беларусь грамадзянскіх спраў па спрэчках, у якіх удзельнічаюць замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя юрыдычныя асобы, а таксама па спрэчках, па якіх хаця б адзін з бакоў пражывае за мяжой, вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь або пісьмовым пагадненнем бакоў.

**Артыкул 545. Агульныя правілы падсуднасці спраў судам Рэспублікі Беларусь**

Судам Рэспублікі Беларусь падсудныя справы паісках замежных грамадзян, асоб без грамадзянства і замежных юрыдычных асоб да адказчыкаў, якія маюць месца жыхарства, або месца знаходжання, або месца размяшчэння ў Рэспубліцы Беларусь. Судам Рэспублікі Беларусь падсудныя таксама справы паісках да замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, калі яны маюць месца жыхарства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і да замежных юрыдычных асоб, калі ў Рэспубліцы Беларусь знаходзіцца орган кіравання, прадстаўніцтва або філіял такой юрыдычнай асобы.

**Артыкул 546. Падсуднасць па пагадненні бакоў**

Падсуднасць справы суду Рэспублікі Беларусь або замежнаму суду можа вызначацца пісьмовым пагадненнем бакоў. Калі пры наяўнасці пагаднення аб падсуднасці справы замежнаму суду вядзенне ў адпаведнасці з агульнымі правіламі падсуднасці,

прадугледжанымі гэтым Кодэксам, было ўзбуджана ў судзе Рэспублікі Беларусь, ён спыняе вядзенне справы ў выпадку заявы адказчыкам адпаведнага хадайніцтва да выкладу пярэчанняў па сутнасці іску.

Выключная падсуднасць не можа быць зменена пагадненнем бакоў.

**Артыкул 547. Нязменнасць першапачатковай падсуднасці**

Справа, прынятая судом Рэспублікі Беларусь да свайго вядзення з выкананнем правіл падсуднасці, павінна быць вырашана ім па сутнасці, нават калі ў далейшым яна стала падсуднай замежнаму суду.

**Артыкул 548. Дзеянні суда Рэспублікі Беларусь у выпадку ўзбуджэння тоеснай справы ў замежным судзе**

Калі спрэчка па правілах гэтага Кодэкса падсудна толькі суду Рэспублікі Беларусь, ён разглядае справу і выносіць рашэнне нават у выпадках, калі тоесная справа знаходзіцца ў вядзенні замежнага суда або ўжо разгледжана гэтым судом.

Пры двайной падсуднасці спрэчкі справа ў судзе Рэспублікі Беларусь падлягае спыненню, калі тоесная справа ў судзе замежнай дзяржавы была ўзбуджана раней.

**Артыкул 549. Наступствы непадсуднасці справы суду Рэспублікі Беларусь**

Непадсуднасць справы суду Рэспублікі Беларусь з’яўляецца падставай адмовы ў прыёме заявы аб узбуджэнні справы.

Суд Рэспублікі Беларусь абавязаны спыніць вядзенне справы па ўласнай ініцыятыве на любой стадыі грамадзянскага судаводства, калі выявіць, што справа падсудная суду замежнай дзяржавы, і калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам і міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 550. Працэсуальная праваздольнасць і дзеяздольнасць асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы**

Працэсуальная дзеяздольнасць грамадзяніна вызначаецца заканадаўствам той дзяржавы, грамадзянінам якой ён з’яўляецца, асобы без грамадзянства – заканадаўствам дзяржавы, у якой ён мае пастаяннае месца жыхарства, а пры адсутнасці такой – заканадаўствам дзяржавы месца яго знаходжання.

Працэсуальная праваздольнасць юрыдычнай асобы вызначаецца паводле закона дзяржавы, на тэрыторыі якой яна заснавана.

**Артыкул 551. Прадстаўнік у міжнародным грамадзянскім працэсе**

Пры вядзенні спраў у судах Рэспублікі Беларусь замежныя грамадзяне і юрыдычныя асобы маюць права свабодна і бесперашкодна карыстацца паслугамі як замежных прадстаўнікоў, у тым ліку і адвакатаў, так і прадстаўнікоў, у тым ліку і адвакатаў, Рэспублікі Беларусь. Замежныя прадстаўнікі, у тым ліку і адвакаты, карыстаюцца ў грамадзянскім судаводстве такімі ж правамі і нясуць такія ж абавязкі, як і прадстаўнікі, у тым ліку і адвакаты, Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 552. Консульскае прадстаўніцтва**

Консульскія ўстановы замежных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь маюць права прадстаўляць і абараняць інтарэсы сваіх дзяржаў, а таксама грамадзян і юрыдычных асоб гэтых дзяржаў.

Службовыя асобы консульскіх устаноў замежных дзяржаў (консульскія службовыя асобы) маюць права прадстаўляць без даручэння і даверанасці інтарэсы сваіх грамадзян у судах Рэспублікі Беларусь, калі гэтыя грамадзяне ў сувязі з адсутнасцю або па іншых

уважлівых прычынах не маюць магчымасці абараняць свае правы і інтарэсы. Такое прадстаўніцтва можа працягвацца да таго часу, пакуль грамадзянін не даручыць вядзенне справы іншаму прадстаўніку або не возьме абарону сваіх правоў і інтарэсаў на сябе.

**Артыкул 553. Іскі да замежных дзяржаў**

Прад'яўленне іску да замежнай дзяржавы, забеспячэнне іску і зварот спагнання на маёмасць замежнай дзяржавы, якая знаходзіцца ў Рэспубліцы Беларусь, могуць быць дапушчаны толькі са згоды кампетэнтных органаў гэтай дзяржавы (адмова ад імунітэту).

**Артыкул 554. Дыпламатычны імунітэт**

Акрэдытаваныя ў Рэспубліцы Беларусь дыпламатычныя прадстаўнікі замежных дзяржаў і іншыя асобы, указаныя ў частцы першай артыкула 555 і частцы першай артыкула 556 гэтага Кодэкса, іншых законах і міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, падлягаюць юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь у межах, якія вызначаюцца гэтым Кодэксам або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 555. Выключэнне з юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь кіраўнікоў і персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў або міжнародных міжурадавых арганізацый**

Не дапускаецца прад'яўленне ў суды Рэспублікі Беларусь іскаў:

1) да акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў;

2) да асоб, якія адносяцца да членаў дыпламатычнага персаналу згаданых прадстаўніцтваў;

3) да іншых асоб, у прыватнасці кіраўнікоў і асобных катэгорый персаналу міжнародных міжурадавых арганізацый, якія карыстаюцца дыпламатычным імунітэтам у сілу закона, міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь;

4) да членаў сямей, якія сумесна пражываюць з вышэйназванымі асобамі.

Аднак да асоб, названых у частцы першай гэтага артыкула, могуць прад'яўляцца:

1) рэчавыя іскі, якія тычацца размешчанай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прыватнай нерухомай маёмасці, калі адпаведныя асобы валодаюць гэтай маёмасцю не ад імя прадстаўляемых імі дзяржаў або міжнародных міжурадавых арганізацый;

2) іскі, якія вынікаюць са спадчыннага права, калі адпаведныя асобы выступаюць як спадчыннікі, адпісаннеатрымальнікі, выканаўцы тастамента або захавальнікі, апекавальнікі над спадчыннай маёмасцю;

3) іскі, якія вынікаюць з ажыццяўлення гэтымі асобамі любой прафесійнай або гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь па-за афіцыйнымі дыпламатычнымі функцыямі.

**Артыкул 556. Выключэнні з юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь для супрацоўнікаў консульскіх устаноў замежных дзяржаў і некаторых іншых асоб**

Па справах, якія ўзнікаюць у дачыненні да дзеянняў, якія ажыццяўляюцца імі пры здзяйсненні службовых функцый, не могуць быць адказчыкамі ў судах Рэспублікі Беларусь:

1) кіраўнікі консульскіх устаноў замежных дзяржаў і іншыя консульскія службовыя асобы;

2) замежныя грамадзяне, якія з'яўляюцца членамі адміністрацыйна-тэхнічнага і абслуговага персаналу дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь, а таксама іншыя асобы, прыраўнаваныя да іх у сілу закона, міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь, якія выключаны з юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь.

Аднак пералічаныя асобы ў любым выпадку адказваюць паісках, прадугледжаных часткай другой артыкула 555 гэтага Кодэкса, і па ісках аб пакрыцці шкоды, прычыненай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дарожна-транспартным здарэннем.

**Артыкул 557. Дзеянні суда пасля выхаду асобы з-пад юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь пасля ўзбуджэння справы**

Калі адказчык поўнасцю або ў дачыненні да канкрэтнай справы выходзіць з-пад юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь ужо пасля прад'яўлення іску, суд спыняе вядзенне справы па ўласнай ініцыятыве.

**Артыкул 558. Адмова ад дыпламатычнага імунітэту**

Нормы часткі першай артыкула 555 і часткі першай артыкула 556 гэтага Кодэкса не падлягаюць прымяненню ў выпадках, калі прадстаўляемая дзяржава прама адмовілася ад імунітэту ў дачыненні да адпаведных асоб. Міжнародныя міжурадавыя арганізацыі могуць адмовіцца ад імунітэту ў дачыненні да сваіх служачых.

Аднак калі асобы, названыя ў частцы першай артыкула 555 і частцы першай артыкула 556 гэтага Кодэкса, самі ўзбудзілі справу ў судзе Рэспублікі Беларусь, гэтаму суду падсудныя любыя сустрэчныя іскі да іх.

**Артыкул 559. Меры ў адказ у выпадку парушэння дыпламатычнага імунітэту Рэспублікі Беларусь або яе прадстаўнікоў**

У выпадках, калі Рэспубліцы Беларусь, яе маёмасці або яе прадстаўнікам не забяспечваецца ў замежнай дзяржаве такая ж судовая недатыкальнасць, якая згодна з гэтым Кодэксам забяспечваецца гэтай замежнай дзяржаве, яе маёмасці і прадстаўнікам у Рэспубліцы Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь або іншым упаўнаважаным органам Рэспублікі Беларусь можа быць прадпісана ў дачыненні да гэтай дзяржавы, яе маёмасці або прадстаўніка прымяненне мер у адказ.

**Артыкул 560. Выкананне судовых даручэнняў замежных судоў і зварот судоў Рэспублікі Беларусь з даручэннямі да замежных судоў**

Суды Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь выконваюць перададзеныя ім ва ўстаноўленым парадку даручэнні замежных судоў аб вядзенні асобных працэсуальных дзеянняў (уручэнне павестак і іншых працэсуальных дакументаў, допыт бакоў і сведак, правядзенне экспертызы, агляду на месцы і інш.), за выключэннем выпадкаў, калі:

1) выкананне даручэння супярэчыла б суверэнітэту або пагражала б бяспецы Рэспублікі Беларусь;

2) выкананне даручэння не ўваходзіць у кампетэнцыю суда.

Выкананне даручэнняў замежных судоў аб вытворчасці асобных працэсуальных дзеянняў праводзіцца на аснове заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Суды Рэспублікі Беларусь могуць звяртацца да замежных судоў з даручэннямі аб вядзенні асобных працэсуальных дзеянняў пры наяўнасці міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

Парадак зносін судоў Рэспублікі Беларусь з замежнымі судамі вызначаецца заканадаўствам і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 561. Выкананне рашэнняў замежных судоў і арбітражаў (трацейскіх судоў)**

Парадак выканання ў Рэспубліцы Беларусь рашэнняў замежных судоў вызначаецца адпаведнымі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Рашэнне замежнага суда,

арбітражу (трацейскага суда) можа быць прад'яўлена да прымусовага выканання на працягу трох гадоў з моманту ўступлення рашэння ў законную сілу, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 561[1]. Асаблівасці разгляду просьбаў аб спагнанні аліментаў на падставе Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і**

Просьбы аб прызнанні рашэння, аб прызнанні і выкананні рашэння, аб вынясенні рашэння, аб удасканальванні рашэння аб спагнанні аліментаў на падставе Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і ад 23 лістапада 2007 года, якія паступілі праз Міністэрства юстыцыі (далей, калі не ўказана іншае, – просьбы аб спагнанні аліментаў), разглядаюцца абласным, Мінскім гарадскім судом па месцы жыхарства (месцы знаходжання) асобы, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдытора), або асобы, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніка). Просьбы аб спагнанні аліментаў разглядаюцца таксама абласным, Мінскім гарадскім судом па месцы знаходжання маёмасці асобы, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніка).

Просьбы аб спагнанні аліментаў з'яўляюцца працэсуальнымі дакументамі. Патрабаванні да формы і зместу просьбаў аб спагнанні аліментаў устанаўліваюцца Канвенцыяй аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і.

Просьбы аб прызнанні або аб прызнанні і выкананні рашэнняў замежных судоў аб спагнанні аліментаў разглядаюцца па правілах дадатку 4 да гэтага Кодэкса з улікам палажэнняў Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і.

Рашэнне замежнага суда аб спагнанні аліментаў, якое не можа быць прызнана і выканана ў Рэспубліцы Беларусь у цэлым, павінна быць прызнана і выканана ў любой аддзельнай частцы, якая можа быць прызнана і выканана, без змянення рашэння па сутнасці.

Просьба аб вынясенні рашэння аб спагнанні аліментаў можа быць пададзена асобай, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдыторам), у выпадку, калі:

адсутнічае рашэнне аб спагнанні аліментаў;

рашэнне замежнага суда аб спагнанні аліментаў не можа быць прызнана і выканана ў Рэспубліцы Беларусь;

у прызнанні і выкананні рашэння замежнага суда аб спагнанні аліментаў у Рэспубліцы Беларусь адмоўлена з прычыны адсутнасці падстаў для яго прызнання і выканання, прадугледжаных Канвенцыяй аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і, або па падставах для адмовы ў прызнанні і выкананні рашэння, прадугледжаных Канвенцыяй аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і для гэтай катэгорыі просьбаў, які дапускае наступную падачу такой просьбы.

Просьба аб вынясенні рашэння аб спагнанні аліментаў разглядаецца па правілах іскавага вядзення з улікам палажэнняў Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і.

Просьба аб удасканальванні рашэння аб спагнанні аліментаў, вынесенага ў Рэспубліцы Беларусь або ў замежнай дзяржаве, можа быць пададзена асобай, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдыторам), або асобай, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніком), у дачыненні да якой вынесена такое рашэнне.

Суд мае права пры змяненні матэрыяльнага і (або) сямейнага становішча асобы, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдытора), і (або) асобы, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніка), змяніць памер аліментаў, спосабы і парадак іх выплаты, прадугледжаныя рашэннем аб спагнанні аліментаў, шляхам вынясення новага рашэння на падставе раней вынесенага рашэння аб спагнанні аліментаў (удасканальванне рашэння аб спагнанні аліментаў).

Просьба аб удасканальванні рашэння аб спагнанні аліментаў разглядаецца па правілах іскавага вядзення з улікам палажэнняў Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і.

Копіі судовых пастаноў па выніках разгляду просьбаў аб спагнанні аліментаў накіроўваюцца судом у Міністэрства юстыцыі ў трохдзённы тэрмін з дня іх вынясення з мэтай забеспячэння выканання абавязацельстваў па Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых форм утрымання сям'і.

## РАЗДЗЕЛ XI
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### ГЛАВА 42
### ПАРАДАК УСТУПЛЕННЯ ГЭТАГА КОДЭКСА Ў СІЛУ

**Артыкул 562. Момант уступлення гэтага Кодэкса ў сілу**

Гэты Кодэкс уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Артыкул 563. Дзеянне заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сувязі з уступленнем у сілу гэтага Кодэкса**

Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць гэтаму Кодэксу і калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 564. Завяршэнне вядзення па асобных катэгорыях спраў**

Справы, пачатыя вядзеннем да ўступлення гэтага Кодэкса ў сілу, падведамныя судам па гэтым Кодэксе ў іншым судаводстве, разглядаюцца па правілах, якія дзейнічалі на момант узбуджэння справы.

**Артыкул 565. Дзеянні дзяржаўных органаў у сувязі з уступленнем у сілу гэтага Кодэкса**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 кастрычніка 1999 года:

унесці ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь праект закона Рэспублікі Беларусь аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у законы ў сувязі з прыняццем гэтага Кодэкса;

прывесці акты Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам, а таксама забяспечыць перагляд і адмену рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання іх актаў, якія супярэчаць гэтаму Кодэксу.

**Артыкул 566. Прызнанне страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь**

У сувязі з прыняццем гэтага Кодэкса прызнаць страціўшымі сілу Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 11 чэрвеня 1964 года (ЗЗ БССР, 1964 г., № 17, арт. 184), а таксама ўсе акты заканадаўства, якімі ўнесены змяненні і дапаўненні ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь у перыяд з 11 чэрвеня 1964 года да моманту ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**

**А.Лукашэнка**

Дадатак 1
выключаны

Дадатак 2

## Аднаўленне страчанага судовага вядзення

**Артыкул 1**. Страчанае судовае вядзенне па грамадзянскай справе можа быць адноўлена судом па заяве юрыдычна зацікаўленых у зыходзе справы асоб, а таксама па ініцыятыве суда.

**Артыкул 2.** Страчанае вядзенне, у тым ліку вынесенае па справе рашэнне або вызначэнне аб спыненні вядзення, аднаўляецца поўнасцю або ў частцы, аднавіць якую неабходна па меркаванні суда.

**Артыкул 3.** Заява аб аднаўленні страчанага судовага вядзення падаецца ў суд, у якім разглядалася справа, і разглядаецца адпаведным судом.

**Артыкул 4.** У заяве павінны ўтрымлівацца падрабязныя звесткі аб справе. Да заявы дадаюцца працэсуальныя дакументы або іх копіі, якія захаваліся ў заяўніка і маюць дачыненне да справы, нават калі яны не завераны ва ўстаноўленым парадку.

**Артыкул 5.** Пры разглядзе справы суд выкарыстоўвае захаваныя часткі вядзення, дакументы, выдадзеныя са справы да страты вядзення грамадзянам і юрыдычным асобам, копіі гэтых дакументаў, а таксама іншыя дакументы, якія маюць дачыненне да справы.

Суд можа дапытаць у якасці сведак асоб, якія прысутнічалі пры здзяйсненні працэсуальных дзеянняў, асоб, якія выконвалі рашэнне суда, а ў неабходных выпадках – суддзю, які ўдзельнічаў у разглядзе справы, па якой страчана вядзенне.

**Артыкул 6.** Пры недастатковасці сабраных матэрыялаў для дакладнага аднаўлення страчанага вядзення суд вызначэннем спыняе разбор заявы аб аднаўленні вядзення. У гэтым выпадку заяўнік мае права прад'явіць іск у агульным парадку.

**Артыкул 7.** Разгляд заявы аб аднаўленні судовай пастановы па страчаным вядзенні не абмяжоўваецца тэрмінам яго захоўвання.

Аднак у выпадку звароту з заявай аб аднаўленні страчанага вядзення з мэтай яго выканання, калі тэрмін для прад'яўлення выканаўчага ліста да выканання скончыўся і судом не аднаўляецца, суд таксама спыняе вытворчасць па заяве.

**Артыкул 8. Выключаны.**

**Артыкул 9. Выключаны.**

**Артыкул 10.** Судовыя пастановы па заявах аб аднаўленні страчанага вядзення могуць быць абскарджаны і апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 11.** Пры заведама няпраўдзівай заяве судовыя выдаткі, звязаныя з узбуджэннем справы па заяве аб аднаўленні страчанай вытворчасці, спаганяюцца з заяўніка. Заяўнік вызваляецца ад выплаты судовых выдаткаў, панесеных судом пры разглядзе справы аб аднаўленні страчанага вядзення.

Дадатак 3
выключаны

Дадатак 4

## Выкананне ў Рэспубліцы Беларусь судамі рашэнняў замежных судоў і арбітражаў (трацейскіх судоў), калі бокам па справе з'яўляецца грамадзянін, які не з'яўляецца прадпрымальнікам, што ажыццяўляе сваю дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы

**Артыкул 1.** Судовыя пастановы замежных судоў, а таксама рашэнні замежных арбітражаў (трацейскіх судоў) (далей – рашэнні замежных судоў) прызнаюцца і выконваюцца ў Рэспубліцы Беларусь, калі гэта прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні замежных судоў, якія не патрабуюць прымусовага выканання, прызнаюцца ў Рэспубліцы Беларусь і ў тым выпадку, калі гэта прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пад рашэннямі замежных судоў разумеюцца рашэнні па грамадзянскіх справах у дачыненні да грамадзян, прыгаворы па крымінальных справах у частцы пакрыцця ўрону, прычыненага злачынствам, а таксама, калі гэта прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, акты іншых органаў замежных дзяржаў.

**Артыкул 2.** Пытанне аб дазволе прымусовага выканання рашэння замежнага суда разглядаецца па хадайніцтве спагнанніка абласным, Мінскім гарадскім судом па месцы жыхарства (знаходжання) даўжніка, а калі даўжнік не мае месца жыхарства (знаходжання) у Рэспубліцы Беларусь або месца жыхарства (знаходжання) даўжніка невядома, – па месцы знаходжання яго маёмасці.

**Артыкул 3.** Хадайніцтва аб дазволе прымусовага выканання рашэння замежнага суда павінна ўтрымліваць:

1) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) спагнанніка, а таксама яго прадстаўніка, калі хадайніцтва падаецца прадстаўніком, указанне іх месца жыхарства (месца знаходжання), а калі спагнаннікам з'яўляецца юрыдычная асоба – яе месца знаходжання;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (найменне) даўжніка і ўказанне яго месца жыхарства (месца знаходжання), а калі даўжніком з'яўляецца юрыдычная асоба – яе месца знаходжання;

3) просьбу спагнанніка аб дазволе прымусовага выканання; у тым выпадку, калі рашэнне ўжо раней выконвалася, – указанне на тое, у якой частцы або з якога часу патрабуецца выкананне рашэння.

Да хадайніцтва прыкладаюцца дакументы, прадугледжаныя міжнародным дагаворам, а калі гэта не прадугледжана дагаворам, то прадстаўляюцца наступныя дакументы: засведчаная копія рашэння замежнага суда, аб дазволе прымусовага выканання якога ўзбуджана хадайніцтва; афіцыйны дакумент аб тым, што рашэнне ўступіла ў законную сілу, калі гэтага не відаць з тэксту самога рашэння; дакумент, з якога вынікае, што бок, супраць якога вынесена рашэнне і які не прыняў удзелу ў працэсе, быў своечасова і ў належнай форме апавешчаны аб разглядзе справы; завераны пераклад указаных дакументаў на рускую або беларускую мову.

**Артыкул 4.** Разгляд хадайніцтва аб дазволе прымусовага выканання рашэння замежнага суда праводзіцца ў адкрытым судовым пасяджэнні з апавяшчэннем даўжніка пра час і месца разгляду хадайніцтва.

Няяўка без уважлівай прычыны даўжніка, адносна якога суду вядома, што павестка яму была ўручана, не з'яўляецца перашкодай да разгляду хадайніцтва. Калі даўжнік звярнуўся ў суд з просьбай аб пераносе часу разгляду хадайніцтва і гэта просьба прызнана

суддзёй уважлівай, суддзя пераносіць час разгляду і апавяшчае даўжніка пра новы час разгляду хадайніцтва.

**Артыкул 5.** Выслухаўшы тлумачэнні даўжніка і разгледзеўшы прадстаўленыя дакументы, суд выносіць вызначэнне аб дазволе прымусовага выканання рашэння замежнага суда або аб адмове ў гэтым.

Адмова ў дазволе прымусовага выканання рашэння замежнага суда дапускаецца ў выпадках, калі:

1) рашэнне паводле заканадаўства дзяржавы, на тэрыторыі якой яно вынесена, не ўступіла ў законную сілу;

2) бок, супраць якога вынесена рашэнне, быў пазбаўлены магчымасці прыняць удзел у працэсе з прычыны таго, што яму не было своечасова і належным чынам уручана паведамленне аб разглядзе справы;

3) разгляд справы адносіцца да выключнай кампетэнцыі суда Рэспублікі Беларусь або іншага органа;

4) ёсць рашэнне суда Рэспублікі Беларусь, якое ўступіла ў законную сілу, вынесенае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і на тых жа падставах, або ў вядзенні суда Рэспублікі Беларусь маецца справа, узбуджаная па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым ж прадмеце і на тых жа падставах да ўзбуджэння справы ў замежным судзе;

5) скончыўся тэрмін даўнасці прад'яўлення рашэння да прымусовага выканання, прадугледжаны артыкулам 468 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

6) выкананне рашэння супярэчыла б суверэнітэту Рэспублікі Беларусь або пагражала б бяспецы Рэспублікі Беларусь або супярэчыла б асноўным прынцыпам заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 6.** Копіі вызначэння, згаданага ў артыкуле 5 гэтага Дадатка, накіроўваюцца судом спагнанніку або яго прадстаўніку і даўжніку ў трохдзённы тэрмін з дня вынясення вызначэння.

**Артыкул 7.** Вызначэнне, згаданае ў артыкуле 5 гэтага Дадатка, можа быць абскарджана або апратэставана ў вышэйстаячы суд у парадку і тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 8.** На падставе рашэння замежнага суда і судовага вызначэння аб дазволе прымусовага выканання гэтага рашэння, што ўступіла ў законную сілу, выдаецца выканаўчы ліст, які накіроўваецца спагнанніку.

**Артыкул 9.** Дзеянні па прымусовым выкананні рашэння замежнага суда праводзяцца судовым выканаўцам на падставе заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 10.** Рашэнні замежных судоў, якія не патрабуюць прымусовага выканання, прызнаюцца без якой-небудзь далейшай вытворчасці, калі з боку зацікаўленай асобы не паступяць пярэчанні супраць гэтага.

Зацікаўленая асоба можа на працягу месячнага тэрміну пасля таго, як ёй стала вядома аб паступленні рашэння замежнага суда, заявіць у абласны, Мінскі гарадскі суд па месцы свайго жыхарства (знаходжання) пярэчанні супраць прызнання гэтага рашэння.

Пярэчанні зацікаўленай асобы супраць прызнання рашэння замежнага суда разглядаюцца ў адкрытым судовым пасяджэнні з апавяшчэннем гэтай асобы пра час і месца разгляду.

Няяўка без уважлівай прычыны зацікаўленай асобы, адносна якой суду вядома, што павестка ёй была ўручана, не з'яўляецца перашкодай да разгляду пярэчанняў.

Калі зацікаўленая асоба звернецца ў суд з просьбай аб пераносе часу разгляду пярэчанняў і гэта просьба будзе прызнана судом уважлівай, суд пераносіць час разгляду і апавяшчае пра гэта зацікаўленую асобу.

Пасля разгляду пярэчанняў супраць прызнання рашэння замежнага суда выносіцца адпаведнае вызначэнне.

Адмова ў прызнанні рашэння замежнага суда, якое не падлягае прымусоваму выкананню, дапускаецца пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных падпунктамі 1–4 і 6 часткі другой артыкула 5 гэтага Дадатка.

Копія вызначэння ў трохдзённы тэрмін з дня яго вынясення накіроўваецца судом асобе, па просьбе якой было вынесена рашэнне замежнага суда, або яе прадстаўніку і асобе, якая заявіла пярэчанні супраць прызнання рашэння.

Вызначэнне суда можа быць абскарджана або апратэставана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у парадку і тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 11.** Палажэнні артыкулаў 2–10 гэтага Дадатка, за выключэннем часткі другой артыкула 3, падпунктаў 1–4 і 6 часткі другой артыкула 5 і часткі сёмай артыкула 10, прымяняюцца таксама да замежных арбітражных рашэнняў, калі гэта прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

Бок, які кіруецца арбітражным рашэннем або які хадайнічае аб прывядзенні яго ў выкананне, павінен прадставіць належным чынам завераны арыгінал арбітражнага рашэння або завераную копію такога, а таксама арыгінал арбітражнага пагаднення або завераную копію такога. Калі арбітражнае рашэнне або пагадненне выкладзена на замежнай мове, бок павіен прадставіць завераны пераклад гэтых дакументаў на беларускую або рускую мову.

У прызнанні або прывядзенні ў выкананне замежнага арбітражнага рашэння можа быць адмоўлена толькі:

1) па просьбе боку, супраць якога яно накіравана, калі гэты бок прадставіць суду, у якім запытваецца прызнанне або прывядзенне ў выкананне, доказы таго, што:

адзін з бакоў у арбітражным пагадненні быў недзеяздольны або гэта пагадненне несправадзейнае паводле закона, якому бакі яго падпарадкавалі, а пры адсутнасці такога ўказання – паводле закона краіны, дзе рашэнне было вынесена;

бок, супраць якога вынесена рашэнне, не быў належным чынам апавешчаны аб прызначэнні арбітра або аб арбітражным разборы або па іншых прычынах не мог прадставіць свае тлумачэнні;

рашэнне вынесена па спрэчцы, якая не прадугледжана арбітражным пагадненнем або не падпадае пад яго ўмовы, або ўтрымлівае пастановы па пытаннях, якія выходзяць за межы арбітражнага пагаднення, з тым, аднак, што калі пастановы па пытаннях, якія ахопліваюцца арбітражным пагадненнем, могуць быць аддзелены ад тых, якія не ахопліваюцца такім пагадненнем, то тая частка арбітражнага рашэння, у якой утрымліваюцца пастановы па пытаннях, якія ахопліваюцца арбітражным пагадненнем, можа быць прызнана і прыведзена ў выкананне;

склад арбітражу або арбітражная працэдура не адпавядалі пагадненню бакоў або ў адсутнасць такога не адпавядалі закону той краіны, дзе меў месца арбітраж;

рашэнне не ўступіла ў законную сілу, або было адменена, ці яго выкананне было прыпынена судом краіны, у якой або ў адпаведнасці з законам якой яно было вынесена;

2) калі суд знойдзе, што:

аб'ект спрэчкі не можа быць прадметам арбітражнага разбору паводле закона Рэспублікі Беларусь;

прызнанне і прывядзенне ў выкананне гэтага арбітражнага рашэння супярэчаць публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь.

Калі ў судзе заяўлена хадайніцтва аб адмене або прыпыненні выканання арбітражнага рашэння, суд, у якім запрошваецца прызнанне або прывядзенне ў выкананне, можа, калі палічыць гэта належным, адкласці вынясенне свайго рашэння.

(Неафіцыйны пераклад). Распаўсюджваецца згодна з пунктам 14 Палажэння аб дзейнасці па распаўсюджанні (прадастаўленні) прававой інфармацыі, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2010 г. № 712 «О совершенствовании государственной системы правовой информации Республики Беларусь».